ARCHE Зьмест № 1’02

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE 1(21)-2002. "…"
3. Я не баяўся слова “сьмерць”. Анатоль Кудравец ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
4. Пагібель “беларускіх пісьменьнікаў”. Валерка Булгакаў ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
5. Амэрыканскі дзёньнік. Славамір Адамовіч ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
6. Заваёўнікі. Алесь Разанаў ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
7. Крыштальны бакал юнацтва… Усевалад Гарачка ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
8. Маша і мядзьведзі. Уладзімер Арлоў у ARCHE 1(21)-2002. "…"
9. Caveat Lector. Аляксандар Надсан ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
10. Падзвіжнікі і не іхнія святыні. Мікола Нікалаеў у ARCHE 1(21)-2002. "…"
11. У пошуках беларускай ідэі. Сямён Букчын у ARCHE 1(21)-2002. "…"
12. Глабалізацыя і валютна-эканамічныя інтарэсы Беларусі. Уладзімер Калупаеў ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
13. Моўная палітыка ў Беларусі ў 1990-я гады. Сяргей Запрудзкі ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
14. Пытаньне дзяржаўнай сымболікі ў Беларусі: гісторыя і сучасны стан. Ігар Лялькоў у ARCHE 1(21)-2002. "…"
15. Усходнеэўрапейскія сталіцы. Іван Міцін у ARCHE 1(21)-2002. "…"
16. Эмансыпацыя слова: “самвыдаў” супраць “дзяржвыдаву”. Мікола Рабчук у ARCHE 1(21)-2002. "…"
17. З дыярыюшу вясковага настаўніка. ARCHE 1(21)-2002. "…"
18. “1896”. Марыя Роўда ў ARCHE 1(21)-2002. "…"
19. Ізноў пра кляты постмадэрнізм. Сяргей Балахонаў у ARCHE 1(21)-2002. "…"

З ь м е с т

Ад рэдакцыі
Трыбуна для ўсіх
Беларусь сёньня
Анатоль Кудравец: Я не баяўся слова “сьмерць”
Валерка Булгакаў. **Пагібель “беларускіх пісьменьнікаў”**
запісы
Славамір Адамовіч. **Амэрыканскі дзёньнік**
лірыка
Алесь Разанаў. **Заваёўнікі**
Усевалад Гарачка. **Крыштальны бакал юнацтва...**
проза
Уладзімер Арлоў. **Маша і мядзьведзі**
крытыка
Аляксандар Надсан. **Caveat Lector**
Мікола Нікалаеў. **Падзьвіжнікі і ня іхныя сьвятыні**
Сямён Букчын. **У пошуках беларускай ідэі**
эканоміка
Уладзімер Калупаеў. **Глабалізацыя і валютна-эканамічныя інтарэсы Беларусі**
праблемы
Сяргей Запрудзкі. **Моўная палітыка ў Беларусі ў 1990-я гады**
Ігар Лялькоў. **Пытаньне дзяржаўнай сымболікі ў Беларусі: гісторыя і сучасны стан**
эсэ
Іван Міцін. **Усходнеэўрапейскія сталіцы**
суседзі

Мікола Рабчук. **Эмансыпацыя слова: “самвыдаў” супраць “дзяржвыдаву”**
вожык
З дыярыюшу вясковага настаўніка
гісторыі
Марыя Роўда. **“1896”**
водгук
Сяргей Балахонаў. **Ізноў пра кляты постмадэрнізм**

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

ад рэдакцыі

Трыбуна для ўсіх

Часопісу “ARCHE” чатыры гады, Вы трымаеце ў руках яго дваццаць першы нумар. “ARCHE” застаецца такім, якім ён быў на пачатку, — народным часопісам для ўсіх, хто хоча жыць і гаварыць па-свойму ды па-свойму думаць. Часопісам вольнае думкі, які займаецца асэнсаваньнем беларускай і сусьветнай рэчаіснасьці. Нашы мэты — узбагачэньне літаратурнай мовы, спрыяньне творчаму наватарству, азнаямленьне чытача з замежнай гуманітарнай думкай. Мы па-ранейшаму не прымаем інтэлектуальнага снабізму, як і тупога асьветніцтва. Яснасьць думкі, сацыяльны і нацыянальны аптымізм, плюралізм пазыцый застаюцца нашымі прынцыпамі. Барацьба за сацыяльную справядлівасьць і ўмацаваньне эканамічнай і культурнай незалежнасьці Беларусі — нашы заданьні. Агульная сытуацыя ў краіне зьмянілася ў выніку перамогі лукашыстаў на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году. Наступствамі гэтага стала расьцерушэньне нацыянал-дэмакратычных сілаў, канфіскацыя літаратурных часопісаў. “ARCHE” пачынаў выходзіць ва ўмовах, калі існавала большая разнастайнасьць літаратурна-мастацкіх выданьняў. Цяпер гэтага няма. Гэта

паставіла нас перад неабходнасьцю зьменаў у канцэпцыі пэрыёдыка.
Абставіны прымушаюць “ARCHE” стаць трыбунаю для ўсіх — нягледзячы на эстэтычныя разыходжаньні, розьніцу пакаленьняў. Каб зрабіць часопіс таньнейшым, даступным па цане розным слаям насельніцтва, мы пераходзім з афсэтнай паперы на газэтную. Рэдакцыя пастараецца вытрымліваць штодвухмесячную пэрыядычнасьць выхаду. Мы адмаўляемся ад спэцыялізаваных “тоўстых” і “тонкіх” нумароў, аддаючы перавагу клясычнаму часопіснаму аб’ёму.
Выходзьце нам насустрач.

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Анатоль Кудравец: Я не баяўся слова “сьмерць”

Гутарка зь пісьменьнікам Анатолем Кудраўцом, былым галоўным рэдактарам часопісу “Нёман” (1978—1997), аўтарам раману “Сачыненьне на вольную тэму” (Дзяржаўная прэмія Беларусі, 1986), зборніка апавяданьняў “Сьмерць нацыяналіста” (1992).

— **Вы** 20 гадоў, з 1978 да 1997-га, былі рэдактарам часопісу “Нёман”, які сеяў зерне беларускага нацыяналізму сярод людзей, расейскіх па культуры. І вось былога часопісу “Нёман” — выданьня Георгія Коласа, Міхася Стральцова, Рыгора Бярозкіна, Варлена Бечыка — няма. У Вашым былым кабінэце сядзіць Ніна Чайка. Цяпер часта пішуць: мова памірае, народ памірае, дзяржава памірае. Ці не баіцёся Вы сьмерці беларускага нацыяналізму як ідэалёгіі? Раз мова памірае, дзяржава памірае — значыць, і беларускі нацыяналізм памірае? Ці не баіцёся сьмерці беларускага нацыяналізму, якому аддалі столькі часу?

— Я не баюся сьмерці нацыяналізму, таму што нацыяналізм — гэта не адзін чалавек і ня дзесяць чалавек. Гэта ідэя, гэта, можна сказаць, душа, душа песьні, душа народу. Нацыяналізм — гэта любоў да зямлі, а яна будзе жыць, пакуль будзе Зямля і пакуль будуць на ёй жыць людзі. Людзі, якіх будуць называць беларусамі ды якія будуць і размаўляць па-беларуску, і думаць па-беларуску, і думаць пра Беларусь.

— Якія былі найбольшыя набыткі Вашай працы ў “Нёмане”, што з пэрспэктывы гадоў бачыцца найважнейшым? І што, наадварот, Вы рабілі ня так?

— Мне цяжка сказаць, што я рабіў ня так. Калі я прыйшоў у “Нёман” галоўным рэдактарам, бытавала ідэя, што “Нёман” павінен быць расейскім часопісам у Беларусі. І цяпер такая ідэя многімі выказваецца зноў. Першае, што я сказаў, — “Нёман” ёсьць беларускі часопіс, але на расейскай мове. Беларускі часопіс на расейскай мове. Ідэя была расказаць беларусам пра Беларусь, пра беларускую літаратуру, пра ўсё найлепшае, што стваралася тут і на беларускай мове, і на расейскай. І наклад тады падымаўся да 180 тысяч. Калі атрымаецца стварыць новы часопіс, ён перш за ўсё павінен казаць пра Беларусь і пра тое вялікае гуманітарнае мінулае, на якім трымалася, трымаецца і будзе трымацца Беларусь. Можна пачынаць ад Скарыны, можна раней, і ісьці да сёньняшніх дзён. У нас ёсьць цудоўная літаратура, вялікая гісторыя, вялікая культура. Пра гэта ня трэба забываць і трэба супрацьпастаўляць іх усёй тэле-радыё-газэтна-кніжнай макулятуры, папсе. Вось такая ідэя жыве ўва мне.

— Параўноўваючы часы, калі Вы пачыналі (1978) і

сканчалі (1997) працаваць у “Нёмане”, якія зь іх былі больш плённыя для беларушчыны?

— Самыя плённыя для беларушчыны — гэта гады Караткевіча і Пазьняка. Караткевіч — гэта казка Беларусі. І “Блакіт і золата дня”, і “Дзікае паляваньне караля Стаха”, і “Замак Альшанскі”. Пазьней зьявілася “Маленькая балерына”. Гэта такі шэдэўр, які, на жаль, мала згадваюць ды мала ведаюць.

Далей — Кісялёў і Мальдзіс. Яны, як краты, капалі зямлю. Кладзешся спаць — нічога няма, а прачынаешся — накапана. Ня проста зямля — людзі, постаці, мінуўшчына. Мінуўшчына, празь якую праглядаецца будучыня. Беларуская гісторыя мне нагадвае неўзаранае поле. Толькі пасьля таго, як па ім пройдзе з плугам пісьменьнік-араты, гісторыя набывае чалавечы характар, аблічча, ажывае постацямі, сытуацыямі. Вось гэта рабілі і робяць Кісялёў ды Мальдзіс. Далей — “Песьняры”, якія ўзарвалі душу беларуса. Задушаная войнамі, рэвалюцыямі, русіфікацыяй, Беларусь проста забылася сама на сябе. Яна чакала свайго Мулявіна. Былі, канечне, Шырма, Цітовіч, Дрынеўскі, але яны імкнуліся паказаць людзям увесь музычны абсяг. А Мулявін узяў вясеньнюю мэлёдыю, аддаў Барткевічу, ускінуў вусамі, разьвёў рукі — і сьвет пачуў журботную жніўную песьню Беларусі: “Пайшла, ніколі ўжо ня вернешся, Алеся…”

Калі называць яшчэ імёны, я б згадаў Адамовіча Славаміра. У яго складаная планіда. На жаль, акрэсьленая, з аднаго боку, неразуменьнем старэйшых, а з другога — нейкай зайздрасьцю равесьнікаў.

Зноў жа, Пазьняк. Яркае ўзыходжаньне і сумны сыход. Сумны, можа, болей для ўсёй Беларусі, чым для самога Пазьняка. Вынікае, для беларушчыны самымі плённымі гадамі былі ўзыходжаньне і росквіт Караткевіча і трыбунная настырнасьць Пазьняка. Зьяўленьне гэтых постацяў абумовіў соцыюм — “зямля паклікала”. Аляксей Пысін некалі напісаў такія словы: “Зямля паклікала, як маці, працяжна, глуха: “Аляксей!..” Зямля Беларусі не магла не паклікаць Караткевіча. Быў такі час, што ня мог не прыйсьці Караткевіч. Потым настаў іншы час, калі ня мог не зьявіцца Пазьняк — трыбун, патрыёт. Пазьняк далёка за межамі Беларусі, а Курапаты, якія ён раскапаў, і цяпер крывавяць, клічуць да гісторыі, да праўды. Так, зямля паклікала іх — і аднаго, і другога, і ня толькі іх.

— Які год Вашай працы ў “Нёмане” быў найлепшы?
— Усе гады былі аднолькава цікавыя і аднолькава складаныя. Складаныя — калі была цэнзура і нагляд партыйных органаў, хаця, прызнаюся, такога ціску — гэта друкаваць, гэтага не друкаваць — я ня памятаю.
— Ці лічыце Вы “Нёман” вяршыняй сваёй рэдактараскай кар’еры?
— Сваю працу тут, у “Нёмане”, і галоўным рэдактарам, і загадчыкам аддзелу, і ў “Мастацкай літаратуры” я не разглядаю як нейкую кар’ерную прыступку. Самае важнае для мяне было застацца пісьменнікам. На жаль, цяжкавата было спалучаць дзьве справы, але галоўнае — гэта ўсё-ткі пісаць, а ня быць кіраўніком хоць і невялікага, хоць і паважанага калектыву часопісу.
— Памятаю, у 1992 годзе мы зь сяброўкаю (я тады быў студэнт) селі і паехалі ў Рыгу. Тады яшчэ хадзіла легендарная “Чайка”, ня трэ было візаў, і да Рыгі можна было даехаць за ноч, пагуляць там дзень і вярнуцца дамоў. Самае моцнае ўражаньне ад Рыгі — што там у пераходзе на раскладцы кнігара прадаваўся нумар часопісу “Нёман” за 20 рублёў. Вялізныя па тых часах грошы. Прадаваўся там нумар з творам пра лёс лунінецкага рабінзона, які пераседзеў савецкую ўладу ад 1945 да 1989 г. у лесе. Такая папулярнасьць часопісу!.. У чым была прычына зьніжэньня накладаў “Нёману” ў 90-х?
— Прычыны аб’ектыўныя. Для параўнаньня можна ўзяць маскоўскія часопісы, той жа *“Новый мир”*, які ў свой час друкаваў Салжаніцына і меў тады мільённы наклад, а сёньня — недзе ў межах 10 тысячаў. Параўнаем зь “Нёманам”: у 2001 годзе ён меў тыраж 3200—3300 асобнікаў. Калі правесьці нейкую арытмэтычную паралель, раскінуць тыраж *“Нового мира”* на ўсю Расею і “Нёмана” на ўсю Беларусь, то “Нёман” мае лепшыя пазыцыі. А аб’ектыўнасьць была ў тым, што, па-першае, прыйшло тэлебачаньне зь вялікай тэлеіндустрыяй. Фільмы амэрыканскія, італьянскія — яны забіраюць чытача. Потым прыйшла свабода ў літаратуры — ад парнаграфіі да дэтэктыву. Тое, што было ў савецкі час пад вялікай забаронай, стала адкрыта. Па-другое, што, відаць, больш істотна, — людзі нашмат зьбяднелі. Раней чалавек мог выпісаць некалькі часопісаў і некалькі газэт. Цяпер ён ня можа выпісаць нават

аднаго часопісу. Мо адну газэту — і тое такую, каб друкаваліся тэленавіны, праграма, надвор'е. Вось дзе прычына падзеньня тыражу і "Нёману", і "Полымя", дый усіх часопісаў і газэт.

— Як Вы ацэньваеце ўспаміны Міхала Дубянецкага, што друкаваліся ў "Полымі"?

— Гэтыя ўспаміны цікавыя як факт гісторыі: Дубянецкі расказвае пра тое, як ён працаваў у цэнтральным апараце партыі і як працаваў у выдавецтве. І яшчэ тым, што ён прыадкрыў тую старонку, якая была невядомая дагэтуль. Зь іншага боку, яны цікавыя як успаміны чалавека, што характарызуюць самога чалавека, самога Дубянецкага. Можна толькі пашкадаваць былога рэдактара "Полымя", што ў нейкіх выпадках ён сваёй воляй, воляй галоўнага рэдактара, трохі ўмяшаўся ў гэтыя ўспаміны, замяніўшы некалькі канкрэтных прозьвішчаў літарай N ці ініцыяламі. А калі б ён надрукаваў так, як было ў Дубянецкага, то ня выключана, што сёньня ў кабінэце галоўнага рэдактара "Полымя" не сядзеў бы нехта Мятліцкі, бо ён там згадваўся як чалавек далёка ня лепшай атэстацыі.

— Думаеце, не асьмеліліся б?

— Ну, гэта было б весялей, прынамсі. А так людзі думаюць, што Дубянецкі ня ўсё бачыў і ня ўсё ведаў пра тых работнікаў, зь якімі працаваў у выдавецтве. Так было б шчыра, ясна — хто ёсьць хто.

— У чым жа прычыны беларускае культурнае катастрофы ў 90-х, дыскрэдытацыі Беларусі ў сьвеце? У тым, што на кожным кроку гісторыі знаходзіўся свой Законьнікаў, які баяўся нешта такое выдрукаваць?

— Я не сказаў, што Законьнікаў пабаяўся. Ён не пабаяўся. Не баяўся друкаваць і Быкава, і Брыля, і Казька, і Алексіевіч, і шмат каго яшчэ. Як чалавек інтэлігентны, ён не хацеў, як мне здаецца, каб паэт Мятліцкі выступаў у той ролі, у якой ён выступаў, — ня толькі паэта, але і пасобніка пэўнае ўстановы. А прычына бяды, мне здаецца, трохі глыбейшая, і больш за ўсё — у нашэсьці бескультур'я, якое захліснула Беларусь. Прычым ішло яно і з Усходу, і з Захаду. Узброенае найноўшай тэхнікай і грашыма.

— Што Вы маеце на ўвазе пад бескультур'ем? Масавую культуру?

— Масавая культура, папса. Гэта як калярадзкі жук на бульбу ці саранча на траву. Папса, арыентацыя на павярхоўную займальнасьць — я маю на ўвазе і дэтэктыў, і сэкс. Тое, чаго нельга выстаўляць. А калі і выпускаць на тэлебачаньне і радыё, то ў нейкіх строгіх маральных рамках. Бескультур'ю можа супрацьстаяць толькі дзяржава — толькі дзяржаўныя людзі, пры ўмове калі ўлада зацікаўлена ў абароне народу ад бескультур'я, у выхаваньні людзей культурных, шчырых, адкрытых, самаахвярных. А калі дзяржава сама падтрымлівае бескультур'е, то гэта ўжо страшнейшае за чуму. Культура ня можа жыць бяз мовы, і ўсе рэфэрэндумы б'юць па ёй, ставячы пад знак зьнішчэньня.

— Сучаснае заходняе грамадзтва выхоўваецца на сучаснай масавай культуры — лёгкай літаратуры, забаўляльнай музыцы, папулярным кіно, выяўленчым мастацтве самых масавых відаў… Тым ня менш, калі прыяжджаеш на Захад, няма адчуваньня культурнай катастрофы, культурнае пустэчы, духоўнага зьнясіленьня, прыкметы якога адзначаюць многія госьці нашай краіны. Чаму тая масавая культура, якая на Захадзе забаўляе чалавека, але ў большасьці выпадкаў не нясе пагрозы для дэмакратыі і не падрывае павагі чалавека да чалавека, у нас прынесла з сабой гэткія рэфэрэндумы? Як так сталася, што ў нас масавая культура пахавала маладую дэмакратыю?

— Ня масавая культура пахавала дэмакратыю. Яе пахавалі камуністы. І пахавалі таму, што дэмакратыя не пасьпела акрэсьліцца, вырасьці. У дэмакратыі ня вырасьлі зубы, каб яна магла абараніць сама сябе. А ў камуністаў былі сілы — у іх была ўлада.

Нашае бескультур'е ішло не ад свабоды, а ад залежнасьці кожнага чалавека (калі ня кожнага, дык дзевяноста, а можа, і дзевяноста дзевяці са ста) ад дзяржаўных сродкаў. Дзяржаўныя сродкі якраз і працягваюць гэтае вось бескультур'е. У іх ёсьць такая задача, як мне здаецца, і яны спрабуюць зь ёй справіцца. Вернемся да сытуацыі з часопісамі. Што гэта — культура ці бескультур'е? Ці культура — зьнішчыць калектывы "Нёману", "Полымя", "Крыніцы", якія ствараліся дзясяткамі гадоў? Зьнішчыць калектывы, што несьлі культурна-гуманістычныя ідэі і культуру ў самым высокім сэнсе слова. Замяніць іхных рэдактараў на людзей, якія не зусім разумеюць, што такое

культура і наколькі яна важная і патрэбная людзям.

— Вы не шкадуеце, што ў 1992 годзе ці ў 1997 годзе, перад сыходам, не зрабілі часопісу “Нёман” незалежным, што не адмовіліся ад дзяржаўнай падтрымкі, дзяржаўных датацыяў? Што не зрабілі часопіс залежным толькі ад чытача?

— Ідэя такая была, і якраз праз гэта ў 1994 годзе мы стварылі пры часопісе “Нёман” спэцыяльны фонд. Мы адчувалі, што дзяржава ня будзе ляяльнай да чыста літаратурнай, культурніцкай палітыкі, якую вядзе часопіс, што прыйдзе час, калі нам паставяць нейкія ўмовы.

— Чаму ў Вас нарадзілася такое адчуваньне? Тады ж было ўсё спакойна.

— Неспакойна стала пасьля рэфэрэндуму, пасьля перапісваньня Закону аб мовах. Гэта былі першыя сымптомы, але гэта былі сур’ёзныя сымптомы. І мы стваралі фонд якраз з той ідэяй, каб ён мог, калі ўзьнікне неабходнасьць, узяць на сябе клопат па выданьні часопісу. Мы рабілі канкрэтныя захады, выйгралі адзін, потым другі грант тадышняга Фонду Сораса, атрымалі яшчэ некалькі кампутараў, што дазволіла ўзьняць самаакупнасьць часопісу да 53 %. Але жыцьцё ішло, свабодных грошай у людзей было ўсё меней, і ўсё цяжэй было знаходзіць дабрадзеяў, якія б дапамагалі часопісу — ці ў набыцьці тэхнікі, ці на іншыя расходы… Мы не пасьпелі зрабіцца незалежнымі, хаця такая ідэя была. А сёньня маем такі новы “Нёман”, а заўтра будзе ў “Нёману” такое новае начальства.

— Што Вы цяпер пішаце?

— Час ня надта спрыяльны для пісьма сур’ёзнага, стабільнага. Раней я пісаў штораніцы. Раніца магла пачацца і ў тры гадзіны ночы, і а пятай… Сядзеў за сталом, пакуль не на работу…

Напісана ў мяне кніжка апавяданьняў, гатовая таксама — у “Нёмане”, “Полымі”, “ЛіМе” прайшлі ўжо ўрыўкі — кніжка партрэтаў нашых пісьменьнікаў, людзей старэйшага, малодшага пакаленьня. Сытуацыя ж з выданьнем кнігі надта складаная, няма грошай, а зь іншага боку, хачу сказаць, няма вялікага жаданьня выдавацца цяпер. Я ня ведаю… Ці то старасьць, ці то такі псыхалягічны бар’ер… Але ёсьць, ёсьць задумкі, ёсьць няскончаная адна і другая аповесьці. Думаю,

што гэты псыхалягічны бар'ер мы пераможам — і дапішам.

— Ваша кніга "Сьмерць нацыяналіста", што выйшла ў 1992 годзе, прыцягвала чытача найперш назвай. Не адна тысяча людзей купіла яе праз гэта. Ці пайшлі б Вы на перавыданьне кнігі пад назвай "Сьмерць нацыяналіста"?

— Я пісаў апавяданьне з гэтым загалоўкам, а пасьля ён перакінуўся на ўвесь зборнік. У знак нейкага пратэсту. XX век напладзіў столькі гэтых палітычных суфіксаў — -ызмаў, -ізмаў: фашызм, камунізм, ідэалізм, нацыяналізм... У Беларусі слова "нацыяналіст" было так замазана чорнай фарбай, што я палічыў: трэба заступіцца за гэтае слова. Бо лічу: нацыяналіст — гэта харошы чалавек, нармальны чалавек, здаровы чалавек; гэта чалавек, які думае пра нацыю, пра сваю зямлю, радзіму, пра свой народ. І гэта нармальна. І гэта правільна. Бо хто будзе думаць пра сваю нацыю, як не нацыяналіст? Хто будзе думаць пра Беларусь, як не беларус?

І што дзіўна: пасьля таго як было надрукавана апавяданьне, заходзіць у "Нёман" — я тады працаваў галоўным рэдактарам — Янка Скрыган. Чалавек, які за гэты прыпісаны яму нацыяналізм адседзеў, адпрацаваў ледзь не 20 гадоў. Ён зайшоў і далікатненька, ціхенька кажа: "Анатолька, а чаму ты "нацыяналіст" ня ўзяў у двукосьсе?" — "А навошта браць?" — "Нацыяналіст — гэта ж маецца на ўвазе нешта такое…" — "Нічога падобнага, я бачыў харошага нацыяналіста".

Людзі, якія адседзелі па 10, 15, 20 гадоў у турмах, настолькі былі запалоханыя, што нават баяліся гэтага простага харошага слова "нацыяналіст"! Так што, калі раптам здарыцца магчымасьць яшчэ раз выдаць кніжку пад такой назвай, я гэта абавязкова зраблю. А можа, напішу для яе яшчэ апавяданьняў.

— А няма ў гэтым дваццаць пятага кадру пэсымізму — "Сьмерць нацыяналіста"? Вы ня бачыце ніякага кепскага знаку ў тым, каб яна яшчэ раз выйшла пад гэтай назвай: "Сьмерць" — і "нацыяналіста"?

— Пішучы, я не баяўся слова "сьмерць", таму што дзясяткі і тысячы людзей, якіх называлі нацыяналістамі, памерлі — хто ў Сібіры, хто ў Карэліі, хто ў Мурманску… Памерлі далёка ад радзімы, ад сяброў, ад сям'і, як чужыя, як непрыкаяныя, як непатрэбныя той зямлі людзі. Сьмерцяў было надта многа.

І яшчэ адна сьмерць, але ўжо нармальнага нацыяналіста, не выглядала такой страшнай. Але для перавыданьня сёньня я

пашукаў бы, відаць, іншы загаловак, больш аптымістычны.
Гутарыў Андрэй Дынько

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 12-11-2002
[image]

Валерка Булгакаў

Пагібель “беларускіх пісьменьнікаў”

ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ (нар. 1974) — галоўны рэдактар часопісу “ARCHE”, укладальнік і рэдактар аналітычных зборнікаў “Палітычная сыстэма Беларусі і прэзыдэнцкія выбары 2001 году” (2001), “Беларуска-расійская інтэграцыя” (2002), зборуў твораў Яна Станкевіча (“ARCHE”—“Энцыкла 2002). Апошняя ягоная публікацыя ў часопісе — артыкул

*П*адзеяй, якая кардынальна зьмяніла культурную сытуацыю ў краіне, стала аб’яднаньне літаратурна-мастацкіх часопісаў “Полымя”, “Маладосць”, “Нёман”, “Крыніца”, “Всемирная литература” і тыднёвіка “Літаратура і мастацтва”, выдаваных за дзяржаўныя грошы, у адзіны дзяржаўны голдынг “Літаратура і мастацтва”.

Аб’яднаньне суправаджалася заменай галоўнага рэдактара часопісу “Полымя” Сяргея Законьнікава на дагэтулешняга супрацоўніка выдавецтва “Мастацкая літаратура” Міколу Мятліцкага, галоўнага рэдактара “Маладосці” Генрыха Далідовіча на паэтку Раісу Баравікову, галоўнага рэдактара “Нёмана” Алеся Жука на лукашэнкаўскую радыёпрапагандыстку Ніну Чайку, масавымі звальненьнямі, а таксама выразнай зьменай рэдакцыйнай палітыкі ў тых выданьнях, дзе былі зьмененыя галоўныя рэдактары. Холдынг “Літаратура і мастацтва” ўзначаліў дэпутат палаты

прадстаўнікоў Сяргей Касьцян, якому ўдаецца сумяшчаць камуністычныя пагляды з асабістай адданасьцяй Лукашэнку. Гэтыя захады, напэўна, высьпявалі даўно. Толькі летась, у год прэзыдэнцкіх выбараў, зрэалізаваць іх не выпадала, бо гэта нарабіла б шкоды выбарчай кампаніі Лукашэнкі, адшпурхнула б ад яго частку выбарцаў. Адно калі прагучалі апошнія акорды выбарчых баталіяў, надарыўся зручны момант для рашучых дзеяньняў. Іх аб’ектам сталі ня толькі літаратурна-мастацкія часопісы, гісторыя некаторых зь якіх налічвае амаль стагодзьдзе, але і іхны фармальны заснавальнік — Саюз беларускіх пісьменьнікаў. Яму было спыненае бюджэтнае фінансаваньне, што выклікала ў гэтай установе арганізацыйны хаос, пацягнула за сабой рэзкія выпады асобных штатных работнікаў супраць яе старшыні раманісткі Вольгі Іпатавай. Паралельна ўладамі быў агучаны плян ператварэньня сямёх менскіх дзяржаўных выдавецтваў у тры: зь ліпеня выдавецтвы “Полымя” і “Ўраджай” далучаюцца да “Беларусі”, “Юнацтва” — да “Мастацкай літаратуры”, “Унівэрсытэцкае” — да “Вышэйшай школы”.

“Дэмакратычная алюшэнка ў плетках, у сваёй ізаляцыі” (№ 6, 2001).

Першыя рэакцыі ў дэмакратычных СМІ наўздагон гэтым падзеям у асноўным зводзіліся да таго, што лукашэнкаўцы так зводзяць рахункі зь беларускімі пісьменьнікамі, бо апошнія ператварыліся ў іх палітычных праціўнікаў, генэруючы ідэі і творачы мастацкія здабыткі, небясьпечныя для цяперашняга палітычнага ладу ў цэлым і праводжанай ім культурнай палітыкі ў прыватнасьці.

Думаецца, у гэтым меркаваньні крыецца толькі доля праўды. Сапраўды, тое самае “Полымя” друкавала прозу апальнага Васіля Быкава або вершы Ўладзімера Някляева, які сваёй неспадзяванай эміграцыяй на Захад выклікаў шэраг скандалаў у пісьменьніцкім асяродзьдзі. Аднак ёсьць і адваротны бок мэдаля: апошнія гады літаратурныя выданьні перажывалі крызыс, страчваючы дасягнутае раней. Зьмяншаўся іх фармат, пагаршалася паліграфічная якасьць, падаў наклад і зьніжалася колькасьць перадплатнікаў. Рэдакцыі гэтых выданьняў былі шчыра перакананыя ў тым, што дзякуючы паважнаму веку рэдагаваных імі выданьняў апошнія набылі статус “сьвятарнае каровы” беларускае культуры. І замест таго каб шукаць новых формаў дыстрыбуцыі часопісаў, павышаць іх самаакупнасьць і пашыраць чытацкую аўдыторыю, да апошняга чапляліся за

дзяржаўную падтрымку. Няма нічога дзіўнага ў тым, што нарэшце за гэтую падтрымку давялося заплаціць вялікую цану.

Таму ў канфіскацыі літаратурна-мастацкіх выданьняў лукашэнкаўцамі мы бачым ня столькі іхную помсту сваім палітычным праціўнікам, колькі сьведчаньне крайняй слабасьці пісьменьніцкага асяродзьдзя, добра ўсім вядомых беларускіх пісьменьнікаў, а таксама Саюзу пісьменьнікаў, які адвеку выступаў мэдыюмам паміж палітычным кіраўніцтвам краіны і літаратурным асяродзьдзем. Невыпадкова гэтая канфіскацыя ня выклікала хоць якіх палітычных праблемаў для рэжыму. Імклівая дэвальвацыя сацыяльна-палітычнай вагі гэтага асяродзьдзя суправаджаецца стратай сацыяльнага прэстыжу прафэсіі “беларускага пісьменьніка”, перад якім найчасьцей стаіць такая дылема: або зрабіцца правадніком Лукашэнкавай ідэалёгіі ў масах, працягваючы тым самым сваё паразытычнае існаваньне, або стаць ёй у апазыцыю, аддаўшыся на волю лёсу.
* * *
Беларускае грамадзтва, нават у абліччы сваёй палітычна актыўнай часткі, амаль не заўважыла гэтай вялікай падзеі ў культурным жыцьці краіны. Мы так і не дачакалі супольнай заявы палітычных партыяў з гэтай нагоды або выступаў дзеячоў “трэцяга сэктару”. З аднаго боку, гэтая халодная абыякавасьць сьведчыць, што кадравыя перастаноўкі ў рэдакцыйным актыве літаратурных выданьняў выклікалі адно ўнутрыгаліновы крызыс, закрануўшы вузкае асяродзьдзе беларускіх пісьменьнікаў, якое засталося сам-насам з сваёй крыўдай.
З другога боку, гэта наводзіць на думку, што палітычныя і грамадзкія лідэры нашай краіны па-ранейшаму не разумеюць важнасьці цяперашніх культурных працэсаў для палітычнай будучыні нацыі.
Нішто так ня лучыць беларускіх пісьменьнікаў зь беларускімі палітыкамі дэмакратычнай арыентацыі, як вузкасьць і неразьвітасьць, адпаведна, літаратурнага і палітычнага рынку ў краіне. Асноватворная праблема беларускіх пісьменьнікаў, якая спараджае ўсе меншыя, палягала і палягае ў тым, што іх творчасьць доўгі час была падпарадкаваная не чытацкім густам і, як вынік, не вымогам літаратурнага рынку, а прыхамацям ідэалягічных работнікаў, якія сьпярша сядзелі ў кабінэтах ЦК, а цяпер атабарыліся ў прэзыдэнцкай адміністрацыі. У беларускай

літаратуры другой паловы XX стагодзьдзя немагчыма вылучыць хоць колькі арыгінальных мастацкіх школаў ці кірункаў. Творы яе найбуйнейшых прадстаўнікоў, за рэдкімі выняткамі, ствараліся ў эстэтыцы, якую ўмоўна можна вызначыць як рустыкальную мяшанку пострамантызму з прэмадэрнізмам.
Дый як можна гаварыць пра залежнасьць беларускіх пісьменьнікаў ад тагачаснага літаратурнага рынку, калі іх асабісты дабрабыт — прадмет чорнай зайздрасьці іх некаторых сёньняшніх наступнікаў — ніяк не залежаў ад таго, як добра прадаваліся напісаныя імі кнігі і ці прадаваліся наагул. Праўдзівай зарукай гэтага дабрабыту было ўменьне дагаджаць палітычнаму кіраўніцтву краіны, мацаваць вызначаны ім палітычны курс. Асабліва шчодра камуністычны рэжым фінансаваў літаратурныя колы тады, калі ў савецкім інфармацыйна закрытым, таталітарным грамадзтве яшчэ не было новых сродкаў масавай інфармацыі, перадусім электронных мас-мэдыяў, і таму пісьменьніцкі талент сапраўды ўплываў на грамадзкую думку.
Паколькі ўнутраны літаратурны рынак існаваў у зародкавым стане, а завышаны, часам нічым не абгрунтаваны сацыяльны статус пісьменьніка дасягаўся паразытычным прыстасаваньнем да палітычнай кан'юнктуры, пісьменьніцкае асяродзьдзе прадукавала тэксты, якія часта не знаходзілі свайго спажыўца, бо ня мелі рэальнай рынкавай вартасьці.
Што ж датычыць дэмакратычных палітыкаў і айчыннага палітычнага рынку, то паміж імі таксама часта не назіраецца адносінаў адпаведнасьці. З-за адсутнасьці рэальнай сацыяльнай базы дэмакратычнай апазыцыі яе лідэры, каб дабіцца палітычнага выжываньня і асабістага дабрабыту, былі вымушаныя ісьці на крокі, прадыктаваныя не патрэбамі і інтарэсамі беларускага грамадзтва, а кабінэтнымі стратэгіямі некаторых ананімных аўтараў. У гэтым — карані невытлумачальных і немагчымых на першы погляд палітычных альянсаў і выбарчых кааліцыяў. Адначасна залежнасьць ад гэтых абстрактных стратэгіяў прывучае дэмакратычных лідэраў да безыніцыятыўнасьці, бязвольнасьці і слабахарактарнасьці. Навошта праяўляць ініцыятыву там, дзе твая роля ўжо загадзя зацьверджаная і наперад прапісаная? Аднак, згадзіўшыся на такую ролю, палітычны лідэр аўтаматычна робіцца паразытам на палітычнай кан'юнктуры. Між тым яго звышзадача — быць

не стараньнім назіральнікам за палітычнай сытуацыяй і тым больш не яе закладнікам, а тварыць палітыку, прышчапляць палітычна актыўным масам сугучныя часу вартасьці. Сацыяльныя спадзяваньні як пісьменьніцкага асяродзьдзя, так і асяродзьдзя дэмакратычных сілаў надзіва супадаюць. Магчыма, таму, што і першыя, і другія растуць з аднаго кораня?

* * *

Заняпад "беларускіх пісьменьнікаў" (тутака мы выкарыстоўваем словазлучэньне "беларускі пісьменьнік" як тэрмін для пазначэньня асобы, якая валодала наступнымі адзнакамі: а) мела прафэсію літаратурнага работніка, б) належала да Саюзу пісьменьнікаў, в) кульмінацыя яе творчай актыўнасьці прыпала на 30—90-я гады ХХ ст., г.зн. часу найбольшых інвэстыцыяў савецкага ўраду ў літаратуру) пачаўся з развалам савецкай імпэрыі і здабыцьцём Беларусяй незалежнасьці. Тады ўпершыню за дзесяцігодзьдзі зьявіліся цяжкасьці з рэгулярным выхадам часопісаў і бесьперабойнай выплатай ганарараў аўтарам. Храналягічна гэты час супадае з дэмантажом савецкага таталітарнага грамадзтва і яго заменай сьпярша на беларускую дэмакратыю ў духу Кебіча—Шушкевіча, а пасьля — на беларускі аўтарытарызм, умацаваны жалезнымі лапамі Аляксандра Лукашэнкі. У гэтую пару разбураецца падмурак, на якім трымаўся гмах беларускай савецкай літаратуры, — дзяржаўны заказ на творы беларускіх пісьменьнікаў. Яны пачынаюць уголас наракаць на рэзкае падзеньне дабрабыту. Згадваецца, як Іван Шамякін публічна жаліўся, што яму няма за што купіць шкарпэткі.
Крах савецкага камунізму быў першым паважным ударам па літаратурнай інфраструктуры ў Беларусі ў выглядзе Саюзу пісьменьнікаў і літаратурна-мастацкіх выданьняў, заснавальнікам якіх выступала гэтая арганізацыя. Адгэтуль для беларускіх пісьменьнікаў пачынаецца чорная паласа. На фоне рэзкага спаду дзяржаўнай падтрымкі літаратурнае працы некаторым зь іх здаецца, што найлепшым адказам на паўсталыя выклікі будзе асваеньне параўнальна новай для беларускага грамадзтва нацыяналістычнай рыторыкі. Былыя "інжынэры чалавечых душ" неспадзеўна паўстаюць у новай ідэалягічнай інкарнацыі — у абліччы трыбунаў нацыі, палымяных прапагандыстаў беларушчыны. Але далёка ня ўсім

зь іх даспадобы гэтае аблічча, і таму з “умацаваньнем антынароднага рэжыму” адбываецца чарговы раскол пісьменьніцкага асяродзьдзя. Прагматыкі накшалт Георгія Марчука, Генадзя Пашкова, Алеся Савіцкага або Івана Карэнды лічаць за гонар пайсьці на службу Лукашэнку, тым часам як рамантыкі-трыбуны на чале зь Нілам Гілевічам, Генадзем Бураўкінам і Рыгорам Барадулінам уважаюць сваім грамадзянскім абавязкам кляйміць дзе толькі ёсьць змога антыбеларускі рэжым. Дарма што “трыбунам” удаецца захаваць маральны ўплыў на частку літаратурна-мастацкіх выданьняў, дарма што існуе Беларускі ПЭН-цэнтар, уплыў пісьменьнікаў на грамадзкую думку застаецца мізэрным, а залежнасьць ад дзяржаўных рэсурсаў блізіцца да абсалютнай.
Як гэта ні парадаксальна, але акурат дзякуючы няздольнасьці ўплываць на грамадзкую думку падчас значнай дывэрсыфікацыі інфармацыйных патокаў канфіскацыя літаратурна-мастацкіх выданьняў адбылася так позна, на восьмы год Лукашэнкавага кіраваньня.

* * *

“Заняпад” і “пагібель” беларускіх пісьменьнікаў азначае зусім не зьнікненьне іх як зьявы ў грамадзка-культурным жыцьці краіны, а іх “функцыянальную сьмерць” як важнага элемэнту дзяржаўнай прапаганды. Беларускім пісьменьнікам гэта дае шанец нарэшце заняцца творчасьцю, бо палітычнае кіраўніцтва паставіла сыстэму прапаганды на больш прафэсійны ўзровень, выкарыстоўваючы для яе самыя эфэктыўныя мэдыі — тэлевізію і радыё. Як некалі раней беларускія пісьменьнікі, сёньня афіцыйныя прапагандысты цешацца высокім стандартам жыцьця. Повязь эпохаў праяўляецца ў драбніцах: як паўстагодзьдзя таму савецкі ўрад уручаў Петрусю Броўку ордэр на сяміпакаёвую кватэру ў былым Доме Саветаў на скрыжываньні вуліц Леніна і Маркса, так цяпер лукашэнкаўская адміністрацыя выдзяляе заслужанаму работніку беларускага тэлеэкрана Аляксандру Зімоўскаму шыкоўную чатырохпакаёвую кватэру ў высотным доме на вуліцы Чкалава, рынкавы кошт якой набліжаецца да астранамічных лічбаў.
Найбольш балюча пагібель беларускіх пісьменьнікаў ударыць па тых, хто год за годам скрупулёзна вывучаў іхную

творчасьць, г.зн. на акадэмічных літаратуразнаўцах. Зьнікненьне нават бачнасьці літаратурнага працэсу ў Беларусі — калі часопіс “Нёман” друкуе выступы Лукашэнкі, а часопіс “Полымя” зьмяшчае заклікі да Першамаю — выракае іх на хранічнае творчае галадаваньне і канчатковае абяскроўліваньне. Ня будзе нічога неспадзяванага, калі па заканчэньні рэформы сыстэмы акадэмічнай навукі Інстытуты літаратуразнаўства, мовазнаўства, этнаграфіі і фальклёру будуць аб’яднаныя ў адну ўстанову — які-небудзь “Інстытут беларускай культуры”, дырэктарам якога прызначаць якога-небудзь Віктара Чыкіна.

* * *

Канфіскацыю літаратурна-мастацкіх выданьняў лукашэнкаўцы прыкрывалі рыторыкай, сэнс якой зводзіўся да таго, што пісьменьніцкае асяродзьдзе ператварылася ў гнайнік на целе беларускага грамадзтва. Савецкая ўлада, маўляў, расьпесьціла і разбэсьціла пісьменьнікаў, прывучыла іх да танных пуцёвак у крымскія дамы адпачынку і казачных барышоў у выглядзе дзяржаўных прэміяў. Цяпер, калі эканоміка ў нас лібэральная, усяго гэтага ня будзе, — падводзілі вынік яны.

Так, безумоўна, пісьменьніцкае асяродзьдзе сур’ёзна хворае. Нібы прадчуваючы свой хуткі адыход у нябыт, беларускія пісьменьнікі яшчэ дзесяць-дваццаць гадоў таму масава аддаваліся ўсім магчымым чалавечым заганам: прагнасьці да дармовых грошай, машынаў і кватэраў, славалюбству, данасіцельству і запойнаму п’янству, асабістай пысе і небасяжным амбіцыям, а таксама неўтаймоўнай распусьце, якая выражалася ў бязладных палавых сувязях і пазашлюбных дзецях. Не адзін і ня два беларускія пісьменьнікі адначасна мелі некалькі сем’яў. На маральнае раскладаньне наслойвалася пляма нацыянальнай здрады: дзеці такіх беларускіх пісьменьнікаў, як Іван Пташнікаў, ня ўмелі гаварыць па-беларуску.

Тое самае тычыцца і акадэмічнага асяродзьдзя. У сваім сёньняшнім абліччы акадэмічная навука застаецца рэліктам таталітарнай фармацыі. Мэтастазы сталінізму падточвалі самі асновы навуковай дзейнасьці. Пошук і назапашваньне навукова вэрыфікаванай веды замяняўся яе пастаўленым на канвэер фальшаваньнем, дагматычным адстойваньнем рэакцыйных

ідэалягем. Цяжка нават ацаніць тую шкоду, якую сваёй лексыкаграфічнай працай нанёс беларускай мове Інстытут мовазнаўства імя Кандрата Крапівы. Некаторыя інстытуты з сыстэмы НАН Беларусі, асабліва гуманітарнага профілю, фактычна зрабіліся адстойнікамі квазінавуковых праграмаў і канцэпцыяў недалёкага савецкага мінулага. Характар іх неадэкватнай часу дзейнасьці недвухсэнсоўна сьведчыць, што сутнаснага абнаўленьня беларускай гуманітарнай навукі так і не адбылося.
Разам з тым, рыторыка лукашэнкаўцаў выкрывае толькі павярхоўныя праявы крызысу, які апанаваў пісьменьніцкае асяродзьдзе. Глыбіннай жа прычынай “пагібелі беларускіх пісьменьнікаў” зьяўляецца адсутнасьць у краіне легітымізаванай дзяржавай сыстэмы рэпрадукцыі нацыянальнай культуры, у прыватнасьці, брак сыстэмы нацыянальнай (беларускамоўнай) адукацыі. Пакуль у краіне ня будзе нацыянальнай школы і нацыянальнага ўнівэрсытэту, расійская культура ў Беларусі будзе захоўваць статус масавай, беларуская — элітарнай, а беларускія пісьменьнікі любой масьці будуць лунаць у беспаветранай прасторы, як матылькі падчас віхуры. Толькі радыкальнаму постмадэрністу гэткае становішча можа падацца дарам Божым.

* * *

Першую перамогу над беларускімі пісьменьнікамі лукашэнкаўцы адсьвяткавалі яшчэ ў 1995 годзе, калі на ўсенародным рэфэрэндуме яны дамагліся скасаваньня беларускіх нацыянальных сымбаляў і ўвядзеньня расійскай мовы ў якасьці другой дзяржаўнай. Беларускія пісьменьнікі нясуць калясальны цяжар адказнасьці за гэтае рашэньне, бо ў сытуацыі адсутнасьці нацыянальнай школы і нацыянальнага ўнівэрсытэту якраз яны для масавай сьвядомасьці заставаліся сымбалічным увасабленьнем беларушчыны, найважнейшым і па сутнасьці адзіным рэальным элемэнтам нацыянальнай традыцыі. Паўзучы канфармізм беларускіх пісьменьнікаў, асабліва калечаньне імі беларускай мовы, ператварэньне яе ў расійска-беларускі жаргон, саслужыў нацыі кепскую службу. Тое, што перамога лукашэнкаўцаў на рэфэрэндуме 1995 году ў культурным пляне была перамогай над беларускімі пісьменьнікамі, абнадзейвае і адначасна ставіць на парадку дня

перад беларускімі культурнымі элітамі пытаньне № 1: выпрацаваць такую рэдакцыю беларускага нацыяналізму, якая б зрабіла ў прынцыпе немагчымым паўтарэньне 1995 году.

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Славамір Адамовіч

Амэрыканскі дзёньнік

СЛАВАМІР АДАМОВІЧ (нар. 1962) — паэт-“правакатар”, стваральнік палітычнага пэрформансу — арганізацыі “Правы рэванш”. Першы палітычны вязень рэжыму Лукашэнкі, які 10 месяцаў (1996) правёў у турме за верш “Забі прэзыдэнта”. У большасьці сваіх твораў Адамовіч выступае як тонкі лірык і мэтафарыст, асноўныя тэмы вершаў — каханьне, вайна, Бацькаўшчына;

І памятай: калі чалавеку пашанцуе ў Нью-Ёрку, яму пашанцуе ўсюды.

Джон Дос Пасас, “Мангэтан”

…**У** аэрапорце Варшавы. Цяпер 11:21 польскага часу.

Я нарэшце пачынаю аджываць ад язды ў цягніку і ўчорашніх шалёных збораў. П’ю піва з бляшанкі. Затэлефанаваў Чэславу Сэнюху, потым у Менск.

З чыгуначнага цэнтральнага вакзалу ў аэрапорт прыехаў аўтобусам № 175 (прыпынак насупраць гатэлю “Марыёт”).

Ад піва ці не, але настрой паляпшаецца. Поўна чысьценькіх людзей.

…Ну вось і ў небе. Набралі каля 10 км вышыні. Пад’ём быў лёгкі, але гэты палёт адбярэ ў мяне гадоў пару жыцьця. І скроні яшчэ больш пасівеюць.

Гартаю газэты, п’ю памаранчавы сок. У сёньняшняй “Рэчы Паспалітай” артыкул пра Яновіча ды ягоную “Вілу “Сакрат”.

Унізе — аблокі. Сяджу каля ілюмінатара, бачу, як выгінаецца крыло, гудзе турбіна. Круцяць відэакліпы, слухаем музычку

праз навушнікі. Працінае завоблачным холадам. Нарэшце перад шарэнгамі амону я так ня дрэйфіў, як зараз. Між небам і зямлёй. І сьцюардэса нейкая старая і няпекная. Дый проста баюся! Аж у грудзях нешта рыпіць. Шкада, што сябе. Пасьля турмы й галадоўкі ня хочацца звалі Атлянтыку.

Перакусілі. У роце — прысмак мэталу.

Сонца! Ляцім проста на сонца. Сінеча вады і бел

17:07 варшаўскага часу. Вышыня — 10 400. Тэм мінус 59. Хуткасьць палёту — 801 км/г. Праляцелі

19:45. Над Лабрадорскай паўвыспай. Сонечна. Х запаўняць дэклярацыі.

21:50. Набралі 11 300 мэтраў. Пад намі суцэльна воблачнасьць, над намі — сонца. Сусед — прыго мужчына зь Беласточчыны. Кажа, што дрэнна ў К што зьяжджаюць людзі, а Квасьнеўскі й яго пама Да Нью-Ёрку застаецца 453 км.

3 красавіка (панядзелак).

Вось і “дома” — у праваслаўнай царкве імя Кір горад Нью-Ёрк, раён Квінз.

А прызямліўся ўчора нармальна. Атрымаў бага Шкада бутэрбродаў, якіх мне ў дарогу любка ма Думаў, што шманаць будуць, але выйшла, што я трантамі нікога не цікаўлю. Малады мурын са кантролю моўчкі выдаў мне неабходныя паперы знаходжаньня ў ЗША да 2 кастрычніка 2000 год праверка. Ідзі, гасьцюй сабе цэлыя шэсьць месяц галаву скруці.

**Нарадзіўся ў Гародні. Скончыў Гарадзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. Аднаасобова выдаў 7 кніг прозы: “Пакуль не позна” (1991), “Дзіцячыя хваробы” (1992), “Дзіцячыя хваробы. Кніга 2” (1993), “Дзіцячыя хваробы. Кніга 3” (1994), “Дзіцячыя хваробы. Кніга 4” (1995), “Дзіцячыя хваробы. Кніга 5” (1996), “Дзіцячыя хваробы. Кніга 6” (1997). Аўтар кнігі эсэ “Дзіцячыя хваробы. Кніга 7” (1998). Сябра Беларускага ПЭН-цэнтра. Адзін з заснавальнікаў Таварыства беларускай культуры. Сябра Беларускага саюза журналістаў. Сябра Беларускага саюза пісьменнікаў. Сябра Беларускага Хартыі-97. Сябра Беларускага Хельсінскага камітэта. Сябра Беларускага ПЭН-цэнтра

“Амэрыканскі дзёньнік” друкуецца са скаротамі, у часопісным варыянце.

Сустрэлі свае — Валя з нашым сьцягам у руках ды Камінскі на машыне.

Начую пакуль што ў Валі, якая жыве ў царкве на другім паверсе. Утульна, ёсьць усё неабходнае для жыцьця. Першая “навіна”: вада ва ўнітазе “стаіць”. Такая, бачыш, традыцыя. Гартаю так званую “рускую” прэсу. Пісьменьніка Лімонава ўзгадваю. На кватэру, магчыма, і зараблю. Час пакажа. Буду за любую работу брацца, каб толькі аплатную, бо, калі прыеду з грашыма, ніхто ня будзе пытацца, як я іх здабыў. Хай пакуль там паваююць безь мяне. Некаторым “беларускім палітыкам” ды нацыяналістам-кніжнікам варта панюхаць, чым пахне турэмная камэра. Ейны “водар” усім прачышчае мазгі.

Тут ужо дзьмухаўцы цьвітуць.

Мёд адносна танны. Валя ўжывае яго замест цукру. Яшчэ тут скрозь і паўсюль аўтамабілі, хасыды і мурыны.

4 красавіка (аўторак).

Дзесьці ў Менску ідуць суды над удзельнікамі акцыі 25-га. У нас у Квінзе дожджык, халаднавата.

Позьні вечар, 23:35. Начую ў Веры й Франціша. Днём Франціш забраў мяне з царквы да сябе ў прыгарад Манхасэт, дзе ў яго добры такі дамок. Без агароджы, дзьве машыны ў гаражы, катэрок на вуліцы. Нажыў чалавек дабра за жыцьцё. Яшчэ мае дачку й сына.

Ішоў дождж. Гаварылі пра рознае.

5 красавіка (серада).

9:00 раніцы, мушу ўстаць: ня сьпіцца. І нешта з арганізмам, прыкладна як у самалёце. Нешта быццам гудзе ў жылах, у галаве. Кажуць, гэта ад перападу ціску. Атлянтычны акіян дыхае.

Па абедзе. Першая работа: лазіў па страсе дому, чысьціў вадасьцёкавыя рышткі. Угрэўся, хоць вецер халодны. Як бы гэта добра было — завяршыць сваё існаваньне ў такім доме. *Сваім* доме, “прыдбаць свой кут”, як сказаў клясык.

6 красавіка (чацьвер).

Да абеду езьдзілі па крамах. Вера набыла мне куртку, два лёгкія швэдры, падушку, прасьцірадлы й коўдру. Валера, былы работнік гомельскага ювэлірнага, кажа, што могуць узяць на працу ў адну тутэйшую ювэлірную фірмачку. Трэба толькі падвучыцца абыходку са спэцінструмэнтам.
У тутэйшых беларусаў лёгкія закалоты: абіраюць старшыню нью-ёрскага аддзелу Беларуска-амэрыканскага задзіночаньня (БАЗ).
Вавёркі тут нейкія сівыя. Уяўляеш, жыў бы я тут і мусіў бы пісаць: “Не сьпяшай, мая шэрая векша…”. Але, дзякуй богу, кожны жыве на сваім месцы. Сёньня на сьняданак два яйкі сырыя, кава, хлеб, сыр. Каву тут п’юць пераважна з малаком. Манхасэт — раён багатых. Але жывуць у гэтых раскошных асабняках больш пэнсіянэры. Дзеці, унукі — асобна. Традыцыі тут такія.
Гаспадары пайшлі перасыпаць падушкі. Сонца.
7 красавіка (пятніца).
Дзіўна і прыемна: чорт ведае дзе за сьветам знаходзіш блізкіх па крыві людзей, з паўслова разумееш іх, як і яны цябе, урэшце, на адной мове зь імі гаворыш. Вялікая гэта раскоша — пагаварыць са *сваімі*. Да такога і ў Менску цяжка дабіцца: там альбо на ссучаны “палітыка” нарвешся, альбо алькаголік “на бутэлечку” канькае, альбо “пісьменьнікі”, як зь іншай плянэты зваліўшыся… І ўвогуле, у Беларусі жыў са сталым жаданьнем даць каму-небудзь па фізіяноміі. Паглядзім, як яно будзе ў “сталіцы сьвету” Нью-Ёрку.
Валера казаў, што возьме на работу ў ювэлірку. Будзем спрабаваць.
Птушкі ціўкаюць па-вясеньняму. Зь Верай вучу ангельскую. Настаўніца мая кажа, што маю добрае вымаўленьне.
Днём сёньня мылі, а потым вашчылі гаспадароў “мэрсэдэс”. Што чакае наперадзе, тое невядома. Трэба думаць, што зусім бяз грошай ня вернемся. *Урваць бы працу ды пачаць вярнуць валуны работы!*

Амерыка — хоць празь “е” пішы,
хоць праз “э” —
Амэрыкай пакуль што застаецца:
ня мае часу ды сваё бярэ,
і ворагу ў твар сьмяецца…

8 красавіка (субота).
Францiш кажа, што ў любы момант магу падаць на палітычны прытулак.
Учора Веры званілі амэрыканцы, пыталіся, ці мае наша дыяспара кандыдатуру на перакладчыка, які валодаў бы беларускай і ангельскай мовамі.
Спаў я гэтыя дні ў бэйсмэнце — цокальным паверсе Францішовага дому. Тут усе дамы з такімі падваламі. Манхасэт забудаваны толькі двухпавярховымі будынкамі. Вышэй у неба лезьці не дазваляе архітэктурны плян. Ёсьць, праўда, аднапавярховыя хаткі, зусім як нашыя.
Работа мая мае быць у Мангэтане, так што ёсьць шанец разгледзець гэты “цуд сьвету”. А ўвогуле адчуваньне такое, як першыя дні ў турме: невядомасьць. Хоць сабе й сярод сваіх.
9 красавіка (нядзеля).
У Фундацыі Крачэўскага, дзе і буду жыць надалей. 8-га вечарам меў прамову перад зборкай тутэйшых. Навум хацеў падбіць Станкевічанку, каб узяла мяне на кватэру, але ж у яе два каты, то яна пакуль ня можа.
У Фундацыі нас пакуль утрох. Сьпім на матрацах. Як-небудзь. Дзень. Надвор’е рэзка зьмянілася: вецер і мокры сьнег. Чакаю шафёра, мусілі паехаць на “экскурсію”.
10 красавіка (панядзелак).
Ноч. Учора быў у гасьцёх у барда Алена і Якуніна Ігара, якія жывуць у беларускай праваслаўнай царкве на Атлянтык-авэню. Васілеўскі даваў вячэру ў нейкім лацінаамэрыканскім рэстаране на Рузвэльта. Гаварылі пра справы дыяспары.
Раніца. Дзявятая. Аматары фізкультуры бегаюць адзін за адным па *Gothic Drive*. Мае суседзі патупалі на работу. Бачу зводдаль Фундацыі двух палісмэнаў у цёмна-сіняй форме. Трэба займацца ангельскай. Учора ў рэстаране аблізваўся ня столькі на ежу, колькі на апэтытную лаціначку.

Работа бывае ўсякая, малады чалавек, акрамя прыстойнай.

Джон Дос Пасас, “Мангэтан”
11 красавіка (аўторак).
Першы дзень работы. Усю ноч прачынаўся, каб не праспаць. Не

праспаў, але не туды зайшоў — у дом № 355 на 14-й вуліцы. Паўтары гадзіны хадзіў кругамі, пакуль не напароўся на Ігара, які выйшаў па каву. Ён і давёў мяне да майго месца працы. З босам — палякам Славэкам — сышліся на 7 далярах за гадзіну. У выхадныя магу хадзіць на работу, а магу й адпачываць. Але ў мае гады і ў маім статусе тут думаюць не пра адпачынак, а з раніцы да вечара — пра работу. Маё месца працы: Нью-Ёрк, Мангэтан, 16-я вуліца, дом № 335, пяць паверхаў плюс бэйсмэнт і дах, якія кожны дзень я мушу падмятаць, вымятаць, замятаць… Разьлік з босам гатоўкай у канцы тыдня. Так павінна быць паводле вуснай дамовы.

14 красавіка (пятніца).

Ужо чатыры дні адрабіў па дзесяць гадзін да дзясятага поту. Пыл, цэмэнт, сажа пачатку стагодзьдзя. Мудохаю, бо ў канцы тунэлю сьвецяць грошы. Грошы, якія могуць умацаваць маю свабоду *там*, на Радзіме.

16-га (нядзеля).

Учора позна вечарам з Валікам ды Васілём глядзелі на відэа фільм “Чэкіст”. Выбухлі эмоцыі, пачалі мы спрачацца. Выглядае, што Васіль наш — мужычок яшчэ той, кручаны. Правакуе суразмоўцу на спрэчку.

19 красавіка (серада).

Позьні вечар. Палякі сьвяткуюць Вялікдзень нявыхадам на працу ў нядзелю й панядзелак. У суботу — рабочы дзень скарочаны. Цяжка, ледзь жывы вяртаюся з будоўлі. Кашляю, наглытаўшыся пылу. У мінулую нядзелю праводзілі на Радзіму сьпевака Алена.

22 красавіка (субота).

Вялікдзень. Устаў а 6-й і пабег на працу. Пішу ў сабвэі (так завецца амэрыканскае мэтро), чакаючы трэйну (цягніка) на Мангэтан. Сьнілася ноччу братва ў кавярні і плюгавы мент, які хацеў мяне забраць.

Атрымаў першую зарплату — 288 паўночнаамэрыканскіх далераў. Бос вылічыў 55 за пояс, малаток ды мэталёвы мэтар. Дарагавата, дый на халеру мне малаток, калі я падмятаю! Прыехаў шэф БАЗу — Антон Шукелойць, за рулём Станкевічанка. Павезьлі мяне ў Мангэтан. Абедалі ў славяна-польскім рэстаранчыку “Алеся”. Я выпіў пінту пльзенскага і пераключыў сябе з рабочага на філязофскі настрой.

N.Y. — горад сьмецьця й сажы. Інакш і ня можа быць у

мэгаполісе. Разам з тым, ён чысты, бо, каб выжыць, ён павінен быць чыстым.
На Мангэтане за хмарачосамі неба не відаць.
Рая ўсю дарогу перапыняла маналёг Антона; паркуючыся, уехала левым бокам у чужую машыну. Па дарозе назад пры павароце ўправа нешта пачало рыпець. Толькі каля Фундацыі ўгледзелі, што адарваўся кавалак днішча.
Позьні вечар. Сусед па матрацы кажа, што ў ЗША ён толькі зарабляе, а жыць будзе ў Беларусі. На працы яго лічаць расістам, але даюць паблажку, раз чалавек прыехаў зь “Белай Расеі”, дзе, мабыць, жывуць адны белыя.
23 красавіка (нядзеля).
Вялікдзень! Іду да Бартулёў.
У тую нядзелю выправілі ў Беларусь Алена. Сабралі яму на дарогу трохі грошай (арганізавала збор Валя, падносячы мой зялёны капялюш усім без выключэньня). Пяяў пяюн — і вясёлае, і сумнае. Была маладая пара з дачкой: маці крадком плакала… Радзіма ёсьць Радзіма.
Холадна, дождж. Чытаю “Незабываемое” Мікалая Краснова-малодшага. Успаміны пра тое, як у 1945-м ангельцы выдавалі саветам казакоў.
25 красавіка (аўторак).
22:45. Дзень быў адносна лёгкі, але я стаміўся. Пакуль даедзеш — восьмая гадзіна. Пакуль есьці зробіш — дзясятая, трэба спаць валіцца. Якія тут вершы!
27 красавіка (чацьвер).
Позьні вечар. Учора з працы папёрся на пікет, які праходзіў насупраць будынку ААН. “Насупраць” — моцна сказана, бо стаялі мы ад таго гмаху мэтраў за 500.
Пасьля пікету быў запрошаны ў сям’ю старых эмігрантаў. Выпіў, само сабою; вяртаўся “F”-трэйнам (fast — хуткі); заснуў, праспаў свой прыпынак. Паўгадзіны чакаў у тупіку, калі вагончыкі пакоцяцца назад, назіраючы, як іх прыбіраюць. Вярнуўся ў Фундацыю ў дзьве ночы, устаў а пятай раніцы. Ізноў сабвэй, пярэсты натоўп імкне на працу. Цікава: тут любую працу называюць “бізнэсам”.
…Слухайце, тут столькі каляровай плоці, такія формы, такія фантастычныя заднічкі, сьцёгны, лыткі-шмыткі, што ніякая цяжкая праца не задушыць тваёй песьні песьняў…

Ён перайшоў 6-ю авэню і заглыбіўся ў брудную заходнюю частку гораду, дзе пахла канюшняй, а на тратуарах валяліся і поўзалі дзеці.

Джон Дос Пасас, “Манхгэтан”
В туманные вечерние дни наш Нью-Ёрк необыкновенно прекрасен для одинокого человека. В таком тумане хорошо искать тюльпаны на вершинах небоскрёбов, мило и одиноко перелетая с крыши на крышу на домосделанных шелковых крыльях.

Эдуард Лімонаў, “Дзёньнік няўдачніка, альбо Сакрэтны сшытак”
4 траўня (чацьвер).
Вясна. Нешта і тут распускаецца, нават пахне. У вольную хвіліну аглядаю з даху нашага будаўнічага аб’екту кварталы Мангэтану. На захад ад нас завісьлі ў небе чатыры патрульныя гелікоптэры. На дахах некаторых дамоў ужо зазелянелі дрэўцы, часта гэта бярозкі-самасейкі.
Гадзіна ночы. Вось калі надыходзіць вольная хвіліна.
13 траўня (субота).
41 дзень у Нью-Ёрку. Мая работа палягае ў тым, што дзесяць гадзін у дзень я падмятаю 5 паверхаў будаўнічага аб’екту плюс дах, бэйсмэнт (падвал) і тэрыторыю вакол будпляцоўкі. Яшчэ мяне могуць кінуць на “прарыў” асабліва працаёмкіх участкаў: напрыклад, разгрузку бэтону, цэглы, іншых будматэрыялаў. За дзень маю 70 даляраў. Запрасіў мяне на гэтую работу Алесь, сын вядомай нашай беларускай дзяячкі. Спакойны, разважлівы малады чалавек, які, хочацца верыць, зьдзейсьніць сваю амэрыканскую мару.
Вечарам у Фундацыі імя Крачэўскага прайшоў вялікі сход нью-

ёрскага аддзелу БАЗу. Абіралі кіраўніка аддзелу.
16 траўня (аўторак).
Сёньня наш аб'ект пікетавалі тутэйшыя прафсаюзы. Прыгналі помпу і цэлы дзень пампавалі ёю паветра ў вялікага брызэнтавага пацука, які меўся сымбалізаваць ненажэрнага амэрыканскага боса — гаспадара будоўлі. Прафсаюзы пачулі, што на аб'екце працуе шмат нелегальных работнікаў, якім плацяць значна меней, чым павінны былі б плаціць сваім. Мы ледзь не паразьбягаліся — і беларусы, і палякі. Але бос Славэк угаварыў не сьпяшацца. Між тым, калі б нас на будоўлі застукала служба эміграцыі, нас бы выкінулі з ЗША за 24 гадзіны. Праўда, ёсьць тут адзін няпісаны нюансік, які і дазваляе нелегальным работнічкам зарабляць свае зялёныя. Рэч у тым, што багацьце Злучаных Штатаў прырастае ў тым ліку і з працы мільёнаў гэтых самых нелегальных працоўных рук. За адну і тую самую работу мы атрымліваем у два-тры разы меней, чым амэрыканцы. Самая танная рабсіла ў Нью-Ёрку — гэта, здаецца, кітайцы і лацінаамэрыканцы. І адны, і другія мітусяцца ў "сталіцы сьвету", як чорныя мурашы па кучы цукру.
19 траўня (пятніца).
Палякаў у Нью-Ёрку ці не пад 2 мільёны. І прыяжджаюць яны сюды цэлымі сем'ямі. Вось і бос Славэк падцягнуў на заробкі свайго цесьця пана Ўладака, і той за 80 даляраў у дзень ганяе ўверх-уніз грузавы ліфт, на якім у пачатку XX стагодзьдзя перавозілі коней. Наш аб'ект — былая стайня. У зацішных куточках будоўлі мы знаходзілі бляшанкі з-пад піва яшчэ 40-х гадоў. А сажа, чорная тлустая сажа ў міжваконьнях асядала тут, відаць, яшчэ да першай сусьветнай!.. Гэта раздражняе — калі падумаеш, што на манхгэтанскія хмарачосы ніколі ня падалі бомбы й снарады варожых армій. Гэтаму гораду здорава шанцуе: час ад часу яго старыя кварталы разбураюць, але толькі для таго, каб на іх месцы пабудаваць новыя, яшчэ больш высокія, яшчэ больш раскошныя будынкі.
23 траўня (аўторак).
Працаваў чыстыя 13 гадзін плюс разгружалі вялізныя мармуровыя пліты, якія прывезьлі ў канцы дня. Ці заплацяць, сказаць з пэўнасьцю нельга.
Цікава назіраць тутэйшых босаў і босікаў у справе: кожны кожнага ненавязьліва імкнецца абдурыць хоць на даляр. Той жа

Славэк, ён што робіць: з будоўлі ўласнага дому прывозіць друз і загружае ў кантэйнэр свайго боса. Атрымліваецца бясплатны вываз. І ў гэтай сьмецьце-адкіднай справе мы зь цёзкам супольнікі.
23 траўня (аўторак).
Быў днямі ў Ю., што гадоў шэсьць таму прыехаў у Нью-Ёрк. На дні нараджэньня дачкі. Увесь час за сталом ягоныя госьці даказвалі мне пра перавагі амэрыканскага ладу жыцьця. Усе яны — нядаўнія грамадзяне Беларусі, у якую наўрад ці вернуцца. Нават памірaць.
Сёньня на працы нехта з нашых нелегалаў убачыў, як у суседнім доме парачка займаецца любошчамі. Янак, Ярак і Казік пайшлі пацікаваць.
25-га, чацьвер.
Забягаў да знаёмай крамніцы Стэлы. Яна з Алматы, здаецца. Працуе ў краме на 14-й. Ёй сумна, бо землякоў сваіх яна тут яшчэ не сустрэла. Перамаўляемся па-расейску.
У Фундацыю нашу падсяляецца нейкі Ільля з Горадні. Кажуць, былы танцор балету. Ці не паўгоду бадзяўся ў Нямеччыне, цяпер вось у Нью-Ёрку шчасьця шукае.
27 траўня, субота.
Фундацыя наша знаходзіцца ў чорным Квінзе, хоць сорак гадоў таму беларускія эмігранты набывалі свой дом у раёне, заселеным белымі. Сёньня часы зьмяніліся: на авэню Джамайка, на Хілсайдзе спрэс мурыны, індусы, арабы… Музыка, сьмецьце, шмат шпакоў, вераб'ёў і галак.
Зьезьдзіў на Брайтан па чорны хлеб. Па чорны "русский" хлеб у міні-пякарню тутэйшага неартадаксальнага жыда. Зрэшты, тутэйшым стаў ён нядаўна, бо яшчэ ўчора быў тамтэйшым савецкім з Бабруйску.
Што такое нью-ёрскі раён Брайтан, яскрава сьведчыць ліст абуранага чытача ў мясцовую газэту "Русский базар":
"Уважаемая госпожа главный редактор! Все у нас грязное и вонючее!!! Начну с примеров. Вчера жена купила вонючие сосиски, позавчера — дурнопахнущие и вздутые банки. Три дня тому назад — липкую колбасу. И если не перебирать эти "пакистанские" яйца, 3—4 текут как минимум. Неделю тому назад, переходя улицу, дочка наступила на жёлтую жижу и испортила босоножки и новые колготки. А сегодня я проходил по Брайтону, и со второго этажа мне на шляпу плюнул

мексиканский ребенок.
Деньги не пахнут. Не пахнут и наши фудстемпы. Пахнет зато Брайтон, в субботу утром воняет, как будто слона вырвало. Не пора ли давать медали некоторым ветеранам, которые не дышат носом в магазине, где карп 39 центов за неочищенный фунт. Здесь же рядом, в выпирающем на улицу овощном, набухшими руками огромные дамы перебирают, как на плодово-ягодной базе.
Пора нам реабилитировать “жемчужину у моря” родную и сердцу милую Одессу, где нас учили “за жизнь” на более чистом Привозе. Зато у нас не на каждом углу валялись вонючие алкоголики.
Наши эммигранты, не все, конечно, и голову моют, а теперь весна, всё прекрасно себе цветет, и шапки почти все сняли. Благодарю, дядя Изя Чабан, ветеран”.
28 траўня (нядзеля).
Днём была ў царкве Кірылы Тураўскага сустрэча зь Вячоркам. Публіка — рознае масьці. Абедалі ў нейкім рэстаранчыку на Атлянтык-авэню; А. Шукелойць распавядаў, як некалі да вайны выкладаў на настаўніцкіх курсах у Ашмяншчыне.
Вяртаючыся ў Фундацыю, любаваўся ў “R”-трэйне прыгожай лаціначкай з чатырма дзецьмі-пагодкамі. Мурын пратанцаваў па вагоне, ажыргаўшы вялікую ляльку-каня. Пры гэтым ён так віхляў клубамі, што некаторыя жанчыны з бляскам у вачах кідалі ў ягоную торбу нават пяцідаляравыя паперкі.
29 траўня (панядзелак).
Мэморыял дэй — амэрыканскі дзень памяці, вэтэранскі дзень. У іх тут з памяццю ўсё, як некалі ў СССР: можна пабачыць помнікі невядомым салдатам, ракетам, самалётам, вечныя агні ды іншую падобную інсталяцыю.
На працы — выхадны.
Вечарам таварыша запрасіў пасядзець у кавярні на Рузвэльт-авэню. Пілі самбуку й каву; ягонай каханцы — мініяцюрнай такой жанчынцы родам з Калюмбіі — купіў букецік за пяць даляраў. Кажа, што жанчыны яе народу вельмі любяць белых мужчын як добрых мужоў і ненавязьлівых палюбоўнікаў.
2 чэрвеня (пятніца).
Пачалася гарачыня. Вечарам прайшоў дождж. На працы Ірак Бурак перад вяртаньнем сваім у Польшчу частаваў гарэлкай усю нашу кампанію з 335-га дому.

ЗША — краіна рознага роду датацыяў, пэнсіёнаў, стыпэндыяў, вэлфэраў і фудстэмпаў.
Фудстэмпы — гэта добра вядомыя былым савецкім талёны на харчаваньне, альбо прадуктовыя карткі. На травень 2000 году фудстэмпамі карысталіся 17 мільёнаў жыхароў Злучаных Штатаў (інфармацыя паводле Міністэрства сельскай гаспадаркі ЗША). Але, нягледзячы на тое што гэтая краіна знаходзіцца ў стане эканамічнага пад'ёму, каля 10 мільёнаў амэрыканскіх сем'яў маюць, мякка кажучы, праблемы з набыццём ежы.
Не, харчу, вядома, хапае, і самага рознага — вельмі часта не хапае "зялёных". Што да мяне, дык я шалею ад бясхлебіцы. Тое, што тут прадаюць як хлеб, я, як белы чалавек, есьці не магу. Раз на тыдзень прыходзіцца езьдзіць ці на Грынпойнт да палякаў, ці да "русских" на Брайтан, каб купіць чорнага хлеба, які, праўда, праз суткі рассыпецца на крошкі. Такі вось фудстэмп па Нью-Ёрку ў пошуках жытняга.
3 чэрвеня (субота).
На працу спазьніўся, бо субота, а ў суботы і нядзелі на лініях сабвэю маршруты мяняюцца з-за прафіляктычных работ. Вось і едзеш, куды вязе цябе твой вагончык. А спазьняцца нельга, лепш загадзя зьявіцца.
Відаць, ад інтэнсіўнага кантакту з будаўнічым сьмецьцем на левай руцэ папаўзьлі нейкія язьвінкі, выступае сукравіца.
4 чэрвеня (нядзеля).
Штат Нью-Джэрзі, Саўт-Рывэр. Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква імя Эўфрасіньні Полацкай. Знаёмства зь беларускай дыяспарай гэтага штату; новы сьвятар Аляксандар спрабаваў прамаўляць па-беларуску. Відаць, што ў быце паслугоўваецца нейкай іншай мовай.
8 чэрвеня (чацьвер).
Позьні вечар. Спаць. Пісаць не магу: мярцьвеюць пальцы. Почырк проста ўвачавідкі мяняецца ў горшы бок. Учора ледзь не аддаў богу душу: абярнуў на сябе кантэйнэр. Выратаваў мяне свой, зь Беларусі, хлапец, які на 335-м таксама працуе — на *свой дом* зарабляе.
Ах, як гэта рамантычна: я, сьпец у беларускай паэзіі, змагар, рэваншыст, праграміст (і што там яшчэ са мной зьвязваюць?) — ляжу ў вялізным зялёным кантэйнэры, прыдушаны меншым жалезным, поўным бітай чырвонай цэглы; мне цісьне на левую нагу; я, пакуль магу, трымаю кантэйнэр на руках; побач

сьмярдзяць гнілыя памаранчы і падсохлы чызбургер, кінуты якім-небудзь сытым чорным аболтусам, а нада мною, над гэтым клятым сьмецьцязборнікам, над доўгай і вузкай 16-й стрыт вісіць адзінае на ўсіх высокае сіняе неба і самотны гелікоптэр нью-ёрскай паліцыі!..

11 чэрвеня (нядзеля).

Наш новы сусед Ільля сноўдае па Фундацыі ў майтках. Ня ў шортах, а ў майтках. І лічыць, што ён мае на гэта права. Праўда, і мы, хто ў нармальных штанах, маем права ня бачыць гэтага мужычка ў трусіках. Калізія.

Еду ў трэйне "F". Побач — бутэлька віна, вінаград. Еду ў Мангэтан адзначаць дзень Пуэрта-Рыка. Маларослыя пуэртарыканцы паўсюль ходзяць вялікімі групамі, махаюць сваімі нацыянальнымі сьцяжкамі — сьвяткуюць.

А нашы ўчора сьвяткавалі атрыманьне беларускай новаэмігранткай права на пражыванье ў ЗША. І дыскутавалі, дыскутавалі пра тое, дзе ўсё ж лепш быць беларусу — тут ці ў Беларусі.

Сёньня днём з Шукелойцем былі ў амэрыканскім касьцёле, дзе назіралі людзей усіх магчымых колераў. Папарадзе мяне сядзела сымпатычная азіятачка з прыадкрытымі плечкамі і стройнымі ножкамі… Потым зайшлі ў нейкі мангэтанскі "цум", перакусілі там.

Па Нью-Ёрку лётаюць вельмі кусьлівыя камары. Газэты й радыё паведамляюць, што некалькі чалавек памерлі ад іхных укусаў.

18 чэрвеня (нядзеля).

Поўдня. Раніцай ішоў дождж. Качаюся ў сваім берлагу, старым і сырым. Душна. Пальцы на правай руцэ нельга сагнуць у кулак: здранцьвелі за ноч. Учора атрымаў заробак — 382 даляры. Бос выплаціў усё сумленна.

Зь Юркам і ягонай калюмбійкай пасядзелі ў рэстаране "Анарансас". Пілі вінцо, гаварылі пра N.Y. і дыяспару. Ішоў дождж. У прыбіральні купіў пачак "Ньюпарту" за 6 $. Потым у калюмбійскім "макдональдзе" перакусілі нейкай чоры-папай ("чорным папам", як я адразу ўдакладніў). Тыцкалі палачкамі, падобнымі да зубачыстак.

В. К. абралі скарбнікам нью-ёрскага аддзелу Беларуска-амэрыканскага задзіночаньня. Выпускнік менскага ліцэю імя Якуба Коласа гутарыць з Ільлём па-расейску. Усе яны жывуць у Фундацыі імя Крачэўскага, закладзенай некалі беларусамі

эмігранцкай хвалі сярэдзіны 40-х ХХ стагодзьдзя.
25 чэрвеня (нядзеля).
Позьні вечар. На электраплітцы смажыцца “ножка Буша”. Учора адзначалі Купальле ў беларускім лягеры міляў за сто ад Нью-Ёрку. Побач — рака Дэлавэр. Сьвята атрымалася стараньнямі В. Я.: зварылі крупнік, танцавалі ў строях. Назад вяртаўся на машыне В. Камінскага. На паўдарозе ягоны “форд” зламаўся: пацякло з-пад споду. Дачакаліся паліцэйскага, які і падвёз нас да аўтобуснага прыпынку.
26 чэрвеня (панядзелак).
22:40. Гарачыня, душна. З працы сарваўся раней. Спадзяюся, заўтра будуць грошы. Званок ад Мішы з царквы Тураўскага. Кажа, Ален перадае мне прывітаньні з Маладэчна і раіць не вяртацца ў Беларусь.
27 чэрвеня (аўторак).
Прозьвішчы беларусаў старой і новай эмігранцкіх плыняў у ЗША: Андрусішыны, Бартулі, Вераб’і, Дворнік, Драбышэўскі, Зэкаў, Камінскі, Кардонскі, Касьцюкевіч, Каханоўская, Капытка, Кузьміцкая, Лапіцкі, Міцкевіч, Міхноўскі, Навумчыкі, Навіцкі, Паланевіч, Пятровіч, Піліповіч, Рыжы, Сёмуха, Стральцова, Станкевіч, Тальянскі, Фанская, Чэрняк, Шаламіцкая, Шчарбацэвіч, Шчэцька, Цяліца, Дарагакупец, Бараноўскія, Малахоўскі, Якімовіч…
Званіў нехта В. Б. зь нейкае расейскамоўнае газэты. Пытаўся пра “новых беларускіх фашыстаў” у Беларусі. Хоча ціснуць артыкульчык на гэтую “вечную” тэму. Яшчэ яго цікавіла, ці вяртаюся я ў Беларусь? Усіх чамусьці хвалюе гэта пытаньне. Здаецца, я ведаю чаму.
29 чэрвеня (чацьвер).
Атрымаў чэкам 757 даляраў. Усяго адклаў ужо 4.250.
Нешта пра сны вярзецца, нейкія вершы:

Арэхавыя сны, калі арэхі;
Гарохавыя сны, калі гарох;
Сны сьмешныя, калі бярэ на сьмехі;
І п’яныя, калі бяром на трох.

3 ліпеня (панядзелак).
Учора быў у царкве на Атлянтык-авэню. Зайшоў у некалькі антыкварных крамаў. Нецікава. У сабвэі даў бязрукаму мурыну жменю цэнтаў і токен на праезд.

Юрка перадаў мне, што званіў і яму гэты Буэйрас ды казаў, што зьбіраўся зрабіць са мною інтэрвію. Але ягоны рэдактар — sic! — не пагадзіўся, бо я, бачыце, *фашыст*. Вось жа што цікава: нават у Нью-Ёрку *іх* турбуе мой беларускі патрыятызм!
Схадзіў на пошту. Марка ў Беларусь каштавала 1 даляр, ліст у Канаду — 48 цэнтаў.
Душна. Чорныя целы проста мільгацяць у вачах. Зараз пад'ем, вып'ю джыну "Джым Бім" і паеду да самотнай.
4 ліпеня (аўторак).
Independance Day — Дзень Незалежнасьці ЗША. Былі з Гэляй у Ракфэлер-цэнтры й Цэнтральным парку ў Мангэтане. Горад сьмярдзіць у любой частцы свайго каменнага цела. Мора выродлівых формаў — тоўстыя, крывыя… І навокал тыя, што ў чорных сурдутах. Вось адзін усьцягнуў на галаву чорны капялюш, абцягнуты тонкім поліэтыленам. Чорт ведае што!
Вечар. У розных кутках Квінзу чуваць гукі самалёту, ірвуцца пэтарды.

Як ні ванітуе ад
Нью-Ёрку, а
сысьці зь яго
няма куды. І
гэта самае
жахлівае. Нью-
Ёрк — вяршыня
сьвету. Нам
застаецца
толькі круціцца
й круціцца, як
вавёрка ў коле.

Джон Дос Пасас "Мангэтан"
11 ліпеня (аўторак).
У трэйне пасажыры праз аднаго з плэерамі: ці стары, ці малы. Жыць ой як хочацца, калі бачыш сівенькую паджарую бабульку ў навушніках, якая падтанцоўвае ў такт толькі ёй чутнай мэлёдыі.
Прайшоў дождж. На вуліцах, як сухія галінкі на старой алеі,

валяюцца рознакаляровыя паламаныя парасоны. Карцінка вартая толькі багатай, дынамічнай краіны. У Беларусі такога мы ня ўбачым. На жаль, беднасьць разьвівае ў нашых людзях сындром Плюшкіна: грамадзяне зьбіраюць у сваіх норках самае неверагоднае ламачча.
…У цягніках сабвэю нью-ёркцы, якім удалося прысесьці, кладуць парасоны пад ногі.
16 ліпеня (нядзеля).
Вечар. Дзесьці зь мячэту раве ў белы сьвет муэдзін. Чытаю пра вязьняў Вялейскай турмы. Заўтра ў работу…
Позьні вечар. Днём быў на адкрыцьці так званага Тыдня паняволеных народаў.
Акцыя пачалася каля гатэлю *“Plaza”* а 9-й раніцы, потым удзельнікі мерапрыемства рушылі да сабору Сьв. Патрыка.
У катэдры адбылася юбілейная імша, прысьвечаная 150-годзьдзю з пачатку службаў, якую правіў новы арцыбіскуп Нью-Ёрку Эдвард Іган.
Пасьля імшы ўдзельнікі маршу выйшлі на 5-ю авэню і па ёй рушылі ў бок Цэнтральнага парку. Я выконваў ролю гранд-маршала працэсіі — нёс наш нацыянальны сьцяг. На мітынгу ў Цэнтральным парку прачытаў верш і кароткую прамову. Выступалі таксама прадстаўнікі ЗША, Латвіі, Чачэніі, усходніх нямецкіх земляў (цяперашняя Калінінградзкая вобл. Расеі — колішняя Прусія). Нашых было мала. Адчуваў сябе паскудна, сумна, нездарова. А заўтра ж на работу! І нейкая морда будзе табе загады загадваць! Цьху ты! Я ўжо сам не разумею, хто я: літаратар, журналісьцік ці зьбіральнік амэрыканскага гаўна?
22 ліпеня (субота).
11:00 дня. Чакаю спадарства Бартулёў. Апрануў касьцюм. Ноччу быў дождж. Пасьвяжэла. Памыўся. Адхаркваю (бедныя лёгкія!). Ну ды нічога, вытрымаем. Толькі марамі, сузіраньнем прыгожага, нябеснага, аксамітнага…
Напісаў верш “На 85-я ўгодкі Сп. Антона Шукелойця, Настаўніка і Таварыша”.

Гэта нічога, што цела цяжэе —
Дух, калі ёсьць, — застаецца лёгкім.
Там, на Радзіме, Волі ды-джэі
Сьмела пяроймуць нашыя ўрокі.
Там, на Радзіме, рыжая векша

Скача ля помніка Янку Купалу…
Ведаю, нехта павінен быць першым,
Каб слабыя духам аднойчы паўсталі.
Вось і кульнулася лета на спадзень,
Восеньню будуць новыя песьні.
Сьпеюць белыя яблыкі ў садзе,
Нацыя сьпее, каб уваскрэснуць!
Сьвяткаванье юбілею А. Шукелойця адбылося ў памяшканьні пры царкве Божай Маці Жыровіцкай у Гайланд-парку, штат Нью-Джэрзі.
24-га, панядзелак.
Працаваў без аддухі. Цяпер бы легчы хутчэй спаць. Душна. Атрымаў паштоўку з Сан-Францыска ад сп. Машкавога. Прыемна.
27 ліпеня (чацьвер).
Позьні вечар. Сёньня прыйшла да нас на аб'ект чорненькая. Выконвае малярныя работы. І як на заказ: сымпатычная, фігурыстая!.. Спрабаваў гаварыць зь ёю, скарыстоўваючы ўвесь свой наяўны лінгвістычны рэсурс. Зрэшты, для таго каб паразумецца, Мужчыну й Жанчыне многа словаў ня трэба. Тут значна больш кажуць вочы, рухі, пахі…
30 ліпеня (нядзеля).
Учора-сёньня гасьцяваў на лецішчы Юлі й Паўла Андрусішыных — у "Родным Куце". Добра было сярод сваіх: Валькі Якімовіч, Дворніка, Алачкі Орсы, Васіля Шчэцькі, доктара Набагеза, сямейства Казакоў… Супакаяльнымі лекамі для нэрваў і душы сталася гульня ў мяч. Трэба было бачыць, як некалькі пакаленьняў беларусаў зь непадробным энтузіязмам не давалі мячу ўпасьці на амэрыканскі дол. І ня дзіва: на кон быў пастаўлены сымбаль нашага змаганьня — лёзунг "Жыве Беларусь!"
Каб жа і ў Беларусі беларусы рознага веку нарэшце аб'ядналіся і згулялі сваю гістарычную гульню, паставіўшы на Перамогу!
31 ліпеня (панядзелак).
Сёньня тое ж самае — позьні вечар. Учора пытаюся ў выпускніка менскага ліцэю імя Якуба Коласа, — так, дзеля сьмеху пытаюся, паказваючы на партрэт Лява Сапегі: "Хто гэта?" А выпускнік круціў-круціў галавой, але мусіў прызнацца, што ня ведае. Вось табе і ўсе дуды!
7 жніўня (панядзелак).

5-га—6-га быў у айца Юр’я Рыжага ў гасьцёх.
У Нью-Ёрк вярталіся цягніком. На станцыі Валік з Васькам ледзь не пабіліся. Васька гэты правакуе ўсіх проста адкрытым тэкстам. Нейкая ж задача стаіць перад чалавекам? Ці сам ён яе перад сабой ставіць, ці хто збоку дапамагае? Такіх кручаных-перакручаных, між іншым, пасьпяхова прадукуе турма. Дык у турме хітраму лягчэй выжываць, а на волі навошта дурыкі строіць?
Ноччу сон быў цікавы: тарнада, дзяўчына наструньваецца насустрач мне; хаваюся ад віхуры ў зруб старой студні… Цела дзяўчыны высьнілася надта выяўна.
Спадарыня Жук-Грышкевіч з Канады даслала сродкі на выданьне “Турэмнага дзёньніка”.
8 жніўня (аўторак).
На працы чысьціў унітазы, мёў, цягаў бэлькі… Бос абяцаў заўтра выплаціць за два тыдні 800 “бруднымі”.
Мурыны пасыпаюць сабе падпахі нечым белым. Кажуць, талькам, каб ня так прэла ў гэткія гарачыя і проста вадзяністыя дні. Так немаўлятам пасыпаюць прысыпкай ружовыя срачкі.
У 7 гадзін раніцы пот на лбе ў чорнай стрыжанай бабы, што стаіць перада мной у чарзе па каву з малаком. Мы стаім разам на рагу 14-й стрыт і 7-й авэню нашага ўнебаімкнутага Мангэтану.
10 жніўня (чацьвер).
Спрабавалі з Алесем раскэшыць чэк на 100 даляраў, але не ўдалося. Прыйдзецца адкрываць рахунак у Польска-славянскім банку.
Янота ўчора бачыў: клыпаў цераз дарогу ад нашай Фундацыі да суседзяў. Тутэйшыя конікі ўсю ноч трашчаць, як нашы драчы на балотах. На 71-й вуліцы, асабліва на станцыі сабвэю, сьмярдзіць хімікаліямі. Відаць, труцяць пацукоў, якіх тут як вераб’ёў.
13 жніўня (нядзеля).
Даведаліся мы, што ў Менску зарэзалі нейкага Глеба Самойлава, кіраўніка адной праварадыкальнай расейскай арганізацыі, якая спрабуе атабарыцца ў Беларусі. Званіў Кастусь Акула з Канады, каб папярэдзіць, што пераслаў колькі канадзкіх даляраў на выданьне маіх турэмных споведзяў.
14 жніўня (панядзелак).
Сёньня ў Фундацыю заехалі на перабыванье яшчэ двое.

Кажуць, скончылі нейкі эканамічны ўнівэрсытэт. Мяркуюць тут працягваць вучобу. Ні літаратуры, ні сьвежых палітычных навінаў з Радзімы не прывезьлі.
Новыя — Васіль К. і Сяргей Р. У апошняга “папа”, як ён кажа, — начальнік у Берасьці, мама — бугальтэрка. С. Р. лічыць сябе беларусам, хоць бацька расеец, а маці ўкраінка.
Работа ў нас пакуль ёсьць: падымаю цяжар, падмятаю. І — пыл, пыл, пыл…
19 жніўня (субота).
Зь Юркам ізноў сустрэліся, піва пілі. Таварыш мой заняты быў у размове пераважна характарыстыкамі пэрсанажаў беларускай дыяспары.
Зайшлі ў краму, дзе прадаюць грашовыя знакі ўсяго сьвету. Не як валюту, а як калекцыйныя рэчы. 300 тысяч беларускіх рублёў на 19.08.2000 году прадаюцца за 38 даляраў ЗША.

Эх,
Зоры падаюць проста,
як падае цела ў прыбой
з раскошнага белага мосту
гарачаю летняй парой…
І сапраўды, тут целы часта падаюць з мастоў у чорныя воды Гудзону.
20 жніўня (нядзеля).
Надвячорак, 5-я гадзіна. Ад паўдня засядае Рада БНР. Прысутнічаюць Сурвілла, Запруднік, Васілеўскі-Чудзін, Орса-Рамана, Шукелойць, Бартуль, Навумчык, Станкевіч…
Купіў у адваротную дарогу сумку за 45 даляраў. Паршывенькая, хоць і на колцах. Цёпла. Цераз дарогу ідзе чорненькая з нагамі, як шпалы, драўляныя прасмоленыя шпалы…
Юрка падсунуў мне кнігу Рыгора Клімава “Імя маё легіён”. Мешаніна нейкая, у якой калі пачаць разьбірацца — мазгі зьвернеш.
23 жніўня (серада).
У Фундацыі цяпер жыве аж восем чалавек. Дні бягуць. На сьпіне паўскоквалі болькі. Ад бруду? У “Голасе Радзімы” пішуць, што дома ўрадзілі баравікі. Стэла тэлефануе, усё шукае сабе жанчыну-сяброўку (адна была ў шырокіх стэпах Казахстану, адна цяпер у каменных сутарэньнях Мангэтану).

Чалавек шукае.
Мы шукаем.
Ніяк не магу зразумець: мы ўсе разам шукаем, ці кожны паасобку?
24 жніўня (чацьвер).
Яшчэ 700 паклаў у кішэню, але падвышкі не атрымаў. З Канады дасылаюць на “Тур. дзёньнік”. На работу бос узяў трох сваіх — студэнтачак з Польшчы Забэлю, Агнешку і Даміцэлю. Худзенькія, глытаюць пыл, падмятаць зусім ня ўмеюць, але маюць жаданьне падзарабіць. Па размове відаць, што дзяўчаты не дурніцы. Заробяць.

Я ведаю адно: больш за ўсё я хачу выбрацца з гэтага гораду, папярэдне падклаўшы бомбу пад які-небудзь хмарачос.
Джон Дос Пасас, “Мангэтан”
1 верасьня (пятніца).
Валік Говараў дапамог адкрыць рахунак у Польска-славянскім банку. Цікавая назва, ці праўда? Прыклад таго, як практычная неабходнасьць уступае ў канфлікт зь лёгікай здаровага сэнсу, паколькі слова “славянскі” зьмяшчае ў сабе ў тым ліку й значэньне “палякі”.
3 верасьня (нядзеля).
Стронгсьвіл, штат Агаё. На 24-й сустрэчы беларусаў паўночнай Амэрыкі. Разам з Алесем Крыштаповічам жывём у пакоі № 152 двухпавярховага гатэлю. Жывём, як здаецца, дружна…
Учора Х. Нюнька й С. Шарэцкі прывезьлі мне навіну зь Вільні: на Радзіме ў мяне расьце дачка Ксеня, якой ужо чатыры месяцы! Вось ён, самы галоўны запіс у дэклярацыю пра мае даходы!
9 верасьня (субота).
Ільля, які так любіў фігураваць перад жыльцамі Фундацыі ў трусіках-майтачках, адляцеў днямі ў Горадню пад мамчын паддашак. Мы так і не даведаліся, чым-дзе займаўся наш “балетмайстар”.
Новапрыбылы Васька таксама мае сантымэнты да нацельнага — любіць трусікі прасаваць. Зь любоўю так прасуе, прасуе…
Вось толькі Вільню Васька-маладзён шукае чамусьці на

тэрыторыі Польшчы.
Сёньня — “схадняк” БАЗу. Былі Пазьняк, Навумчык, сьвятар зь Беларусі Іван Спасюк, сьвятар тутэйшы Юрка Рыжы… Ці ня ўсе адзін на другога глядзелі непрыхільна, калі не сказаць, што варожа. Кожны быў сам сабе герой.
11 верасьня (панядзелак).
Паўдня. Душна. Дома.
Польскамоўныя газэты, якія тут выдаюцца: *“Super Express”*, *“Nowy dziennik”* (тыднёвік), *“Polska gazeta”* (штодзённая), *“Tygodnik nowojorski”*, *“Kurier plus”* (тыднёвік).
Быў сёньня ў польскім пасольстве, што на скрыжаваньні 37-й вуліцы й Мэдысан-авэню. Вырабляў транзытную дваццацідаляравую візу.
Учора гасьцяваў у А. Крыштаповіча. Здымае бэйсмэнт у двухпавярховым прыватным доме дзесьці ў прыгарадзе Нью-Ёрку, у адпачынку ня быў ужо восем гадоў — з часу, як прыехаў у ЗША.
Зьезьдзілі на ягонай белай машыне на акіян. І вось ідзём мы па пляжы: два русявыя статныя беларусы, два Алесі (другі — студэнт родам зь беларускага мястэчка Масты), і сярод іх — я, чарнявы, росту ледзь-ледзь сярэдняга. Я ў плаўках, Алесі ў шортах да калена. Ідзём сабе, усьлед нам пляжная публіка неяк занадта ўважліва пазірае, хлапцы мае пасьміхаюцца. Урэшце гаспадар белай машыны растлумачыў, што ў ЗША на пляж у плаўках выходзяць толькі пэдэрасты. Шорты — для ўсіх астатніх; у іх, у штанах, толькі што без калашын, гэтыя амэрыканскія вычварэнцы і боўтаюцца ў брудных прыбярэжных водах Атлянтыкі, стукаючыся аб цьвёрдыя целы мэдузаў.
…А дзесьці далёка, там нашы Браслаўскія, Лепельскія, Мядзельскія азёры, нашыя Нарач, Сьвіцязь… І Беларусь наша — “мора Геродота”.
Вяртаньне з Акіяну пралягала праз кітайскі рэстаранчык, дзе я, прызнаюся, зьеў і выпіў залішне. А ўсё з галадоўлі. Вось і накінуўся на морапрадукты ў выглядзе малюскаў розных, на клешні каралеўскага краба і скрыдэлкі нейкай мініяцюрнай птушкі ўперамежку з салатаю. Па ўсім наверх навярнуў марозіва грамаў дзьвесьце і пінтаў пяць піва… Ужо ў Алесевым падвальчыку глядзелі фільм “Майкл Колінз”.
Нават сьлёзы наварочваліся, тыя сьлёзы, за якія мужчынам не павінна быць сорамна — за “сьлёзы нянавісьці да акупанта”.

Фільм гэты — пра барацьбу Ірляндзкай рэспубліканскай арміі супраць брытанцаў.
13 верасьня.
Алесь прывёз на сваім белым аўто ў Фундацыю новага пастаяльца — Аркадзя, якога дэпартавалі з Канады. З такой нагоды мы выпілі чырвонага віна й паваліліся спаць. Сьнілася залатая пшаніца на бацькавым хутары й дзедавы борці зь мёдам.
16 верасьня (субота).
Васіль Кузьмоў на працы адрэзаў сабе мезенец, а Гаварушкін запарушыў вочы шклаватай. Так можна й галаву скруціць, калі не пільнавацца.
У беларускай царкве на Атлянтык-авэню адбылася сустрэча тутэйшай дыяспары з кіраўніком Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі З. Пазьняком і адным зь сяброў гэтай арганізацыі Ю. Беленькім. У канцы сустрэчы я запрасіў грамаду на сваю разьвітальную вячэру, заплянаваную на 23 верасьня.
Вечар. Позьні чмель шукае ў белых кветках нешта сваё. Заляцела й гудзе над сталом муха.
17 верасьня (нядзеля).
Прыехаў айцец Юры Эмігідыюш Рыжы. Прывёз нам, галадранцам, некалькі паленцаў белага хлеба. Ня ўсе з тутэйшай нью-ёрскай дыяспары вітаюцца з гэтым чалавекам. А ён жа, я думаю, ня большы эгаіст і арыгінал, чым іншыя. Што ж тут дзяліць?
Каля будынку Фундацыі сёньня паліцыя лавіла двух маладзёнаў, якія перлі навыперадкі з такой хуткасьцю, што толькі крыжы на тоўстых залатых ланцужках матляліся ў розныя бакі. Вечарам гарэлі прыватныя дамкі на Хілсайдзе. Было шмат чорнага дыму і бліскучых пажарных машын.
20 верасьня (серада).
Жанчына — маці-адзіночка з суседняга з нашай будоўляй дому — сёньня мне асабліва ўсьміхалася. Прыгожая, велікавокая. А я сядзеў вярхом на вялізным зялёным кантэйнэры, калупаў нагою рэшткі эмігранцкага ланчу і таксама ўсьміхаўся: ці то як проста ідыёт, ці то як ідыёт шчасьлівы.
Штодзень назіраем жыцьцё ў некаторых кватэрах іншага суседняга дому, на даху якога таксама пачаліся будаўнічыя работы. Шмат вокнаў, якія чамусьці безь фіранак. Вось у адной кватэры з драўлянай падлогай ходзіць сабака, стаіць тэлевізар і

канапа. І на канапе поўная маладзіца інтэнсіўна паядае нешта з пакету. Зайшоў малады чалавек з гітарай, прысеў насупраць яе, стаў перабіраць струны. Потым гітару ўзяла яна…
Учора маладзіца хадзіла з голенькім торсам, час-часам пазіраючы ў наш бок. Потым халацік накінула, але грудцы яе самавітыя пэрыядычна выскоквалі з апранахі.
23 верасьня (субота).
<АсноуДва мінулыя дні паміраў ад вострага прыступу гемарою. Учора прыйшлося пайсьці з працы на паўдня раней — так мяне скруціла. Аслабеў быў, падскочыла тэмпэратура, занылі косьці. Учора ж і разьлік атрымаў — 650, мае апошнія амэрыканскія “бабкі”, вечназялёныя мае.
Сёньня ў Фундацыі павінен адбыцца мой разьвітальны вечар. Хвароба крыху адпусьціла. Чакаю гасьцей.
24 верасьня (нядзеля).
Разьвітальны сход прайшоў нядрэнна: народ даваў наказы, парады ў дарогу, прасіў перавезьці грошы.
Ведаючы пра мае сымпатыі да халоднай зброі, Камінскі падарыў салідны армейскі нож з варанёнага мэталу. Што ж, дасьць бог, і гэты арыгінальны падарунак, і дзесяць тысяч наяўнага “зяленіва”, і сваё “грэшнае цела” мы прывязём на Радзіму цэлымі.
Тры гадзіны дня. Ізноў у Алесевым падвальчыку. Гаспадар па сваіх справах адышоўся, а я зноў змагаюся з гемароем, атакуючы яго сернымі сьвечкамі. Як ні круці, а прычына прыступу, відаць, адна — нэрвы. Бо, зарабіўшы задуманую суму грошай, я цяпер усімі сваімі тоўстымі і тонкімі кішкамі, пячонкаю, ныркамі і селязёнкай, правым і левым лёгкімі, мозгам касьцей і каранямі валасоў перажываю праблему трансакіянскага перамяшчэньня мною тут здабытай валюты. Кансыліюм маіх нутраных органаў выносіць рашэньне: грошай з рук не выпускаць і везьці іх “жыўцом”.
25 верасьня (панядзелак).
Гаспадар падвёз у краму, дзе купілі мне лекі і нам — чырвонага віна. Увечары зайшоў да нас Віктар, былы хірург з Горадні. Як і Алесь, ён спрабуе зарабіць капітал на нью-ёрскіх будоўлях. Як і Алесь, Віктар ня мае сям’і.
28 верасьня (чацьвер).
Пазаўчора з Алесем і яго знаёмай Эдзітай зь Беластоку езьдзілі глядзець амэрыканскае начное неба над акіянам. Знайшлі

сузор’е Карца і вельмі гэтым усьцешыліся. Нарэшце зьмерзьлі і паехалі былі назад, але па дарозе Эдзіта прапанавала зазірнуць у стрыптыз-клюб. І вось мы ў клюбіку, гадзін 12 ночы, з намі раскошная высакастройная славянка, магчыма, што нават крэўніца-беларуска, бо родам зь Беласточчыны; і вось мы за столікам, бяром па бутэлечцы мінэралкі, папіваем і ўзіраемся ў той бок, дзе подыюм-сцэна. У такім месцы я першы раз. Вочы хутка прывыкаюць бачыць рухі аголенага цела. Прыгожых з твару маладых жанчын зусім мала. Тонкія фігуркі згінаюцца, дрыгаюць ножкамі-ручкамі, поўзаюць, кратаюць пальчыкамі свае дзюрачкі-складачкі… У залі пераважна зусім маладыя хлапцы, каму яшчэ цікава плаціць за сузіраньне жаночай таямніцы. Ёсьць таксама чалавек пяць-сем перастаркаў.
Два дні Крыштап зь вялікім, як мне здалося, энтузіязмам запісваў на сваю апаратуру вершы ў маім выкананьні.
Поўдня. Чытаю кнігу Сьвятланы Алілуевай “*Только один год*”. Толькі адзін год застаецца да выбараў новага прэзыдэнта Беларусі.
29 верасьня (пятніца).
Днямі Васька-безьмезенец зрабіў нам падарунак — звадзіў у “русскую баню”. Лазьня была невялічкая: жанчыны і мужычкі мыліся разам. Змылі і мы пыл нью-ёрскіх вуліц, пачысьцілі нашы пёркі, бадвайзэру выпілі, паўздыхалі, назіраючы такія блізкія і такія далёкія фігуркі жанчын. І адну я запомню: тыфознага выгляду белацелую жанчыну з рэдкімі і нездаровымі валасамі на галаве.
Магчыма, гэта яна піша сваім родным у Беларусь, успамінаючы на хаду школьны курс чыстапісаньня.
“Петенька и Наташенька, здравствуйте! Я жива и здорова, чего и Вам желаю. Петенька, высылаю тебе 200 долларов. Я открыла счет в банке. Работаю, кручусь, к вечеру устаю, но по-другому нельзя. Такова моя судьба. Смотрите Нату, приучайте с детства ко всему, может, в гимназию с английским уклоном отдадите. Петя, сколько нужно денег, чтоб тебе провести телефон или квартиру поменять? Прошу Вас, берегите Людкины картины, она еще нескоро будет рисовать, хоть ей этого хочется. Она очень много теперь работает над собой, когда-то будет жить как американка, но это всё не так легко. Петенька, учись… Ванька, здравствуй! С приветом — Полина! Я жива и здорова, чего и тебе желаю. Работаю, кручусь, мне не на кого надеяться.

Смотри, береги здоровье, на детей не обижайся. Молодым много нужно. Пусть Витя учится, по командировкам не ездит. Пробуй где-нибудь подрабатывать. Ладно, не тебя мне учить, все равно скажешь, что я командую. Я всю жизнь стремилась к лучшему, но у нас не получалось. Будь здоров…
Марковские, здравствуйте! С приветом — Полина! Не расстраивайтесь, что Валю не пустили. Этот запрет только на шесть месяцев. Пускай Валька в институт поступает, хоть что-то берёт от страны. Пробуйте подторговывать, это легче. Людка движется вперед, много занимается. Алик еще нигде не может устроиться. Тут всё не так, вам не понять. Очень скучаю по всем.
Валя, Сергей, Олежка, привет! Я на грин-карту ничего не получила. От Маньки подписаных бумаг нет. Получила только фото. Живу теперь одна, за квартиру тоже мне платить. Пускай Алешка пробует на учебу сюда попасть. Тут будет работать и оплачивать учение. Но на компьютер его не возьмут, тут страна впереди намного от нас. Мне тяжело, но другого выхода нет. Пишу в метро, по дороге в Квинс. Там наша база, где собираются Беларусы. Завтра в нашей церкви беларуской будет фестиваль. Отпросилась с работы, схожу, это мне нужно. Будьте здоровы”.
1 кастрычніка (нядзеля).
Паўдня. У 18:35 — самалёт на Варшаву. Надвор’е сёньня добрае: сонечна, цёпла. Раніцай з Крыштапам і Аркадзем схадзілі на каву. Вось і надышоў час разьвітаньня зь Вялікім Горадам: з Мангэтанам у раёне 16-й, з Цэнтральным паркам і Ракфэлер-цэнтрам, з сабвэем і трэйнам нумар “F”, зь ювэлірнымі крамамі Джамайкі, кітайскімі забягалаўкамі “чыкен-фут” і ландраматамі з вострым пахам пральнага парашку…
Вось і ўсё. Бывай, гарбіч! бывай, самотная з сынам! бывай, Сайман-канстракшн! бывай, былая стайня, якая не без маёй дапамогі ператварылася цяпер у пяціпавярховы офісны будынак на 16-й вуліцы нью-ёрскага востраваМангэтан!..

Я працаваў бесьперапынна ўсё мае жыцьцё з чатырнаццаці гадоў. Цяпер прыйшоў час адпачыць. Я хачу жыць, падарожнічаць, думаць і быць шчасьлівым. Я больш ня маю

моцы трываць такі тэмп жыцьця. Я хачу навучыцца гуляць, расслабіцца, зьняць напружаньне.
Джон Дос Пасас, “Мангэтан”
2 кастрычніка (панядзелак).
Учора вечарам Франціш Бартуль, мой старэйшы таварыш, падвёз мяне ў аэрапорт.
…І вось я зноў у самалёце: пры мне 10 тысяч даляраў, у багажным аддзяленьні ляжыць варанёны кінжал Камінскага, а ў думках — Радзіма, дачка мая Ксеня і любоў жанчыны.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Часопіс для ўсіх
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Алесь Разанаў

Вэрсэты

Заваёўнікі

АЛЕСЬ РАЗАНАЎ (нар. 1947) — паэт-мадэрніст. Ягонае імя фігуруе сярод беларускіх кандыдатаў на Нобэлеўскую прэмію ў галіне літаратуры. Часова жыве ў Нямеччыне. Аўтар кнігі “Камень. Гліна. Жалеза” (Бібліятэчка “Белавежы”, 2000)..

II

I

Яны ідуць па чужой зямлі.
Кожны іх крок — парушэньне
невідавочнай мяжы,
якая ўтрымлівае іх саміх
у іхных абліччах, у іхных імёнах,
у іхных жыцьцях…
Яны выходзяць зь сябе:
скура старых забаронаў
выварочваецца на левы бок.
На іх наведзена пільная лінза нябёсаў.
Сярэдзіна сьвету перамяшчаецца

разам зь імі. За імі гарыць зямля.
Яны ня змогуць вярнуцца.
Бы жменя зярнят,
сыпанутых у неабсяжнасьць,
вы несяце з сабой старажытны —
і зноў абуджаны — зьмест.
І кожны жыхар, кожны дом,
кожны камень і дрэва
заваяванага краю маюць да вас
асабістае дачыненьне
і мусяць сустрэцца
сам-насам з вамі,
каб нешта — ужо забытае —
зноў убачыць
і зноў зразумець.
Законам ахвяры ўраўнаважваецца
закон улады.
Агольвае вострыя лёзы лёс.
“Не аддавайце сябе таму,
што знаходзіцца па-за вамі,
і не бярыце, што вам не належыць,—
вас папярэджвае нечы голас,—
інакш…”
Але над сьветам зіхціць маладое сонца.
Але грае ў грудзях адвага.
Вы — першыя: нібы жанчына,
чужына вас вабіць углыб
непазьбежнасьці — у нябыт.

З прыцемкаў
досьвітку,
адасабляючыся
паступова
ад камянёў і
дрэў,
выходзяць, як

здані,
насустрач вам
людзі
і, набліжаючыся
да вас,
у вас
углядаюцца ва
ўсе вочы:
ці вы такія ж,
як і яны.
На момант, на
два ці на тры
яны
параўнаюцца з
вамі,
вы — зь імі і
здасца,
што вы і яны —
адно,
ды тут жа, праз
момант,
праз два ці праз
тры,
нібы неахвотна,
пачне
пашырацца
між імі і вамі
адлегласьць
прагалу:
сваёю хадою
пройдзеце
вы празь іх, а
яны — праз вас.
Вам падавацца
далей,
у сваю
наступнасьць,
імі пакінутую
для вас,
а ім — западаць

у мінулае,
што сьцірае ўсе
рысы і вобразы,
непадабенствы
і падабенствы,
каб нанава там
супасьці з
дрэвамі,
з камянямі, з
прыцемнаю
імглой.

III

Яны пазіраюць сьцярожка
перад сабою. Чырванеюць
крытыя чарапіцай дахі дамоў.
Золатам зьзяюць крыжы бажніцаў.
Блішчыць,
абмыты імклівай залеваю, брук.
Вуліца Дамініканаў,
Габрайская вуліца,
Ганчарны завулак… Дзе тут
затойваецца жыцьцё?
Дзе тут затойваецца сьмерць?
Нябачная сіла згінае
каардынаты прасторы.
На вежы гадзіньнік паказвае
нераспазнаны час. Вучацца нанава
вымаўляцца словы, лічыцца лічбы…
Гуляе жыцьцё зь імі ў сьмерць,
сьмерць — у жыцьцё.

IV

Нібы маладыя багі, вы ўзыходзіце
на пракаветных палетках зямлі —
і зямля становіцца вашай.
Вам дазваляецца ўсё:
вы пераймаеце ў свае рукі ўсялякі суд
і пераходзіць на ваш бок праўда.
“Бог абірае таго,
хто сам сябе здольны абраць”,—

вы пераконваеце з дня ў дзень
рэчаіснасьць, а яна гэтаксама,
з дня ў дзень, пераконвае вас,
што Бог, якога вы маеце,— мёртвы,
што Бог, якога вы маеце,—
сьмерць.

V

Быццам вандроўныя месцы,
вы пераходзіце з мовы ў мову,
з падзеі ў падзею, са зьместу ў зьмест.
Вы адлучаеце
ад адной паловы прасторы
яе лагчыны і выспы
і далучаеце да другой, але ўсё роўна —
зямлі, хто арэ яе, хто засявае
і хто кладзецца ў яе.
Вам нешта пярэчыць і ўпарціцца —
і ў рэчаіснасьці, і ва ўчынках,
і, пэўна, якраз таму вы абіраеце тое,
што ўпарціцца і пярэчыць,
сваім неспадманлівым арыенцірам,
і сіла, што вас вызначае ўсюды,
зьдзяйсьняе і кліча тое,
што не павінна зьдзяйсьняцца і наставаць.
Прыкметы ўсчынаюць сваю варажбу,
і бяруць вас у свой палон заваёвы,
і вынік не разумее, што ён здабыў.

VI

Вы прыналежыце моцы,
і перашкода для вас апора.
Цьвёрды ваш крок,
пераможныя вашы ўчынкі,
і постаці вашы
згодна ўрастаюць у сталь.
У рулі й жаролы ўкладаецца перавага.
Ловяць люстэркі адлюстраваньні таго,
што мае настаць.
На сьценах дымныя цені.
На бруку разьбітая чарапіца.
У небе сьпявае гром.

VII

Быццам сухая лістота,
ад вас адпадаюць вашы імёны.
Няма каго клікаць дамоў,
і дом ваш ня там і ня тут.
У звыклае ўгукваецца падзея,
і сьвет пазнае ў вас
свае безназоўныя мроі
пра іншую долю і вам аддае
свае скарбы, але
вы даяце сьвету самі
больш, чым ён можа зьмясьціць.
Ад вас ухіляецца ноч,
і дзень расступаецца перад вамі,
і позіркі дораць свае
незвычайныя кветкі вам.

VIII

IX

З мноства магчымасьцяў,
што паўстаюць перад вамі,
вы абіраеце тую,
што вас разумее найбольш, найглыбей,
найпаўней,— немагчымасьць.
І чорныя сонцы ўглядаюцца вам
у вочы, а смага вас поіць
горкай вадой.
Быццам даецца сьвятое,
якое аддацца назад ня можа,
вам давяраецца даўняя
таямніца пра тое, што азначае
насамрэч — ня быць.

У стрыжні рэчаў
няма іх — рэчаў,
і ў сутнасьці чалавека
няма яго — чалавека,
і шлях ваш — углыб сябе.

X

Ломяцца ў дзьверы і ў вокны сноў,
шукаючы вас, апраметныя жахі,
і непрытомным натоўпам
целы навальваюцца на вас,
а вы ня можаце ўспомніць
ніводнай малітвы!
Зрабілася нешта ня так,
а назад адрабіцца ня можа:
ужо расступілася, выкапаная паслухмяна,
і вас засыпае
задушлівая зямля.
Трэба прачнуцца — і немагчыма амаль
прачнуцца:
дзе ён, праўдзівы мір?!.

XI

Чаму чалавек жывы,
калі ён жывы,
і чаму ён мёртвы, калі ён мёртвы?
Дзьве долі адна адной
абяцаюць сустрэчу,
але сустрэцца ніяк ня могуць.
А вы ідзяце
паміж мёртвымі і жывымі
і абвяргаеце відавочнасьць,
упарта даводзячы,
што чалавек — нешта інакшае,
чым ён мёртвы,
і нешта інакшае,
чым ён жывы.

XII

Усе пуцявіны
перацінаюцца вашым шляхам,
і паварочваюцца да вас усе лёсы.
У сьвеце, што зьдзейсьніўся,

вы — пачатак, і сьвет перад вамі
трымае сваю справаздачу,
выносячы сам сабе свой прысуд.
Ужо распадаюцца на руіны
колішнія цьвярдыні,
і нанава трэба складацца
законам і песьнясьпевам.
Вас лічаць,
парадкуючы, як прадметы,
<Асндбайныя лічбы,
аднак у вас — невымернасьць,
і самая значная бітва — у ёй.

XIII

Жалезам
счышчаеце зь сябе кроў,
жалезам счышчаеце зь сябе скуру,
жалезам счышчаеце зь сябе цела —
і вамі, вас вызваляючы
ад абалонак,
трызьніць вялікая перамога:
ці датрываеце да канца?!.
Масты паабрушваліся —
і ранай зьядноўваюцца
берагі быцьця і нябыту,
ранай, якая крывавіцца і смыліць.

XIV

Вы — мерка, якою дагэтуль
ня мералася рэчаіснасьць.
Трохі яшчэ — і адолеецца
адлегласьць між зьяваю і заваёвай,
трохі яшчэ — і ўкладзецца
відушчасьць у зрок,
трохі яшчэ — і прыйдзе
вам дапамогаю немагчымасьць,
трохі яшчэ —
і матэрыя меркі сплавіцца зь ёй самою,
трохі яшчэ…
Жалеза рве прастору,
і, вызвалены, узыходзіць
зь бездані цела Бог.

XV
Што дазваляецца чалавеку,
калі няма Бога,
і што дазваляецца, калі ёсьць,—
пытаецца ў вас то адна,
то другая думка,
а вы — па-за думкай і па-за думкай,
і шлях ваш просты і востры,
быццам лязо нажа.
Вы парушаеце звыклае —
і яно робіцца неабходным,
вы парушаеце існае —
і няма каму вам запярэчыць
і вас аспрэчыць
і перайначыць азначаны вамі лёс.
За вамі ўзьнікаюць
і апярэджваюць вас
пагалоскі, што вы — ня людзі,
і дзіўная радасьць,
што вы сапраўды — ня людзі,
вам укладаецца ў грудзі
і вас уздымае над сьмерцю
і над жыцьцём.
XVI
Адлегласьці разважаюць,
што настае ў чалавеку
і што мінае,
трымаючы вас неаслабна
ў прыцэле зроку і здабываючы
з вас адказ.
У вас уваходзіць вайна,
а вы — у вайну, і сьледам
ляцяць крумкачы, праракуючы,
што жывымі зь яе вам
ужо ня выйсьці.
Аднак вы
й ня зычыце сабе выйсьця.
Усёю істотаю вы спасьцігаеце,
што вайна ўваходзіць у вас так глыбока,
бо там ужо ёсьць,

і толькі тады, калі яна
дойдзе да першапачатку,
тады і закончыцца назаўсёды
і назаўсёды адпусьціць вас.
Разгортваецца ў падзеі
тое, што нерухома,
бяз вобразу і найменьня ляжала
ў глыбокіх сховішчах сэрцаў,
і вы апынаецеся сам-насам
зьнянацку зь ім.

XVII

Кожны ў адказе
за ўсіх астатніх
і кожны ў пытаньні за ўсіх астатніх:
хто тут чужы, а хто свой?!.
Напружваюцца пагляды:
у прастрані зроку —
расплывістае бяльмо.
Што ўчора
і пазаўчора было відавочным,
сёньня
ахуталася ў сумненьне
і патрабуе пераправеркі,
што насамсправе яно —
яно.
Увага!..
Увага!.. Зман расстаўляе пасткі,
і безаблічныя маскі
ўядаюцца ў твары.
Вы жывіце небясьпеку,
а вас — небясьпека.
Блукаюць у навакольлі
навобмацак
галасы.

XVIII

Дзеліцца вамі
мясьціна зь мясьцінаю,
і адна пара
перадае вас другой пары.
Быццам праліўся дождж
і бягуць, паглынаючыся зямлёю,
бурлівыя ручаіны,
вас усё менш —
і ці хопіць урэшце
на ўсіх і на ўсё?!.
Часткі ўпадаюць у цэласнасьць,
час — у наступнасьць:
там ужо
нехта заўсёды ёсьць.

XIX

Ніхто ня ведае
іхняй апошняй мэты,
і нават яны: яны — прылады вайны,
і вайна прамаўляе імі
сваю, забароненую да часу,
праўду пра чалавека.
Яны на адзін
узор,
яны на адну
выснову,
яны на адно
аблічча,
зь якога глядзіць ніхто.
Абмерваюцца чарапы,
праводзяцца дугі
ад скроняў да падбародзьдзя:
у іх няма іх, і самі яны
ўжо ня здолеюць уратавацца.
Адтуліны цэляцца ў цела.
Гук распадаецца на аскепкі.
Хай уратуе нас Бог!..

XX

З усіх канцоў сьвету
зьбіраюцца госьці на сьвята,
і сьвята

сьпявае.
Пасьпеў небывалы ўраджай,
і час, завяршаючыся,
падрыхтаваў усім
падарункі.
Апошнім прыходзіць
жаніх
і сьмерць бярэ за нявесту.
Расплюшчылася —
і з гурбы старога рызьзя
глядзіць
відушчае вока.

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 12-11-2002
[image]

Усевалад Гарачка

УСЕВАЛАД ГАРАЧКА (нар. 1968) — інжынэр-тэхноляг, працуе на заводзе “Інтэграл” у Менску. Жыве ў Фаніпалі. Паэт. Ягоныя вершы апошніх гадоў друкаваліся ў газэтах “Літаратура і мастацтва”, “Наша Ніва”, часопісе “Крыніца”.

***

Крыштальны бакал юнацтва…
(Я думаў, што ён — крыштальны
І некалі разаб’ецца:
Слізгне з далоні
І — пырскі…)
Я думаў, што ён крыштальны,
А ён
У руках
Растаў.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**

майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 12-11-2002
[image]

Уладзімер Арлоў

Маша і мядзьведзі

Дзецям да 16 гадоў прысьвячаецца

Ня верыць у рэінкарнацыю — дэбільна проста. А калі яна ўсё ж існуе? А калі ў апошнім з тваіх папярэдніх жыцьцяў ты сапраўды — як вылічыла з эзатэрычных табліцаў адна абазнаная жанчына — дыхаў п’янкім паветрам XVIII стагодзьдзя, прачынаючыся й засынаючы ў аблічны папулярнай мэксыканскай танцоркі, асобы спакусьлівай, падступнай і, бясспрэчна, тэмпэрамэнтнай ня толькі на сцэне? У якім увасабленьні і праз колькі гадоў ці стагодзьдзяў ты зноў прыйдзеш у гэтую юдоль пасьля змушанага або добраахвотнага разьвітаньня зь сёньняшнім целам і сёньняшняй сьвядомасьцю? Ці залежаць хоць нейкім чынам наступныя зьяўленьні на сьвет ад тваіх цяперашніх прынцыпаў і паводзін? (Няўжо меў рацыю Плятон, які ў адным са сваіх славутых дыялёгаў бязьлітасна сьцьвярджаў, што гулякаў, пражэраў і жлукталёў у наступных увасабленьнях безальтэрнатыўна чакае лёс асла?). Ці марыш ты адпачыць ад чалавечае іпастасі, знайшоўшы для душы зусім іншую цялесную абалонку з абсалютна новым

УЛАДЗІМЕР АРЛОЎ (нар.1953) — пісьменьнік і гісторык, віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-цэнтру. Суаўтар (з Генадзем Сагановічам) бэстсэлеру “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі”, аўтар зборніка “Сны імператара” (“Мастацкая літаратура”, 2001). Майстар гістарычнае прозы, іранічны эсэіст. Філіграннае валоданьне стылем і

дыяпазонам магчымага і немагчымага?
Ці будзе ўлічанае тваё жаданьне ўцялесьніцца ў нейкім канкрэтным абліччы або ў пэўным месцы? Можа ў спадзяваньні на тое, што дзесьці там, умоўна кажучы, “наверсе”, прыслухаюцца), гэтае жаданьне сапраўды ж публічна агучыць, як, прыкладам, Іосіф Бродзкі, пакуль яго паўтараў, што ў новым увасабленьні хацеў бы жыць у Венэцыі — хоць катом, хоць пацуком.
Пра такія рэчы добра бывае паразважаць у зьвярэнцы, асабліва калі сонца паварочвае на вясну, калі зноў верыцца ў лепшае, а ў кішэні ў цябе — зграбная булькатлівая біклажка нержавейкі.
Вось перад табою, да прыкладу, леў.
Ува ўмовах дзікае прыроды ён, як паведамляе шыльдзінка, жыве пятнаццаць гадоў, у няволі — усе трыццаць. Чамусьці ягоным месцы аддаў перавагу? Што лепей? Пагодзіцца, адмеранае табе лёсам па саване, паесьці дасхочу ў ягоных розных там антылёпаў, зэбраў ды жырафаў — і ўжо на другім дзясятку заручыцца зь зямлёю? Або ўдвая даўжэй маўрыцы гатовым займацца філязофскімі назіраньнямі за шлях пародаю, каб урэшце прыйсьці да высновы, што ў зьвярынцы, як і ў чалавечай турме, самае страшнае, што ты каштавала яму зачыніцца зь сярэдзіны.
Па гамбурскім рахунку, скарачаць сваё жыцьцё пад свецтва цікава, як і яго расьцягваць. А ўсё ж як наконт камфортнага варыянту? На пятнаццатым годзе волі, пакаштаваўшы ўсяго на сьвеце (у тым ліку, вядома, і карыснай для львінага арганізму чалавечыны), можна самахоць здацца ў заапарк і, бо спрэчна гледзячы людзям у вочы, атрымаць яшчэ адзін жыцьцёвы тэрмін з гарантаванаю пайкай. Які з трох шляхоў абяцае найбольш прыстойную рэінкарнацыю?

Побач з ільвом — самец малпы, гібон, які, песьцячы позіркам вабных жанчын, натхнёна займаецца мастурбацыяй, што выклікае здаровую цікавасьць у юных аматараў прыроды, якіх бацькі мусяць жывасілам цягнуць да іншых клетак. Кім быў у мінулым жыцьці ён? Сэксуальным маньякам? Хлопчыкам з чарнобыльскай зоны, які ціха сканаў ад лейкеміі, так і не пасьпеўшы зрабіцца мужчынам?
А твой зялёны рахманы брат кракадзіл, што ў зімовай кватэры-

сакавіта-грубіяты гумар зрабілі жудадным з самых папулярных пісьменьнікаў краіны. Яго ня актыўная грамадзянская пазыцыя — У.Арлоў выступае за дэбаветызацыю краіны і вяртаньне яе на другім дэмакратычны шлях ў зьвярынцы, — каштавала яму звальненьня з выдавецтва “Мастацкая літаратура” і сыходу з часопісу “Крыніца”.

камэры ня можа нават выпрастаць хвост і гібее, уяўляючы сабой жывы пытальнік бяз кропкі?
У адоранага амаль чалавечай прыгажосьцю, але нязьмерна больш дасканала складзенага пітона прасторы болей: хапае й тром жвавым белым курапаткам — ягонаму падвячорку. Хто ведае, ці не былі гэтыя грацыёзныя бесклапотныя істоты ў ранейшым жыцьці прафэсійнымі выляжанкамі й вэнэрычкамі, а мо — выдатніцамі й сакратаркамі камсамольскіх камітэтаў…
Між іншым, часам табе самому таксама маніцца пасьля сьмерці вярнуцца птушкаю. Нездарма ты некалі ўяўляў свае пераўвасабленьні ў грака і яго самотныя палёты над горадам з прызямленьнямі ў самых нечаканых месцах — ад вар'ятні да падваконьня кухні адной здрадлівай знаёмай.
Чаму грак, а не якісь там бусел? Мо таму, што тады ня трэ будзе адлятаць на зіму, а ты адчуваеш, што з гадамі можаш зрабіцца лайдакаватым і цяжкім на пад'ём пэрсанажам, які лічыць, што, маючы розум, са свайго акна можна ўбачыць болей, чым аб'ехаўшы цэлы сьвет?
Але вось галоўная праблема: ці будзеш ты ў іпастасі грака памятаць, што ты — гэта ты? А калі не, калі ня будзе прынцыповай розьніцы паміж табой у новай цялеснай "апранасе" і табой, хворым, крый божа, на хваробу Альцгаймэра, пры якой чалавек страчвае сваю памяць, а значыць, і сваё "я", калі так, дык ці ня ўсё адно, вернешся ты або не, а калі й вернешся, то хіба істотна, у чыім абліччы: халаднакроўнай вужакі, перапоўненага каханьнем марцовага ката, балотнай п'явіцы або блакітнага матылька-аднадзёнкі?
Не, мабыць, кот усё ж мае перавагі перад вужакай. Але ты рызыкуеш апынуцца ў зачараваным коле, бо мяркуеш пра свае новыя верагодныя ўвасабленьні выключна з чалавечага гледзішча. А дзе, скажы, гарантыя, што ў момант свайго сьмяротнага ўкусу вужака не перажывае асалоды й шчасьця, стакроць мацнейшых і шматстайнейшых за твае адчуваньні пры самым фантастычным аргазьме?
Дарэчы, пра аргазм. Зь якой прычыны табе ў гэты момант зазвычай прагнецца хоць на імгненьне стаць жанчынаю, каб даведацца, што адчувае таямнічая істота, зь якой ты дзеліш ложак? Можа, ніякай мэксыканскай танцоркі напраўду ніколі не існавала, бо ў адваротным выпадку ты ну хоць нешта, нейкае каліва, але павінен быў бы памятаць. Нельга ж

пагадзіцца, што тая белазубая смуглявачка з пышным бюстам і ўсім астатнім сваім-тваім жаночым багацьцем служыла эталёнам фрыгіднасьці і за свае пяцьдзясят тры (як паказалі эзатэрычныя табліцы) вірлівыя гады так нічога і не адчула. Адзінае, на што ты катэгарычна не пагаджаешся, — вярнуцца расьлінаю. Ты згодны зь філёзафамі: любая, няхай сабе найпрыгажэйшая кветка ўсё адно асуджаная на паўсоннае, прыкутае да зямлі існаваньне. А вось непрыкметны камарык — насаты тварык — свабодны: звоніць у свой невідочны званочак, вырабляе складаныя піруэты ў сонечным прамяні, сам вызначае сабе шлях і выбірае ахвяру. Жывёла мае выбар. І ў гэтым сэнсе нябачная воку інфузорыя, якая займае сабой нейкую тысячную долю кроплі, сапраўды незалежная ад усяго астатняга Сусьвету, а велічэзны клён, на галінцы якога яна вісіць, — несвабодны. Вырасьці клёнам, каб нейкі піяка пускаў на цябе свой пругкі струмень і яму нельга было даць высьпятка, ты ня згодны. Няхай ужо тады будзе мікракосм інфузорыі… (Цікава, колькі інфузорыяў затаілася ў сусьвеце тваёй біклажкі?) Блукаючы ад клеткі да клеткі, ад глытка да глытка і ад рэфлексіі да рэфлексіі, ты настолькі заблытваешся ў іхным багавіньні, што ледзьве не прапускаеш падзеі, якая нядаўна крыху ўзбунтавала ціхамірную плынь аднастайных тутэйшых дзён, напоўніўшы сэрцы жыхароў і наведнікаў зьвярынымі й чалавечымі пачуцьцямі.

Зрэшты, у здарэньні няма нічога неардынарнага: белыя мядзьведзі зьелі дзяўчынку Машу.

Гэтую афарбаваную сьветлым фаталістычным сумам гісторыю ты чуеш адразу ў некалькіх сагрэтых чалавечай спагадаю інтэрпрэтацыях.

Паводле першай, брацік неабачліва паставіў сястрычку на верх агароджы, а малой заманулася пагуляць зь “мядзьведзікамі”. Праз хвілю аматары прыроды ўбачылі, што ласкавыя, амаль плюшавыя “мішуткі” хацелі есьці. (Некаторыя заўсёднікі зьвярынцу ўдакладняюць, што дзяўчынка Маша летась прыехала з бацькамі з Расеі.)

Другая вэрсія сьцьвярджае, нібыта дзеці расьлі ў моцна пітушчай сям’і і брацік асэнсавана падштурхнуў любую сястрыцу, як часам птушаняты выкідаюць слабейшых з гнязда, каб самім мець лепшы наедак.

Прыхільнікі трэцяга варыянту перакананыя, што Маша, ад якой

засталіся адны пажаваныя ружовыя майткі, была не такая ўжо малая й пасьпела запусьціць свае вострыя зубкі ў сакавіты яблык зямных спакусаў, бо хварэла на СНІД і заразіла блізу сотні мужчынаў і пару дзясяткаў жанчын і дзяўчынак. Прыгнечаная сумленьнем, пачвара татальнага сэксу і выправілася ў ружовых майтках на гасьціны да дружнай сям'і мядзьведзяў, эгаістычна ня думаючы, што можа заразіць яшчэ й іх.

У апошняга варыянту ёсьць падварыянт, згодна зь якім перадаць невылечную пошасьць хворая ад нараджэньня Маша, ня ведаючы пра тое, здолела адно свайму каханаму Гошу. Пасьля жахлівага прысуду мэдыкаў юная пара проста на ганку дыспансэру паклялася разам зьвесьці падрахункі з жорсткай рэчаіснасьцю, аднак у астатні момант Гоша выявіў агідную слабасьць характару і цяпер да скону дзён будзе сьніць пагардлівую ўсьмешку на вуснах каханай, пасланую яму ўжо з пашчы паўночнага драпежніка.

Значна менш прыхільнікаў маюць іншыя вэрсіі. Напрыклад, што Маша ані не хварэла на СНІД, а легкадумна закахалася й страціла нявіннасьць у пяшчотных абдымках мясцовага плэйбоя, гнюснага вашывага прадпрымальніка, які нават у непаўторныя хвіліны пяшчоты тэлефанаваў кудысьці праз мабільнік і замаўляў вагон рыбы. Гэты монстар ніколі не дазваляў сабе быць з адной жанчынаю болей за адзін раз, а крыху экзатычны спосаб самагубства пакінутая Маша абрала з тае прычыны, што пісала вершы, а значыць, была натураю артыстычнай і нават у драбязе не цярпела банальнасьці.

Ты аўтаматычна шукаеш рыфму да слова "мядзьведзь": "ледзь-ледзь", "сьмярдзець"… Далей выплывае нешта спрэс непрыстойнае.

Пакуль тое, нейкая цётухна прапануе іншы жаласны сюжэт. Маша чакала дзіця; адпаведная апаратура ўжо паказала, што народзіцца хлопчык, і шчасьлівая маці выбрала яму імя — Саша. Але імя выявілася нешанцоўным, бо разьвіцьцё падзеяў атрымала незаплянаваны паварот: Сашаў бацька, які рыхтаваўся стаць Машыным законным спадарожнікам жыцьця, прадэманстраваў усім зацікаўленым бакам запэўненыя гербавай пячаткаю дакумэнты, адкуль вынікала, што ён — інвалід савецкай арміі, дзе хапянуў дозу радыяцыі, якой з гакам хапіла, каб стаць поўным імпатэнтам і ніколі ня мець

дзяцей. “Вось табе й Саша!” — пераможна заявіў інвалід савецкай арміі й, весела насьвістваючы расейскую песеньку пра тое, што “Сладку ягоду рвали вместе, горьку ягоду — я одна”, разьвітаўся з будучай маці, якая на апошнія грошы набыла квіток у зьвярынец.
Гэты досыць трывіяльны сюжэт табе чамусьці не падабаецца: магчыма, шкада Сашу, якога драпежнікі зьелі разам з Машай, спыніўшы працэс ягонае рэінкарнацыі на самым пачатку. Больш сымпатычнай выглядае вэрсія, паводле якой ахвяра мядзьведжага апэтыту была транссэксуалкай, што пасьля апэрацыі ператварылася ў Мішу, але аднойчы, і, трэба сказаць, у самы пікантны й напружаны момант, у скляпаным дактарамі шчасьлівым арганізьме неспадзявана пачалася рэакцыя адчужэньня, і трансплянтаваны орган адваліўся, што й змусіла агорнутага роспаччу Мішу, зноў перавернутага ў Машу, аддацца на разарваньне белым мядзьведзям.
І, бадай, самае неверагоднае, што ты выслухаў каля вальеры, — нібыта Маша ня мела аніякага дачыненьня ні да малалетніх дзяўчынак, ні да няшчасных закаханых і хворых на СНІД, а жыла на вуліцы Калектарнай у тым доме, дзе прымаюць шклатару, і была сямідзесяцігадовай бабуляю, якую дзеці і ўнукі выгналі з дому за тое, што ўначы яна моцна храпла й будзіла канарэйку. Вось бабуля і пайшла да мядзьведзяў, бо любіла жывёлаў і рэгулярна падкормлівала галубоў каля помніка Ф. Дзяржынскаму. У такі варыянт, пры ўсёй ягонай вонкавай абгрунтаванасьці, паверыць архіскладана: пералезьці высокую жалезную загарадку вальеры няпроста нават спрытнай жыцьцярадаснай дзяўчыне ў ружовых майтках, а спагадлівыя наведнікі зьвярынцу напэўна засаромеліся б падсаджваць бабулю, уважаючы на ейны век і ўсеагульную павагу, бо Маша штодня па шмат разоў займала чаргу да вакенца прыёму шклатары і брала за паслугу амаль сымбалічныя ганарары. Наўрад ці бабулі дапамаглі караскацца на агароджу і родныя ёй людзі, таму што, як ты разумееш, яны ня ставілі задачы кардынальнай ліквідацыі бабы Машы. Праблема палягала адно ў моцным храпе, і ня выключана, што, жывучы ў натуральных прыродных умовах і на адпаведнай дыеце, бабуля магла хутка перавыхавацца й трыюмфальна вярнуцца ў свае пэнаты на Калектарнай.
Зрэшты, няма ніякай гарантыі, што ўсё гэта — ня больш чым

брудныя інсынуацыі. Рэальнасьць жа перад табою: засраная вальера й зграя прадстаўнікоў арктычнае фаўны — калісьці, відаць, сапраўды белых, сытых і поўных мядзьведжае годнасьці. Што ім мроіцца ў звыклым галаднаватым паўсьне? Неабсяжная, зіхоткая ў месяцавым сьвятле сьнегавая роўнядзь? Атамны ледакол “Ленін” на ахопленым паўночным зьзяньнем даляглядзе? Некалькі кашчавых нясмачных палярнікаў? Ясачка цікавасьці й спадзяваньня прачынаецца ў зацягнутых каламутнай плеўкаю вачах адно тады, калі да сталёвых прэнтаў набліжаецца якая-небудзь таўсманенькая бестурботная дзяўчынка, што, безумоўна, сьведчыць на карысьць вэрсіяў пра браціка й сястрыцу.
Цалкам рэальны і разьвязны цынічны тып у модным чорным паліто і шэрай кепурцы, які — дарма што вакол дзеці — гучна прапануе паставіць на бэтоннай скале ў вальеры помнік: вясёлага масянжовага мядзьведзя зь дзяўчынкаю ў зубах. Шэрая кепурка мяркуе, што мядзьведзі заслугоўваюць на помнік ужо хаця б з тае прычыны, што не пагрэбавалі чалавекам. Чорная фантазія гэтага суб’екта прыводзіць на ўспамін інфэрнальных пэрсанажаў Міхаіла Булгакава, але сам змрочны Азазэла не дадумаўся б да таго, што лепей бы расейскую дзяўчынку Машу праглынуў пітон, бо пасьля такога абеду ён сыты цэлых паўгоду, а мядзьведзі ўжо ўвечары таго самага дня са смакам схрумсталі б штук пяць сьвежых дзяўчынак. Апрача таго, калі б Машаю заняўся пітон, нейкі час яе, ці, праўдзівей, ейныя дзявочыя абрысы яшчэ можна было б бачыць, што крыху супакоіла б боль незваротнае страты ў душах бацькоў і хлопчыка, якому Маша падабалася.

Публіка нэрвуецца (маўляў, адкуль толькі бяруцца гэткія выродкі) — і абсалютна дарэмна, бо, як вядома, чым вышэйшая генэтычная разнастайнасьць віду, тым лепшыя патэнцыйныя магчымасьці яго разьвіцьця.
Суб’ект у чорным паліто прапануе прысутным ушанаваць памяць дзяўчынкі Машы хвілінаю маўчаньня й першы здымае сваю шэрую кепурку. Гэта моцны ход, які адразу змушае абураныя галасы сьціхнуць.
Але ты выдатна ўсьведамляеш, што нельга дазваляць эмоцыям расцугліцца. Калі зыходзіць зь магчымасьці рэінкарнацыі, гісторыя зь дзяўчынкай успрымаецца зусім ня так трагічна і зь

яе лёгка пераключыцца на праблему наступнага Машынага ўвасабленьня. Як і дзе яна вернецца да тваіх сучасьнікаў ці нашчадкаў? Залатой рыбкаю дзе-небудзь у Тайляндзе або галоднай белай мядзьведзіцай у засранай вальеры пасярод тваёй краіны?..

Тым часам думка зрываецца са звыклай арбіты, і ты пачынаеш разважаць прыкладна так. Калі ў пэўным сэнсе можна казаць пра рэінкарнацыю жывых істотаў у герояў мастацкіх твораў, то чаму б не дапусьціць, што празь нейкі час літаратурны герой, у сваю чаргу, уцелясьняецца ў чалавеку або іншай Божай тварыне? Гаротны Муму за ягоныя пакуты няхай бы атрымаў кампэнсацыю ў выглядзе поп-зоркі, а жорсткую барыню варта было б пусьціць бегаць па памыйках аблезлай сучкай-бесхацінкай. Хто наагул возьмецца даказаць, што сьвет літаратурных вобразаў менш рэальны за наш? Пэўна, не адзін ты і ня толькі прыкладаючыся да сваёй біклажкі, заўважаеш, што часьцей не мастацтва насьледуе жыцьцю, а якраз жыцьцё — мастацтву. Дастаткова згадаць авіятараны хмарачосаў у Нью-Ёрку — катастрофу з разраду тых, што значна раней нам ужо паказвалі ў галівудзкіх фільмах.

Але цяпер цябе цікавяць не арабскія тэрарысты, а мірныя, вечна недакормленыя мядзьведзі, якія за месяц апрыходавалі б усіх байцоў бэн Ладэна.

Нейкае яшчэ не да канца ўсьвядомленае жаданьне не адпускае цябе ад вальеры, прымушаючы накручваць вакол яе новыя й новыя кругі.

Паводзіны мядзьведзяў, безумоўна, заслугоўваюць павагі. Яны, як і ты сам, відавочна стаяць на тым, што калі ў змаганьні нельга перамагчы, то неабходна, прынамсі, не паддацца. Яны кінулі выклік сваім турэмнікам, зьеўшы на падвячорак прадстаўніцу іхнай пароды, якая, стаўшы дарослай, наўрад ці змагалася б за правы абяздоленых жывёлаў, бо, кажуць, займалася ў школьным гуртку юных натуралістаў, дзе вучні звычайна мучаюць небараку-вожыка, здадзеную кім-небудзь старую чарапаху ды пару анэмічных вавёрак. Ты сам быў такім гурткоўцам і добра памятаеш, як лагодную зялёную чарапаху Тарцілу вы кармілі газэтамі з партрэтам Хрушчова (што, як ні дзіўна, пайшло ёй на карысьць), а лядашчую вавёрачку пачаставалі аднойчы адмысловымі арэхамі, якія праз шпрыц начынілі гарчыцай.

Мядзьведзі пра згаданыя экспэрымэнты, трэба спадзявацца, ня ведаюць. Іх чацьвёра: бацька, маці й двое нашчадкаў. Ужо па іхных паставах і выгоднасьці месца, занятага дзеля дзённае дрымоты, ты бачыш, што рэй у сям'і вядзе стары бялун, у якога жыцьцё ў няволі так дарэшты і ня зьнішчыла прыроднай велічы. Ты з усё большай павагаю прыглядаешся да патрыярха, бо гэта відавочна ён у крытычны момант, маланкава ацаніўшы сытуацыю, прыняў адзіна правільную пастанову: "Есьці!"
Твой унутраны краявід ачышчаецца ад туману, і ты разумееш, што прымагнічвае цябе да вальеры: імкненьне ўступіць са старым мядзьведзем у кантакт. Табе ўяўляецца, што дзеля гэтага не абавязкова лезьці да яго (з усімі непрадказальнымі вынікамі такой экспэдыцыі). Мо хопіць таго, што ты на імгненьне спаткаешся зь ім вачыма і, як часам здараецца ў сьвеце людзей, галоўная інфармацыя будзе счытаная — важна толькі гранічна сканцэнтравацца й настроіць свой унутраны прыймач на адпаведную хвалю.
Што ты прагнеш даведацца найперш, дык гэта тое, кім ён хадзіў па зямлі ў мінулым жыцьці. Ты мусіш ухапіць нейкую зачэпку, нітачку, якая дапаможа раскруціць клубок аналёгіяў і асацыяцыяў. Аднак злавіць позірк уладара вальеры надзвычай няпроста, бо ён цяпер у абдымках свайго мядзьведжага Марфэя: заснуў на санцагрэі пад штучнай скалой з падазронымі цёмнымі плямамі.
З паўночнага боку вальеры — адтуль, дзе рэзыдэнцыя паўліна з выскубаным на сувэніры хвастом, — да скалы можна падысьці бліжэй. Але чым парушыць ціхамірны сон белага патрыярха? У кішэні твайго паліто — жменя цукерак "Чырвоная Шапачка". На абгортках якраз тое, што трэба: апэтытная дзяўчынка з кошыкам. (Праўда, на месцы ваўка ты пакрыўдаваў бы, бо яго адсутнасьць на малюнку пахне дыскрымінацыяй, і застаецца суцяшацца думкаю, што акурат у гэты час ён, воўк, зьмястоўна бавіць час з бабуляю.)
Першая й другая цукеркі не далятаюць, але прыстрэльваньне ідзе ўдала, і ўжо трэцяя "Шапачка" трапляе ў брудна-белы азадак, а чацьвертая й пятая кладуцца на цэмэнт перад самай пысаю соннага драпежніка. Той падымае галаву — і вось ён, чаканы момант! Вашыя позіркі сустракаюцца, і паміж імі напраўду ўзьнікае невідочны, але жывы, пульсоўны ток, канал сувязі — і яно невыпадкова, бо гэтыя вочы, дзьве сьпелыя

чорныя сьлівіны, — фантастыка! — нібыта знаёмыя табе, ты ўжо калісьці глядзеў у іх, а таму з падвойнай энэргіяй намагаешся выцягнуць з прыцемку сьвядомасьці свайго белага візаві хоць якуюсьці зьвестку пра ягонае ранейшае, дамядзьведжае жыцьцё.
Неверагодна, але, здаецца, нешта выходзіць, і ты, зьняможаны сэансам сувязі, сядаеш на лавачку каля паўліна і, апусьціўшы павекі, пракручваеш сам сабе атрыманы інфармацыйны ролік. Чаму б не прызнаць "карцінку" сыгналам, пасланым тваім маўклівым суразмоўцам з тых сховаў, дзе дрэмле пад попелам незьлічоных гадоў непрадказальная памяць продкаў? Вогнішча, яркая нетутэйшая зеляніна, цёмныя расфарбаваныя постаці аголеных людзей, правадыр на ўзвышэньні — таксама голы, адно са скураным паскам на таліі, адкуль, прыкрываючы мужчынскае багацьце, зьвісае лахман зь нейкім цьмяна знаёмым з твайго дзяцінства значком, які зачаравана разглядвае мурзатае хлапчанё зь сінім пяром у жорсткіх чорных кучарах. Ты падкручваеш колца павелічэньня й бачыш акцябрацкі значок з тварам маленькага, яшчэ бяскрыўднага Валодзі Ўльянава…
Але пры чым тут незабыўны амфітэатар вашай студэнцкай аўдыторыі й прафэсар з цудоўным рэдкім імем Гілер Мардухавіч, які аднойчы добраахвотна стаў ардынарным Генадзем Міхайлавічам, за што яму напэўна давядзецца заплаціць падатак пры рэінкарнацыі?
Аўдыторыя, Гілер Мардухавіч і твой аднакурсьнік зь яшчэ больш дзівосным імем Мбамба (што з афрыканскай перакладаецца прыкладна як "аматар чалавекаў"), зь якім ты па чарзе смокчаш праз саломінку "Портвейн розовый крепкий" (0,7 л), захінуўшы зялёную пляшку чырвоным падручнікам гісторыі КПСС. А побач, таксама з саломінкаю ў зубах, пасмоктвае "Лідзкае" вялікая аматарка піва Маша Тарабанава, што ня толькі круціла з Мбамбам раман, але і зьбіралася да твайго чорнага сябра на летнія вакацыі, а потым у ЗАГС, балазе вірусу СНІДу тады яшчэ не існавала (прынамсі, у вашых шыротах пра яго ня чулі), а грошай яе каханы не лічыў і безьліч разоў паіў упокат увесь ваш інтэрнатаўскі пакой армянскім каньяком, а танны партвэйн вы зь ім цадзілі з тае прычыны, што гэты суворы напой быў для загартаванага сына экватарыяльных лясоў нечым накшталт мінэралкі. Аднак у

апошні момант Маша, на жаль, перадумала ехаць, бо папаўзьлі недарэчныя, яўна запушчаныя зайздросьніцамі чуткі, быццам у таго племя, што ўзгадавала Мбамбу, існуе мудры, асьвечаны стагодзьдзямі звычай зьядаць нявестаў, якіх не ўпадабаюць бацькі закаханага юнака.

Ты робіш зь біклажкі добры глыток, і пенлівая хваля ўражаньняў і ўспамінаў адкочваецца назад, пакідаючы на беразе сьвядомасьці выразны сьлед.

Усё выцягваецца ў мудрагелісты, але цалкам лягічны ланцужок. Правадыр з акцябрацкім Валодзем Ульянавым у раёне амбівалентнага органа — гэта тата Мбамбы, хлопчыка зь сінім пяром у валасах, які потым дзякуючы левым поглядам таты, пераканага марксіста й героя вайны з калянізатарамі, атрымаў накіраваньне ў БДУ імя Леніна.

Маша Тарабанава так і не нарадзіла Мбамбу сына, які называўся б Мбамба Мбамба Мбамба Мбамба, бо народ твайго колішняга аднакурсьніка трымаецца старажытнага звычаю, калі да сына пераходзіць бацькава імя, якое проста паўтараецца два разы. Насамрэч твой афрыканскі сябар зваўся, згодна з пашпартам, Мбамба Мбамба, а вось ягоны бацька — той, што насіў у запаветным месцы дзіцячы партрэцік Валодзі Ўльянава, — быў проста Мбамба, бо, як звалі ягонага бацьку, ня ведала нават маці Мбамбы. Таму, дарэчы, яго так і ахрысьцілі Мбамбам (у перакладзе зь іхнай афрыканскай — ня толькі двухсэнсоўнае “аматар чалавекаў”, але і “выблядак”), што, аднак, не зашкодзіла носьбіту гэткага праўдзівага імя зрабіцца правадыром свайго свабодалюбнага народу.

Але Маша не прыехала; Мбамба Мбамба на вакацыях засумаваў, узначаліў змаганьне з хеўраю мааістаў з суседняга племя і, як пісалі газэты, мужна загінуў у няроўным баі. Як многае нават у глябальнай ідэалягічнай барацьбе залежыць ад выпадковасьці! Каб Тарабанава не купілася на брудныя чуткі, твая краіна магла б мець сёньня надзейнага хаўрусьніка на чорным кантынэнце.

Што ж да саміх тых чутак, дык аднаго разу, выпіўшы за кошт народу Мбамбы бутэльку рому *“Havana Club”*, ты адкрыта запытаўся ў сябра, ці ўваходзіць чалавечына ў мэню ягоных супляменьнікаў, і твой сябар, бязгрэшнае дзіця джунгляў, асьветленых ідэямі самага перадавога вучэньня, шчыра адказаў, што, як ты і думаў, усё гэта лухта: ніякіх нявестаў,

нават белых, у іх не ядуць, і наагул, пасьля заваёвы незалежнасьці ваяры іхнага племя, даеўшы палонных калянізатараў і калянізатарак, урачыста прысягнулі зрабіць крок насустрач забабонам усясьветнай цывілізацыі і конча адмовіцца ад ужываньня такога спажыўнага прадукту. Вынятак зрабілі толькі для Дня незалежнасьці, калі маленькі Мбамбаў народ чыста рытуальна — так, што не пасьпявае адчуць і смаку, — зьядае некалькіх былых калянізатараў, якіх ловяць і прывозяць у родныя мясьціны юнакі зь іхнага племя, што служаць у сталіцы, ходзяць, як і ён, Мбамба, у штанах і ахоўваюць там міжнародны аэрапорт, у ваколіцах якога найчасьцей трапляюцца былыя калянізатары, каторых зазвычаена гатаваць з рознымі духмянасьцямі. (Вось чаму Мбамба старанна скупляў у краме насупроць вашага інтэрнату духмяную грузінскую прыправу хмелі-сунэлі.)

Трымаючы ў розуме аднакурсьніцу Машу, ты на ўсялякі выпадак пацікавіўся, ці ня ўлетку адзначае народ Мбамбы Мбамбы сваё сьвята вызваленьня. Не, сказаў твой цемнаскуры сябар, на жаль, якраз узімку, калі ў іх на экватары сэзон дажджоў, а ён здае тут экзамены, і, не здагадваючыся пра падтэкст твае цікавасьці, прастадушна дадаў, што, зрэшты, дата Дня незалежнасьці даволі рухомая і яе ўжо ня раз мянялі праз рэфэрэндумы, прычым кожнае племя краіны, паводле іхнае дэмакратычнае канстытуцыі, мае права правесьці ўласны рэфэрэндум і вызначыць сабе найбольш зручную дату галоўнага дзяржаўнага сьвята.
Толькі цяпер у зьвярынцы ў цябе мільгае думка, што акурат у зімовую сэсію, калі Мбамба актыўна запасаўся хмелямі-сунэлямі, бясьсьледна зьнік ваш выкладчык лаціны Бэньямін Айзікавіч Пільман, але ты з палёгкаю сьмяешся, узгадаўшы, што згуба потым усплыла на гістарычнай радзіме, дзе ўзьнялася ад шараговага савецкага дацэнта да намесьніка міністра адукацыі. Дый не такоўскі быў Мбамба чалавек, каб есьці з хмелямі-сунэлямі выкладчыкаў роднага факультэту… Вось як бывае: прыйдзеш у зьвярынец прыгожа адпачыць, а тут столькі ўсяго абрынецца, што застаецца адно выгадней уладкавацца на лавачцы і, расшпіліўшы пад амаль вясновымі сонечнымі прамянямі чорнае паліто ды накрыўшы шэрай кепуркаю родную біклажку, паспрабаваць неяк выбавіцца з

гэтага завалу.
Дзеля пачатку ты вырашаеш засяродзіцца на праблеме асабістае рэінкарнацыі. Натуральна, што пасьля апошніх падзеяў ты проста асуджаны “прымерыць” іпастась мядзьведзя, праўда, адразу зарэзэрваваўшы сабе варыянт з айчыннай бурай пародай.
Сьпярша ты ўспамінаеш усё, што ведаеш пра будучага віртуальнага ўладальніка тваёй душы.
Першая згадка — пра дзіцячы садок, дзе перад Новым годам цябе прызначылі мядзьведзем, і мама змайстравала табе ўбор з брунатных штонікаў, сваёй старой кофты і каптурка з круглымі вушамі. Пад сьвяточнай ялінкаю кожны зьвер меўся абараніць свой навагодні строй — расказаць Дзеду Марозу вершык, атрымаўшы ў выніку жменю ліпучых цукерак-ірысак. Знайсьці табе вершык мама папрасіла суседа Грышу — чарнявага, з густымі, як быццам намаляванымі бровамі, габрэйскага хлопчыка, які ўжо вучыўся ў школе. Грышаў вершык быў кароткі і вельмі табе спадабаўся. Менавіта яго ў патрэбны момант ты і прадэклямаваў Дзеду Марозу:

Миша, серенький медведь,
Научил меня пер…ть.

Наступны — ужо дарослы — верш ты ўпадабаў, чытаючы расейскую літаратуру:

Приятно зреть,
Когда большой медведь
Ведет под ручку
Маленькую сучку.

Трэба заўважыць, што героі гэтага ляпідарнага твору нязьменна выклікаюць у цябе самыя сьветлыя пачуцьці.
Затым у тваіх прыгадах ідуць добра знаёмыя ўсім народныя казкі, сярод якіх адметнае месца, вядома, займае вэгетарыянская гісторыя пад назваю “Маша і мядзьведзі”.
Сёньня ты яшчэ раз пераканаўся, што жыцьцё шматстайнейшае, весялейшае й смачнейшае за самую цікавую казку. (Вось таксама забаўны нюанс: уплыў казачнага сьвету на рэчаіснасьць. Тая Маша, ад якой ацалелі толькі майткі, магла начытацца казак і паспрабаваць “эміграваць” са сьвету вечна п’яных бацькоў й галоднага браціка ў тую ідылію, дзе маленькі

Мішутка амаль ласкава пытаецца, хто еў зь ягонай місачкі.)
Ад казак ты плаўна пераходзіш да славутай навэлы Праспэра Мэрымэ “Локіс” — пра графа-пярэваратня, народжанага графіняю, што страціла розум, адстаўшы на паляваньні ад сваіх і апынуўшыся ў пяшчотных абдымках мядзьведзя, які на ўсю поўніцу скарыстаў свой шанец. Навэла заўсёды была блізкая табе ня толькі жывым паўнакроўным вобразам графа (каму ты, як і ягонаму лясному тату, па-добраму зайздросьціў), але і ейнай геаграфічнаю прывязкаю, бо французскі клясык апісаў падзеі, што адбываліся ў братняй жмудзкай частцы Вялікага Княства Літоўскага, а “локіс” у перакладзе з мовы жмудзінаў і азначае “мядзьведзь”.
Ну, граф з такім, дарэчы, мілагучным беларускім імем — Міхал Шэмет — быў экстрэмалам, так шэнціць ня кожнаму. А яшчэ ты чуў пра сьціплых шараговых мядзьведзяў, якія адносна нядаўна так шчыльна насялялі тваю краіну, што ў прыдзьвінскіх лясах нейкіх 150 гадоў таму паляўнічыя здабывалі, бывала, за аблаву дзясятак касалапых, ніколі не адмаўляючыся пры гэтым пачаставацца мядзьведжымі секунцамі ды паляндвіцамі.
Гэты экскурс у гісторыю наганяе на цябе лёгкі сум, і ты паварочваеш да больш памысных рэчаў. Напрыклад, да мэню бурага мядзьведзя. Як табе памятаецца, рацыён у яго, адрозна ад твайго сябра Мбамбы, пераважна расьлінны: ягады, арэхі, авёс, жалуды, што не выклікае ў цябе пярэчаньняў, тым больш, у ім ёсьць і спажыўныя прадукты жывёльнага паходжаньня: жамяра, жабы, грызуны, рыбка, капытныя… Хіба не прыемна паласавацца на зайздрасьць французам сьвежай, халоднекай жабкаю, зажаваць жменю ружовых жыцьцярадасных чарвякоў якім-небудзь сьвежым сусьлікам, закінуць за шчаку парачку салодкіх сялявак або курмелікаў, а на мядзьведжы Дзень Волі можна ўпаляваць казулю, дзіка, а як падфартуніць, то і нешта арыгінальнейшае…
Усьлед за мядзьведжым мэню з памяці ўсплываюць зьвязаныя зь ім гісторыі — чутыя й перажытыя. Бо зусім побач з тваім Полацкам — Бярэзінскі запаведнік, а там мядзьведзяў болей, чым ува ўсіх разам узятых краінах Эўразьвязу.
Гісторыя нумар адзін — пра старога вясковага настаўніка біялёгіі. Настаўнік меў слабы зрок, а таксама пункцік — нястомна бараніў мурашак, бо лічыў іх найкарысьнейшымі істотамі. Ідзе, значыцца, настаўнік лясной дарогаю і бачыць, як

нейкі боўдзіла варушыць мурашнік. Стары паводле сваёй завядзёнкі наважыў таго боўдзілу ўлякнуць, каб і дзясятаму заказаў, — падкраўся ззаду ды як раўне: “Ты што, урадзіцель ё…ны, робіш?!”. “Урадзіцель” — брык — і не варушыцца, ды яшчэ ў паветры неяк нецікава запахла. Настаўнік працёр акуляры — і сам ледзь у штаны не нарабіў: ляжыць побач з мурашнікам у кучы г… вялізны мядзьведзь з лапаю ў роце і ўжо ня дыхае. Паласаваўся, называецца, кісьленькім…

Або другая гісторыя. Ходзіць чалавек па грыбах і чуе раптам, як у нетразях штосьці дзеецца. Падышоў бліжэй, а там мядзьведзь хавае пад ламаччам задзёртую казу, каб сок пусьціла, бо ён, гурман, любіць мяса з душком… Грыбнік і вокам не зьміргнуў, як апынуўся на дрэве. Мядзьведзь, пакуль тое, казу схаваў, паюньдзіў ад задавальненьня на малады баравік ды рушыў па сваім зьвярыным клопаце. А чалавек ужо трохі агоўтаўся і касалапаму з дрэва наўздагон: “Мэ-э-э…” Той вярнуўся, адкапаў “заначку”, панюхаў, пакруціў і так і гэтак ды, супакоіўшыся, закідаў хлудзьдзём назад. Толькі сыходзіць, а тут аднекуль: “Мэ-э-э…” Мішка вярнуўся, зноў, але ўжо палахліва азіраючыся, паўтарыў свае манэўры з козачкай і пасунуўся паціху ў лес, а грыбнік трэці раз: “Мэ-э-э!” І тады мядзьведзь як падмазаў пяты — толькі лес трашчаў.

Трэба сказаць, што размовам пра мядзьведжую палахлівасьць ты ня надта даеш веры. Найхутчэй гэта — дзеля свайго заспакаеньня — прыдумалі вы, людзі. А калі і сапраўды трапляюцца сярод тваіх будучых братоў баязьліўцы, дык хапае й надзеленых не абы-якой мужнасьцю й вытрымкай — такіх, як герой трэцяй гісторыі.

Выходзіць у адной вёсцы пад Лепелем гаспадар на ганак, а ў садзе, проста перад хатаю, сядзіць на яблыні мядзьведзь ды есьць сьпелыя малінаўкі. Мужык трапіўся няўломак і замест хавацца як гаркне: “Пайшоў на х…!” Але не на таго нарваўся: касалапы адно трохі зьдзівіўся, а малінаўкі як цюмрыў, так і цюмрыць. Ужо ўся сям’я з ганку мацюкала ляснога госьця, а той, каб не заміналі вячэраць, усяго што задам да іх павярнуўся, і толькі калі гаспадар пальнуў угару з дубальтоўкі, адно тады твой верагодны лясны суродзіч дазволіў сабе ўлучыцца, так бы мовіць, у дыялёг з чалавекам: зароў, абтрос, схапіўшыся за галіны, усю яблыню, а потым саскочыў долу ды давай шпурляць яблыкамі па хаце, пакуль не павыбіваў усе

вокны, што абвяргае пашыраную думку, быццам мядзьведзі дрэнна бачаць. Мізансцэна з мужным мядзьведзем на яблыні такая выразная, што ты зь цяжкасьцю сьціраеш яе зь сеткавіны вачэй.

Тым часам зь дзяцінства выплывае яшчэ адна гісторыя, праўда, цалкам кніжная, як і “Локіс”, але нязьмерна жудлівейшая за расказаную Праспэрам Мэрымэ, бо ў таго дзейнічалі зьвяры звыклыя й родныя, няхай і зь невялікімі адхіленьнямі ад нормы: ну, маглі там заняцца любоўю з графіняю або перакінуцца ў чалавека і назад, што на гэтых тэрыторыях, спрадвеку ўпадабаных ваўкалакамі, — навіна невялікая.

У восьмай клясе ў зашмальцаваным зборніку фантастыкі ты прачытаў аповед, які ўразіў цябе так глыбока, што ты зноў, як маленькі, не хацеў заставацца дома адзін, баяўся цемры, але, на шчасьце, не пачаў зноў сікацца. У аповедзе вялося пра сакрэтную лясную лябараторыю, дзе вучоныя стварылі мядзьведзяў, надзеленых магутным інтэлектам, якія, быццам семкі, лускалі задачы з вышэйшай матэматыкі, распрацоўвалі абаронныя праграмы, а ў рэдкія хвіліны адпачынку з грасмайстарскай лёгкасьцю ставілі маты сваім прафэсарам, а пасьля і самім шахматным мэтрам, якіх прывозілі ў лябараторыю на трэнінгі. Потым ад вялікага розуму ў экспэрымэнтальных мядзьведзяў стала выкочвацца поўсьць, на лбах зьявіліся амаль чалавечыя плехі, а крыху пазьней, калі чатырохногія інтэлектуалы асвоілі людзкую мову, яны зьелі ўсіх высакачолых прафэсараў, выпілі за іхную сьветлую памяць у лябараторным бары і закусілі аховаю, а ў час дэсэрту акурат пад’ехалі на чарговы турнір грасмайстры, якім мядзьведзі сумленна прапанавалі згуляць на жыцьцё, і хоць шахматысты згадзіліся, шанцаў ніхто зь іх ня меў. Пераможцы турніру разьбегліся па навакольных лясох дзеля бліжэйшага знаёмства зь мясцовым жыхарствам, але адразу адчулі сябе дыскамфортна, бо тубыльцы кепска гулялі ў шахматы, ня ведалі вышэйшай матэматыкі і не маглі забясьпечыць інтэлектуальныя запатрабаваньні былых паддосьледных, што выклікала ў апошніх абгрунтаваную ўкveленасьць і не спрыяла рацыянальнаму харчаваньню.

Пакуль згадваеш дзіцячыя страхі, у атмасфэры зьвярынцу штосьці адбываецца — ты фізычна адчуваеш разьлітыя ў паветры хваляваньне, трывогу, напятае да тонкага звону

чаканьне.
Зьверыну пачынаюць карміць.

Твой сусед, абскубаны паўлін, атрымлівае тры жмені крупаў. Мядзьведзям прыносяць брудны тазік рыбы. Выгляд і памер пайкі непазьбежна наводзяць на думку пра злоўжываньні службовым становішчам.
Мядзьведзі прыніжана падымаюцца, адзін гаспадар вальеры гідліва паварочвае галаву ў процілеглы бок. Ты таксама адварочваешся, аднак зь іншае прычыны: яда — працэс зусім не публічны, а выключна асабісты. Як, напэўна, пакутуюць зьвяры, змушаныя штодня карміцца навідавоку ў зайздросьлівага натоўпу гледачоў! (У выпадку з Машай было тое самае, адно што ўдалося зьменшыць цікаўную зграю на аднаго гледача.) Пітону лягчэй: добра падсілкуешся і да наступнага абеду — цэлы месяц.
Яда, безумоўна, рэч інтымная. Невыпадкова мужчына запрашае жанчыну разам павячэраць: ад супольнай трапэзы недалёка да супольнага ложку. Калі ты ясі з кім-небудзь, робішся яму амаль як брат. Каб ты разам зь мядзьведзямі зьеў Машу, стаў бы для іх сваім і мог бы цяпер гэтаксама выцягнуцца пад скалой. Або калі б у касалапай кампаніі пераведаў адвячоркам на Радаўніцу вясковыя могілкі, дзе на кожным грудку стаіць чарка з размаітымі закускамі, якімі спрадвеку любяць у гэты дзень частавацца пасьля людзей полацкія мядзьведзі, памінаючы чалавечых, а мо й сваіх продкаў.
Дарэчы, на тваім жыцьцёвым шляху ўжо была магчымасьць разьдзяліць зь мядзьведзямі харч.
Калі заплюшчыць вочы і падставіць твар сонцу, вельмі лёгка аднавіць палескі ляндшафт, хуткую Гарынь і ваш памаранчавы намёт на беразе. Надвечар на тым баку глыбокай, але вузкай ракі зь лесу выйшаў мядзьведзь. Буйны, ахайны і бадзёры, ён годна рэпрэзэнтаваў сваю папуляцыю, а накіроўваўся, найверагодней, на недалёкі пчальнік, з гаспадаром якога меў гешэфты.
Аматар мёду ў роздуме пазіраў на намёт і нетутэйшую публіку, што заступіла яму дарогу. Роздум доўжыўся, пакуль з-за павароту не паказалася, выючы сырэнай, баржа-самаходка, якія тады яшчэ нястомна шнуравалі па Гарыні. Мядзьведзь нехаця адступіў у прыбярэжны падлесак, аднак у сутоньні зьявіўся

зноў і, дэманструючы паважнасьць намераў, наблізіўся да самае вады, прычым нават пакратаў яе лапаю.
Замест таго каб прасякнуцца клопатам ляснога брата, вы расклалі каля намёту вялікае вогнішча, але імпэту зьбіраць і падкідаць у агонь дровы вам хапіла ўсяго гадзіны да другой ночы, а тады, захмялелыя ад крынічна чыстага паветра, а таксама ад аднаго чысьцюткага, як сьляза, прадукту аўтахтоннага вырабу, вы дружна ўзяліся важыць носам табаку. Мядзьведзь стаічна чакаў і быў узнагароджаны: перш чым залезьці ў намёт ды адключыцца, вы яшчэ здолелі скарэктаваць бураму падарожніку маршрут, пакінуўшы яму на пні за сотню мэтраў убаку бохан “нарачанскага” хлеба і пару бляшанак са згушчонкай. Раніцой пачастунак зьнік, а вільготны прыбярэжны пясок зьбярог выразныя, надзіва падобныя да чалавечых пяціпалыя сьляды. Нехта з вас, памятаецца, узгадаў з гэтае нагоды паданьне, што даўней мядзьведзі былі людзьмі, а можа, і наадварот.
Пад ракурсам сёньняшніх падзеяў тая прыгода выглядае зусім іначай. А што калі ты страціў унікальную магчымасьць твар у твар сустрэцца з сваім будучым увасабленьнем, пасьля чаго твой лёс мог бы крута зьмяніцца, і, верагодна, ты даўно ўжо перажыў бы рэінкарнацыю…
Наастачу — апошняя зь вядомых табе “мядзьведжых” гісторыяў, зноў, як і першая, пра пэдагога: гэтым разам пра настаўніцу расейскай мовы, прысланую ў заходнебеларускую каталіцкую вёску. Тая сьціплая працаўніца на ніве народнай асьветы несла цёмнаму тамтэйшаму люду сьвятло свайго “великого и могучего языка”, несла ахвярна й самааддана, але нядоўга: у сьцюдзёную калядную ноч на сьнезе ў беларускім лесе ад жанчыны-пэдагога засталіся толькі сьпярэшчаныя “двойкамі” вучнёўскія сшыткі ды арэнбурская пуховая хустка. Пазьней мужная выкладчыца стане гераіняю баляды папулярнага айчыннага барда, але там, як і ў кожным мастацкім творы, ёсьць прынамсі дзьве невялікія недакладнасьці: насамрэч настаўніцу прыслалі ня зь Бійску, а з Валакаламску, а зьелі яе на сьвяточную вячэру не нацыяналістычна настроеныя санітары лесу — ваўкі, а мядзьведзі-патрыёты, што ты павінен канстатаваць з пачуцьцём глыбокага чалавечага смутку, мімаходзь заўважаючы паміж настаўніцай расейскай мовы і расейскай дзяўчынкаю Машай

нейкую лёгкую містычную сувязь.
Згадка пра прыежджую здалёк выкладчыцу братняе мовы наводзіць на думку пра падарожжы, якія, пакуль ты ў чалавечай іпастасі, займаюць у тваёй гіерархіі каштоўнасьцяў надзвычай высокае месца — напэўна, з тае прычыны, што адзін з тваіх продкаў належаў да вандроўнага цыганскага племя. (Між іншым, якраз цыганы, паводле згаданага нядаўна палескага паданьня, і былі раней мядзьведзямі або мядзьведзі былі цыганамі.)
Нарадзіўшыся ў бурай шкуры, ты відавочна атрымаеш прынцыпова іншыя магчымасьці вандраваць па сьвеце. З аднаго боку, здымаецца з парадку дня пытаньне фінансаў, затое з другога, падарожнічаць давядзецца на сваіх чатырох, што, зрэшты, больш пазнавальна й карысна для здароўя. Гэта значыць, вырушыўшы ўвесну з-пад Менску і перасоўваючыся пераважна начнымі перабежкамі, Каляды можна будзе сустрэць недзе пад Лісабонам. Паглядзіш, як жывуць твае заходнеэўрапейскія суродзічы, а мімаходзь высьветліш, на якой мове яны гавораць: ці то на адной — незалежна, з-пад Докшыцаў паходзіш ці з-пад Жэнэвы, — ці то ў кожнай краіне мова свая, а для міжнародных сувязяў існуе нейкі мядзьведжы “інгліш”.
Але цікава, як ты зьбіраешся перасякаць дзяржаўныя межы і найперш — надзейна перакрытую заходнюю мяжу тваёй дзяржавы, патрыётам якой ты, верагодна, застанешся і ў мядзьведжай іпастасі? Пэрспэктыва быць расстраляным на кантрольнай паласе як пераапрануты вораг сваімі ж хлопцамі зь зялёнымі пагонамі цябе прываблівае мала.
Застаюцца падарожжы праз слаба кантраляваныя ўсходнія рубяжы краіны, на якіх дзеля пачатку варта будзе наладзіць абсьледаваньне вашага колішняга этнічнага абшару, што на ўсходзе сягае, як вядома, далёка за Смаленск. На поўнач дарога таксама адкрытая: з полацкіх лясоў за тыдзень ты, ня надта сьпяшаючыся, дасягнеш запаведнага пушкінскага Міхайлаўскага, затрымаешся на колькі дзён у тых паэтычных мясьцінах, каб сустрэць для натхненьня якую-небудзь сваю Машу або, на горшы выпадак, Арыну Радзівонаўну, і рушыш далей, на Лугу й Санкт-Пецярбург — шляхам, які не адолеў напалеонаўскі маршал Удыно і які некалі ў адваротным кірунку мераў штолета сваімі шырокімі крокамі твой

знакаміты суайчыньнік і зямляк Ян Баршчэўскі, што меў сантымэнт да мядзьведзяў, а таму, мяркуючы па шматлікіх пасьпяховых вандроўках празь лясы, карыстаўся выдадзенай імі “ахоўнай граматай”.
Ну, здаецца, з праблемамі і рацыёну, і бязьвізавых падарожжаў ты збольшага разабраўся, але непазьбежна паўстае новая, ня менш хвалявальная — зімовая сьпячка.
Неабавязкова быць яйкам на патэльні, каб уявіць, як атрымліваецца яечня. Ты ведаеш рэсурсы свайго цела і духу і цешышся імі, як музыка-віртуоз радуецца роднаму інструмэнту, цалкам усьведамляючы ягоныя магчымасьці. Ты ўяўляеш, як надыходзіць верасень. Ты ўжо дасхочу наеўся суніцаў, чарніцаў, малінаў і тваіх улюбёных буякоў-дурніцаў. Натуральна, што, паводле спаконвечнай мядзьведжай традыцыі, сам ты ягадаў не зьбіраў, а цярпліва чакаў, пакуль ягадніцы набяруць поўныя вёдры, потым па-гаспадарску палохаў руплівых жанок і спакойна ласаваўся сумленна заробленым дэсэртам, а калі хтосьці не пагаджаўся з законнай экспрапрыяцыяй, твой абед рабіўся больш разнастайным. Назапашаны за лета тлушч адпаліруецца восеньскімі арэхамі й жалудамі, тузінам гладзенькіх грызуноў і, калі пашанцуе, кім-небудзь яшчэ, але гэта ўжо твая гастранамічная таямніца. Урэшце трэба ладзіцца на сон; як сьлед адаспацца за зіму — любата, і тут бурыя мядзьведзі маюць велізарную перавагу перад сваімі белымі сваякамі, бо на радзіме ў апошніх такі калатун, што асабліва не разасьпішся. А добры здаровы сон, як пісаў нехта з клясыкаў,— найлепшая страва на банкеце жыцьця, пагатоў, гэтая страва павялічвае працягласьць самога банкету. Мядзьведзь у сярэднім жыве гадоў дваццаць, але калі шанаваць сябе і паўнавартасна адпачываць ва ўтульным, высланым імхом бярлогу ад падарожжаў, дзяўчынак Машаў ды іншага летняга клопату, то можна, відаць, дацягнуць і да трыццаці.
У тваёй лясной старонцы кожны сабака ведае, што праціраць вочы й выходзіць пасьля зімы на людзі ў мядзьведзяў зазвычаена на Зьвеставаньне, якое, паводле грыгарыянскага календару, прыпадае на 25 сакавіка. Такім чынам, атрымліваецца падвойнае сьветлае сьвята, што проста вымагае зьесьці на полудзень каго-небудзь больш істотнага за сусьліка. Аднак вось што архіважна: ці сьпіць з табою твая мядзьведзіца,

а як сьпіць, то колькі прыкладна разоў вы прачынаецеся, каб коштам назапашаных калёрыяў аддацца любові і зноў, пяшчотна абняўшыся, адчаліць у спакойнае мора мядовага сну, дзе цябе чакаюць зялёныя выспы, густа населеныя разнастайнай спажыўнай фаўнай і нечаканымі прыгодамі. Дык усё ж ці сьпіць разам з табою твая бурая, зь белаю плямкай на грудзёх сяброўка?

Зразумела, чаму глуха маўчаць пра гэта энцыкляпэдычныя даведнікі савецкага часу, калі сэксу не было ні ў гарадох і вёсках, ні ў неабсяжных палёх і лясох тваёй шчасьлівай радзімы. Але ж неяк ты зазірнуў у энцыкляпэдыю часоў незалежнасьці й высьветліў, што там праблема па-ранейшаму пакідаецца за кадрам. Калі твая мядзьведзіца і сапраўды ўзімку смокча лапу асобна — яўны непарадак, і ты яшчэ падумаеш. Вядома, ад устрыманьня яшчэ ніхто не памёр, але ніхто і не нарадзіўся…

Ты ўздрыгваеш, адчуўшы на плячы нечую цяжкую руку або лапу. Не, гэта не гаспадар вальеры, а ўсяго толькі працаўнік зьвярынцу — дзяцюк з круглымі шчокамі ды яшчэ не зусім шызым носам (фізіягномікa падказвае, што наступнага разу ён можа нарадзіцца хамяком).

Зьвярынец зачыняецца? Тады ў цябе адна невялікая просьба: вось грошы, няхай белыя мядзьведзі зьядуць заўтра лішнія дзесяць кіляграмаў добрага мяснога філе, толькі скажыце, калі будзе кармленьне, каб прыйсьці парадавацца разам зь імі.

І апошняе: чаму пустуе клетка бурых мядзьведзяў? Былі на кіназдымках? Чаму *былі*?

Верагодны хамяк напружана маўчыць. Здаецца, яшчэ крыху, і будзе чуваць, як у ягонай галаве варушацца думкі. Нарэшце ён зьбянтэжана мармыча пра няшчасны выпадак з рэжысэрам. Толькі рэжысэрам. Значыцца, апэратара чатырохлапыя акторы пакінулі, каб той мог зьняць фінальныя кадры жыцьця свайго калегі?.. Лягічна.

Аднак табе ўжо бракуе часу ацаніць атрыманыя наастачу ўсьцешлівыя зьвесткі. Зь няўхільнасьцю навальнічнае хмары насоўваецца хвіля, якой ты чакаў і баяўся.

Трымаючы ў руцэ біклажку з апошнім глытком, ты падыходзіш да тоўстых жалезных прэнтаў мядзьведжае вальеры, і тваё сэрца падае ў глыбокую студню. Але не ад страху: стары белы мядзьведзь падымаецца і, з годнасьцю пацягнуўшыся, таксама

ідзе да агароджы. Дзьве сьпелыя чарнасьлівіны знаходзяць твой замглёны блакітнай сьлязінаю позірк, і час спыняецца.
Бывай, стары бялун! Самае лепшае, што твой маўклівы суразмоўца мог бы зрабіць зараз для цябе, — пералезьці праз загародку, каб ты зь сям'ёю яго зьеў. Магчыма, калі-небудзь так і станецца, але пакуль у яго, уладальніка шэрай кепуркі і бліскучай біклажкі, яшчэ ёсьць колькі справаў, што вымагаюць чалавечае іпастасі. І калі гэта ня плён запаленай фантазіі, калі ў мінулым жыцьці ты сапраўды вучыўся ў БДУ імя Леніна, ведай: гэты белы чалавек ніколі не забудзе ні смаку "Портвейна розового крепкого" праз саломінку, ні Машы, якая, пасьля тваёй гераічнай сьмерці ў баі з афрыканскімі мааістамі, атрымала вольную, ні таго, што Мбамба быў добрым сынам і ніколі, нават пасьля трэцяй пляшкі, не гуляў, як легкадумныя белыя аднакурсьнікі, у карты на штаны, бо трымаў у памяці запавет бацькі, героя барацьбы супроць калянізатараў і аматара вострых прыправаў: толькі штаны адрозьніваюць адукаванага чалавека ад дзікуна…
Жалезная брама зьвярынцу зь мілагучным рыпеньнем зачыняецца за табой. Ты адчуваеш, што хочаш сказаць сваім дзьвюхногім братам-людзям нешта важнае. Ты хочаш сказаць ім, каб заўсёды памяталі: выходзячы са зьвярынцу, радуйцеся, што можаце вярнуцца сюды ня толькі наведнікамі.

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Аляксандар Надсан

Caveat Lector

Алена Яскевіч. Падзвіжнікі і іх святыні. Духоўная культура старажытнай Беларусі. — Менск: Полымя, 2001.

Увосень 1944 году вайна закінула мяне і маіх сяброў на самы поўдзень Італіі. Апранутыя мы былі паводле апошняй моды сярод маладых людзей таго часу ў г.зв. “battledress” (баявы строй), а на нагах у нас былі вялізныя чаравікі, кожны вагой з паўпуда, або прынамсі нам так здавалася. Мы жылі ў намётах, што стаялі ў аліўкавым садзе. Я ўпершыню бачыў аліўкавыя дрэвы, на якіх віселі цёмныя, сакавітыя, быццам сьпелыя сьлівы, аліўкі. Я ня вытрываў, сарваў адну аліўку, уклаў у рот, раскусіў і… адчуў сябе як дзядзька Антось з Коласавай “Новай Зямлі” пасьля таго, як пакаштаваў сваіх слаўных клёпкаў на бярозавым соку.

Нядаўна мне трапіла ў рукі кніга Алены Яскевіч “Падзвіжнікі і іх святыні” (у цытатах з кнігі захоўваецца правапіс аўтара) з падзагалоўкам: “Духоўная культура старажытнай Беларусі”. Выдадзеная багата, з каляровымі рэпрадукцыямі больш як 150 ікон, пераважна Багародзіцы, у выходных зьвестках кніга

АЛЯКСАНДАР НАДСАН (нар. 1926) — апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў замежжа. Апякуецца лёнданскай бібліятэкай імя Францішка Скарыны. Аўтар кнігі “Друя і Грэка-каталіцкая царква на Беларусі” (“Божым шляхам”, 2001), укладальнік беларускага “Малітаўніка” (“Сафія”, 2002). Ягоны апошні артыкул у часопісе “ARCHE” —

кваліфікуецца як “навуковае выданне”.
Галоўная тэма кнігі — разьвіцьцё праваслаўнай рэлігійнай думкі ў Беларусі XV—XVII стагодзьдзяў. Закранаюцца пытаньні разьвіцьця мовы і ўзаемасувязяў зь іншымі нацыянальнымі культурамі. Заслугоўвае ўвагу спроба асэнсаваць месца іконаў у жыцьці і дзейнасьці прадстаўнікоў культуры і таго, што аўтар любіць называць “этнасам”.

“Скарына і рэлігійны” (№ 3-2001).

Пэрыяд, ахоплены працаю Яскевіч, у аснове супадае з пэрыядам, які прынята на Захадзе называць па-француску “Renaissance”, а па-беларуску — “Адраджэньне”. Яскевіч не згаджаецца з гэтым. Паводле яе, *“славянскімі вучонымі апошніх гадоў аспрэчваецца правамернасць распаўсюджвання самога тэрміну АДРАДЖЭННЕ на заходні свет, які праз свой Рэнесанс адышоў ад хрысціянскіх каштоўнасцяў у язычаства, бездань ерасяў і граху, адмовіўся ад трансцэндэнтнай сінергіі, побач з дадатнымі, сутыкнуўся з пэўнымі крызіснымі момантамі”* (с. 167). Чытач, для якога гэтыя два тэрміны ёсьць “rose by any other name” (ружа, і няважна, як назавеш), застаецца зьбянтэжаны: у заходнеэўрапейскім кантэксьце яны азначаюць зварот, які адбыўся прыблізна на пераломе XIV і XV стагодзьдзяў, да здабыткаў старажытнай культуры, што праз доўгі час былі ў забыцьці. І гэта зусім не азначае адыходу ад хрысьціянскіх каштоўнасьцяў: проста найлепшыя прадстаўнікі гэтага пэрыяду да словаў *“Да Цябе, Госпадзе, узношу душу маю”* (Пс 24:1) дадалі *“Якое багацьце твораў Тваіх, Госпадзе, Ты ўсё мудра стварыў”* (Пс 103:24).
Культурныя і духоўныя рухі адбываліся і адбываюцца ўвесь час, і кожны зь іх трэба разглядаць у канкрэтных абставінах месца і часу. Таму *“перагляд канцэпцыі Рэнесанса ў бок яго ўсходніх каранёў”* (с. 167) патрэбны толькі хіба дзеля таго, каб даказаць, як у той амэрыканскай песеньцы, што “Anything you can do, I can do better” (усё, што ты можаш зрабіць, я магу зрабіць лепш).

Шмат месца Яскевіч адводзіць апісаньню гісторыі іконаў. Вось, напрыклад, што яна піша пра Віленскі Вастрабрамскі абраз Божай Маці: *“Першая служба ў гонар віленскіх мучанікаў адбылася ў 1431 годзе ў капліцы над Вострай Брамай перад Віленска-Вострабрамскай іконай Божай Маці, якая належыць да тыпу “Нявеста Ненявестная”… Ікона распавядае і пра*

няпростыя часы для праваслаўя ў ВКЛ. Яна — старажытная праваслаўная святыня, хаця і знаходзіцца цяпер ва ўлонні каталіцкай царквы. Ікона была прывезеная ў Вільню з Крыма, менавіта з Корсуні, вялікім князем літоўскім Альгердам Гедымінавічам (1345—1377)" (сс. 146—147). Пра корсунскае паходжаньне абраза першы напісаў Тодар Нарбут у 1835 г. Вестку падхапілі праваслаўныя, сярод іх мітрапаліт Язэп Сямашка і Андрэй Мураўёў, брат вядомага Міхаіла Мураўёва "Вешальніка". У канцы XIX і праз усё XX стагодзьдзе абраз быў прадметам шматлікіх дасьледчых працаў. Апошняй была фундамэнтальная праца Марыі Каламайскай-Саээд "Ostra Brama w Wilnie" (Warszawa, PWN, 1990, 282 s.), у якой аўтарка падсумоўвае ўсё, што было зроблена, уключна з вынікамі ўласных дасьледаваньняў і знаходак. Сёньня можна з упэўненасьцю сказаць, што абраз паходзіць з пачатку XVII стагодзьдзя, быў створаны, праўдападобна, у Вільні; узорам для яго сталі гравюры флямандзкага мастака XVI стагодзьдзя Мартына дэ Фос. Узор прадстаўляе тып Божай Маці, вядомы як "Mater misericordiae" (Маці міласэрнасьці). У цяперашняй капліцы абраз знаходзіцца ад XVIII стагодзьдзя.

Яскевіч піша: *"У 1829 годзе лік Прачыстай Дзевы быў падноўлены ў каталіцкім стылі. Захавалася сведчанне тых часоў, што на іконе можна было адрозніць царкоўнаславянскі надпіс "Честнейшая Херувимъ и славнейшая безъ сравнения Серафимъ".* У зносцы як крыніца падаецца "Беларускі праваслаўны каляндар за 1997 г." (Менск, 1996). Сапраўды, на с. 156 календара ў артыкуле "Беларускія праваслаўныя святыні" знаходзіцца даслоўна вышэй прыведзены тэкст. Аўтар артыкула — Алена Яскевіч…

На с. 147 Яскевіч дае дзьве рэпрадукцыі Вастрабрамскага абраза, адна зь якіх мае быць каталіцкай вэрсіяй, а другая — праваслаўнай. Незразумела, пра якія "вэрсіі" можа быць гутарка: ёсьць адзіны абраз, што знаходзіцца ў Вострай Браме. Вастрабрамскі абраз Божай Маці шануюць аднолькава каталікі і праваслаўныя. Ён шырока вядомы сярод беларусаў, летувісаў, палякаў. Гэта наша супольная сьвятыня. Пісаць пра яго, абапіраючыся толькі на аднабаковыя тэндэнцыйныя крыніцы, — значыць уводзіць чытача ў зман. А гэта несумленна, асабліва для аўтара, які займаецца вывучэньнем духоўнай культуры. Вэрсіі — гэта "канёк" Яскевіч: іх у кнізе некалькі. Напрыклад,

на с. 220 зьмешчаныя рэпрадукцыі двух абразоў. Паводле Яскевіч, гэта каталіцкая і праваслаўная вэрсіі іконы Лясьнянскай Божай Маці. Лясьнянскі жаночы манастыр быў на Падлясьсі недалёка ад гораду Бяла-Падляска па шляху Варшава—Берасьце. Праваслаўная "вэрсія" — невялікая круглая іконка Багародзіцы зь Дзіцяткам Ісусам. Калі верыць Яскевіч, яна зьявілася ў 1683 г. у часе барацьбы з… крыжакамі. Дагэтуль я быў перакананы, што крыжацкі ордэн у Прусіі перастаў існаваць у 1525 г. Каталіцкая "вэрсія" прадстаўляе Маці Божую безь Дзіцятка Ісуса — тып, вядомы на Захадзе як "Mater dolorosa" (Маці журботная). Унізе ёсьць польскі надпіс: *"Łaskami słynący obraz Matki Boskiej Licheńskiej Bolesnej Królowej Polski"* (Праслаўлены ласкамі абраз Маці Божай Ліхенскай Журботнай, Каралевы Польшчы). Ліхень — места прыблізна ў палове дарогі між Варшаваю і Познаньню. Сувязь Ліхеньскага абраза зь Лясьнянскай іконай застаецца загадкаю. Як кажуць палякі, "co ma piernik do wiatraka" (што супольнага ў перніка зь ветраком).

Іконы Маці Божай, паводле Яскевіч, мелі вялікае месца ў жыцьці Францішка Скарыны. Напрыклад, Бялыніцкая ікона Багародзіцы *"аказала благадатную падтрымку Ф. Скарыне ў кракаўскі перыяд яго творчасці, натхніла на падрыхтоўку і выданне новага перакладу Біблії"* (с. 60). Акрамя Бялыніцкай іконы, *"у сваей асветніцкай дзейнасці старабеларускі першадрукар звяртаўся да іконы Божай Маці "Выхаванне"… Згадаем, што ў час працы над прадмоваю да кнігі "Песня песняў" у празрыстым сне Францыску Скарыне з'явілася ікона Божай Маці "Выхаванне"* (с. 64). Нарэшце, *"у час працы над перакладамі і каментарыйнымі творамі Ф. Скарына неаднойчы звяртаўся за благадатнай дапамогай да іконы Божай Маці "Збавіцельніца"* (с. 67).

Малітва Скарыны ў гонар Багародзіцы ў "Малой падарожнай кніжыцы", ягоныя прысьвячэньні перакладаў "ко чти и похвале Створителю, Спасителю, Утешителю Богу в Троицы единому, и Пресвятой Преблагославенной Пречистой Матери Его Марии" не пакідаюць сумневу адносна шчырай пабожнасьці да Маці Божай. У Яскевіч ён нагадвае прыстасаванца, які выкарыстоўвае розныя іконы Багародзіцы залежна ад патрэбы, быццам таблеткі ад болю галавы, горла ці страўніка.

Калі верыць Яскевіч, духоўным настаўнікам беларускага

першадрукара быў *“былы ігумен Троіцка-Сергіевай Лаўры, вучань Максіма Грэка, сусветна вядомы праваслаўны кніжнік… старац Арцемій”* (с. 78). Расейскі манах Арцём, які ў 1551 г. стаў ігуменам Траецка-Сяргееўскай лаўры каля Масквы, у 1554 г. быў абвінавачаны ў ерасі і змушаны ўцякаць на Беларусь. Памёр у 1570 годзе. Дапускаючы, што Арцём дажыў да глыбокай старасьці, ён у найлепшым выпадку мог быць равесьнікам Скарыны, а хутчэй за ўсё, — быў маладзейшым за яго. Скарына пакінуў Беларусь назаўсёды недзе ў палове 1530-х гадоў і памёр не пазьней як у 1551 г. Узьнікае пытаньне: калі і дзе ён пасьпеў стаць духоўным сынам *“сусветна вядомага праваслаўнага кніжніка”*?

Яскевіч згадвае пра Арцёма ў кантэксьце апісаньня рэлігійна-інтэлектуальнага асяродку, які быццам склаўся ў палове XVI стагодзьдзя вакол Супрасьльскага манастыра. Яна піша: *“Паступова ў падляшскім асяродку склаўся літаратурна-рэдактарскі Савет, куды ўваходзілі не толькі братчыкі, мяшчане, прадстаўнікі духавенства, шляхты, але і адзінаверцы-суайчыннікі князі Астрожскія і Слуцкія, будучы канцлер Яўстафі Валовіч, каралеўскі пісар Міхаіл Гарабурда, акрамя архімандрыта Сергія Кімбара, пратапоп падляшскі Нестар, будучы Патрыяршы Экзарх, былы ігумен Троіцка-Сергіевай Лаўры, вучань Максіма Грэка, сусветна вядомы праваслаўны кніжнік і духоўны настаўнік Ф. Скарыны старац Арцемій”* (сс. 77—78).

Духоўнай культурай Падляшша займаюцца ад даўжэйшага часу Ю. Лабынцаў і Л. Шчавінская з Расейскай акадэміі навук. Яны пішуць: *“Постепенно в среде подляшского интеллектуального сообщества православных, куда, кстати, входили не только местные магнаты, представители черного и белого духовенства, шляхты, мещан, но и живущие далеко от Подляшья единоверцы, такие как князья Острожские, Слуцкие и многие другие, сложился особый литературно-энциклопедический совет, разработавший программу будущего Заблудовского издательства. В этот совет вошли Ходкевичи, включая сыновей Григория Александровича Андрея и Александра, супрасльские монахи, протопоп подляшский Нестор — будущий патриарший экзарх, представители местной шляхты и магнатов. Значительное влияние на деятельность совета оказывали князья Слуцкие, будущий канцлер Евстафий Волович,*

королевский писарь Михаил Гарабурда, а позднее бывший игумен Троице-Сергиева монастыря, ученик Максима Грека старец Артемий”. Урывак узяты з дакладу аўтараў “Библия в Западнорусской монастырской среде XV—XIX вв.”, прачытанага на Міжнародным кангрэсе беларусістаў у Менску 21—25 траўня 2000 г. (гл. Хрысціянства і беларускі народ. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2001. С. 71). Упершыню ён быў надрукаваны па-польску ў кнізе “W mieście zwanym Zabłudowem” (Беласток, 1995), а пасьля па-расейску — у кнізе “Православная академия Ходкевичей” (Менск, 1996).

Кідаецца ў вочы падабенства двух тэкстаў, з той розьніцай, што ў расейскіх аўтараў, як паважных вучоных, няма згадкі пра Скарыну. Добрае выхаваньне і справядлівасьць вымагаюць, каб той, хто выкарыстоўвае працы іншых, зрабіў адпаведную спасылку. Інакш гэта будзе плягіят. У Яскевіч такой спасылкі няма. (Лацінскае plagium — “плягіят”, як і дзеяслоў plagio — “красьці”, “рабаваць”, паходзяць напэўна ад грэцкага πλάγιος — “крывы”, “хітры”, “несумленны”).
У Яскевіч ёсьць цэлы разьдзел пра Яна Ўжэвіча (сс. 107—114), аўтара дзьвюх рукапісных “славянскіх граматыкаў” на лацінскай мове. Першая зь іх была напісаная ў 1643 г. у Парыжы, калі аўтар быў студэнтам багаслоўя ў “Славной Академии Парижской“. Другую “граматыку”, якая знаходзіцца ў бібліятэцы гораду Арас у паўночнай Францыі, Ужэвіч напісаў у 1645 г. Факсымільнае выданьне абодвух рукапісаў, разам з украінскім перакладам, выйшла ў Кіеве ў 1970 г. (Граматика словеньска И. Ужевича. — Київ: Наукова думка, 1970). Тэксты да выданьня падрыхтавалі І. Беладзед і Е. Кудрыцкі, для іх гэта — помнікі ўкраінскай мовы. Тут ня месца разглядаць, ці маюць яны рацыю, хоць ёсьць падставы зь імі не згаджацца.
Вельмі мала вядома пра аўтара “граматыкаў”. Звычайна ўважаюць, што ім быў Ян, сын Пятра, Ужэвіч зь Віленскай дыяцэзіі, які 28 кастрычніка 1637 г. быў запісаны ў студэнты Кракаўскага ўнівэрсытэту. Яскевіч дапаўняе біяграфію Ўжэвіча весткай, што ён быў удзельнікам *“навукова-асветніцкага гуртка”* архімандрыта Кіева-Пячэрскай Лаўры Елісея Плецянецкага (гл. с. 107), які памёр у 1624 г. Калі дапусьціць, што Ўжэвіч у 1637 г. меў 20—25 гадоў, дык у 1624 г. яму было ня больш як… 12.

У 1641 г. у Кракаве выйшла друкам паэма Ўжэвіча на польскай мове “Obraz cnoty i sławy…”, напісаная з нагоды шлюбу нашчадкаў польскіх шляхецкіх сем’яў Аляксандра Пшыленцкага і Евы Рупнеўскай. Як большасьць твораў гэтага роду, вартасьць паэмы невялікая. Гэта не перашкаджае Яскевіч сьпяваць гімн у гонар *“Івана Ужэвіча, паэта, роўнага талентам Рансару і Каханоўскаму”* (с. 110), што паказвае ейнае няведаньне твораў гэтых паэтаў. Што далей, то лепш: *“Вытанчаны мастакоўскі густ Івана Ужэвіча, філігранная майстэрства радка, глыбокае пачуццё рытму і гармоніі гавораць пра знаёмства нашага земляка з лепшымі творамі сучасных яму французскіх пісьменнікаў: Франсуа Малерба і Мікалая Буало; Венсана Вуацюра, Андрэ д’Юрдэ; Тэафіля дэ Віё і Сірано дэ Бержэрака”* (с. 111). У 1641 г. Буалё было… 5 гадоў. У тым самым годзе Сірано дэ Бэржэрак, цяжка паранены, пакінуў ваенную службу ў веку 21 гаду. Як пісьменьнік ён стаў вядомы шмат пазьней. Яскевіч ня кажа, якім чынам Ужэвіч, жывучы ў Кракаве (гутарка ідзе пра 1641 год), мог быць знаёмы з творамі французскай літаратуры перад тым, як яны былі напісаныя. Можа, ён іх бачыў у “празрыстым сьне”?
Беладзед і Кудрынскі, спасылаючыся на працу польскага гісторыка літаратуры В. Мацяёўскага з 1851 г., пішуць: *“На думку вченого, ця брошура цікава не змістом своім, а епілогом, в якому І. Ужевич описав особу зоїла, його житло і страву, наприкінці іронічно визначив його долю, злучно забезпечуючи себе від можливої критики в майбутньому”* (Уступ, сс. XII—XIII). А вось што піша Яскевіч: *“Асаблівую цікавасць, на думку даследчыкаў, уяўляе эпілог панегірыка родам Пшылецкіх і Рупнеўскіх, дзе Іван Ужэвіч уводзіць вобраз крытыка Заіла, апісвае яго жыллё і харчаванне, у канцы іранічна вызначае яго лёс, пры гэтым трапна абараняе сябе ад магчымай крытыкі ў будучым”* (с. 111).
Сваю напісаную ў Парыжы граматыку Ўжэвіч сканчае вершам на лацінскай мове. Яскевіч дае гэты верш у беларускім перакладзе. Вось два першыя радкі:

У роднай краіне, о кніга, такой ты
ніколі не знана,
Мову славянскую месціш ты на
старонках сваіх (с. 110).

А вось тыя самыя радкі ва ўкраінскім перакладзе:

В рідній країні, о книго, такою ніколи
не знана,
Мову слов'янську містиш ти на своїх
сторінках.

Цяпер зразумела, чаму ў Яскевіч няма згадкі пра кіеўскае выданьне "Граматыкі" Ўжэвіча. Як кажуць, "канцы ў ваду". Тое, што *"Два варыянты… "Граматыкі" Івана Ужэвіча… былі створаны ў час заканчэння праўлення… кардынала Рышэлье, па ягоным загадзе"* (с. 110), лепш пакінуць без камэнтароў як вынік неўтаймоўнае фантазіі аўтара. Абедзьве граматыкі былі напісаныя пасьля сьмерці Рышэльё, які памёр у 1642 годзе. Ужэвіч, як перад ім Скарына, быў вельмі стрыманым у пытаньні свайго веравызнаньня. Для Яскевіч ён быў адназначна *"праваслаўным багасловам"* (гл. с. 110). Між іншым, яна "прымацавала" да Ўжэвіча Жыровіцкую ікону Багародзіцы, забыўшыся, відаць, што ў тым часе Жыровіцы належалі да ўніятаў.

Са сказанага вышэй можна бачыць, што веды Яскевіч у галіне гісторыі даволі хісткія. Прывядзём яшчэ некалькі прыкладаў. На с. 108 чытаем: *"У 1522 годзе ўладальнікі Жыровіцаў дамагаліся для мястэчка ад польскага караля Яна Казіміра магдэбургскага права"*. Ім, напэўна, прыйшлося доўга чакаць, бо Ян Казімер стаў каралём толькі ў 1649 годзе…

Або яшчэ: *"Багародзіца ўразуміла Кірыла, Патрыярха Канстанцінопальскага, каб ён спыніў ганенні на Іаана Залатавуснага"* (с. 296). Першы Канстантынопальскі патрыярх, які меў гэтае імя, быў Кірыла Люкарыс у 1620 годзе. Цікава, чым пакрыўдзіў яго сьв. Ян Залатавусны, які памёр у 407 г., больш як 1200 гадоў раней…

Цікавая храналёгія жыцьця Пятра Магілы, які жыў у 1596—1646 гадох. Паводле Яскевіч, *"у 1652 г. ён прыняў манаскі пострыг у Кіева-Пячэрскай Лаўры (яму не было 30 гадоў ад роду)"* (с. 205). Такім чынам, калі верыць аўтару, Магіла стаў манахам праз шэсьць гадоў пасьля сьмерці. Перад тым, аднак, *"у 1633 годзе Пятра Магілу выбіраюць мітрапалітам"* (там жа). Простыя падлікі паказваюць, што, паводле храналёгіі Яскевіч, у тым часе Магілу не было 10 гадоў. Але гэта ня ўсё: *"На пачатку 1683 года Пётр Магіла быў блаславёны канстанцінопальскім*

патрыярхам Кірылам Лукарысам на мітраполію” (с. 206). Гэта той самы Кірыла, які перасьледаваў сьв. Яна Залатавуснага (гл. вышэй) і які, дарэчы, быў забіты туркамі ў 1638 г. Што ж, немагчымае ў людзей — магчымае ў Бога. Дадамо: і ў Яскевіч…

Багасловаў, напэўна, зацікавіць зьвестка пра “VI Усяленскі Халкідонскі Сабор”, на якім *“перамаглі ўяўленні пра адзінства ў Збаўцы Хрысце Божай і чалавечай прыроды”* (с. 38). Да гэтага часу было прынята ўважаць, што Халкідонскі Сабор 451 г. быў чацьвертым. На ім было выпрацаванае вучэньне пра Боскую і чалавечую прыроду Хрыста. Вось тэкст галоўнага пункту канчатковай пастановы: *“Вучым вызнаваць… Аднаго і Таго самага Хрыста, Сына, Госпада Адзінароднага, які пазнаецца ў дзьвюх* **прыродах нязьлітна (’άσυγχύτως), нязьменна (’άτρέπτως), непадзельна, неразлучна***”* (выдзелена мною — **А. Н.**). Ня трэба быць вялікім вучоным, каб заўважыць, што напісанае Аленай Яскевіч выглядае падобна на вучэньне, якое на Саборы было асуджанае.

Ня ведаючы Сьвятога Пісаньня, Яскевіч аддае перавагу розным фантастычным казкам тыпу: *“Захаваліся мясцовыя паданні, што ад вады, дзе мыліся пялюшкі Дзіцяткі Хрыста, многія людзі ацаляліся”* (с. 262). Цяжка зразумець, як нешта падобнае можна сумясьціць з годнасьцю чалавека, якога Бог ушанаваў, стаўшыся ім сам.

Тое, што Яскевіч піша пра Багародзіцу, часта нельга чытаць бяз прыкрасьці і зьдзіўленьня. Вось прыклад: *“Пасля адыходу Госпада ўсе Яго вучні і паслядоўнікі былі ў прыгнечаным стане, толькі Божая Маці была для “тужлівых вянцом радасці”* (с. 260). Тым часам у Эвангельлі чытаем: *“Калі Ён* (Хрыстос — **А. Н.**) *бласлаўляў іх, Ён пачаў аддаляцца ад іх і ўзносіцца да неба. Яны пакланіліся Яму і вярнуліся ў Ерусалім зь вялікай радасьцю”* (Лк 24:51—52).

Зноў жа, паводле Яскевіч, *“менавіта Яна* (Багародзіца — **А. Н.**) *пахавала святое цела Іаана Прадцечы”* (там жа). У Эвангельлі знаходзім нешта іншае: пасьля таго як Ірад загадаў адсекчы галаву Яну, *“вучні ягоныя, прыйшоўшы, узялі ягонае цела і пахавалі яго; і пайшлі і абвясьцілі Ісусу”* (Мц. 14:12, гл. таксама Мк 6:29).

А вось яшчэ “пэрла”: *“Майстэрства Багародзіцы як ткалі чалавецтва спазнала праз цудадзейны чырвоны хітон, цэльны,*

шыты без адзінага шва (так! — **А. Н.**). *Расло Дзіцятка Хрыстос — разам з Ім павялічваўся ў памеры хітон, ласкаю Божаю створаны”* (с. 263). У Яна Багаслова сапраўды ёсьць наступная згадка пра хітон: *“Жаўнеры, калі ўкрыжавалі Ісуса, узялі ягоную вопратку і разьдзялілі на чатыры часткі, кожнаму жаўнеру па адной частцы, і хітон: а хітон быў ня шыты, а ўвесь тканы згары. Дык яны сказалі адзін аднаму: ня будзем разьдзіраць, але кінем жэрабя, чый будзе”.* (Ян 19:23—24). У сьвятле трагічнай падзеі ў гісторыі нашага збаўленьня напісанае Яскевіч выглядае на фарс.

Яскевіч, перакананая праваслаўная, піша пра духоўную культуру праваслаўнай Беларусі. Тэма важная і цікавая, і таму хацелася б сказаць ёй: “Памагай Бог!” Але ці нельга гэта рабіць без непраўдзівых намёкаў, крыўдных для тых, хто не падзяляе ейных перакананьняў? Вось хоць бы такі прыклад: *“Першыя уніяты… лічылі, што сапраўдная праваслаўная вера з Візантыі, ад паўднёвых славян пасля асманскага заваёўніцтва знікла. Грэчаскія кнігі перавозяцца да лацінян, перакладаюцца, а пасля спальваюца. Лацініне фактычна застаюцца адзінымі спадкаемцамі першахрысціянскіх традыцый”* (с. 99). І яшчэ ў іншым месцы: *“…Пад пагрозай вынішчэння туркамі хрысціянскіх святыняў, грэкі перадалі многія кнігі рымлянам, якія іх пераклалі, а арыгіналы спалілі”* (с. 156).
Ва ўсім сказаным Яскевіч няма драбка праўды. Зацікаўленасьць грэцкай культурай і мовай на Захадзе, асабліва ў Італіі, пачалася ў XIV стагодзьдзі, задоўга да ўпадку Канстантынопалю. Пасьля наведваньня Італіі грэцкімі вучонымі (як, напрыклад, Хрызалярас у Флярэнцыі) зацікаўленасьць ператварылася ў энтузіязм. Многія італьяцы езьдзілі ў Канстантынопаль, каб на месцы піць з крыніцаў грэцкай культуры. Дзе маглі, яны куплялі грэцкія рукапісы, або прынамсі замаўлялі копіі. Такім чынам, некаторыя з італьянцаў стварылі свае багатыя бібліятэкі. Адзін зь іх, Ніколё Ніколі, набыў 800 рукапісаў і збанкрутаваў. Пасьля ягонай сьмерці бібліятэка трапіла ў рукі Казіма Мэдычы, які памясьціў яе ў дамініканскім кляштары Сьвятога Марка ў Флярэнцыі. Ён даручыў упарадкаваць яе Тамаза дэ Саранца, які, стаўшы ў 1447 г. папам Міколам V, заснаваў Ватыканскую бібліятэку. Іншы вялікі кнігалюб і вучоны, грэк кардынал Бэсарыён свой

збор рукапісаў пакінуў сэнату Вэнэцыі, дзе ён стаў пачаткам слаўнай “Biblioteca Marciana”. Нешта падобнае, хаця ў меншай меры, адбывалася ў іншых краінах. У канцы XV стагодзьдзя, пасьля вынаходзтва кнігадрукаваньня, пачалі выдаваць тэксты ў арыгінале і ў перакладзе на лацінскую мову. Вэнэцыянскі друкар Альда Мануцыё заснаваў за свой кошт акадэмію, дзе вучоныя займаліся падрыхтоўкай крытычных выданьняў грэцкіх аўтараў. У 1516 годзе Эразм Ратэрдамскі зрабіў першую спробу крытычнага выданьня грэцкага тэксту “Новага Запавету”. Пачынаючы ад XVI стагодзьдзя, патрыстычныя грэцкія і лацінскія тэксты выдаюцца ўсё больш у Францыі. Шмат зрабілі бэнэдыктынцы з манастыра Сьв. Маўра. Адзін зь іх, Манфакон (Montfaucon), у 1708 годзе апрацаваў падручнік грэцкай палеаграфіі, які ня страціў вартасьці да нашых дзён. Французскі сьвятар Мінь (Migne) у 1844—1866 гадох выдаў дзьве манумэнтальныя сэрыі твораў айцоў Царквы — “Patrologia latina” (221 том) і “Patrologia graeca” (162 тамы). У нашыя дні французы працягваюць традыцыю сваёй выдатнай сэрыяй “Sources Chrétiennes”. Усе, хто цікавіцца ўсходняй літургіяй, ня могуць абысьціся без фундамэнтальных працаў Гаара “Euchologion sive Rituale Graecorum” (Парыж 1647; 2-е выд. — Вэнэцыя, 1730) і “Liturgiarum Orientalium Collectio” Renaudot (Парыж, 1716; 2-е выд. — Франкфурт 1847). Між іншым, гэтымі выданьнямі праваслаўныя карыстаюцца ня менш за каталікоў. Яскевіч або ня ведае, або хлусіць.

Ня менш бязглуздае цьверджаньне, што *“ў адрозненне ад заходняй традыцыі, на хрысціянскім Усходзе не Нараджэнне Хрыстова, а Вялікдзень (Пасха Гасподня) лічылася найвялікшым хрысціянскім святам”* (с. 264). Уваскрасеньне Хрыстова зьяўляецца цэнтральным пунктам хрысьціянскай веры, няважна ў якой традыцыі, згодна са словамі сьв. Паўла: *“Калі Хрыстос не ўваскрос, дык дарэмная вера вашая, і вы застаяцеся ў вашых грахох”* (1 Кар 15:17). Нельга судзіць сутнасьць па вонкавых прыметах. У такі спосаб можна зрабіць выснову, што ў Беларусі найвялікшым сьвятам ёсьць не Каляды і не Вялікдзень, а Новы год.

Вядомы ўкраінскі славіст Юры Шавялёў напісаў у 1974 годзе артыкул пра разьмежаваньне беларускіх і ўкраінскіх пісьмовых помнікаў XVI ст. (G. Y. Shevelev. Belorussian versus Ukrainian: Delimitation of Texts before A. D. 1569 // *The Journal of*

Byelorussian Studies. Vol. III, 2. 1974. P. 145—156), за што меў шмат прыкрасьцяў ад сваіх, украінцаў. Я спытаўся ў яго, чаму ён гэта зрабіў, і атрымаў адказ: “Таму што я ўкраінскі патрыёт і хачу, каб украінцы пазналі сваё. А то яны набралі столькі чужога, што за ім свайго ня бачаць”. Гэтага прынцыпу варта было б трымацца Яскевіч. Ян Вішанскі (з Судовай Вішні каля Пярэмышля, а ня зь Вішнева, як хоча Яскевіч), Елісей Плецянецкі, Інакент Гізель, Памва Бярында, Захар Капысьценскі, Зьміцер Растоўскі, Эпіфан Славінецкі, Лазар Барановіч, Антон Радзівілоўскі, Янікі Галятоўскі, Сьцяпан Яворскі, Хвядос Чарнігаўскі… Сувязь гэтых асобаў зь Беларусяй у найлепшым выпадку належыць да тыпу “Ленін думае пра Беларусь” (хай прабачыць сябар Бураўкін!). Дый пачынаючы ад Зьмітра Растоўскага, іхным духоўным домам была Расейская праваслаўная царква, дзе некаторыя зь іх займалі высокія становішчы. Ці часам Яскевіч ня хоча нам нешта сказаць, хоць бы “Inspice et fac secundum exemplum”, што можна прыблізна перакласьці як “Прыгледзься і бяры прыклад”?
Яскевіч любіць пачынаць сказы словамі *“адзначым”, “варта адзначыць”, “варта згадаць”, “згадаем”, “прыгадаем”, “шырока вядома”*. Гэта адразу ставіць чытача ў няёмкае становішча: яму сорамна, што ня можа прыгадаць таго, што павінна быць агульнавядомым. Іншыя сказы Яскевіч пачынае словамі “Гісторыкі сведчаць”, “Даследчыкі адзначаюць”, “На думку гісторыкаў (даследчыкаў)” і г.д. Пасьля такога ўступу чытач набірае павагі да ўсяго, што далей сказана, як да высноваў паважных вучоных. Вось прыклад: *“Выказваецца меркаванне, што ў аснову алфавіта, які выкарыстоўвалі роўнаапостальныя Кірыла і Мяфодзій, былі пакладзены літары са знойдзеных у час наведвання святымі братамі Корсуні ў 860—861 гадах Евангелля і Псалтыры. Даследчыкі бачаць у іх правобразы нашых сучасных царкоўнаславянскіх літар пазнейшай кірылічнай графікі. Св. Канстанцін нават навучыўся ад жыхара з усходнеславянскіх зямель яго мове. Некаторыя даследчыкі лічаць, што такі чалавек паходзіў з Полаччыны”* (с. 190). Грудзі кожнага беларуса, які прачытае гэтыя радкі, павінны поўніцца гордасьцю: гэта ж царкоўнаславянская мова — амаль нашая!
Я пазайздросьціў Яскевіч і вырашыў паспрабаваць напісаць нешта ў ейным стылі. Вось вынік: “Варта прыгадаць, што старэнькі Язэп — гісторыкі кажуць, што яму было за 80, — узяў

у рукі кій і выгнаў двух хлапчукоў-падшыванцаў, якія гралі на дудзе, шумелі і не давалі спаць дзіцятку Ісусу. Гісторыя захавала іхнія імёны: адзін зь іх называўся Саўка, а другі Грышка. На думку некаторых дасьледчыкаў, яны былі беларусамі". Хваліцца непрыгожа, але, здаецца, выйшла зусім нічога сабе і нават навукова!
Паводле Яскевіч, *"на глебе старабеларускай мовы сфарміраваліся суседнія мовы: старапольская, старалітоўская, стараруская (дарэчы, старабеларуская традыцыя складае падмурак сучаснай расійскай, рускай літаратурнай мовы), з яе папаўнялі свае лексічныя багацці старарумынская і старавенгерская мовы, як і мовы чэхаў і славакаў"* (с. 114).
Як быццам гэтага было мала: *"У гэты час новастворанай (1634—1636) французскай Акадэміяй навук прымаюцца тэрміновыя меры па стылістычным упарадкаванні старафранцузскай літаратурнай мовы. Таму менавіта працы праваслаўнага багаслова* (Ужэвіча — **А. Н.**) *з Вялікага Княства Літоўскага зацікавілі французскую грамадскасць"* (сс. 110—111). Здаецца, лепш ня скажаш, хоць было б больш пераканаўча, калі б Яскевіч прывяла хоць нейкія доказы. А так усё гэта выглядае на цукерку, каб беларусы, думаючы пра веліч іхнай мовы ў мінулым за мяжою, забываліся на яе сучасны стан на бацькаўшчыне.

Мова Яскевіч служыць добрым прыкладам гэтага апошняга. Возьмем хоць бы тытул уступнага артыкулу, "*Сцяжаць* духоўную мужнасць" (с. 9). Слова "сцяжаць" няма ні ў адным беларускім слоўніку. Ёсьць "сьцяжка" з двума значэньнямі: 1) тое, чым сьцягваюць, замацоўваюць; 2) частка счэпа чыгуначных вагонаў… Цяжка зразумець, што значыць *Неапальная Купіна* (с. 260): у беларускай мова слова "неапальны" зусім адсутнічае, а "купіна" даецца ў слоўніках як "грудок сухой, цьвёрдай зямлі на нізкім або балоцістым месцы, аброслы мохам, травой". Або такі сказ: *"Дзева Марыя сышла на зямлю, каб пячыся аб… родзе чалавечым"* (с. 300). Беларускія слоўнікі даюць наступныя значэньні слова "пячыся": 1) гатавацца сухім награваньнем, без вады, на адкрытым агні, у духу або патэльні; 2) грэцца на сонцы; 3) мець здольнасьць, уласьцівасьць паліць, абпальваць. Зноў жа на с. 305 чытаем: *"Паклала яму* (звычаю падыходзіць да сьвятыні на каленях —

А. Н.) *пачатак адна старыца*”. У беларускіх слоўніках ёсьць слова “старыца” са значэньнем “старое перасохлае рэчышча”. Вось невялікая падборка словаў з кнігі Яскевіч: *абрэценне, адкравенне, благадаць, благаухальная (квецень), брань, быціе тварнае… і нятварнае, галубіца, гроб, дабрадзецель, дзерзнавенныя (прашэнні), у дзясніцы (Усявышняга), лабзанне, у нечысцівым (горадзе), пабег, пагуба, пазорышча, памышленне, пахар, пачытаць (іконы), пітае (малаком), правідзенне, прадстаяць, прастол, сонм, спадобіцца, стада, супруг, Уладычыца, цэп-ланцуг, цягаценне, Свята Чрэва, чады (нараджаць)*.
Ёсьць і новыя формы: благадаці *Божыяй* (с. 38, 48, 144, 165, 286); *абставіна* (с. 92); *падзвіжніцкі* пасвіў Хрыстовае стада (с. 142); Малая Русь была *связана* (с. 144); ружа сярод *церняў* (с. 254); узыходжанне *любовію*-агапіяй (с. 286).
Выкарыстоўваючы слоўнік (і правапіс) Яскевіч, можна сказаць, што “начытаўшыся розных *чрэваў* і *чадаў*, мімаволі *прадстаяць дзерзнавенныя* і *нечысцівыя памышленні* пра *пазорышча быція* мовы, на якой можна “только разговаривать””. Адразу засьцерагаюся, што ня маю на думцы мову беларускую…
Але трэба падводзіць вынікі.
У мае студэнцкія гады ў Рыме сярод студэнтаў быў звычай ладзіць перад Вялікім Постам тэатральныя пастаноўкі. Памятаю адну камэдыю, у якой герой, вясковы дурань, пажыўшы нейкі час у горадзе, вярнуўся дамоў “вучоным інтэлігентам”. Ня тое, каб ён сапраўды нешта ведаў, як зразумеў, што “важна ня ведаць, але ўмець рабіць уражаньне, што ведаеш”. Кніга Яскевіч “робіць уражаньне” выдатна.
Навуковыя рэдактары звычайна сваім аўтарытэтам сьведчаць аб вартасьці дадзенай працы. З двух навуковых рэдактараў кнігі Яскевіч адзін, У. Вялічка, *“заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі”*, — рэдактар “Беларускай думкі” (так называецца апошняя рэінкарнацыя часопісу “Коммунист Белоруссии”). У 1998 годзе ён пісаў: *“Отношение у нас, белорусов, к России не просто дружеское, а гораздо большее. Единство с великим восточным соседом — это внутренняя потребность, не подверженная влиянию времени. И когда читаеш, что богатая ресурсами и талантами Россия погрузилась во мглу, обидно становится за нее вдвойне. Но очень скоро она воспрянет духом, а ее*

разрушителям и грабителям не избежать кары. Пока же наш нравственный долг — заступаться за страну, с которой у нас много общего — этнические корни, история, судьба” (Беларуская думка. — Менск, 1998, № 3. С. 148). Трэба сказаць, што Яскевіч не магла нават марыць пра лепшага, больш духоўна роднага (“soul mate”) навуковага рэдактара… Затое зьдзіўляе прозьвішча М. Касьцюка, былога дырэктара Інстытуту гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Што змусіла яго да кроку, ад якога ён ня можа чакаць нічога добрага для сваёй рэпутацыі паважнага вучонага?

Калі ідзе пра духоўны аспэкт кнігі, дык яго я, на жаль, не заўважыў. Дый гэта зразумела: духоўнасьць абапіраецца на прыродныя дабрадзейнасьці, такія як сумленнасьць, праўдзівасьць, сьціпласьць, разважнасьць.

Беларусы маюць вялікі голад духоўнае стравы, але, празь няведанне і недахоп дасьведчаньня, часта трапляюць у пастку, зь якой ім пасьля цяжка выбрацца. Вялікая адказнасьць ляжыць на тых, каго Бог паклікаў быць пастырамі Божага народу, чыім абавязкам ёсьць тое, што сьв. Павал загадваў Цімафею: *“Абвяшчай слова, настойвай у час і ня ў час, выкрывай, павучай, падтрымлівай на духу з усёй цярплівасьцю, калі навучаеш”* (2 Цім 4:2).

На самым пачатку кнігі Яскевіч сказана, што яна выйшла *“па благаславенні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха Беларусі”*. Для праваслаўных беларусаў гэта ёсьць найвышэйшая рэкамэндацыя. Дзеля павагі да высокай годнасьці духоўнага пастыра вялікай часткі беларускага народу, я хацеў бы ўстрымацца ад камэнтароў. Аднак я б ня выканаў майго маральнага абавязку, не спытаўшыся ў дастойнага Ўладыкі, ці, перш як блаславіць, ён пазнаёміўся са зьместам кнігі, каб часам ня даць сваёй пастве камень замест хлеба? (гл. *Мц 7 : 9*).

Лёндан, 25 студзеня 2002 г.

P.S. Для тых, хто ўжо даўно чытаў “Новую зямлю” Якуба Коласа і сёе-тое забыў, вось апошнія радкі з разьдзелу “Дзядзька-кухар”:

— Ну, дзядзька, як на смак, прызнайся?

— Паскудзтва, брат, і не пытайся!

[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 1 (21) – 2002
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image] [image] 2002
[image] [image] [image] [

духоўным жыццём, веравызнаннем, навуковай працай і творчасцю шэрагу выдатных асобаў мінуўшчыны, якія малюе свае вобразы гэтай гісторыі. Натуральна, што аповед на ўласныя веды і вопыт робіць гэтыя вобразы вельмі суб'ектыўнымі. Ці ж магчымае ўвогуле аб'ектыўнае даследаванне такой нематэрыяльнай сферы, як пачуцці і памкненні людзей мінулага, асаблівасці іх веры? Дасягненні сучаснага мастацтвазнаўства і псіхалогіі гісторыі дазваляюць станоўча адказаць на гэтае пытанне. Але аўтарка рэцэнзаванай кнігі не выкарыстоўвае дасягненняў сучаснай гістарычнай навукі і працаў па гісторыі царкоўнага мастацтва, а ідзе іншым шляхам: для даследавання ёю абраная метадалогія пашырэння філалогіі да памераў усёахопнай навукі, імя якой — "агульнафілалагічная цэласнасць". Шырока пастаўленая задача вымушае паралельна выцягваць лінію тлумачэння сюжэту абразоў з апісаннямі гісторыі асобных іконаў. Для Алены Яскевіч не існуе майстра-мастака, які маляваў ікону, усе абразы *"абрэцены"*, *"яўлены"*, і гэта не тэрміналагічныя асаблівасці тэксту, але ідэалагічныя ўстаноўкі аўтаркі. Тэкст апелюе не да інтэлекту, а да веры і пачуццяў чытача. Гэта робіць чытанне кнігі справай надзвычай эмацыйнай. Тэматыка кнігі непазбежна патрабуе пэўнай метадалогіі ў перадачы гістарычнай інфармацыі. Алена Яскевіч робіць гэта экстравагантна і неардынарна, напрыклад: *"Па сведчанні мясцовага гісторыка-краязнаўцы І.С.Грыня, у XII стагоддзі будуюцца першыя храмы ў цэнтры Наваградка…"* (с.82). Гэта навуковая некарэктнасць. Названыя факты здабыў не філолаг па адукацыі Іван Грынь, а ленінградскія археолагі, якія раскопвалі старажытныя храмы Наваградка, — Міхаіл Каргер і Марыяна Малеўская-Малевіч. Ёсць іхнія шматлікія, што да гэтай тэмы, публікацыі. А калі б Алена Яскевіч не сустрэла на сваім шляху Івана Грыня, хто б ёй расказаў пра Наваградак? І што б яна тады напісала ў сваю кнігу? Публікацыяў вучоных-археолагаў яна не згадвае (здаецца, і не ведае).

культура Вялікага Княства Літоўскага".

Кніга складаецца з уступу, чатырох раздзелаў, заключэння, паказальніка імёнаў і персаналіяў, календара ўшанавання цудадзейных беларускіх абразоў, бібліяграфіі (на самай справе гэта вынесеныя ў канец кнігі спасылкі на літаратуру) і "Слоўніка рэдкіх тэрмінаў і абазначэнняў". У апошнім

звяртаюць на сябе ўвагу тлумачэнні навамодных тэрмінаў “пасіянарнасць”, “пасіянарны імпульс паводзін”, “пасіянарны штуршок” (хаця выраз *“пасіянарны выбух”* (с.56) у слоўніку не патлумачаны).
Кніга дзякуючы арыгінальнаму макету (мастак В.П.Масцераў) выглядае прыгожа і багата. І хаця не ўсе рэпрадукцыі аднолькава якасныя, плён працы паліграфістаў прыемна ўзяць у рукі. *“Уся гісторыя нашай краіны прайшла пад знакам, пакровам іконы. Сведкамі многіх гістарычных антынамічных катаклізмаў і лёсавызначальных падзей былі цудадзейныя святыні”*. Нельга не пагадзіцца з гэтым сцвярджэннем аўтаркі, асабліва калі адкінуць таямніча-няясныя *“антынамічныя катаклізмы”*. Шматлікія ілюстрацыі павінны, па ўсёй верагоднасці, дапамагчы суперажываць лёс і шляхі падзвіжнікаў і ўзбагаціць уражанні чытача ад знаёмства з духоўнай культурай старажытнай Беларусі. Усяго ў кнізе 191 ілюстрацыя (10 на вокладцы, 8 вынесены блокам у пачатак кнігі і 173 ў тэксце), з якіх 152 — гэта іконы і 38 — партрэты розных гістарычных асобаў. Такім чынам, і з назвы кнігі, і з пабудовы яе “візуальнага раду” вынікаюць два галоўныя сэнсавыя кірункі: іконы — гэта святыні, а паказаныя асобы — падзвіжнікі зямлі беларускай. Спынім сваю ўвагу на апошніх. Прадстаўленыя некалькі праваслаўных і адзін каталіцкі епіскап, віленскі ваявода Рыгор Хадкевіч, два князі Астрожскія, два Алелькавічы, вялікі князь Вітаўт, вялікія князі Ягелоны, гуманісты Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Ян Вісліцкі, вялебны Максім Грэк, асобным іканастасікам — шэсць рэальных і міфічных жанчын, некалькі вучоных праваслаўных манахаў. Рэжа вока стылістычны разнабой фантазійных партрэтаў (арыгінальныя выявы большасці асобаў не захаваліся). Асабліва ўражвае жонка Аляксандра Ягелончыка Алена Іванаўна: на малюнку яна ўбраная ў футра з каўнерам і капялюшык з вуаллю — акурат “Незнаёмка” расійскага мастака XIX ст. І.Крамскога. Не менш эмоцый і ад выявы Івана Ўжэвіча: яго намалявалі пункцірам-кропачкамі з косамі, як вучаніцу малодшых класаў сярэдняй школы. Хто аўтар гэтых шаржаў, “навуковае выданне” не паведамляе.
[image]

Гарадзенскі цудатворны абраз Багародзіцы (Сьв. Тройца і

Багародзіца). З кнігі Яна Дрэўса “Methodus peregrinationis menstruae Marianae ad imagines Deiparae Virginis per ditiones regni Poloniae et M. Ducatus Lituaniae…” — Vilnae: Typis Academicis, [1684].
Большасць паказаных асобаў зрабілі важкі ўнёсак у культуру (пра Ганну Наўгародскую і Харыціну Літоўскую нічога сказаць не можам: бракуе інфармацыі), аднак навукова абгрунтаваных крытэрыяў уключэння гістарычных дзеячоў у шэраг “Падзвіжнікаў” Алена Яскевіч не прапануе. Чытач мусіць сам меркаваць, чаму, напрыклад, Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч падзвіжнікам з’яўляецца, а Мікалай Радзівіл Сіротка (аўтар “Падарожжа ў Святую Зямлю”, арганізатар тапаграфічных працаў, заказчык і фундатар мапы Вялікага Княства Літоўскага — самай дакладнай еўрапейскай мапы мяжы XVI—XVII стагоддзяў, будаўнік Нясвіжскага замка, збіральнік адмысловай бібліятэкі etc.etc.) — не падзвіжнік. Як і шматлікія іншыя не згаданыя дзеячы сярэдневяковай беларускай культуры. Безумоўнае дасягненне аўтаркі і выдавецтва — распрацоўка новага тыпу кнігі: беларускі чытач нарэшце можа пазнаёміцца з хрысціянскай (у дадзеным выпадку пераважна праваслаўнай) іканаграфіяй не маўкліва-альбомным спосабам, а з разгорнутым каментарыем, апісаннем сюжэтаў і гісторыі іканаграфічных тыпаў, тут вельмі да месца каляндар ушанавання цудадзейных беларускіх абразоў. Хай знаёмства гэта не поўнае, тым не менш, у кнізе прысутнічаюць выявы 152 абразу, з іх 111 — багародзічныя. У сваім захапленні гэтым матэрыялам А. Яскевіч заходзіць часам вельмі далёка: *“… Асноўнае, што пакінулі Збаўца Хрыстос і Багародзіца і явілі нам пасля Свайго Успення, — гэта цудадзейныя іх іконы…”* (с.263). Аўтар гэтых радкоў — не тэолаг — заўсёды асноўным лічыў зробленыя евангелістамі запісы Слова Божага. Адказнае (і вельмі спрэчнае) цверджанне А.Яскевіч патрабуе нейкага тлумачэння. Звернем увагу і на тое, што большасць паказаных у кнізе абразоў — рэпрадукцыі іконаў расійскага пісьма XIX і XX стагоддзяў, г.зн. спісы, якіх не маглі бачыць (і маліцца на іх) не толькі падзвіжнікі, але і ніякія насельнікі старажытнай Беларусі. Парушаны вельмі важны навуковы прынцып — прынцып гістарызму: для апісання рэалій аднае эпохі выкарыстаны творы іншай эпохі.

[image]

Наваградзкі цудатворны абраз Багародзіцы (з гербам Лебедзь). З кнігі Methodus peregrinationis menstruae Marianae proposita a p. Ioanne Drews Societatis Iesu, anno M. DC. LXXXIV. — Vilnae: Typis Academicis, [1684].
Царква шануе кожны спіс абраза, і, хаця прызнаецца цудадзейная сіла канкрэтнай іконы, слава кожнага іканаграфічнага тыпу распаўсюджваецца на ўсе спісы. Перад аўтаркай працы пра абразы-святыні ў сувязі з гэтым паўстала няпростая задача: вырашыць, якія спісы паказваць чытачу, апавядаючы пра культуру часоў Вялікага Княства Літоўскага. Алена Яскевіч праблемы гэтай у тэксце не акрэсліла, а на практыцы абрала шлях кампрамісу: у шэрагу выпадкаў паказаны самыя старыя спісы шанаваных іконаў, калі-нікалі — больш познія, часта — найноўшыя. Такі падыход часам выдаецца адзіна магчымым (як, напрыклад, для абраза Еўфрасінні Полацкай, ранняя іканаграфія якога невядомая, альбо новых абразоў кшталту іконы праведнага Іаана Кармянскага ці Сабору беларускіх святых), але часам выклікае пратэст. Здавалася б, больш лагічна надрукаваць старажытныя выявы цудадзейных Купяціцкай, Наваградскай і Жыровіцкай іконаў, тым больш што апошняя знаходзіцца ў Беларусі, а атрымаць рэпрадукцыі першых дзвюх не вымагае асаблівага старання. Замест гэтага Алена Яскевіч чамусьці прапануе чытачу нейкі абгрызак выявы Наваградскага абраза, а Купяціцкі і Жыровіцкі — у сучасных і не найлепшых спісах.
[image]

Жыровіцкі цудатворны абраз Багародзіцы. З кнігі Яна Дрэўса “Methodus peregrinationis menstruae Marianae ad imagines Deiparae Virginis per ditiones regni Poloniae et M. Ducatus Lituaniae…” — Vilnae: Typis Academicis, [1684].
Абразы з выявай Багародзіцы займаюць асаблівае месца ў культуры Вялікага Княства Літоўскага. Трапяткія адносіны да Маці Божай уласцівыя і рыма-каталікам, і ўніятам, і праваслаўным. Вобраз заступніцы з’яўляецца на гравюрах старадрукаў і ў мініяцюрах рукапісаў, у кнігах агульнага зместу (як, напрыклад, у “Svada latina” Яна Дамейкавіча Астроўскага) і ў шматлікіх выданнях, што спецыяльна

прысвечаны Багародзіцы. Адным з першых такіх выданняў стала кніга Іаана Дрэўса “Спосаб паломніцтва” (“Methodus peregrinationi menstruae Marianae”), якая выйшла з друкарні віленскага ўніверсітэту ў 1684 годзе. Тут пададзены выявы абразоў, па адным на кожны месяц, у тым ліку: на травень — віленская св. Міхала (цяпер гэты абраз знаходзіцца ў Віленскай кафедры, у капліцы Гаштольдаў; цудадзейным яго прызнала камісія, якую стварыў у 1699 г. біскуп Аляксандр Сапега), чэрвень — троцкая ў Літве, ліпень — жыровіцкая ў Літве, жнівень — наваградская ў Літве (у тым самым годзе была выдадзеная і асобная кніга Дрэўса пра гісторыю гэтай іконы з медытацыямі да яе), снежань — у тэксце надрукавана малітва да холмскай Багародзіцы ў Русі (Чырвонай), але гравюра была зроблена з абраза ў Сэйнах, у Літве, у гарадзенскім дыстрыкце. Кніга Алены Яскевіч пра гэтае выданне не ўспамінае.
У некаторых выпадках недапіскі ў кнізе Алены Яскевіч выглядаюць як няведанне альбо наўмыснае ігнараванне аўтаркай старажытнай беларускай спадчыны. Так, апавядаецца, што ікона “Памнажэнне розуму”, якая знаходзіцца ў Спаса-Праабражэнскім храме Рыбінску на Яраслаўшчыне, пашырана ў храмах Беларусі (с.54). Нібыта і не трэба казаць пра тое, што ікона гэтага тыпу ў Беларусі асацыюецца перш за ўсё з Сапегамі: цудатворны яе спіс з першай паловы XVII стагоддзя да сёння захоўваецца ў родавым маёнтку Сапегаў Кодні (за 15 км ад Берасця, на левым беразе Буга), і графічная выява гэтага абраза змешчана ў славутым сапегаўскім выданні “Svada latina”. Пра Коданскі абраз у кнізе згадваецца (с.220): аўтарка паведамляе, што гэтая ікона (напісаная, паводле падання, св. Аўгусцінам) была здабыта ў Гвадэлупе (Іспанія). Мікалай Сапега выкрадае святыню ў папы Урбана VIII, а ў 1635 г. пасля пакаяння просіць пакінуць святыню ў Кодні. З 1927 г. абраз знаходзіцца ў Коданскім касцёле. Але, здаецца, А.Яскевіч не ўяўляе, што ў двух месцах сваёй кнігі гаворыць пра адзін і той самы іканаграфічны тып (навуковыя рэдактары таксама на гэта не звярнулі ўвагі). Не паведамляе аўтарка і пра тое, што шматлікія пакаленні студэнтаў Віленскага ўніверсітэту ад XVI ст. шанавалі ва ўніверсітэцкім касцёле Св. Яна ікону, якой яны ж і далі назву “Памнажэнне розуму”. Чытач кнігі А.Яскевіч мусіць пасля ўсяго верыць байцы аб прыбыцці ў Беларусь гэтай (даўно тут шанаванай) іконы з *“г. Рыбінска на Яраслаўшчыне”*.

[image]

Троцкі цудатворны абраз Багародзіцы. З кнігі Methodus peregrinationis menstruae Marianae proposita a p. Ioanne Drews Societatis Iesu, anno M. DC. LXXXIV. — Vilnae: Typis Academicis, [1684].

Занадта часта, на жаль, тэкст і ілюстрацыі знаходзяцца ў супярэчнасці. Характэрны прыклад — выява абраза “Раство Хрыстова” і суправаджальны тэкст на развароце сс. 256—257. Спачатку, гледзячы на ікону “Раство Хрыстова”, можна толькі пашкадаваць, што Алена Яскевіч не паказала-такі кранальна-непаўторнага абраза нацыянальнай беларускай школы з гэтым сюжэтам, створанага ў 1649 г. майстрам Пятром Яўсеевічам з Галынца, — фрагмент яго нават вынесены на супервокладку альбому “Жывапіс Беларусі XII—XVIII стагоддзяў”, — а аддае перавагу іконе позняга пісьма (XIX—XX ст.) работы невядомага расійскага мастака. Аднак найгорш тое, што ў суправаджальным тэксце напісана: *“На ніжняй частцы іконы сядзіць Іосіф, якога спакушае нячысты дух у абліччы пастуха, апранутага ў авечую скуру…”*. На выяве абраза на суседняй старонцы такога няма! Лагоднае ягнятка каля ног Багародзіцы ніяк не цягне на нячыстага духа.

Мы ўжо адзначылі той факт, што чытанне кнігі — справа ў вялікай ступені эмацыйная. Хіба не найбольшыя эмоцыі выклікае паведамленне пра тое, што *“ў час працы над прадмоваю да кнігі “Песня песняў” у празрыстым сне Францыску Скарыне з’явілася ікона Божай Маці “Выхаванне”* (с.64). Вось дзе да месца была б спасылка на крыніцу сведчання аб тым празрыстым сне, ды яшчэ з дакладнай назвай абраза — гэта ж новае слова ў скарыназнаўстве! Усе магчымыя дакументальныя звесткі пра беларускага першадрукара сабраныя і апублікаваныя, але ў іх няма звестак аб “блакітным сне” ні ад самога Францыска, ні ад ягоных сучаснікаў. Ствараецца ўражанне, што гэта быў сон не Францыска Скарыны, а паважанай аўтаркі. Урэшце, права развязаць гэту праблему пакінем выдавецтву “Полымя” і людзям, якія спрычыніліся да падрыхтоўкі кнігі.

А бласлаўленне на выхад “навуковага выдання” ў свет далі два навуковыя рэдактары і два тытулаваныя рэцэнзенты, якія не

палічылі гэтай сентэнцыі, як і іншых падобных у тэксце кнігі, лухтой. Доктара мастацтвазнаўчых навук А.І.Паламарчука і доктара філасофскіх навук І.Д.Шамырова “Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі” не ўспамінае, а новае выданне агульнай “Беларускай энцыклапедыі” да літараў “П” і “Ш” яшчэ не дайшло. Ніводнай кнігі Паламарчука і Шамырова не знайшлося ў каталогу Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, дзе працуе аўтар гэтых радкоў. Для нас яны засталіся персонамі інкогніта. Затое навуковыя рэдактары — асобы вядомыя: філосаф Уладзімір Пятровіч Вялічка яшчэ ў “добрыя” брэжнеўскія часы напісаў кнігу пра арганізацыю партыйнай працы па сацыялістычным спаборніцтве (яна кранальна называлася “Каштоўнае пачуццё”), цяпер ён галоўны рэдактар часопісу “Беларуская думка”. Выпускнік гістфаку гарадзенскага педінстытуту Мікалай Паўлавіч Касцюк добра вядомы як даследчык сялянскага пытання ў Заходняй Беларусі. Цяпер яны абодва — акадэмікі і смела ўзяліся за навуковае рэдагаванне кнігі па гісторыі іканапіснага мастацтва і царквы, нават і шырэй — па старажытнай беларускай культуры. Навуковыя рэдактары павінны былі б дапамагчы падкрэсліць аўтарскія знаходкі і дасягненні, зняць альбо ўдакладніць памылковыя тэзы, максімальна карэктна сфармуляваць спрэчныя і гіпатэтычныя пытанні. І толькі потым запісаць свае імёны і тытулы на адвароце тытульнага аркуша кнігі Алены Яскевіч. Вялікі гонар для маладой аўтаркі. Прынамсі ў нас, у Пецярбургу, выдаць кнігу пад рэдакцыяй акадэміка Ліхачова было гонарам для аўтара. А для чытача гэта значыла, што Ліхачоў, калі нават і не згодны з аўтарам, адказвае за навуковасць усяго, што напісана.
Тым часам, у кнізе А. Яскевіч шмат загадак. Напрыклад, здагадайцеся, што такое *“этнічнароднасныя землі”* ў дачыненні да шматнацыянальнай Беларусі. Аўтарка патрапіла напісаць аб іх як пра рэч трывіяльную і чытачу сакрэту не патлумачыла. Ці дапаможа тут досвед яе навуковага рэдактара У.Вялічкі — сказаць цяжка.
[image]

“Прыбаўленьне розуму” — віленскі цудатворны абраз Багародзіцы з універсытэцкага касьцёлу Сьв. Яна. З кнігі: Methodus peregrinationis menstruae Marianae ad imagines

Deiparae Virginis per ditiones regni Poloniae et M. Ducatus Lituaniae, miraculis celebriores pro publicis privatisque necessitatibus sine fatigatione, fructuose tamen, instituendae/ proposita a p. Ioanne Drews Societatis Iesu, anno M. DC. LXXXIV. — Vilnae: Typis Academicis, [1684].
[image]

Прыбаўленьне розуму. Кодэнскі (Гвадэлупскі) цудатворны абраз Багародзіцы. З кнігі Яна Дамейкавіча Астроўскага “Svada latina” (ёсьць традыцыя лічыць сапраўдным аўтарам Яна Фрыдэрыка Сапегу).
“Чаму прападобнамучанік Афанасій Брэсцкі дорыць аднапляменнаму Міхаілу, сыну патрыярха Філарэта і ігуменні Марфы, першаму цару дынастыі Раманавых Купяціцкую ікону-крыж?” — задае пытанне Алена Яскевіч (с.258). Але ў цікаўнага чытача можа паўстаць іншае пытанне: як атрымалася дзіця ў патрыярха і манахіні? Ці першы цар з дынастыі Раманавых нарадзіўся ад беззаганнага зачацця, ці патрыярх з ігуменняй парушылі зарокі, ці аўтарка проста некарэктна апавядае ўсю гісторыю? Двухсэнсоўныя намёкі Алены Яскевіч не прыцягваюць увагі навуковага рэдактара-гісторыка Мікалая Касцюка. Не рэагуе ён і на частае дыстанцыяванне аўтаркі ад зместу фразамі *“на думку гісторыкаў Царквы”* (с.164 і інш.), *“на думку даследчыкаў”* (с.305 і інш.), а часцей за ўсё гэта не названыя гісторыкі царквы і невядомыя “даследчыкі”.
“Сталічныя” навуковыя рэдактары лёгка прапускаюць у тэксце выдатны ўзор “местачковай” вучонасці: *“Вынікам магутнага міжнароднага аўтарытэту Усяслава Полацкага стаўся і яго трывалы палітычны саюз з братам Ізяславам…”* (с.303). Сапраўды, які ж саюз з родным братам без магутнага міжнароднага аўтарытэту!
Жаданне пісаць “па-вучонаму” прыводзіць да дзіўных “навуковых” паведамленняў, на гэты раз адносна Пажайскай іконы: *“Святыя шаты Багародзіцы і кароны-венчыкі Яе і Дзіцяткі Хрыста зроблены з металічнай масы”* (с.285). І што ж гэта за рэчыва такое — металічная маса?
Аўтарка вылучае два варыянты Страсной іконы Божай Маці: праваслаўны (с.282) і каталіцкі (с.283), але па якіх крытэрыях вылучае — не гаворыць. На самай справе няма каталіцкіх і праваслаўных абразоў Багародзіцы, ёсць абразы, напісаныя ў

іканапіснай (грэцкай, расійскай, беларускай) традыцыі, ёсць абразы, напісаныя пад уплывам мастацтва Рэнесансу, ёсць сучасныя абразы. Канкрэтна каталіцкімі ці праваслаўнымі абразамі, як падаецца, можна называць толькі іконы тых святых аднае царквы, якіх не кананізавала (альбо не прызнала) другая. Аднак ці варта дзяліць (пароўну ці па-брацку, але абавязкова "з мондрым відам") іканаграфічныя багародзічныя тыпы на іх канфесійныя варыянты, як, напрыклад, гэта зроблена з іконай Ляснянскай Багародзіцы, што таксама засталося без тлумачэння (с.220)?

Міфалагічнасць мыслення Алены Яскевіч характарызуецца самымі нязмушанымі пераходамі ў часе і прасторы. Напрыклад, апавядаецца, як у XV стагоддзі туркі разбураюць у Канстанцінопалі хрысціянскі храм, а ў наступным абзацы такі выдатны пасаж: *"Усё ж з часам, калі і сам турэцкі султан стаў патаемным хрысціянінам і сябраю вернікаў, была збудавана невялічкая царква, але і яна ў 1828 годзе была зруйнаваная…"* (с.276). Прабачым аўтарцы граматычную форму *"сябраю"*, моўчкі прапусцім імклівы пералёт з XV стагоддзя ў 1828 год — у гэтым пасажы нас найбольш хвалюе тое, што рэцэнзент — акадэмік НАН Беларусі спадар Касцюк — прагне славы ўсходазнаўца: маўляў, хай свет даведаецца з адрэдагаванай ім кніжкі пра султана — патаемнага хрысціяніна! М.Касцюку, гісторыку, не рэжа вока і "гістарычны пасаж" Алены Яскевіч пра ягоную родную Навагрудчыну: *"Мошчы прападобнага Елісея абаранілі ў 1505 годзе ваколіцы Навагрудка ад татараў, калі на манастырскім двары з'явілася адмысловая ангельская конніца, яны таксама праславіліся ацаленнямі псіхічнахворых"* (с.122). Якая *"ангельская конніца"*, адкуль? Усю глыбіню і "навуковасць" дадзенага фрагменту можна ацаніць, параўнаўшы тэкст Алены Яскевіч з першакрыніцай — летапісным аповедам: *"…Царевичи [татарскія — **М.Н.**] отступивши от Слуцка пошли до Новгородка, а на той час в Новгородку все панове сеймовали, которые видечи же зле, выехали з Новогродка за Немен, а татаре за ними гонили. Взявше перше Новгородок, запалили его…"*. А новае слова Алены Яскевіч, цяпер ужо ў расійскай гісторыі, пад рэдакцыяй таго ж акадэміка Касцюка: *"Расійскія імператрыцы XVIII—XIX стагоддзяў мелі імя па-бацьку Фёдараўна… [што] яшчэ раз пераконвае ў глыбіні пранікнення беларускага рэлігійнага ўплыву*

ў расійскія этнагенезісныя карані” (с.215). Пасля гэтага мы маем права запытаць ў кандыдата навук А.Яскевіч і акадэміка М.Касцюка: а калі цяперашні прэзідэнт Расіі — па бацьку Ўладзіміравіч, гэта чый рэлігійны ўплыў на расійскі этнагенезіс?

Філосаф і журналіст Уладзімір Вялічка не міргнуўшы вокам прачытаў пра ікону, што знаходзілася ў манастыры *“на востраве ля Ладажскага возера ў ваколіцах Пецярбурга”* (с.237). Хаця дасведчаны журналіст мог бы звярнуць увагу на тыповы стылістычны “ляп”: востраў — ля возера! Аб тым, што Каневецкі манастыр на востраве ў Ладажскім возеры не трэба называць Канеўскім, Уладзімір Вялічка таксама мог бы сказаць. А калі не ведаў, навошта браўся за навуковае рэдагаванне? Ці, можа, акадэмікі М.Касцюк і У.Вялічка лічаць навуковае рэдагаванне не працай, а проста “візавай падтрымкай”? Сярод шматлікіх навастворaных акадэміяў Нацыянальная акадэмія навук Беларусі вылучаецца. Яна старэйшая. Яе закладалі, у ёй працавалі выдатныя людзі. Тут фармулююцца шляхі выхаду з цяжкага крызісу нашых дзён. Крызісу не толькі і нават не столькі эканамічнага, колькі ідэйнага і культурнага. Аднак які тут выхад, калі “маршал” Мікалай Касцюк, рэдагуючы іншую кнігу — “Памяць. Навагрудскі раён”, дапускае, што назва “Наваградак” у адным выданні падаецца ў чатырох (!) розных варыянтах напісання, сярод шматлікіх ілюстрацыяў няма ніводнае мапы ні Наваградскага павета, ні ваяводства, а гісторыя гораду і краю ў XVIII стагоддзі ўвогуле не згадваецца. Напачатку здавалася, што гэта проста некалькі недахопаў і адсутнасць пазіцыі. Цяпер бачыцца іначай: гэта пазіцыя, якая спрыяе працягу гуманітарнага крызісу сучаснасці, што праяўляецца між іншым у выцясненні гісторыі Беларусі з магістральнага шляху навукі (з навуковым апаратам, адмысловай метадалогіяй, спадчынай гістарыяграфіі, дапаможнымі дысцыплінамі) у краязнаўства і далей — у мастацкую міфатворчасць. У тую прастору, дзе скарынаўскі пераклад нараджаецца ў празрыстым сне, гісторыю расказвае знаёмы краязнаўца, а дакументаванасць фактаў і аргументаванасць словаў настолькі неабавязковая, што на гэта не звяртаецца ніякай увагі. “Навуковае рэдагаванне” кнігі Алены Яскевіч — відавочны крок у гэтым кірунку.

А што ж сказаць самой аўтарцы? Вельмі паказальны адзін з адказаў Алены Яскевіч газеце “Голас Радзімы”: яна расказвае, як часам выпадае начамі не спаць, рыхтуючы адразу некалькі сваіх кніг. Для пісьменніцтва ўжо дастаткова. Але для навукоўца трэба найперш быць уважлівым чытачом чужых кніг і аналізаваць іх. Гэта абавязак. На жаль, навуковыя рэдактары ні самі не сталі, ні аўтарцы не парэкамендавалі спачатку пазнаёміцца з літаратурай, якая прысвечана абразам увогуле, і беларускім у тым ліку. Аднак жа гістарыяграфія пытання — абавязковы пачатак усякае навуковае працы. Грэх не скарыстаць з назапашаных ведаў. Пры рэалізацыі такога вялікага праекту добра было б узгадаць і пра саборнасць у навуцы — паклікаць на рэдактараў і рэцэнзентаў людзей дасведчаных: Аляксандра Ярашэвіча, Надзею Высоцкую, Васіля Пуцка, Марыю Ткачэнка, Юрыя Піскуна. А ўжо як прыдаўся б досвед замежных беларусаў-вучоных — таго ж прафесара Антона Мірановіча з Беластоку! І не бяда (а можа, нават добра), што яны розных спавяданняў і пагонаў акадэмікаў не носяць. Яны — знаўцы і навукоўцы найвышэйшага на сёння ўзроўню. На жаль, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі не змагла зрабіць такога важнага (і, напэўна, нятаннага) выдавецкага праекту сваіх супрацоўнікаў (аўтаркі і навуковага рэдактара) агульнанацыянальным дасягненнем. Спадзяёмся, што гэта няўдача часовая і беларуская Акадэмія навук яшчэ не здэвальвавала так, як абясцэнілася банкнота Беларускага банку з выявай яе галоўнага будынку.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Сямён Букчын

У пошуках беларускай ідэі

Сергей Дубавец. Русская книга. — Менск: БГАКЦ, 1998.

Пошук Беларусі, яе сапраўднага вобразу, характару, гісторыі і будучыні ідзе даўно. Тут магчымыя розныя пункты адліку. Можна зьвяртацца да часоў, калі былі выдадзены Статут Вялікага Княства Літоўскага і “Біблія” Францішка Скарыны. Можна прыгадаць горкія словы з прадмовы да “Дудкі беларускай” Францішка Багушэвіча: *“не пакідайце, каб ня ўмёрлі”*. Гэта ўжо 90-я гады XIX стагодзьдзя. А потым — Янка Купала зь яго надрыўным “*людзьмі звацца*” і Максім Багдановіч з рамантычнай, хвалюючай сэрца “Пагоняй”.

Пошук Беларусі, яе адслаеньне ад расійскіх і польскіх культурна-гістарычных традыцыяў — гэтыя працэсы з рознай хуткасьцю ішлі і ў савецкую эпоху. Больш актыўна — у часы так званай “беларусізацыі” 20-х гадоў, калі ўзьнікла вера, што нацыянальную Беларусь можна пабудаваць на бальшавіцкім падмурку. Нацыянальная інтэлігенцыя, у тым ліку й тая, што паверыла ў гэтую пэрспэктыву і вярнулася з эміграцыі, дорага заплаціла за гэтую ілюзію. Амаль уся яна была зьнішчана,

СЯМЁН БУКЧЫН (нар. 1941) — літаратуразнаўца, публіцыст. Дасьледчык беларуска-расейскіх літаратурных сувязяў. Аўтар кнігі “Польскі дзёньнік” (“Энцыклапедыкс”, 2002). У “ARCHE” № 6-2001 была надрукаваная тутарка Сямёна Букчына з Сакратам Яновічам.

загінула ў сталінскіх вязьніцах і лягерах. Па сутнасьці, народ застаўся без духоўных настаўнікаў. Тым ня менш, пошук Беларусі не спыніўся. У вайну беларускія нацыяналісты спрабавалі абраць трэці шлях і, чакаючы, пакуль Сталін і Гітлер зломяць адзін адному галовы, усё-ткі знаходзіліся на службе ў Трэцяга райху ды, у заплату за дазвол акупацыйнай улады на нацыянальнаую самаарганізацыю, выконвалі яе крывавыя загады ня толькі “адносна бальшавікоў і жыдоў”, але й супляменьнікаў-беларусаў, насельнікаў спаленых вёсак. Слова “паліцаі”, што выкарыстоўвала пасьляваенная савецкая прапаганда, надоўга легла магутным цяжарам на ўсіх беларускіх незалежнікаў. У гэтай культурнай несамастойнасьці — адна з сутнасных прычынаў кволасьці беларускай нацыянальнай самасьвядомасьці, яе расколатасьці, што дае пра сябе знаць у вырашальныя для краіны і народу гады сувэрэннасьці.

І ўсё-ткі ў апошнія гады (пачынаючы з 80-х) адбывалася фармаваньне абсалютна новай беларускай інтэлектуальнай генэрацыі. Зьявіліся маладыя людзі з эўрапейскай філязофскай вывучкай, з цудоўным веданьнем замежных моваў. Іх пошук Беларусі калі і не адкідваў цалкам звыклую фальклёрна-этнаграфічную лінію папярэднікаў, то найперш спрабаваў абапірацца на эўрапейскі гістарычны, культурны, інтэлектуальны досьвед. Сяргей Дубавец, вядомы літаратурны крытык і публіцыст, які амаль дзесяць год узначальваў узноўленую “Нашу Ніву”, — знакавая фігура гэтай генэрацыі. Скразная лінія ягонай публіцыстыкі — імкненьне выявіць, агаліць, усталяваць каардынаты сапраўды нацыянальнага ў Беларусі, таго нацыянальнага, якое можа, павінна стаць фундамэнтам для будаўніцтва сапраўды свабоднага, дэмакратычнага беларускага грамадзтва і дзяржавы. У гады позьняй перабудовы Дубавец апублікаваў артыкул пад амаль акадэмічнай назвай “Падставы рацыянальнага нацыяналізму”. Гэта была спроба надаць “страшнаму”, традыцыйна “нэгатыўнаму” тэрміну рысы, скажам так, стваральнай актыўнасьці ва ўмовах нацыянальнага спусташэньня, якое адбылося ў Беларусі за гады савецкай улады. Але — на жаль! — ня выйшла ў Беларусі стваральнай актыўнасьці. Выйшаў Лукашэнка з дыктатарскім рэжымам, з выкраданьнем вядомых апазыцыянэраў, з масавым зьбіцьцём і вязьніцамі для

нязгодных, зь нечуваным нават у савецкія гады прыніжэньнем беларускай мовы і культуры.

“Русская книга” Сяргея Дубаўца — гэта спроба адказаць на пытаньне, чаму так атрымалася. Яна, дарэчы, стваралася менавіта з такой задачай. Анатацыя паведамляе, што кніга *“составлена из текстов, написанных автором в середине 90-х для периодических изданий, выходящих на русском языке…*” Ня ведаю, можа быць, аўтар сапраўды кіраваўся менавіта гэтым прынцыпам, але сама кніга (прынамсі, значная частка яе аб’ёму) успрымаецца як рознабаковая трактоўка расійскага фактару і ў далёкай, і ў сучаснай гісторыі Беларусі, пакуль укаранаваная кіраваньнем Лукашэнкі.
Амплітуда разваг С. Дубаўца надзвычай шырокая — ад чыста эмацыйнай эсэістыкі да гістарычнага аналізу з прэтэнзіяй на строгасьць развагаў, што адлюстравалі веру, адчай і нават разгубленасьць аўтара, які шукае найбольш пераканаўчую аргумэнтацыю. У эсэ “Среда и кровь”, якое пачынае кнігу, зь відавочным выклікам гаворыцца: *“Кровь — наша общность. Которая отделит нас от среды*”. Можна ўздрыгнуць ад вельмі блізка наяўных аналёгіяў, калі не прачытаць далей: *“Язык — это кровь наших предков”.* Аўтар не жадае, ня можа быць *“минским русским — голосом среды”*, ён прагне вырвацца з гэтага “*гіблого болота”*. Ён ведае, што *“национализм — хищный зверь”.* Але ён ведае і тое, што *“лучший контроль — свобода”. “Посмотри*, — зьвяртаецца ён да суразмоўцы, — *как все более подконтрольными становятся мои слова. Я как будто обмяк от своих принципиальных признаний”.*
Але за гэтай мяккасьцю, за гэтай больш чым зразумелай інтэлігенцкай рэфлексіяй устае досьвед доўгіх кніжных штудыяў, адчайных спрэчак найперш з самім сабою. “Почему мы не стали русскими” — так называецца артыкул, прысьвечаны разбору даўно забытага, надрукаванага ў 80-я гады XIX стагодзьдзя сачыненьня Н. Ланской “Обрусители. Роман из общественной жизни Западного края”. Высновы аўтара гучаць як прысуд: *“Потому что вместо русской природы, языка, культуры нам предлагались природа, язык и культура чиновнические. Мы, народ, превращались не в русских, а в денационализированных чиновников — вбирая в себя эту психологию, этот тип достоинства и ценностей. Они входили в*

нас не вместо нашей белорусской сути, а лишь потеснив ее, приглушив своим объемом, своей массой. Мы так и не почувствовали ничего русского в себе, называя этим словом лишь цепь своей зависимости от системы, а не пуповину, которая могла бы связывать нас с национальной жизнью соседней страны”.
Можна, вядома, паспрачацца з аўтарам і ўказаць яму на словы Максіма Багдановіча (1916 г.) пра тое, што “*печать русской культуры лежит на духовном творчестве любого народа России, она является для них общей почвой, сближая содержание их культур, их идейных и литературных течений”*. Можна дадаць, што акрамя “культуры чиновничества” прапаноўвалася і іншае — Дастаеўскі, Талстой, Чэхаў...

Але пытаньне ж у іншым: “Почему мы не стали русскими?” Урэшце, праблема ня ў тым, каб лішні раз выкрыць “імпэрскага монстра” ці ўпасьці ў ягоныя братэрскія абдымкі (тут варта мець на ўвазе, што тэме “гістарычных рахункаў” у кнізе прысьвечаныя артыкулы “Семейный спор” і “Братский пепл”, нагодай для напісаньня апошняга сталі перасьледаваньні ўладамі кнігі Ўладзімера Арлова “Рассказы по истории Беларуси для младших школьников”). Для С. Дубаўца значна істотней зразумець нацыянальны шлях як рух да свабоды. Ён так і фармулюе: “*Насколько белорусский путь — это путь к свободе?*” Тут аўтару не ўдалося абысьціся бязь містыкі. Стагодзьдзямі перакочваліся праз краіну хвалі маскоўскай і польскай экспансій, затым саветызацыя-камунізацыя-русіфікацыя, зьнішчана ўсё, у тым ліку “*деревня — космос нации*”. І тым ня менш, “*несколько лет назад белорусы вновь стали появляться на арене событий, начав было исчезать уже окончательно*”. І больш за тое — беларусы ўжо “*несут свободу в своих генах*”. Аўтар, безумоўна, перабірае. Але гэты патас зразумелы — пісалася ж на пачатку 90-х, калі прыйшла, нечакана, як дарунак зь нябёсаў, звалілася сувэрэннасьць, нацыянальнае шчасьце здавалася так блізка...
Але вельмі хутка з-пад рамантычнага ўбраньня беларускай Свабоды стала выглядаць нейкае Нячыстае Рыла, і наш публіцыст адчуў вострую неабходнасьць увасабленьня “*белорусской идеи как идеи лучшего человека*”. На жаль, а можа, і на шчасьце, нічога новага: “*Национальная идея овладевает*

массами, благодаря стремлению каждого человека приобщить себя к элите, к моральному большинству, к сообществу порядочных людей. При этом национальный идеал остается недостижимо высоким”.
Дзе ж гэта шукаць? Аўтар ведае пэўна: “*Поэтому в поисках национального стереотипа порядочности мы, городские, поедем в деревню. В испохабленную председателями-паханами, разграбленную, отселенную. И все-таки еще живую... Не даром ведь так держались за деревню белорусские писатели всех времен. Правда, так и не добились они одного — не создали из деревни святыню, моральный кодекс нации”.*
Мне зусім не падабаецца вядомая фармулёўка пра “ідыятызм вясковага жыцьця”. Але, далібог, вельмі дзіўны гэты патрыярхальны заклік аўтара, які наважыўся аспрэчыць крэда беларускай нацыі — верш Янкі Купалы “А хто там ідзе?” Мабыць, упершыню ў Беларусі сказана, што знакаміты радок *“Людзьмі звацца”* не зьмяшчае “Задачи и Выхода”. Аспрэчаны й сам заклік: *“А что, мы и так не люди*?”
Вёска як асяродак нацыянальнага духу? Нічога ня маю супраць, бо хто ж ня ведае, што *“ўсе мы з хат...”*

Але ці не адтуль, ці ня зь вёскі той выбітны дэмагог, што вось ужо восем год душыць Беларусь? Ці не яна, вёска, цёмная і забітая, як і дзьвесьце гадоў таму, дае яму галасы і рэйтынгі? Напэўна, аўтар меў на ўвазе іншую вёску, нейкія, кажучы ягонымі словамі, *“уцелевшие гнезда человечности”*. Але не яны — на жаль — вызначаюць сёньня рух стрэлкі палітычнага баромэтру ў Беларусі. Зрэшты, аўтар і сам разумее гэта, таму й накочваецца пэсымістычная хваля: *“Поэтому ничто никуда не движется, и все только ждут: кто внешнего воздействия, кто провидения, кто окончательного крушения экономики, например”*. І як не зразумець, як не падзяліць гэтай аўтарскай горычы: *“Жаль этих дней и лет, посвященных всеобщему ожиданию. Жаль жизни — большой и малой, которая не складывается, потому что нет под нею твердой основы. Нет принципов”.*
Але тым даражэйшы пошук саміх прыцыпаў. Адзін з найважнейшых для аўтара — у сьвяткаваньні 25 сакавіка Дня Волі. *“Начало республики”*. Дзень, які *“будет отмечаться всегда, независимо от того, утвердит его очередная власть или*

нет”. І, як гэта заўсёды бывае ў жыцьці, расчараванасьць, стомленасьць, сум зьмяняюцца надзеяй. Аўтар бачыць, што новы этап нацыянальнага адраджэньня зьвязаны з *“открытым противостоянием режиму”*. Шматтысячны Марш Свабоды ўвосень 1999 г. у Менску — жывое таму пацьверджаньне. Сама ж улада Лукашэнкі, пераканаы С. Дубавец, гэта ня больш чым *“дань недалекому прошлому, с которым психологически трудно распрощаться”*. Так, разьвітаньне, відавочна, зацягнулася. Але яно ідзе. І тая ж урэшце згалелая вёска ўжо ня так адназначна ўспрымае свайго куміра й дабрадзейніка. І само жыцьцё вакол, досьвед такой блізкай аўтару “Русской книги” Літвы (артыкул “Вильня — Wilno — Vilnius”) пераконваюць: беларуская цемра павінна разьвеяцца. Хаця гэты аптымізм не выключае іншых складанасьцей, якія штодня ўзьнікаюць у сёньняшнім сьвеце. Натуральна, усё не адбудзецца само сабой. Беларус мусіць дзейнічаць. А гэта значыць, што пошук беларускага шляху, беларускай ідэі будзе працягвацца.

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Чалавек – інтэгр 2002
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Уладзімер Калупаеў

Глабалізацыя і валютна-эканамічныя інтарэсы Беларусі

УЛАДЗІМЕР КАЛУПАЕЎ (нар. 1975) — супрацоўнік Навукова-дасьледчага эканамічнага інстытуту Міністэрства эканомікі. Аўтар дысэртацыі па мэханізьме валютнага рэгуляваньня ў Беларусі (2002).

Глабалізацыя сусветнай эканомікі, у тым ліку адна з яе распаўсюджаных формаў — міждзяржаўная інтэграцыя, — гэта аб'ектыўны працэс, які звязаны з развіццём і ўкараненнем новых тэхналогіяў. Акурат ён штурхае краіны да такога шчыльнага супрацоўніцтва, нягледзячы на тое, што пераразмеркаванне выгадаў часцей за ўсё адбываецца на карысць багатых краін. Любы эканамічны і валютны саюз мае пад сабой найперш палітычны падмурак, дзе кожны з удзельнікаў адстойвае перадусім уласныя нацыянальныя эканамічныя інтарэсы. У гэтым сэнсе інтэграцыю нацыянальнай эканомікі ў сусветную гаспадарку можна параўнаць з гульнёй, у якой трэба максімізаваць выгады і мінімізаваць выдаткі.

У Беларусі розныя эліты працягваюць дыскутаваць наконт геапалітычнага і геаэканамічнага выбару краіны. Гэта пры тым,

што практычна ўва ўсіх постсацыялістычных краінах нашага геаграфічнага рэгіёну (Чэхіі, Славаччыне, Вугоршчыне, Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі) такі выбар быў зроблены адназначна. У гэтых краінах не вядзецца дыспутаў што да стратэгіі эканамічнага развіцця і эканамічнай інтэграцыі. Меркаванні разыходзяцца толькі ў тым, з якой хуткасцю трэба ажыццяўляць інтэграцыйныя захады. Эканамічная палітыка гэтых дзяржаваў літаральна “зараджана” ідэяй найхутчэйшага ваканання гаспадарчых паказнікаў, неабходных для ўступлення ў ЕС.

У чым жа рэч? Ці ёсць у беларускім грамадстве рэальныя разыходжанні ў разуменні выгадаў, якія можна атрымаць ад уваходу ў еўрапейскія гаспадарчыя структуры? Чаму афіцыйная пазіцыя нашай краіны настолькі адрозніваецца ад пазіцыі ейных суседзяў? Чым абумоўлена жаданне краін нашага рэгіёну да найхутчэйшага ўступлення ў ЕС?

Аб’ектыўнасць працэсаў міждзяржаўнай валютнай інтэграцыі ў свеце

Ува ўсім свеце назіраецца тэндэнцыя да выкарыстання ў міжнародным абарачэнні стабільных і прадказальных нацыянальных валют. Да прыкладу, у Паўночнай Амерыцы ў межах Пагаднення аб паўночнаамерыканскім свабодным гандлі ЗША, Канада, Мексіка абмяркоўваюць увядзенне амерыканскага даляра ў якасці адзінай валюты рэгіёну; у Лацінскай Амерыцы краіны гандлёвага блоку “Меркасур” (Бразілія, Аргентына, Уругвай, Парагвай, Чылі, Балівія) пастанавілі зблізіць нацыянальныя эканомікі дзеля стварэння супольнага рынку, а ў перспектыве — і адзінай валюты; у Паўднёва-Ўсходняй Азіі краіны АСЕАН (Бруней, Камбоджа, Лаос, Інданезія, Малайзія, М’янма, В’етнам, Тайланд, Філіпіны, Сінгапур) разам з Японіяй, Кітаем і Паўднёвай Карэяй актыўна абмяркоўваюць стварэнне адзінай рынкавай прасторы (магчымае рэгіянальнае ўтварэнне ўжо атрымала назву “Вялікая Ўсходняя Азія”) са сваёй валютай, у якасці якой можа выступіць сінгапурскі даляр, японская іена альбо кітайскі залаты юань; на былой постсавецкай прасторы пяць краін СНД (Расія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан) узважваюць магчымасць стварэння валютнага саюзу з адзінай

валютай. Штуршком для актывізацыі такіх працэсаў у розных рэгіёнах свету стала ўвядзенне адзінай еўрапейскай валюты еўра ў краінах Еўрапейскага валютнага саюзу (далей ЕВС). Сёння выказываецца шмат прагнозаў што да развіцця сусветнай валютнай сістэмы. Напрыклад, канадскі эканаміст Р. Мандэл, які атрымаў Нобелеўскую прэмію ў 1999 г. акурат за распрацоўку тэорыі аптымальных валютных зонаў і лічыцца “хросным бацькам” Еўрапейскага валютнага саюзу, прагназуе, што праз дзесяць гадоў будуць дамінаваць тры асноўныя валюты — еўра, даляр і іена, а ўсе астатнія будуць звязаны з імі праз валютныя рэжымы рознай ступені фіксацыі. Праўда, цяперашняе развіццё японскай эканомікі, якая ніяк не можа пераадолець наступствы валютнага крызісу 1997—1999 гг., найхутчэй сведчыць, што японская іена наўрад ці ў сярэднетэрміновай перспектыве здолее скласці канкурэнцыю еўра і амерыканскаму даляру.

Выказваюцца і больш смелыя прагнозы, а менавіта: стварэнне адзінага сусветнага рынку можа падштурхнуць да наступнага этапу інтэграцыі — гэтым разам паміж рэгіянальнымі эканамічнымі блокамі, напрыклад, Еўрапейскім Саюзам (ЕС), Паўночнаамерыканскім эканамічным блокам (НАФТА), Садружнасцю незалежных дзяржаваў (СНД), Арганізацыяй Азіяцка-ціхаакіянскага эканамічнага супрацоўніцтва (АЦЭС). На найвышэйшым палітычным узроўні ўжо не раз выказвалася ідэя стварэння Еўра-Атлантычнага альянсу паміж двума найбольш развітымі рэгіянальнымі блокамі НАФТА і ЕС. Усё гэта, на думку польскага эканаміста Г. Калодкі, “можа зрабіць тэхнічна магчымым увядзенне адзінай сусветнай валюты” (са стэнаграмы выступу Г. Калодкі 27 траўня 2001 г. у Менскім адукацыйным цэнтры). Ужо нават прапанаваны магчымы варыянт яе назвы — “глобал”. Г. Калодка згадаў пачатак 50-х гадоў XX ст.: “Хто ў тыя часы мог уявіць, што пры канцы XX стагоддзя ў Еўропы будзе адзіная валюта ды што іспанец і фін будуць адной і той самай валютай разлічвацца за тавары? Дык, чаму нельга ўявіць, што праз 50 гадоў на большай частцы свету будуць карыстацца адзінай сусветнай валютай?” (з таго самага выступу).

Такім чынам, для дынамічнага развіцця сучаснай сусветнай эканомікі *патрабуецца стабільная і прадказальная валютная сістэма* (і лягчэй гэтага дасягнуць з меншай колькасцю валют).

Якраз гэта штурхае краіны да ўдзелу ў працэсах міждзяржаўнай палітычнай, эканамічнай, а таксама валютнай інтэграцыі — самай шчыльнай з усіх магчымых формаў. Адна з галоўных яе мэтаў — зберагчы нацыянальную эканоміку ад нестабільнасці, выключыць дыктат з боку іншых сусветных цэнтраў, абараніць сваю маёмасць і тавары ад неэквівалентнага абмену ў выніку дэвальвацыі нацыянальных валют.

Эканамічны механізм атрымання выгадаў ад удзелу ў валютным саюзе

Удзел краін у валютным саюзе дае ім непасрэдныя эканамічныя выгады. Лічыцца, што перадача эмісійных паўнамоцтваў у наднацыянальны орган, а дакладней у Цэнтральны надрэгіянальны банк, дазваляе больш паспяхова змагацца з інфляцыяй, а гэта, у сваю чаргу, вядзе да зніжэння працэнтных ставак па крэдытах. Далей — уваход у кола доўгатэрміновага няспыннага эканамічнага росту: павелічэнне інвестыцыяў — павелічэнне тэмпаў эканамічнага росту і даходаў насельніцтва — павелічэнне збору падаткаў — памяншэнне бюджэтнага дэфіцыту — скарачэнне інфляцыі — далейшае памяншэнне працэнтных ставак па крэдытах і г.д., па новым коле.

Увядзенне еўра стварыла яшчэ адну рэчаіснасць, актуальную для краін, што мяжуюць з Еўрапейскім валютным саюзам: *пры наяўнасці стабільнай рэгіянальнай валюты трэцім краінам, якія знаходзяцца па суседстве, але не ўвайшлі ў валютны саюз, становіцца нявыгадна і немэтазгодна захоўваць надалей сваю нацыянальную валюту.* Да таго ж, чым больш адсталая эканоміка краіны, тым складаней і даражэй падтрымліваць уласную нацыянальную валюту: неабходна траціць валютныя рэзервы для падтрымання стабільнасці абменнага курсу і канверсоўнасці нацыянальнай валюты, але самае галоўнае — не ўдаецца вырашыць праблемы інфляцыі і даводзіцца прытрымлівацца высокіх працэнтных ставак. Усё гэта негатыўна ўплывае на інвестыцыйную актыўнасць і канкурэнтаздольнасць нацыянальнай эканомікі. У дачыненні да нашай краіны гэта азначае, што калі *ў доўгатэрміновай перспектыве еўра стане стабільнай міжнароднай валютай, постсацыялістычным краінам з пераходнай эканомікай, у тым ліку ўсімі еўрапейскімі краінамі СНД, улучна з Беларуссю і Расіяй,*

будзе нявыгадна захоўваць свае нацыянальныя валюты.
Такі стан рэчаў, калі краіны з нязначным эканамічным патэнцыялам, г.зн. удзельнай доляй нацыянальнай эканомікі ў сусветнай вытворчасці і экспарце, актыўна спрабуюць выкарыстоўваць свае не зусім стабільныя і канверсоўныя нацыянальныя валюты для абслугоўвання знешнеэканамічных сувязяў краіны, супярэчыць тэндэнцыям развіцця сусветнай сістэмы міжнародных эканамічных стасункаў. Таму цалкам заканамерна, што толькі каля 10% разлікаў па замежнаэканамічных аперацыях Беларусі ажыццяўляюцца ў беларускіх рублях (у Расіі і іншых краінах СНД вага такіх разлікаў у нацыянальнай валюце мае падобную велічыню). Калі абапірацца на сучасную эканамічную тэорыю і браць пад увагу аб'ектыўнасць працэсу глабалізацыі сусветнай эканомікі (можна параўнаць з працэсам індустрыялізацыі XIX—XX ст.), адна з формаў якога — міждзяржаўная палітычная, эканамічная і валютная інтэграцыя ў розных рэгіёнах свету, вынікае, што *пры пэўных умовах выгадна і мэтазгодна адмовіцца ад правядзення самастойнай грашова-крэдытнай і валютнай палітыкі.*

Выхад "нацыянальнай валюты" з сімвалаў незалежнасці краіны

У эканамічнай навуцы паступова адбываецца трансфармацыя паняцця валютна-эканамічнай бяспекі краіны Усе болей набывае распаўсюджанне меркаванне, што ліквідацыя нацыянальнай валюты не вядзе да страты дзяржаўнага суверэнітэту, а наадварот — мацуе незалежнасць краін валютнага саюзу. Тлумачыцца гэта тым, што дзяржава, будучы саўладальнікам міжнароднай валютна-фінансавай сістэмы і міжнароднай валюты, набывае рэальную эканамічную моц для адстойвання нацыянальных эканамічных інтарэсаў у сусветнай гаспадарцы і здольнасць больш уплываць на працэсы перараэмеркавання сусветных рэсурсаў.
Фінансавая сістэма ўжо даўно ператварылася ў магутны сродак забеспячэння гаспадарчага суверэнітэту і рэалізацыі нацыянальных эканамічных інтарэсаў, таму многія краіны шукаюць усё новыя формы мадэрнізацыі фінансавай сферы.
У краінах з адкрытай эканомікай валютная палітыка даўно ператварылася ў найважнейшы інструмент інтэграцыі

лакальнай эканомікі ў сусветную гаспадарку, а міжнародная валюта разглядаецца як кандэнсаванае спалучэнне нацыянальных эканамічных інтарэсаў розных краінаў, сярод якіх трэба знайсці і адстаяць уласны інтарэс.
Такім чынам, неабходнасць інтэграцыі валютнай сістэмы Беларусі ў сусветную валютную сістэму не выклікае сумневу. Сёння ў ізаляцыі немагчыма дабіцца прагрэсу, бо гэта супярэчыць сучасным глабальным працэсам развіцця гаспадаркі. І краіна, якая стала на такі шлях, паводле трапнага выразу Г. Калодкі, “рызыкуе выпасці з другога свету ў трэці” (тамсама).

Еўрапейскі саюз

Паводле статыстычных звестак па замежным гандлі Беларусі за 1997—99 гг., таваразварот з еўрапейскай часткай Расіі склаў 39%, з ЕС — 14%, з краінамі — асацыянаванымі сябрамі ЕС — 17% (г.зн. з геаграфічнай Еўропай 70%), з сямю прылеглымі да еўрапейскай часткі Расіі абласцямі — 16%. На ўвесь астатні свет, у тым ліку такія сусветныя эканамічныя блокі, як ЗША і паўднёва-ўсходнюю Азію, прыпадае толькі каля 14% ад агульнага аб’ёму замежнага гандлю. Яшчэ адна цікавая акалічнасць: нягледзячы на ўсю ідэалагічную рыторыку, таваразварот з Таджыкістанам, Кыргызстанам (удзельнікамі супольнай мытнай прасторы), Лівіяй, Аб’яднанымі Арабскімі Эміратамі, Кубай блізіцца да нуля. У дзесятку найбуйнейшых замежнагандлёвых партнёраў Беларусі апошнімі гадамі трывала ўваходзяць еўрапейская частка Расіі, Украіна, Нямеччына, Польшча, Латвія, Літва, Італія, Нідэрланды, ЗША. Такім чынам, пераважная бальшыня замежнага гандлю Беларусі прыпадае на геаграфічную Еўропу.
Фармаванне ля межаў Беларусі адзінай еўрапейскай эканамічнай і валютнай прасторы, у якую паступова ўцягваюцца краіны нашага рэгіёну, стварае прынцыпова новы геапалітычны і валютна-эканамічны расклад. Расце ўзаемазалежнасць эканомік не толькі ў межах ЕС, але і Еўропы ў цэлым, і ў большай ці меншай ступені яна закране і еўрапейскія краіны СНД. Еўрапейскі саюз — гэта не толькі ёмісты і разліказдольны рынак высакаякасных тавараў і паслуг, але і найважнейшая крыніца інвестыцыйных, крэдытных

рэсурсаў, высокіх тэхналогіяў, сучаснага менеджменту і культуры гаспадарання.
У еўрапейскіх краін СНД, у тым ліку і ў Расіі, калі сапраўды ў іхных нацыянальных эканамічных інтарэсах стварэнне ўмоваў для паляпшэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва, няма іншай альтэрнатывы, як паступовае адкрыццё эканомікі, паэтапная інтэграцыя ў магутны міждзяржаўны палітычны, эканамічны і валютны блок — Еўрапейскі саюз.
З іншага боку, уступленне ў ЕС і ЕВС нават у сярэднетэрміновай перспектыве для еўрапейскіх краін СНД, у тым ліку Беларусі і Расіі, немагчыма з шэрагу аб'ектыўных прычын: праз істотнае адставанне на ўзроўні эканамічнага развіцця (гл. табл. 2), незавершанасць рынкавай трансфармацыі эканомікі, недастатковае развіццё дэмакратычных інстытутаў і палітычнай сістэмы, моцную далярызацыю нацыянальных эканомік, няўстойлівасць нацыянальных валют, нізкую вагу таваразвароту з краінамі ЕС (гл. тамсама), недастатковую гнуткасць рынку працы.

* * *

Рэальны змест любога саюзу залежыць непасрэдна ад інтарэсаў яго краін-удзельніц. Трэба толькі ўдакладніць, чые гэта інтарэсы: элітаў альбо насельніцтва (асабліва часта яны адрозніваюцца ў краінах з няўстойлівай дэмакратыяй). Дыскусія наконт выбару стратэгічнага кірунку інтэграцыі для Беларусі перайшлі ў іншую якасць — у дыскусію паміж рознымі элітамі, якія пры гэтым адстойваюць уласныя інтарэсы. Калі ж падыходзіць да гэтага пытання з пункту гледжання нацыянальных эканамічных інтарэсаў*, спрэчных момантаў тут няма, бо інтарэсы Беларусі — і ў Расіі, і ў Еўропе. І калі ў Расіі яны адстойваюцца даволі добра, то пра Еўрапу такога сказаць нельга.

Артыкул выкананы дзякуючы падтрымцы фундацыі імя Сцяпана Батуры (Польшча).

*

Пад
нацыянальнымі

эканамічнымі
інтарэсамі ў
эканамічнай
тэорыі прынята
разумець
забеспячэнне і
падтрыманне
развіцця
нацыянальнай
эканомікі дзеля
павышэння
ўзроўню жыцця
і задавальнення
патрэбаў
насельніцтва
гэтай краіны
праз
павелічэнне
канкурэнтаздольнасці
нацыянальнай
эканомікі ва
ўмовах
глабалізацыі
сусветнай
эканомікі,
знікнення
нацыянальных
межаў,
перыядычных
рэгіянальных
эканамічных
крызісах.

[image]
[image]

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

СЯРГЕЙ ЗАПРУДЗКІ (нар. 1957) — мовазнаўца, кандыдат філялягічных навук. Выкладае ў БДУ. Аўтар працы “Правапісныя рэформы ў славянскіх літаратурных мовах у XX стагодзьдзі” (БДУ, 1998).

Сяргей Запрудзкі

Моўная палітыка ў Беларусі ў 1990-я гады

Рэспубліка Беларусь часткова ўспадкавала моўную палітыку апошняга году існавання БССР, якая тады ў значнай ступені вызначалася прынятым у студзені 1990 году “Законам БССР аб мовах у Беларускай ССР”. У 2-м артыкуле закону беларуская мова абвяшчалася адзінай дзяржаўнай у Беларусі, расійская мова кваліфікавалася ў законе як *“мова міжнацыянальных зносін народаў Саюзу ССР”*. Закон не рэгламентаваў ужывання моў у неафіцыйных зносінах. Розныя артыкулы закону меліся ўводзіцца ў жыццё паступова, на працягу 3—10 гадоў. Прыняцце ў Беларусі ў 1990 годзе закону аб мовах трэба разглядаць і як уплыў знешніх чыннікаў, і як значную перамогу дэмакратычнай апазіцыі.

Закон 1990 году быў прыняты пасля працяглага перыяду заняпаду беларускай мовы, які доўжыўся ў 30—80-х гадах, таму яго трэба разглядаць у межах заканадаўства, арыентаванага на абарону слабейшых моў. Разам з тым, закон

прадугледжваў вельмі значнае пашырэнне сфераў ужывання беларускай мовы, што, як меркавалася, у перспектыве павінна было б прывесці да ператварэння беларускамоўнай меншасці ў беларускамоўную большасць.
Заканадаўства ў моўнай галіне і звязаныя з ім несхаваныя, адкрытыя грамадству практычныя захады ва ўмовах постсавецкай Беларусі былі новай сферай у дзейнасці дзяржаўных інстытутаў. Не існавала спецыяльных органаў для выпрацоўкі і рэалізацыі моўнай палітыкі, таму на самым першым этапе выканаўчая ўлада палічыла магчымым выкарыстаць інтэлектуальныя рэсурсы грамадскай арганізацыі, якая мела пэўны багаж ведаў у гэтай галіне, — Таварыства беларускай мовы (ТБМ), заснаванага ў чэрвені 1989 году. Так, у траўні 1990 году ТБМ сумесна з Міністэрствам народнай адукацыі БССР правяло навукова-практычную канферэнцыю “Дзяржаўнасць беларускай мовы: праблемы і шляхі ажыццяўлення”. У верасні 1990 году пастановай Савету Міністраў была зацверджана “Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у БССР”, якая прадугледжвала правядзенне ў 1990—2000 гадах комплексу мерапрыемстваў, скіраваных на выкананне Закону.
Калі ва ўмовах БССР і СССР абмеркаванне моўных праблем у Беларусі знаходзілася пад партыйным кантролем, то з распадам СССР, абвяшчэннем Рэспублікі Беларусі і часовым прыпыненнем дзейнасці КПСС—КПБ значна павялічыліся магчымасці свабоднага волевыяўлення. Знікненне з карты свету колішняй супердзяржавы і ўзнікненне незалежнай беларускай дзяржавы выклікала пратэст у значнай частцы расійскакультурнага насельніцтва Беларусі, якое ў значнай ступені фармавала эліты беларускага грамадства. Гэтае насельніцтва яшчэ нядаўна ідэнтыфікавала сябе выключна ў межах Савецкага Саюза і не мела патрэбы сутыкацца з беларускай мовай і культурай. У новай сітуацыі гэтыя людзі сталі аспрэчваць абгрунтаванасць існага моўнага заканадаўства, імкнучыся дыскрэдытаваць як тэндэнцыі новай моўнай практыкі, так і грамадска-палітычныя сілы, якія стаялі за яе ўвядзеннем.

Са з’яўленнем у Беларусі шматпартыйнай сістэмы моўная праблематыка стала істотным складнікам палітычнага

дыскурсу. Сярод дзеячаў дэмакратычнай арыентацыі ў гэты час ўзнікла вострая канкурэнцыя за права выступаць ад імя “сапраўдных” дэмакратаў. У выніку на палітычнай карце Беларусі сталі ўзнікаць шматлікія эфемерныя аб’яднанні дэмакратычнай арыентацыі, якія сталі шукаць сваю нішу. Так, напрыклад, нягледзячы на існаванне Аб’яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (скарочана — АДПБ; гэта першая палітычная партыя ў Беларусі, утворана ў лістападзе 1990 году), у лістападзе 1991 году ўзнік Рух за дэмакратычныя рэформы ў Беларусі (скарочана — ДДР, ад рас. “Движение за демократические реформы”), праграма якога адрознівалася ад праграмы АДПБ толькі ў культурнай частцы. Такім чынам, галоўным плацдармам для дэманстрацыі ўласных дэмакратычных поглядаў для дзеячаў ДДР непазбежна стала новая культурная палітыка. ДДР стаў гучна крытыкаваць прынятае ў 1990 годзе моўнае заканадаўства за недэмакратычнасць і абвінавачваць адну з галоўных тагачасных дэмакратычных сіл Беларусі, БНФ, у бальшавізме, русафобіі, ізаляцыянізме, у *“раздувании низменных националистических инстинктов”*. У сакавіку 1992 году ДДР выказаўся за наданне дзяржаўнага статусу беларускай і расійскай мовам *“в соответствии со сложившейся языковой ситуацией, за свободный выбор гражданами языка обучения”* (Народная газета. 1992. 7 сакавіка). Апелюючы да існай моўнай сітуацыі, ДДР замест перспектыўнай прапанаваў рэтраспектыўную моўную палітыку, скіраваную на вяртанне ранейшага становішча. Зыходзячы з уяўнай *“антидемократичности и антилиберальности”* прынятага ў 1990 годзе Закону аб мовах, з таго, што гэты закон *“попирает права личности на самоопределение”* (Фемида. 1993. 24—30 мая), вясной 1993 году члены ДДР сумесна з выдавецкай фірмай “Эридан” падрыхтавалі і апублікавалі законапраект “О языках в Республике Беларусь”, у якім прапаноўвалі прызнаць дзяржаўны статус за беларускай і расійскай мовамі.
Рух, які адбываўся ў стане “ліберальсцкіх” партый, змусіў і Аб’яднаную дэмакратычную партыю Беларусі ўдакладніць свае адносіны да дзяржаўнага моўнага рэгулявання. У лістападзе 1994 году Цэнтральная рада АДПБ даручыла сваёй палітычнай камісіі падрыхтаваць заяву аб магчымасці рэалізацыі права выбіраць мову навучання і аб недапушчальнасці яе навязвання.

У праграму Аб’яднанай грамадзянскай партыі (узнікла ў кастрычніку 1995 году ў выніку зліцця АДПБ і Грамадзянскай партыі) быў унесены запіс пра неабходнасць даваць грамадзянам *“права выбіраць мову выхавання і навучання сваіх дзяцей”*. Паколькі рэалізацыя безумоўнага права бацькоў вызначаць мову навучання для сваіх дзяцей нярэдка вядзе да выбару той мовы, якая мае рэальныя сацыяльныя перавагі, пастолькі ў дадзеным выпадку можна казаць, што “слабая” і менш прэстыжная беларуская мова пры такім падыходзе непазбежна мела стаць ахвярай пашырэння дэмакратыі ў Беларусі.

Актыўныя працэсы адбываліся ў першай палове 90-х гадоў і ў лагеры левых партый. Калі на зыходзе 80-х гадоў КПБ праз Вярхоўны Савет БССР змушана падтрымала заканадаўства, якое прадугледжвала прызнанне за беларускай мовай статусу адзінай дзяржаўнай, то пасля ўнутранай перабудовы ў сваіх шэрагах яна вярнулася на ранейшыя пазіцыі. З пачатку 90-х гадоў у газетах — органах левых партый стала весціся актыўная прапаганда, скіраваная на дыскрэдытацыю існага моўнага заканадаўства і практыкі правядзення яго ў жыццё. Дзяржаўнае дзвюхмоўе з’яўлялася абавязковым пунктам праграм Руху за дэмакратыю, сацыяльны прагрэс і справядлівасць (ДСПС, ад рас. Движение за демократию, социальный прогресс и справедливость), заснаванага ў лістападзе 1991 году, і Народнага руху Беларусі (узнік у снежні 1992 году). У верасні 1993 году адбыўся кангрэс народаў Беларусі, які аб’ядноўваў левыя і прарасійскія сілы. На ім была прынята рэзалюцыя з патрабаваннем *“исключить насилие и дискриминацию в языковой политике, перейти на официальное двуязычие (белорусское и русское)… узаконить преимущество воли родителей в определении языка обучения ребенка”*.

Вострая дыскусія пра абгрунтаванасць прынятага заканадаўства і правільнасць правядзення яго ў жыццё разгарнулася ў сродках масавай інфармацыі. З аднаго боку, гэтая дыскусія паказала, што пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы патрабуе больш мэтанакіраваных і сканцэнтраваных намаганняў, чым тыя, якія ўжывала ў тыя гады дзяржаўная ўлада. Так, са спецыфічнымі складанасцямі сутыкнулася прасоўванне беларускай мовы ў сферы вышэйшай адукацыі і дакладных навук, дзе востра адчуваўся недахоп

навучальнай і навуковай літаратуры на беларускай мове. З іншага боку, дыскусія выявіла, што ў Беларусі ёсць людзі, якія катэгарычна не прызнаюць існавання самастойнай беларускай мовы і, больш за тое, не ўхваляюць любых практычных крокаў, скіраваных на яе развіццё. Пераважна людзі з поглядамі на беларускую мову як на непаўнавартую сталі рэсурсам для стварэння ў Беларусі прарасійскай партыі "Славянский собор "Белая Русь" (утворана ў жніўні 1992 году). У прынятай у снежні 1993 году праграме Славянскага сабору беларуская мова кваліфікавалася толькі як "региональная", як складовая частка расійскай мовы.

Больш ці менш рэгулярна дыскусіі пра беларускую і іншыя мовы ў першай палове 90-х адбываліся і ў беларускім парламенце. Варта адзначыць, што ў цэлым Вярхоўны Савет 12 склікання (распачаў працу ў траўні 1990 году, 86 % яго дэпутатаў складалі камуністы) не быў схільны займаць больш-менш актыўную пазіцыю на карысць пашырэння ўжывання беларускай мовы. Тым не менш, пад уплывам абвяшчэння суверэнітэту Беларусі, паступовай дэманапалізацыі партыйнай улады і часовага прыпынення ў жніўні 1991 году дзейнасці КПСС—КПБ камуністычныя сілы ў парламенце былі змушаны саступіць перад дамаганнямі нешматлікіх нацыянал-дэмакратаў. У выніку ў чэрвені і кастрычніку 1991 году ў Беларусі былі прыняты "Закон аб культуры" і "Закон аб адукацыі", якія або непасрэдна спасылаліся на "Закон аб мовах" (першы выпадак), або нават трохі ўмацоўвалі зафіксаваныя ў законе 1990 году нормы (другі выпадак). Аднак па меры зменаў вакол Беларусі (звязаных з перамогай былых камуністаў на выбарах у Літве і ростам супраціву рэформам прэзідэнта Ельцына ў Расіі), аслаблення ў парламенце ўплыву БНФ, пасля аднаўлення летам 1992 году дзейнасці КПБ і скасавання ў лютым 1993 году Вярхоўным Саветам сваёй ранейшай забароны на яе дзейнасць сітуацыя стала змяняцца. У першай палове 1992 году з былой наменклатуры ў Вярхоўным Савеце была сфармаваная група "Беларусь", якая ў сваёй барацьбе з дэмакратычнымі і незалежніцкімі ініцыятывамі дэпутатаў ад БНФ выкарыстоўвала, сярод іншага, слабасць пазіцый нацыянал-дэмакратаў у пытаннях мовы. Так, напрыклад, калі ў траўні

1992 году тагачасны старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч адмовіўся парафіраваць пагадненне аб калектыўнай бяспецы з Расіяй, то блок “Беларусь” паспяхова шантажаваў яго магчымым будучым рэферэндумам, на які мела выносіцца і пытанне аб дзяржаўнасці расійскай мовы. Паступова ў сценах Вярхоўнага Савета сталі гучаць прапановы аб неабходнасці надання дзяржаўнага статусу расійскай мове поруч з беларускай — першымі такія прапановы выказалі ў канцы 1992 году дэпутаты, абраныя ў Вярхоўны Савет ад ветэранскіх арганізацый.

Моўныя праблемы актыўна абмяркоўваліся ў парламенце ў 1993 годзе ў сувязі з падрыхтоўкай новай Канстытуцыі. Група па выпрацоўцы Канстытуцыі ў Вярхоўным Савеце прапаноўвала захаваць ранейшую рэдакцыю моўнага артыкула, аднак пры яго абмеркаванні ў траўні 1993 году яна не была прынята, як не была прынята і ніводная альтэрнатыўная прапанова. Падчас абмеркавання гэтага ж пытання на восеньскай сесіі Вярхоўнага Савету ў 1993 годзе канстытуцыйны артыкул, у якім замацоўвалася дзяржаўнасць толькі беларускай мовы, сабраў яшчэ меншую колькасць галасоў, чым гэта было на вясновай сесіі. Страціўшы надзею правесці праз Вярхоўны Савет моўны артыкул, у сакавіку 1994 году парламенцкая канстытуцыйная камісія зрабіла спробу выключыць гэты артыкул з Канстытуцыі ўвогуле, аднак супраць гэтага катэгарычна запярэчыла камісія Вярхоўнага Савету па культуры і гістарычнай спадчыне.

Выкананне Закону аб мовах на практыцы сутыкнулася са значнымі цяжкасцямі. Новая моўная палітыка стала рэалізоўвацца адначасова з правядзеннем эканамічнай рэформы, якая, сярод іншага, мела вынікам значнае пагаршэнне ўзроўню жыцця і вельмі неадназначна ўспрымалася насельніцтвам. Некаторыя грамадзяне з ліку былых “прававерных” ідэалагічных работнікаў звязвалі (магчыма, несвядома) новую, ідэйна “варожую” ім эканамічную перабудову жыцця з гэткай жа новай моўнай палітыкай, скіраванай на стварэнне пераваг для беларускай мовы, што змушала іх ставіцца да новых павеваў у моўным жыцці Беларусі выключна агрэсіўна.

Найбольш падрыхтаванай для рэалізацыі закону аказалася сістэма адукацыі, і на працягу 1990—1994 гадоў у сярэдняй школе сітуацыя моцна змянілася. Была ўведзена 10-працэнтная

надбаўка да зарплаты настаўнікам беларускай мовы. Плыні з выкладаннем на беларускай мове сталі з'яўляцца і ў вышэйшых навучальных установах, а некаторыя педагагічныя ўстановы цалкам перайшлі на выкладанне на беларускай мове. Між тым, гучныя публічныя заклікі да рэвізіі моўнага закону, невыразнасць і хісткасць палітычнай сітуацыі ў першыя гады беларускай незалежнасці, недахоп ва ўрада выразнай волі праводзіць моўную рэформу і, як вынік, недавер з боку грамадзян да сур'ёзнасці намераў дзяржавы ў гэтай справе, агульная атмасфера татальнай зменлівасці, уласцівая пачатку 90-х гадоў, спрычыняліся да развіцця моцнага дзяржаўна-прававога нігілізму і адмоўна адбіваліся на выкананні закону 1990 году. Не верачы ў раптоўна здабытую незалежнасць, не ведаючы, у які бок у любую хвіліну можа павярнуцца палітычны ківач, многія дзяржаўныя чыноўнікі лічылі за лепшае не рабіць якіх-небудзь заўважных крокаў дзеля рэалізацыі Закону аб мовах, што давала магчымасць захаваць устойлівасць у выпадку верагоднай "адмены" дзяржаўнай незалежнасці і рэстаўрацыі савецкай палітычнай сістэмы. Найвышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі даволі індыферэнтна ставіліся да неабходнасці выконваць моўны закон; пераважная большасць іх у сваіх публічных выступах карысталася толькі расійскай мовай.

Пэўную ролю ў складанасці рэалізацыі моўнага заканадаўства ў Беларусі адыгрывала тая акалічнасць, што прыняты ў 1990 годзе моўны закон у пэўнай ступені не столькі ўвасабляў сабой рэальныя нормы права, колькі з'яўляўся *"маніфестам нацыянальна-моўнай самасвядомасці"* (Н. Мячкоўская).

У прыватнасці, закон не прадугледжваў ніякіх нормаў адказнасці за парушэнні моўнага заканадаўства. Заклапочаны дрэнным выкананнем закону, у пачатку 1993 году Менскі гарадскі савет звярнуўся з хадайніцтвам у Вярхоўны Савет, каб той дазволіў патрабаваць адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне гэтага закону, аднак станоўчага адказу не атрымаў. Нягледзячы на тое што закон уключаў спецыяльны артыкул, у якім разглядаліся абавязкі службовых асоб *"валодаць беларускай і расійскай мовамі"*, ніякіх канкрэтных захадаў дзеля выканання гэтага артыкула ўчынена не было. Фактычна ніякай атэстацыі кіруючых работнікаў адносна валодання імі беларускай мовай не праводзілася. Пасля

прыняцця закону ў 1990 годзе ў Беларусі не было створана ніякіх структур, якія спецыяльна займаліся б пытаннямі моўнай палітыкі. У сакавіку 1993 году III з'езд Таварыства беларускай мовы звярнуўся ў прэзідыум ВС з прапановай стварыць пры прэзідыуме камісію па ажыццяўленні адзінай моўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусі. Гэта прапанова таксама падтрымана не была.

Тым не менш, падчас прыняцця ў сакавіку 1994 году новай беларускай Канстытуцыі артыкул аб дзяржаўнасці беларускай мовы быў у ёй зафіксаваны, аднак у ім жа агаворвалася права *"свабоднага карыстання расійскай мовай як мовай міжнацыянальных зносін"*. Гэта фармулёўка была амаль цалкам перанесена ў Канстытуцыю з заканадаўства 1990 году, аднак тут мы маем справу не з простым дубляваннем, як можа здацца, паколькі ў 1990 годзе расійскай мове не прыпісваўся статус мовы-пасрэдніцы ў зносінах паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцяў унутры Беларусі. Замацаванне за расійскай мовай у Беларусі статусу мовы міжнацыянальных зносін міжволі дэвальвавала статус беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай. У такой сітуацыі натуральным чынам паўставала пытанне: ці папраўдзе беларуская мова можа выконваць функцыі адзінай дзяржаўнай, калі кансалідоўная (інтэграцыйная) функцыя мовы міжнацыянальных зносін у межах дзяржавы аддадзена не ёй?
Калі наданне расійскай мове статусу мовы міжнацыянальных зносін падрывала статус беларускай мовы хутчэй сімвалічна, то значна большую праблему стварыў запіс у 50-м артыкуле Канстытуцыі аб гарантыях *"у адпаведнасці з законам свабоды выбару мовы выхавання і навучання"*. Ён, як і фармулёўка пра расійскую мову ў якасці мовы міжнацыянальных зносін, відавочна, з'явіўся ў Канстытуцыі ў адказ на дыскусіі папярэдніх гадоў. Пазней, апелюючы да гэтага артыкула Канстытуцыі, некаторыя бацькі сталі катэгарычна патрабаваць безумоўнай рэалізацыі права выбіраць мову навучання для сваіх дзяцей.
Тым не менш, у студзені 1995 году патрабаванні некаторых бацькоў забяспечваць права на выбар мовы навучання фактычна былі падтрыманы Канстытуцыйным судом. У сваім пасланні прэзідэнту і Вярхоўнаму Савету Канстытуцыйны суд

крытычна выказаўся пра 24-ы артыкул Закону аб мовах, які нібыта абавязваў праводзіць навучальную і выхаваўчую работу ў агульнаадукацыйных школах *“толькі на беларускай мове”*.
З іншага боку, Канстытуцыйны суд ухвальна выказаўся пра іншыя артыкулы Канстытуцыі, якія, паводле суда, гарантавалі *“свабоду выбару мовы выхавання і навучання”* (Звязда. 1995. 2 лютага).
Моцную падтрымку прыхільнікі дзяржаўнага дзвюхмоўя атрымалі ў ліпені 1994 году ў асобе першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Яшчэ будучы шараговым дэпутатам, А. Лукашэнка прапаноўваў замацаваць у канстытуцыі за расійскай мовай *“статус, равный государственному”*. У прэзідэнцкай праграме Лукашэнкі быў пункт, які датычыўся *“обеспечения реальной возможности каждому гражданину Республики Беларусь думать и говорить на том языке, на котором он воспитан”*. Стаўшы прэзідэнтам, А. Лукашэнка ўпершыню закрануў моўную тэму, выступаючы 1 верасня 1994 году ў Беларускім педагагічным універсітэце. Прэзідэнт узяў пад абарону выкладчыкаў грамадскіх навук і расійскай мовы, якія, паводле ягоных слоў, у некаторых ВНУ сталі *“едва ли не изгоями”*. А. Лукашэнка вельмі крытычна, у карыкатурнай форме абмаляваў палітыку апошніх гадоў у сістэме адукацыі, скіраваную на пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы, і сказаў, што мова выкладання не павінна вызначацца адміністрацыйным шляхам.
Выступленне А. Лукашэнкі ў Педагагічным універсітэце з’явілася сігналам для актывізацыі кампаніі за садзейнічанне расійскай мове. Ужо 6 верасня ў Віцебскім педагагічным інстытуце стаў распаўсюджвацца “Зварот ініцыятыўнай групы”, у якім яго аўтары, выкладчыкі, *“поддерживая намерения Президента Республики начать оздоровление социальной обстановки”*, запатрабавалі, каб мова выкладання выбіралася студэнтамі і выкладчыкамі. У верасні і кастрычніку 1994 году бацькі ў асобных школах правялі забастоўкі супраць “гвалтоўнага” беларускамоўнага навучання. Гэтыя падзеі старанна асвятляліся некаторымі найбольш тыражнымі дзяржаўнымі газетамі.
Цікавым момантам у дзеяннях прыхільнікаў надання расійскай мове дзяржаўнага статусу ўвосень 1994 году з’явілася спроба групы грамадзян з пракамуністычнага Народнага руху

ініцыяваць рэферэндум, на які мела б выносіцца і моўнае пытанне. Заява гэтай групы аб ініцыяванні рэферэндуму была разгледжана ў шасці парламенцкіх камісіях і ў Міністэрстве юстыцыі. Усе яны, як паведамлялася ў друку, зрабілі *“прыблізна аднолькавую матывіроўку адмовы ў правядзенні рэферэндуму”*. Грунтуючыся на атрыманых заключэннях і спасылаючыся на арт. 3 Закону аб рэферэндуме, згодна з якім на рэферэндум забаранялася выносіць пытанні, якія *“парушаюць неад’емнае права народа Рэспублікі Беларусі на дзяржаўныя гарантыі існавання беларускай нацыянальнай культуры і мовы”*, у кастрычніку 1994 году Цэнтральная камісія па выбарах і рэферэндумах растлумачыла падаўцам заявы, што пытанне аб наданні расійскай мове дзяржаўнага статусу *“прама забаронена заканадаўствам рэспублікі”*.
Напярэдадні зімы 1994 году пад эгідай Славянскага сабору ў Беларусі быў створаны камітэт “За свободный выбор языка обучения”, які 29 лістапада вывеў да будынку Мінскага гарадскога савета каля двух дзесяткаў бацькоў, што патрабавалі навучання на расійскай мове. Сюжэт пра гэты пратэст з адпаведнымі каментарамі быў паказаны ў навінах па нацыянальным тэлебачанні.

Сітуацыя, якая склалася ў гэты час з выкананнем Закону аб мовах, а таксама кампанія па рэвізіі моўнага заканадаўства выклікалі шматлікія пратэсты з боку ангажаваных арганізацый і партый тыпу ТБМ і БНФ. У канцы 1994 году быў створаны Грамадскі камітэт абароны беларускай мовы, вялася контркампанія за поўны пераход БДУ на беларускую мову да 1 верасня 1995 году. У студзені 1995 году актывісты камітэта пікетавалі будынкі БДУ і Міністэрства адукацыі, Канстытуцыйнага суда і прадстаўніцтва ААН. У студзені ж камітэт абароны мовы прыняў заяву, у якой заклікаў грамадзян *“паведамляць пра ўсе факты спробаў парушаць статус дзяржаўнасці беларускай мовы з боку дзяржаўных чыноўнікаў у пракуратуру”*; 16 лютага 1995 году камітэт абароны мовы апублікаваў свой зварот да генеральнага пракурора Беларусі са скаргай на прэзідэнта А. Лукашэнку.
Між тым, 2 лютага на сустрэчы з прадстаўнікамі ветэранскіх арганізацый А. Лукашэнка паведаміў аб сваім намеры правесці рэферэндум па пытанні дзяржаўнасці беларускай мовы і 20

лютага пацвердзіў свой намер. 18 сакавіка быў апублікаваны адрасаваны прэзідэнту Лукашэнку ліст 73-х дэпутатаў Вярхоўнага Савету (у значнай частцы абраных у Вярхоўны Савет ад ветэранскіх арганізацый), у якім яны звярталіся да яго з просьбай ініцыяваць правядзенне рэферэндуму па мове. 21 сакавіка А. Лукашэнка дэталёва гаварыў пра будучы плебісцыт на сесіі Вярхоўнага Савету, хоць яшчэ і не меў у той момант дакладна сфармуляваных пытанняў для будучага рэферэндуму. У гэты час многія, падобна, лічылі правядзенне такога рэферэндуму малаімаверным, бо ў кастрычніку 1994 году спроба ініцыяваць падобны плебісцыт была адхілена Цэнтральнай камісіяй па выбарах і рэферэндумах. Між іншым, пра малаімавернасць падобнага плебісцыту 22 сакавіка гаварыў на сваёй прэс-канферэнцыі выконваючы абавязкі старшыні Канстытуцыйнага суда Валерый Ціхіня, спасылаючыся пры гэтым на артыкул 3 Закону аб рэферэндуме. 21 сакавіка агульны сход аддзялення гуманітарных навук Акадэміі навук Беларусі прыняў пастанову, у якой выказаўся супраць вынясення на рэферэндум моўнага пытання.

Тым не менш, А. Лукашэнка ўнёс у Вярхоўны Савет сваю прапанову аб ініцыяванні рэферэндуму з чатырох пытанняў, якая, аднак, пасля разгляду ў парламенцкіх камісіях да 11 красавіка была адхілена па трох пунктах, у тым ліку і па моўным. У адказ прэзідэнт прыгразіў Вярхоўнаму Савету, што ён правядзе рэферэндум без яго санкцыі. Тады больш за два дзесяткі дэпутатаў абвясцілі галадоўку-пратэст непасрэдна ў зале пасяджэнняў парламенту. Уначы 12 красавіка гэтыя дэпутаты былі прымусова выкінуты з будынку Вярхоўнага Савету ваенізаванымі падраздзяленнямі па загадзе прэзідэнта А. Лукашэнкі. Толькі пасля неардынарных падзей дэмаралізаваныя дэпутаты 13 красавіка прынялі з парушэннем працэдуры пастанову аб правядзенні рэферэндуму. Да 26 красавіка камісія Вярхоўнага Савету па культуры і гістарычнай спадчыне звярнулася ў Канстытуцыйны суд з просьбай разгледзець на прадмет законнасці пастанову Вярхоўнага Савету ад 13 красавіка наконт правядзення рэферэндуму, аднак Канстытуцыйны суд адмовіўся разглядаць гэту справу.

14 траўня 1995 году ў Беларусі быў праведзены рэферэндум, на які былі вынесены 4 пытанні. Першае выглядала так: *“Ці згодны Вы з наданнем расійскай мове роўнага статусу з беларускай?”*.

Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, у галасаванні ўзялі ўдзел 64,8 % грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у галасаванні. 88,3 % з іх, або 53,9 % ад колькасці ўсіх выбаршчыкаў, выказаліся ў падтрымку моўнага пункта плебісцыту. У працэсе падрыхтоўкі і правядзення рэферэндуму быў зафіксаваны шэраг парушэнняў.
Найперш, быў парушаны арт. 3 Закону аб рэферэндуме, які, як вядома, забараняў праводзіць плебісцыт на такую тэму. Згодна з арт. 148 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі, не дазвалялася змяняць або дапаўняць Канстытуцыю на працягу апошніх шасці месяцаў паўнамоцтваў парламенту.
Пры ўтварэнні камісій па рэферэндуме былі парушаны нормы артыкулаў 18 і 20 Закону аб рэферэндуме ў частцы спосабу фармавання камісій.
На вядзенне агітацыі супраць вынесеных на рэферэндум прапаноў накладаліся істотныя абмежаванні. Рэферэндум праводзіўся пад пільным кантролем выканаўчай улады, у дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, асабліва электронных, падаваліся пераважна патрэбныя ініцыятару рэферэндуму погляды. Таварыства беларускай мовы напярэдадні рэферэндуму двойчы звярталася да кіраўніцтва Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі з просьбай прадаставіць эфір, а адзін з намеснікаў старшыні Таварыства даў інтэрв'ю для другой праграмы Беларускага радыё. Інтэрв'ю было знятае з эфіру. У той жа час на тэлеэкране раз-пораз з'яўляліся актывісты Славянскага сабору і камітэта "За свободный выбор языка обучения".
Рэферэндум 1995 году быў сумешчаны з кампаніяй па выбарах у Вярхоўны Савет. За выбарамі і рэферэндумам назірала дэлегацыя Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая зрабіла вывад, што выбары і рэферэндум 1995 году ў Беларусі не адпавядалі ўсім міжнародным нормам свабоднага і справядлівага галасавання. У прыватнасці, адзначаліся кантроль з боку ўрада Беларусі за сродкамі масавай інфармацыі (што прыводзіла да недахопу або скажэння інфармацыі), умяшанне выканаўчай галіны ўлады ў выбарчы працэс, падаўленне дзейнасці палітычных партый і інш. Спецыяльную заяву наконт праведзеных у Беларусі ў траўні 1995 году выбараў і рэферэндуму зрабіў Дзярждэпартамент ЗША, у якой было выказана шкадаванне з

нагоды таго, *“якім чынам і ў якой абстаноўцы кіраўніцтва Беларусі правяло выбары і рэферэндум”*.

Беларускае грамадства, якое перажывала падчас правядзення рэферэндуму эканамічныя нягоды, не змагло, а часткова і не захацела ўбачыць за казуістычнай фармулёўкай пытання рэферэндуму аб “роўнасці” моў пагрозу дыскрымінацыі сваёй мовы. Выявілася, што ініцыятыва Лукашэнкі адпавядае жаданням значнай часткі грамадства, якая прагнула вяртання “добрага старога” камуністычнага часу, пры якім у крамах была танная каўбаса і “не існавала” моўных праблем. З дапамогай плебісцыту прэзідэнт Беларусі хацеў атрымаць грамадскую падтрымку свайго асабістага перакананння ў тым, што *“беларуская мова бедная і пры яе дапамозе немагчыма выказаць што-небудзь вялікае”*. Менавіта такую думку выказаў А. Лукашэнка, выступаючы ў Гомелі перад дэпутатамі мясцовага савета.
Вынікі рэферэндуму 1995 году выклікалі шок у прыхільнікаў пашырэння сфераў ужывання беларускай мовы. Толькі праз паўтара месяца пасля плебісцыту сакратарыят ТБМ прыняў зварот да грамадзян Беларусі, у якім аспрэчваў вынікі рэферэндуму ў якасці паўнавартаснага волевыяўлення ўсяго беларускага народу. Аўтары звароту спасылаліся на няўлічаныя галасы *“людзей новай генерацыі — нашых дзяцей, падлеткаў, якія ў беларускіх садках і школах адчулі смак роднага слова”*, на волевыяўленне *“шматлікіх пакаленняў нашых продкаў”* і *“мільёны ахвяр сталінізму і фашызму”*. Адначасова ў звароце прызнавалася: *“Нас цяпер растапталі”*.
Рэагуючы на вынікі рэферэндуму і жадаючы хоць трохі ўратаваць сітуацыю, камісія Вярхоўнага Савету па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны ў чэрвені 1995 году прыняла дзве пастановы. У першай камісія рэкамендавала міністэрствам і ведамствам ажыццявіць комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на тое, каб супрацоўнікі дзяржаўных устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў належным чынам валодалі дзвюма, беларускай і расійскай, мовамі. (Пры гэтым падкрэслівалася, што першачарговую ўвагу трэба звярнуць на вывучэнне той мовы, якой чыноўнікі не валодаюць або валодаюць у аб’ёме, недастатковым для выканання службовых абавязкаў.) У другой пастанове Міністэрству

адукацыі і навукі рэкамендавалася ўвесці для абітурыентаў усіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў абавязковыя экзамены і па беларускай, і па расійскай мове. (Гэта рэкамендацыя фактычна азначала дадатковае ўвядзенне ў пералік абавязковых экзаменаў расійскай мовы, бо беларуская мова ў гэтым пераліку ўжо прысутнічала.) У сітуацыі, калі паўнамоцтвы Вярхоўнага Савету 12 склікання падыходзілі да канца, калі прыхільнікі пашырэння сфераў ужывання беларускай мовы на рэферэндуме пацярпелі паразу, гэтыя дакументы не мелі ніякага юрыдычнага і практычнага значэння. Скіраваны на паніжэнне статусу беларускай мовы, рэферэндум 1995 году праводзіўся, безумоўна, не для таго, каб дзяржаўныя чыноўнікі сталі вывучаць і актыўна выкарыстоўваць беларускую мову. З іншага боку, рэкамендацыя, паводле якой усе абітурыенты, незалежна ад іх будучай спецыяльнасці, мелі здаваць на ўступных экзаменах дзве моўныя дысцыпліны выглядала добрым пажаданнем, ігнаравала спецыфічныя патрэбы абітурыентаў-негуманітарыяў і як такая не мела шанцаў быць падтрыманай.

У заяве II Міжнароднага кангрэсу Беларускага ПЭН-цэнтра (адбыўся ў жніўні 1995 году) з нагоды травеньскага рэферэндуму сцвярджалася: *“На практыцы ўвядзенне расійскай мовы як другой дзяржаўнай будзе замацоўваць рэальнае сёння нераўнапраўе беларускай мовы і будзе спрыяць яе выцясненню, а значыць, будуць працягвацца русіфікацыя і дэнацыяналізацыя беларускага народу, якія праводзіліся ў Расійскай імперыі, а потым у СССР”*. У рэзалюцыі “Аб свабодзе і адказнасці СМІ” кангрэс адзначыў, што *“ў Беларусі свабода слова і друку распаўсюджваецца на адных, пераважна блізкіх да ўладных структур грамадзян, а адказнасць за сказанае, апублікаванае, растыражаванае слова ўскладваецца на іншых, якія ў асноўным належаць да “апазіцыйнай меншасці” ці “беларускамоўнай” часткі насельніцтва”*. У дакументах кангрэсу згадваліся *“рэзервацыі для “беларускамоўных беларусаў”*, стварэнню якіх адкрыў шлях рэферэндум, *“захоп”* уладай *“і падпарадкаванасць масавых выданняў”*. Сам плебісцыт быў кваліфікаваны як праява *“мускульнай дэмакратыі”*, *“падмена дэмакратыі псеўдадэмакратыяй”* (Наша слова. 1995. 1 лістапада).

Калі раней у сваёй практычнай дзейнасці прыхільнікі пашырэння сферы ўжывання беларускай мовы абапіраліся на

“волю народа”, нібыта засведчаную ў дадзеных перапісу насельніцтва, то на плебісцыце ім была прадэманстравана воля “іншага народу” ці, прынамсі, “іншая воля”, згодна з якой беларуская мова мусіла мець здавальняючае становішча толькі фармальна, на паперы. Праблема рэальнага бытавання беларускай мовы, такім чынам, пазбаўлялася статусу актуальнасці. Значэнне гэтага ўроку для беларускай інтэлігенцыі, традыцыйна вельмі моцна падлеглай народніцкім перакананням, цяжка пераацаніць.
Абраны на травеньскіх-снежаньскіх выбарах 1995 году Вярхоўны Савет 13 склікання не меў намеру асабліва старанна займацца моўнымі праблемамі. З аднаго боку, у яго складзе зусім мала аказалася дэпутатаў, якія хацелі ў неспрыяльнай сітуацыі 1995—1996 гадоў ставіць і станоўча вырашаць праблему развіцця беларускай мовы. (У Вярхоўны Савет не быў абраны ніводзін дэпутат ад БНФ.) З іншага боку, пасля рэферэндуму, на якім прыхільнікі мэтанакіраванага і хуткага пашырэння сфераў ужывання беларускай мовы пацярпелі сакрушальную паразу, для трансфармацыі гэтай паразы ў практыку патрабавалася пераважна спыніць дзеянне некаторых ранейшых, скіраваных на падтрымку беларускай мовы праўных актаў. Зрабіць гэта было не вельмі складана.

Дадзеныя аб галасаванні былі апублікаваны ў беларускім друку 26 траўня, а ўжо 30—31 траўня, не чакаючы зацвярджэння матэрыялаў плебісцыту Вярхоўным Саветам, былі прыняты пастанова калегіі і загад Міністэрства адукацыі і навукі, паводле якіх у пералік уступных экзаменаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў дадаткова ўводзіўся экзамен па расійскай мове і літаратуры. Адначасова Міністэрства тлумачыла, што абітурыенты не павінны здаваць экзамены па дзвюх мовах, а маюць спыніць свой выбар на адным.
У чэрвені 1995 году Міністэрства апублікавала тлумачэнні адносна камплектавання першых класаў і груп у дзіцячых дашкольных установах на 1995/96 год, якое цяпер мела ажыццяўляцца зыходзячы з пажаданняў бацькоў. Адміністрацыям школ і дашкольных устаноў прадпісвалася правесці бацькоўскія сходы, на якіх бацькі павінны былі падаць на імя адміністрацый навучальна-выхаваўчых устаноў заявы з

пазнакай пажаданай мовы навучання або выхавання іх дзяцей. Паколькі, як справядліва прадбачылася, такі неабмежаваны выбар мог прыводзіць да ўзнікнення змешаных з пункту гледжання мовы школ, то, зазначалася, *“на пераходны перыяд”* такія школы маглі існаваць. Выказанае ў тлумачэннях Міністэрства правіла аб выбары мовы навучання і выхавання не абмяжоўвалася толькі дашкольнымі ўстановамі і першымі класамі агульнаадукацыйнай школы, але пашыралася таксама на 2—4 класы.

Новая моўная палітыка ў сферы дашкольнага выхавання і школьнай адукацыі вельмі хутка стала прыносіць плён. Усвядоміўшы новую тэндэнцыю, бацькі гарадскіх дзяцей у пераважнай большасці сталі выбіраць для сваіх дзяцей у якасці мовы выхавання і навучання расійскую. Пасля набору школьнікаў на 1995/96 навучальны год на расійскай мове ў Беларусі сталі вучыцца 62 % першакласнікаў (лічба папярэдняга, 1994/95 году складала 25 %), у той час як на беларускай мове — 38 % (у 1994/95 годзе — 75 %). У 1996/97 навучальным годзе колькасць расійскамоўных першакласнікаў выросла да 68 %, колькасць беларускамоўных адпаведна скарацілася да 32 %. Не так імкліва, але таксама даволі хутка стала скарачацца колькасць беларускамоўных вучняў і ў 2—4, і часам нават у старэйшых класах. Бацькі дзяцей, якія вучыліся ў беларускамоўных другіх і старэйшых класах, вельмі чуйна зрэагавалі на перамену сітуацыі: у 1995—1996 гадах яны актыўна патрабавалі пераводу гэтых класаў на расійскую мову навучання, часта не зважаючы на ўжо засвоеныя дзецьмі моўныя звычкі і тэрміналогію. Іх патрабаванні былі задаволены.

Зрухі 1995 году ў моўнай структуры сеткі школьных устаноў суправаджаліся значным абвастрэннем сітуацыі ў асяроддзі бацькоў, а таксама ў адносінах паміж бацькамі, з аднаго боку, і школьнымі адміністрацыямі, з іншага. У новай сітуацыі прыхільнікам беларускамоўнага навучання ў гарадах нярэдка цяжка было сабраць дастатковую колькасць заяў для адкрыцця першых беларускамоўных класаў нават у даволі вялікіх школах, у выніку чаго яны змушаны былі або адмаўляцца ад беларускамоўнага навучання, або шукаць беларускамоўныя школы не ў непасрэднай блізкасці ад дому. Што ж датычыцца навучання ў другім і старэйшых класах, то вельмі пашыранымі

былі выпадкі, калі бацькі якога-небудзь, раней беларускамоўнага класа займалі процілеглыя пазіцыі адносна мовы навучання іх дзяцей. У той час як адны з іх катэгарычна патрабавалі перавесці клас, у якім вучацца іх дзеці, на расійскую мову навучання, іншыя не менш настойліва выказваліся за захаванне *status quo*. Выбар мовы навучання ў такіх выпадках фактычна залежаў ад школьных адміністрацый, якія прымушалі адну частку бацькоў адмовіцца ад сваіх патрабаванняў. Паколькі агульная тэндэнцыя лета—восені 1995 году хілілася да расійскамоўнага навучання, то такія канфліктныя сітуацыі вырашаліся тады пераважна на карысць бацькоў, якія патрабавалі навучання на расійскай мове. У тых выпадках, калі прыхільнікі беларускамоўнага навучання апыналіся ў выразнай меншасці, падобныя канфлікты былі “латэнтнымі”, у значнай ступені схаванымі ад грамадскасці. У такіх выпадках на зусім “законнай” падставе і ў адпаведнасці з правіламі дэмакратыі беларускамоўным дзецям прапаноўвалася пакінуць клас або школу, якія яшчэ нядаўна мелі беларускамоўны статус. Часам некаторым вучням пераходы з адной беларускамоўнай школы ў іншую даводзілася рабіць некалькі разоў, бо і ў новаабраных школах згодна з пажаданнямі бацькоў у якасці мовы навучання ўрэшце таксама ўводзілася расійская мова. Летам 1997 году ў Горадні прайшоў судовы працэс па пазове да мясцовых уладаў аднаго з бацькоў, дачцэ якога пасля заканчэння 5 класа адмовілі ў далейшым навучанні па-беларуску. Працэс скончыўся не на карысць спаганятага. Увогуле, у неспрыяльнай для беларускай мовы грамадскай абстаноўцы першых гадоў пасля рэферэндуму многія скаргі аб парушэннях моўных правоў і свабодаў беларускамоўных грамадзян пад увагу не браліся і судовыя справы па іх не заводзіліся. У некаторых выпадках адміністрацыі школ самі выступалі ініцыятарамі пераводу сваіх беларускамоўных школ на расійскую мову; бацькі навучэнцаў гэтых школ атрымлівалі паведамленні ад школьнага кіраўніцтва аб тым, што яны павінны падаць заявы аб змене моўнага рэжыму.

Імклівае скарачэнне ўвосень 1995 году колькасці беларускамоўных школ і класаў, якое суправаджалася значным адміністрацыйным ціскам, дало падставу выканкаму Аб’яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі прыняць у верасні

1995 году адмысловую заяву, у якой быў выказаны пратэст супраць *“навязвання”* ў школьным навучанні расійскай мовы. У заяве сцвярджалася, што некаторыя чыноўнікі сістэмы адукацыі *“скажона”* інтэрпрэтуюць вынікі рэферэндуму. У дакуменце было выстаўлена патрабаванне, каб права бацькоў навучаць дзяцей на расійскай або беларускай мовах рэалізоўвалася “бесперашкодна”.

Між тым, Вярхоўны Савет 13 склікання не зацвярджаў вынікаў плебісцыту. З аднаго боку, пасля правядзення рэферэндуму паспяховыя наступствы прасоўвання расійскай мовы і скарачэння беларускай былі настолькі відавочнымі, што фактычна яны не мелі патрэбы ў юрыдычным замацаванні. З іншага боку, асобныя кіраўнікі Вярхоўнага Савету выказваліся адносна будучага моўнага рэгулявання спецыфічным чынам, які не супадаў з меркаваннямі прэзідэнта Лукашэнкі. Напрыклад, тагачасны старшыня Вярхоўнага Савету Сямён Шарэцкі не лічыў, што *“безумоўны”* выйгрыш на рэферэндуме *“прарасійскіх”* сілаў трэба зацвярджаць *“аўтаматычна”*, без разгляду. На парламенцкім узроўні юрыдычная рэвізія Закону аб мовах 1990 году адбылася толькі ў чэрвені 1998 году, праз 3 гады пасля правядзення рэферэндуму, калі створанай прэзідэнтам Лукашэнкам у выніку прававога пераваротy 1996 году палатай прадстаўнікоў быў прыняты Закон аб унясенні зменаў і дапаўненняў у закон 1990 году. Структурна закон 1998 году амаль цалкам паўтараў закон 1990 году, аднак у ім адсутнічала прэамбула. (У прэамбуле закону 1990 году была сфармулявана ацэнка крытычнага стану беларускай мовы і была выказана неабходнасць яе аховы.) Галоўнай асаблівасцю рэвізаванага закону ў параўнанні з аналагічным актам 1990 году з’яўляецца тое, што амаль у палове яго артыкулаў беларуская і расійская мовы спалучаюцца размеркавальным злучнікам *або* (артыкулы 3, 9, 12—18, 21, 25, 28—30, 32), амаль гэтак жа шырока ў падобных выпадках у законе выкарыстоўваецца спалучэнне двух злучнікаў: *і* і *або* (артыкулы 7, 8, 10, 11, 19, 20, 22—24, 26, 27, 31). Так, напрыклад, згодна з арт. 14, судаводства ў Рэспубліцы Беларусі мае весціся *“на беларускай або расійскай мове”*, а паводле арт. 20 ва Ўзброеных Сілах ужываюцца *“беларуская і (або) расійская мовы”*. Насуперак дэкларованаму ў

арт. 2 закону дзяржаўнаму статусу беларускай і расійскай моў шырокае выкарыстанне ў тэксце закону размеркавальнага злучніка *або* адкрывае шырокую вуліцу выкарыстанню толькі адной з моў, без абавязковага ўжывання другой. У законе 1998 году свядома была абрана “палітыка адсутнасці палітыкі”, якая, як вядома, вядзе да замацавання моўнага нераўнапраўя і выцяснення слабейшай, у дадзеным выпадку беларускай мовы. Пасля бурных падзей восені 1996 году, калі на ініцыяваным прэзідэнтам Лукашэнкам яшчэ адным рэферэндуме выбарцы падтрымалі праект новай Канстытуцыі (у ім значна пашыраліся паўнамоцтвы прэзідэнта, а ў якасці дзяржаўных фігуравалі дзве, беларуская і расійская мовы), канфлікт паміж А. Лукашэнкам і дэмакратычнымі сіламі Беларусі абвастрыўся яшчэ больш. Пераварот 1996 году дазволіў актывізаваць дзейнасць дзеля стварэння саюзу Беларусі і Расіі, і ў траўні 1997 году быў прыняты статут гэтага саюзу. Згодна з арт. 38 статута рабочай мовай органаў саюзу стала расійская мова. У 1996—1999 гадах дэмакратычныя сілы Беларусі арганізавалі некалькі масавых маніфестацый, скіраваных супраць палітыкі інкарпарацыі Беларусі ў склад Расіі, — падчас правядзення ўсіх гэтых маніфестацый выкарыстоўвалася пераважна беларуская мова. У другой палове 90-х гадоў улада Рэспублікі Беларусі паслядоўна дэманстравала няўвагу і нават пагарду да пытанняў развіцця беларускай мовы і патрэбаў беларускамоўных грамадзян. Сфера ўжывання беларускай мовы ў дзяржаўных інстытуцыях у гэты час пастаянна скарачалася. У прызначанай прэзідэнтам палаце прадстаўнікоў, якая лічыцца заканадаўчым органам, дакументы рыхтуюцца толькі на расійскай мове. На мясцовым узроўні былі зафіксаваны выпадкі, калі прымаліся падзаконныя акты, якія забаранялі ўжываць беларускую мову. З другога боку, актыўна праводзіліся рэпрэсіі супраць многіх беларускамоўных людзей, уцягнутых у апазіцыйную палітычную дзейнасць. Падчас правядзення масавых палітычных акцый некаторыя іх удзельнікі часам затрымліваліся міліцыяй на падставе таго, што яны гаварылі на беларускай мове. Падчас судовых працэсаў некаторым беларускамоўным людзям забаранялася карыстацца беларускай мовай, у некаторых выпадках з беларускамоўных удзельнікаў судовых працэсаў улады спрабавалі спагнаць выдаткі на аплату паслуг перакладчыкаў.

Па меры нарастання канфлікту паміж прэзідэнтам Лукашэнкам і дэмакратычнымі сіламі Беларусі, адначасова са значным скарачэннем ужывання беларускай мовы ў дзяржаўных установах і з паступовым звядзеннем палітычна актыўных беларускамоўных людзей да становішча сацыяльных “лішэнцаў”, беларуская мова стала міжволі асацыявацца з інструментам процістаяння прэзідэнцкай уладзе. Самі свядомыя носьбіты беларускай мовы пры гэтым сталі ледзь не аўтаматычна залічацца ў разрад “апазіцыянераў”. (Да кола апазіцыянераў, аднак, не залічаліся “натуральныя” носьбіты беларускай мовы — сацыяльна найбольш адсталыя слаі вясковага насельніцтва, якія гавораць на беларускай мове не па прынцыповых матывах, а з прычыны таго, што іншай мовай яны не валодаюць.) Стаўшы выразнай прыкметай апазіцыйнасці, паступова беларуская мова стала больш выкарыстоўвацца ў дзейнасці дэмакратычных партый. Выступаючы летам 1998 году на паседжанні 50-й сесіі Падкамісіі ААН па папярэджанні дыскрымінацыі і абароне меншасцяў, каардынатар апазіцыйнага палітычнага руху “Хартыя-97” А. Саннікаў гаварыў у тым ліку пра “знішчэнне” беларускай культуры, гісторыі і мовы, пра наяўную ў Беларусі *“практыку свядомага здзеку з мовы і яе (мовы) падаўленне”*. У лютым 1999 году Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі прыняў спецыяльную рэзалюцыю “Пра дыскрымінацыю беларускай мовы ў Рэспубліцы Беларусі”, у якой была зроблена выснова аб тым, што правы беларускага народу на свабоднае развіццё сваёй мовы і культуры *“груба парушаюцца”*.

У цяперашні час беларуская мова сутыкаецца з многімі выклікамі. Яна ў недастатковай ступені падтрымліваецца беларускай дзяржавай, што само па сабе абвастрае і без таго неспрыяльнае становішча, у якім яна цяпер знаходзіцца. Традыцыйна пагарджаюць праблемамі развіцця беларускай мовы камуністычныя партыі; што ж датычыць дэмакратычных палітычных сілаў Беларусі, то яны звярнулі на яе ўвагу як на важны элемент ідэнтычнасці беларускага народу толькі ў апошні час. Гэтаму міжволі спрыяла дзяржаўная палітыка 1995—2000 гадоў, скіраваная на выцясненне беларускай мовы з грамадскага ўжытку і яе перавод у разрад маргінальных, “апазіцыйных” з’яў.

Можна чакаць, што ў больш ці менш аддаленай будучыні

незалежна ад наяўнасці ці адсутнасці значных палітычных пераменаў рэпрэсіўная ў дачыненні да беларускай мовы дзяржаўная палітыка будзе перагледжана.

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Ігар Лялькоў

Пытаньне дзяржаўнай сымболікі ў Беларусі: гісторыя і сучасны стан

ІГАР ЛЯЛЬКОЎ (нар. 1971) — архівіст і гісторык, часова працуе ў Варшаве. Заснавальнік Беларускага таварыства імя Шумана. Аўтар кнігі *“Aperçu de l’histoire politique du Grand-Duché de Lithuanie”* (l’Harmattan, 2000), напісанай па-француску.

Беларускае грамадзтва глыбока расколатае. Праз дзесяць гадоў пасьля абвяшчэньня незалежнае Рэспублікі Беларусі назіраецца настолькі радыкальнае адасабленьне адной часткі грамадзянаў гэтае краіны ад другой, што, слухаючы размовы ды чытаючы артыкулы адных і другіх, староньні назіральнік можа проста не паверыць, што вядзецца ў іх пра адны й тыя ж рэаліі. Цяжка назваць хоць адзін з нацыявызначальных парамэтраў, апрача супольнага месца жыхарства, які б аб’ядноўваў гэтыя групы людзей: яны розьняцца і моваю, і зьместам гістарычнае памяці, і самасьвядомасьцю (дарма што абедзьве называюць сябе беларусамі — укладаюць яны ў гэтае паняцьце зусім розны сэнс), і стаўленьнем да іншых нацыяў па прынцыпе “блізкія-далёкія”, і бачаньнем пэрспэктываў

далейшага развою краю…
Часам здаецца, што найбольш камфортна гэтыя людзі адчувалі б сябе, калі б жылі ў дзьвюх розных краінах. Дарэчы, гэтыя “дзьве Беларусі” ўжо маюць і дзьве асобныя сыстэмы дзяржаўных сымбаляў, абсалютна не падобныя паміж сабою: з аднаго боку — рыцарскі герб “Пагоня” і бела-чырвона-белы сьцяг, з другога — традыцыйны савецкі гербападобны знак без шчыта, упісаны ў вянок, ды чырвона-зялёны сьцяг з арнамэнтам. Герб “Пагоня” (срэбны рыцар-вершнік у чырвоным полі шчыта) застаўся гэтаму краю ў “спадчыну” ад Вялікага Княства Літоўскага, краіны, у складзе якой продкі большасьці сучасных жыхароў Беларусі жылі на працягу большае часткі сваёй гісторыі (у XIII—XVIII стст.), падчас чаго й сфармавалася, уласна кажучы, этнічная супольнасьць, за якой у XIX ст. замацавалася найменьне “беларусы”. Разам зь бела-чырвона-белым сьцягам герб “Пагоня” быў прыняты ў якасьці дзяржаўнага сымбалю Беларускай Народнай Рэспублікі — першай дзяржавы, што паўстала на гэтых землях пасьля распаду Расейскай імпэрыі; і да сёньня ім паслугоўваецца ўрад БНР у выгнаньні, які мусіў пакінуць краіну ў 1920 г. пад ударамі Чырвонай арміі Савецкай Расеі. Гэтыя ж сымбалі былі першымі дзяржаўнымі і ў незалежнай Рэспубліцы Беларусі ў 1991—1995 гг. Што да другой сымбалічнай сыстэмы, то ейнае існаваньне цалкам зьвязанае зь Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай — створанай бальшавікамі на частцы тэрыторыі БНР марыянэткавай квазідзяржавай у складзе СССР. Ейны “герб” (узору 1927 г.) і сьцяг (узору 1951 г.), зь невялікімі рэдакцыйнымі праўкамі, былі абвешчаныя дзяржаўнымі сымбалямі Беларусі ў 1995 г., пасьля прыходу да ўлады нэасавецкага дыктатара Аляксандра Лукашэнкі.

Філёзафы кажуць, што структура любога сымбалю “накіраваная на тое, каб даць праз кожную прыватную зьяву цэльны вобраз сьвету” [1]. У поўнай згодзе з гэтаю формулай у беларускіх умовах пазытыўнае ці нэгатыўнае стаўленьне да тае ці іншае сымболікі ёсьць галоўным індыкатарам сьветапогляду, галоўным тэстам на прыналежнасьць асобы да ліку грамадзянаў **Беларусі эўрапейскай** ці падданых **Беларусі савецкай**.
Думаю, будзе дастаткова трох невялічкіх цытатаў з

[1] Философский энциклопедический словарь. Москва, 1989. С. 581.

выказваньняў на тэму сымболікі прадстаўнікоў гэтых двух супраціўных бакоў, каб пераканацца ў слушнасьці вышэйпаданых тэзаў. Вось заява чальцоў гэтак званага “нацыянальнага сходу” — прадстаўнічага органа цяперашняй апазіцыі:

> Заява. — 12 верасня 2000
>
> У адказ на прапанаваныя ўладамі асабіста Лукашэнкам пасьля разгону ў 1996 г. законна абранага парлямэнту краіны:
>
> У 1995 і 1996 гадах народ Беларусі дакладна і недвухсэнсоўна выказаўся за кардынальныя зьмены ў ключавых пытаннях далейшага развіцця нашай дзяржавы і грамадства. Была адхілена ранейшая антынацыянальная сімволіка і зацверджана “новая-старая”, гэта значыць ранейшая, з якой большасць грамадзян Беларусі звязвае сваё жыццё і гісторыю Радзімы ў даваенныя і пасляваенныя гады, калі Беларусь была квітнеючай рэспублікай, адной з 15 брацкіх у саставе магутнай краіны Саюза ССР [2].

А вось “адказ” 10 верасня 2000 паэта Беларусі Рыгора Барадуліна:

> *Відаць, нас мала перылі,*
> *Што цягне да імпэрыі*
> *Пад сьцягам мусульманістым,*
> *З палітбюро іваністым* [3],

ды меркаваньне гісторыка Алега Трусава, старшыні Таварыства беларускай мовы:

> Улады і зараз добра разумеюць штучнасьць сваёй сымболікі. Іх герб ужо даўно зьнік з паштовых марак Беларусі, а на грашовых купюрах так і не зьявіўся. І гэта не выпадкова. Народ не зьмірыўся з навязанай яму сымболікай. Ужо 27 ліпеня 1995 году на Дзень Незалежнасьці Беларусі ў горадзе Лёзна на Віцебшчыне легендарны Мірон узьняў на 40-мэтровым коміне райбыткамбінату бел-чырвона-белы сьцяг і пакінуў побач зь ім запіску: “Вярніце народу гістарычную памяць”.
>
> *І яна неўзабаве вернецца. Апошні 40-тысячны Чарнобыльскі Шлях, аздоблены нацыянальнай сымболікай, добрае таму пацьверджаньне* [4].

Каб незаангажаваны ў беларускую палітыку замежны чытач мог скласьці сваё ўласнае ўяўленьне пра гістарычныя падставы гэтых поглядаў на дзяржаўную сымболіку, а значыць і сьветапогляд апанэнтаў, мяркую, будзе дарэчы прапанаваць яму больш падрабязную панараму гісторыі згаданых сымбаляў, чымся папярэдні пункцірны агляд.

---

[2] Наша Ніва. — 11 верасня 2000.

[3] Наша Ніва. — 15 верасня 2000.

[4] Наша Ніва. — 10 верасня 2000.

Такім чынам, узьнікненьне гербу “Пагоня”, па зьвестках старабеларускіх летапісаў, адносіцца да 70—90-х гадоў XIII стагодзьдзя, калі выява вершніка з занесеным над галавой мячом “замацавалася ў якасьці рэпрэзэнтацыйнага сымбалю за асобамі, якія ажыцьцяўлялі вярхоўную ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім” [5], дзяржаве, якая на працягу ўсяго свайго існаваньня (сярэдзіна XIII — канец XVIII ст.ст.) злучала ў адно цэлае землі, дзе ў XX ст. паўсталі сёньняшнія Літоўская Рэспубліка й Рэспубліка Беларусь. Продкі сучасных беларусаў складалі большую частку насельніцтва Княства, таму й ня дзіўна, што акурат яны дамінавалі ў культуры гэтай краіны на працягу ўсяго ейнага існаваньня (дастаткова згадаць, што мовай дзяржаўных актаў ВКЛ да канца XVII ст. была старабеларуская, якую пасьля зьмяшала роднасная ей польская). Паўплывала беларуская культурная дамінацыя й на выбар дзяржаўнай эмблемы. Конная постаць рыцара была сюжэтам, вельмі шырока распаўсюджаным у тагачаснай эўрапейскай геральдыцы, дзе ён быў “іканаграфічным эквівалентам выразу dux (князь)” [6], аднак толькі ў Вялікім Княстве Літоўскім гэты сюжэт заняў месца на дзяржаўным гербе краіны (юрыдычна замацаваным Статутам ВКЛ 1566 г.). На думку спэцыялістаў, гэтаму паспрыялі мясцовая славянская традыцыя (што захоўвалася ў Беларусі яшчэ ў мінулым XIX ст.) шанаваньня паганскага боства Ярылы, “які езьдзіць на белым кані, на ягоных плячах белая мантыя” [7], ды мясцовая ж іканаграфія найбольш папулярных у беларусаў хрысьціянскіх сьвятых — сьв. Дзьмітра, сьв. Георга, сьв. Барыса й Глеба, — што выяўляліся ў выглядзе ўзброеных вершнікаў. Апрача дзяржаўнага герба, “Пагоня” прысутнічала й на зямельных гербах большасьці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак ВКЛ і на ягонай дзяржаўнай харугве (сьцягу), якая ўяўляла сабою чырвонае чатырохраговае палотнішча “з выявамі Пагоні і Панны Марыі зь дзіцем-Ісусам у Сонцы” [8]. Такім чынам, на працягу больш за 500 гадоў усе этнічна беларускія землі жылі “пад знакам Пагоні”, а продкі сучасных беларусаў проста ня ведалі іншай дзяржаўнай эмблемы, апрача гэтага арганічнага складніка эўрапейскае геральдычнае сыстэмы. Як агульнапрызнаны й агульнапрыняты сымбаль земляў, што ўваходзілі ў склад ВКЛ у апошні пэрыяд ягонага існаваньня,

[5] **Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Менск, 1999. С. 367.**

[6] **Цітоў А. Наш сімвал — Пагоня: Шлях праз стагоддзі. Менск, 1993. С. 5.**

[7] **Афанасьев А. Поэтические воззрения славян на природу. Т. 1. Москва, 1865. С. 441.**

[8] **Цітоў А. Цыт. тв. С. 27.**

[9] **Цітоў А. Цыт. тв. С. 38.**

гэта значыць сучасных Літвы й Беларусі, успрымалася “Пагоня” і ў Расейскай імпэрыі. Таму шырокае выкарыстаньне гэтай эмблемы на гэтых землях працягваецца й пасьля іхняга далучэньня да Расеі ў канцы XVIII ст. Справядлівай для гэтага часу падаецца выснова вядомага беларускага геральдыста Анатоля Цітова:
Адлюстраванне старажытнай Пагоні на беларускіх губернскіх, павятовых, гарадскіх, вайсковых гербах было з’явай, якая канстатавала асэнсаванне суседнімі народамі тоеснасці паняццяў: геаграфічна-этнічнага — Беларусь, і геральдычнага — Пагоня [9].
Дзеля гэтага зусім натуральным выглядае той факт, што дзеячы беларускага нацыянальна-вызвольнага руху, які на поўную моц заявіў пра сябе ў пачатку XX ст., уважалі “Пагоню” за натуральны нацыянальны сымбаль свайго народу. Клясык беларускай літаратуры Максім Багдановіч пісаў у 1916 г. у сваім хрэстаматыйным вершы “Пагоня”:

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах,
Успомню Вострую Браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях.
У белай пене праносяцца коні,
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць;
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць!

У гэты час белы рыцар “Пагоні” аздабляе й чырвонае палотнішча нацыянальнага сьцяга. Аднак ужо неўзабаве, дзесьці ў канцы 1916 — пачатку 1917 г., зьяўляецца й новы арыгінальны сьцяг беларускага руху. У поўнай згодзе з найбольш пашыраным у Эўропе прынцыпам сьцягаўтварэньня на падставе гербу, калі колеры асноўных дэталяў гербу (эмблемы й поля) адлюстроўваюцца на палотнішчы сьцяга шляхам спалучэньня гарызантальных палос рознай ці аднолькавай шырыні, эскіз гэтага бела-чырвона-белага сьцяга быў створаны беларускім архітэктарам і палітыкам Кляўдзіем Дуж-Душэўскім. У пачатку сакавіка 1917 г. бел-чырвона-белае палотнішча зьявілася ў Петраградзе на будынку Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, супрацоўнікам

[10] **Цыт. па: Наша Ніва. 1995. № 5.**

якога быў Дуж-Душэўскі. А ўжо 25 сакавіка таго ж году менскі Беларускі нацыянальны камітэт прымае пастанову наступнага зместу:

“1. Дзеля таго што амаль усе гарады Менскай губэрні ўжывалі ў сваіх пячатках старадаўнюю ПАГОНЮ, пастаноўлена захаваць гэтую спадчыну Вялікага Княства Літоўскага. Камітэт аднагалосна прыняў “Пагоню” ў якасьці дзяржаўнага гербу будучай незалежнай Беларусі.

2. Дзеля таго што ў беларускім народным мастацтве пераважаюць белыя й чырвоныя ўзоры, палічана дарэчным ужыць гэтыя колеры ў беларускім нацыянальным сьцягу. Такім чынам, Камітэт пастанавіў, што сьцяг мусіць складацца з трох гарызантальных палосаў аднолькавае шырыні — белай, чырвонай і белай, і што даўжыня яго ўдвая большая за шырыню” [10].

Новая дзяржаўная сымболіка спалучаўся з старажытнай “Пагоняй”, што ўжо праз кароткі час стаўся агульнапрызнаным нацыянальным сымбалем. У тым самым 1917-м “Статут Беларускіх Нацыянальных Культурна-Прасьветных Гурткоў у Менску” [11] ўсе гурткі называлі сваімі сьцягамі белыя, чырвоныя і белыя — аднэй шырыні [11]. У сьнежні таго ж году бела-чырвона-белыя сьцягі аздаблялі залю паседжаньняў Усебеларускага зьезду — найважнейшага дзяржаватворчага форуму ў найноўшай гісторыі Беларусі, падчас якога 1872 дэлегаты ад усіх беларускіх земляў аднагалосна абвясьцілі аднаўленьне Беларускай дзяржаўнага самавызначэньня краю. Такім чынам, пытаньне аб дзяржаўнай сымболіцы першай навачаснай беларускай дзяржавы было, фактычна, вырашанае наперад: дзяржаўным гербам паўсталай у 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі стаўся герб “Пагоня”, а ейным дзяржаўным сьцягам — бела-чырвона-белы сьцяг.

У тыя ж часы ўзьніклі й першыя праблемы, зьвязаныя з гэтаю сымболікай. Справа ў тым, што адначасна зь дзяржаватворчымі працэсамі на беларускіх землях аналягічныя падзеі адбываліся й на этнічнай тэрыторыі літоўцаў, яшчэ адных спадкаемцаў гісторыі й традыцыяў былога Вялікага Княства Літоўскага.

У тым самым 1918 годзе на тэрыторыі былога Жмудзкага (Самагіцкага) староства ВКЛ (дарэчы, ягонай адзінай буйной

---

11 Цыт. па: Наша Ніва. 16 сакавіка 1998.

12 Наша Ніва. 28 лістапада 1997.

13 Октябрьская революция и судьбы культурного наследия. Часть II. Хрестоматия по истории общественных движений и политических партий. Гомель, 1993. С. 190.

14 Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мінск, 1996. С. 246.

тэрытарыяльнай адзінкі, якая мела ўласны герб, адрозны ад “Пагоні”, — чорнага мядзьведзя ў срэбным полі) і прылеглых да яго паветаў былых Віленскага й Троцкага ваяводстваў была абвешчаная незалежная Літоўская дзяржава (спачатку манархія, а пазьней рэспубліка). З мэтай падкрэсьліць ейную гістарычна-юрыдычную пераемнасьць зь Вялікім Княствам Літоўскім (а тагачасныя літоўскія нацыянальныя дзеячы прэтэндавалі на атрыманьне ўлады над усімі землямі колішняга Княства) за дзяржаўны герб была ўзятая ўсё тая ж “Пагоня”. Прычым паколькі афіцыйная ідэалёгія абвяшчала акурат гэтую наваствораную Літву адзіным сапраўдным спадкаемцам былога Вялікага Княства Літоўскага, то і права выкарыстаньня эмблемы з узброеным вершнікам на белым кані на чырвоным тле нашчадкі жмудзінаў пакідалі толькі за сабою. З гэтай прычыны пэрыядычна здараліся інцыдэнты, накшталт выпадку ў сьнежні 1919 году, калі па дарозе з Бэрліну ў Рыгу на літоўскай мяжы была арыштаваныя дыпляматычная дэлегацыя БНР. Прычынаю арышту, паводле пратаколу затрыманьня, былі знойдзеныя пры мытным аглядзе “блянкі пашпартоў невядомай нам Беларускай Рэспублікі зь літоўскім гербам на вокладцы” [12].

Але яшчэ большымі ворагамі беларусы, якія паслугоўваліся “Пагоняю” і бела-чырвона-белым сьцягам, былі для прышлых з Усходу расейскіх бальшавікоў. Яшчэ падчас Усебеларускага зьезду выступ іхнага прадстаўніка быў такім: “Мы стаім за брацтва ўсіх народаў. Не павінна быць падзелу на нацыі”. Указваючы на нацыянальны беларускі сьцяг, гаворыць: “Кіньце гэты флаг” [13].

Канчаткова замацаваўшы сваю ўладу над Беларусяй у 1920 г. і стварыўшы тут “першую на беларускай зямлі дзяржаву рабочых і сялян”, у 1922 г. бальшавікі аб’ядналі яе разам зь іншымі падобнымі “дзяржавамі” ў адзіную камуністычную імпэрыю — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Адзіным сьцягам, які было дазволена ўжываць на ўсёй ягонай тэрыторыі, быў чырвоны сьцяг бальшавіцкай партыі. Адзіным дапушчальным адрозьненьнем быў надпіс у левым верхнім рагу, у нашым выпадку — “БССР”. Тое самае было і з гербам. Першы герб Савецкай Беларусі “быў копіяй дзяржаўнага гербу РСФСР з адрозьненьнем у надпісе” [14].

Некаторая лібэралізацыя камуністычнага рэжыму ў часы гэтак

званага НЭПу і зьвязаная зь ёй тэндэнцыя прызнаньня за “савецкімі рэспублікамі” права на пэўную нацыянальную адметнасьць спрычыніліся да пастаноўкі пытаньня аб стварэньні новых “дзяржаўных” сымбаляў гэтых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак СССР, “нацыянальных па форме, сацыялістычных па зьмесьце”. У лютым 1924-га ў БССР быў абвешчаны конкурс на найлепшы праект такога сымбалю. Ягоным пераможцам Рада Народных Камісараў прызнала расейскага мастака Валянціна Волкава, які, ня надта мудрагелячы, трохі падрэдагаваў герб Савецкай Расеі зь сярпом і молатам, пяціканцоваю зоркаю, сонцам і вянком, а для наданьня лякальнага каларыту зрабіў стужкі, што абвіваюць вянок, колераў нацыянальнага сьцягу беларусаў — бела-чырвона-белымі. “Новы” герб быў зацьверджаны 11.04.1927 на 8-м зьезьдзе Саветаў БССР з адной “невялічкай” праўкай: стужкам вярнулі колер, уласьцівы арыгіналу, — чырвоны. Мясцовыя “таварышы” лепш за выпускніка Пецярбурскай Акадэміі мастацтваў ведалі, дзе хаваецца бацыла “беларускага буржуазнага нацыяналізму”. Нішто ў сымболіцы “малодшага брата” ў “брацкай сям’і савецкіх народаў”, што ўпэўнена крочылі да пабудовы “новай нацыянальнай агульнасьці — адзінага савецкага народу”, ня мусіла нагадваць беларусам пра часы, калі яны імкнуліся самі, без дапамогі “правадыроў сусьветнага пралетарыяту”, вырашаць лёс сваёй краіны. Вось пад гэтаю “дзяржаўнай эмблемай”, якая час ад часу пражывала невялікія рэдакцыйныя праўкі, Беларусь і жыла да канца 1991 году.

Між іншым, вельмі сымптаматычна выглядае адна з правак, якая датычылася мовы тэксту “Пралетарыі ўсіх краінаў, злучайцеся!” на стужках вянка. Першапачаткова гэты тэкст падаваўся там на беларускай, ідыш, расейскай і польскай мовах, але 28 ліпеня 1938 году Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэньне пакінуць на гербе толькі беларуска- й расейскамоўны надпісы. Што, дарэчы, і ня дзіўна, калі ўлічыць, зь якім імпэтам НКВД акурат у тыя часы займаўся вынішчэньнем “агентаў Троцкага” й “белапольскіх шпіёнаў” на тэрыторыі Савецкай Беларусі.
І вось у траўні 1995 г. гэты ж “геральдычны знак”, які, дарэчы, мае вельмі мала супольнага з традыцыйнай геральдыкай,

зьявіўся на франтоне будынку Адміністрацыі прэзыдэнта незалежнай Рэспублікі Беларусі, сымбалізуючы сабою імкненьне новага кіраўніцтва гэтай краіны і значнай часткі ейнага насельніцтва пазбавіцца ад цяжару незалежнасьці й вярнуцца ў “сьветлае савецкае ўчора”.
Яшчэ больш кароткая гісторыя ў чырвона-зялёнага палотнішча, які сёньня вісіць над тым жа палацам. У пачатку 1950-х гадоў, зыходзячы зь нейкіх таямнічых меркаваньняў, Масква загадала адміністрацыям “савецкіх рэспублік” дадаць да чырвоных бальшавіцкіх сьцягоў зь сярпом і молатам, што лічыліся “дзяржаўнымі” ўва ўсіх частках Савецкага Саюзу, нейкія стандартызаваныя дэталі, якія мусілі сымбалізаваць пэўную “спэцыфіку” кожнай тэрыторыі. Выконваючы загад, Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету БССР сваім указам ад 25.12.1951 дадаў (без аніякага тлумачэньня!) да кумачовага палотнішча зялёную паласу ўнізе й арнамэнт, узяты з ручніка, вышытага ў 1917 г. сялянкай М. Маркевіч зь вёскі Касьцілішча на Сеньненшчыне, уздоўж дрэўка. Эскіз гэтага сьцяга быў створаны зноў-такі (як і ў выпадку з гербам БССР) мастаком-расейцам, на гэты раз Мікалаем Гусевым.
Што датычыцца “Пагоні” й бела-чырвона-белага сьцяга, то, застаючыся афіцыйнымі сымбалямі Беларускай Народнай Рэспублікі ды ейнага ўраду ў выгнаньні, вакол якога гуртавалася беларуская палітычная эміграцыя, яны аўтаматычна траплялі пад фактычную забарону ў БССР. Адносна вольнае іх выкарыстаньне ў Беларусі да 1990 г. датуецца толькі часамі, калі савецкая акупацыя ў 1941—44 гг. зьмянілася на нямецкую. Спадзеючыся здабыць прыхільнасьць мясцовага насельніцтва, немцы не забаранялі беларусам паслугоўвацца нацыянальнымі сымбалямі. Натуральна, што ў такіх варунках ужывалі іх і некаторыя калябаранцкія арганізацыі (Беларуская рада даверу, Беларуская цэнтральная рада, Саюз беларускай моладзі і інш.). Немцам, як вядома, такі “лібэралізм” не прынёс значных дывідэндаў, аднак у больш позьнія часы гэты факт даў падставы для шматлікіх палітычных спэкуляцыяў вакол сымболікі прыхільнікам савецкага ладу.
На працягу ўсіх 70 гадоў існаваньня камуністычнага рэжыму названыя сымбалі заставаліся галоўнымі для ўсіх прыхільнікаў аднаўленьня незалежнасьці Беларусі. У 1940—50-х гг. пад імі гуртаваліся ўдзельнікі антысавецкага партызанскага руху й

падпольля (Беларуская вызвольная армія, Беларуская незалежніцкая партыя, Саюз беларускіх патрыётаў і інш.). У 1960—70-я пра іх легальнае адраджэньне ў Беларусі марылі інтэлектуалы-гуманітары з так званага “Акадэмічнага асяродку”, разгромленага КГБ у 1974—75 гг., і мастакі-дысыдэнты з творчага кола “На Паддашку”, якія ў 1980 годзе падрыхтавалі й распаўсюдзілі “самвыдатам” паштоўкі й плякат з выявамі “Пагоні”. Патрапіўшы за мяжу (адна з гэтых паштовак аўтарства Яўгена Куліка была перавыдадзеная і атрымала там пэўны розгалас), гэтыя сьціплыя творы надалі гістарычна-культурніцкай маніфэстацыі сэнс палітычнай вызвольнай акцыі й засьведчылі сьвету, што кіраваныя з Масквы працэсы нацыянальнай дэградацыі й асыміляцыі беларускага народу не дасягнулі яшчэ канчатковых вынікаў. У 1980-я “Пагоня” й бела-чырвона-белы сьцяг робяцца агульнавядомымі сымбалямі беларускасьці й незалежніцтва, а іх публічная дэманстрацыя адназначна трактуецца і ўладамі, і апанэнтамі гэтых уладаў як акт нацыянальнага супраціву. Для прыкладу можна прывесьці падзеі кастрычніка—лістапада 1985 г., калі на будынку Менскай мастацкай вучэльні імя Глебава два навучэнцы, Міхал Мірошнікаў і Юры Макееў, вывесілі бел-чырвона-белыя сьцягі, сарваўшы сьцягі СССР. У выніку КГБ распачало юрыдычны перасьлед 6 чалавек, а Макееў быў вымушаны спыніць вучобу.

З пачаткам працэсу дэмакратызацыі ў Савецкім Саюзе выкарыстаньне дасавецкай сымболікі ў БССР набывае масавы характар і пачынаюць гучаць патрабаваньні яе легалізацыі (першай такое патрабаваньне высунула незалежніцкая моладзевая арганізацыя “Талака” ў жніўні 1988 г.). 19 лютага 1989 г. акурат пад бела-чырвона-белымі сьцягамі на стадыёне “Дынама” ў Менску адбываецца першы ў БССР дазволены ўладамі апазыцыйны палітычны мітынг. Аднак у гэтыя ж часы нярэдкімі застаюцца арышты й пакараньні людзей (асабліва ў правінцыі) за выкарыстаньне гэтага сьцягу й “Пагоні”. Нават 19 чэрвеня 1991 г. найбуйнейшая тагачасная апазыцыйная арганізацыя — Беларускі народны фронт — была афіцыйна зарэгістраваная (праз два гады пасьля стварэньня) толькі з умоваю, што на працягу трох месяцаў прывядзе свой статут у адпаведнасьць з заканадаўствам, а менавіта скасуе там запіс,

што “БНФ выкарыстоўвае беларускую гістарычную сымболіку — бела-чырвона-белы сьцяг і герб Пагоня” [15]. І гэта пры тым, што першы з названых сымбаляў быў легалізаваны ўжо годам раней (у 1990 г.), прынамсі ў сталіцы БССР, дзе Менскі гарадзкі савет прыняў пастанову пра дазвол на ягонае выкарыстаньне ў якасьці нацыянальнага (але не дзяржаўнага) сьцягу беларусаў (але не Беларусі).

БНФ не пасьпеў прывесьці свой статут у адпаведнасьць з заканадаўствам БССР. Дакладна праз тры месяцы пасьля ягонай рэгістрацыі, 19 верасьня, краіна стала звацца Рэспублікай Беларусьсю, а ейнымі дзяржаўнымі сымбалямі сталі “Пагоня” і бела-чырвона-белы сьцяг. Ува ўмовах прагрэсаванага развалу савецкай імпэрыі, пасьля няўдалай спробы дзяржаўнага пераваротуў Маскве ў жніўні гэтага году, прадстаўнікі тагачаснай кіроўнай эліты Беларусі былі гатовыя йсьці на любыя крокі дзеля захаваньня сваёй улады ў краіне. Пасьля забароны дзейнасьці Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу ды ейнай мясцовай філіі, Камуністычнай партыі Беларусі (25.08.1991), публічна захоўваць вернасьць камуністычнай сымболіцы здавалася ім небясьпечным. Іншых гістарычных сымбаляў Беларусі, апрача тых, што выкарыстоўвала апазыцыя, ніхто ня ведаў, а выдумляць новыя не было часу: тая самая апазыцыя, праз сваю парлямэнцкую меншасьць, актыўна высоўвала прапановы па дэсаветызацыі й дэкамунізацыі краіны, сярод якіх патрабаваньне зьмены сымболікі здавалася прагматыкам-намэнклятурнікам адным з найменш пагрозьлівых для іх асабіста. Што ж да беларускіх незалежнікаў, прадстаўнікі якіх і складалі гэтую меншасьць, то для іх вяртаньне дзяржаўнасьці нацыянальных сымбаляў было прынцыповым пытаньнем, вырашэньне якога мусіла гарантаваць незваротнасьць шляху да дзяржаўнай самастойнасьці Беларусі й беларусізацыі ейнага грамадзтва. Такім чынам, у канцы 1991 г. адрадзілася незалежная беларуская дзяржава, галоўныя эмблемы якой адпавядалі сымбалям папярэдніх самастойных дзяржаўных утварэньняў, што існавалі на гэтай зямлі, — Вялікага Княства Літоўскага й Беларускай Народнай Рэспублікі. Аднак для значнай часткі грамадзянаў новай дзяржавы, якія былі ня надта абазнанымі ў гісторыі (у школах і ўнівэрсытэтах БССР “дасавецкая” гісторыя Беларусі альбо зусім не вывучалася, альбо вывучалася ў

мінімальным аб'ёме) ды ня надта паглыбляліся ў мудрагелістасьці палітычных маніфэстаў, гэтая сымболіка паранейшаму ўспрымалася як сымболіка апазыцыйных сілаў, што здолелі выкарыстаць зручны для іх момант, каб "навязаць" яе ўсёй краіне. Да таго ж, захаваўшы ўладу ў Рэспубліцы Беларусі, былыя кіраўнікі БССР выявілі сваю поўную няздольнасьць кіраваць гаспадаркай краіны ў новых умовах. На першыя два гады пасьля абвяшчэньня незалежнасьці прыйшоўся пік эканамічнага крызысу, які распачаўся яшчэ ў былым СССР у канцы 1980-х. Замест таго каб праводзіць неабходныя рэформы, тагачаснае кіраўніцтва аддавала перавагу тлумачэньню праблемаў, што апанавалі Беларусь, як непазьбежных выдаткаў дзяржаўнай самастойнасьці, якой так дамагалася "нацыяналістычная апазыцыя". Нядзіўна, што ў такіх варунках словы "крызыс", "пагаршэньне ўмоваў жыцьця", "незалежнасьць", "Пагоня", "бела-чырвона-белы сьцяг" і "апазыцыя" зьліліся ў галовах "простага люду" ў адзін сынанімічны шэраг. Да таго ж, і прасавецкія ды прарасейскія сілы, што ў асноўным атабарыліся ў гэтак званых "сілавых структурах" (кшталту так і не рэфармаванага ў Беларусі КГБ) і атрымлівалі моцную падтрымку звонку, не пакідалі надзеі зьмяніць напрамак хады гісторыі і вялі несупынную тайную й яўную "працу сярод насельніцтва". Найбольш удзячны водгук гэтая "праца" знаходзіла ў сэрцах старэйшага пакаленьня краіны — вэтэранаў другой сусьветнай вайны й пэнсіянэраў, для якіх СССР быў краінай іхнай маладосьці, а нечаканыя перамены несьлі толькі зьбядненьне й галечу. Варта дадаць, што дэмаграфічная сытуацыя ў тагачаснай Беларусі выглядала такім чынам, што гэтыя людзі складалі амаль 1/3 ад усяго праваздольнага насельніцтва краіны.

Акурат гэтыя чыньнікі ў сукупнасьці і сталіся галоўнай прычынай упэўненай перамогі на першых вольных прэзыдэнцкіх выбарах у 1994 г. прыхільніка аднаўленьня СССР і вяртаньня да сацыялістычна-разьмеркавальнай сыстэмы ў эканоміцы, падтрыманага Расеяй маладога маёра КГБ у адстаўцы Аляксандра Лукашэнкі. Паміж іншымі абяцаньнямі гэтага кандыдата ў прэзыдэнты было й такое:
Верну наш родной белорусский (а не БНФ-аўскі — **І. Л.**) *флаг и символику. Народ сам решит на референдуме! Пусть сам*

выберет из нескольких вариантов. Не тот, который хотим ему в зубы всунуть, а тот, что ему настроение поднимает [16].

Абяцаны рэфэрэндум адбыўся 14 траўня 1995 г. і стаўся кульмінацыйным пунктам абяцанага ж хуткага адкату нацыянальна-адраджэнскіх працэсаў 1990-х гадоў. Вынікі рэферэндуму вярнулі Беларусь у стан, у якім яны знаходзіліся да абвяшчэння ейнае незалежнасці. Вярнулі ў сваім найгоршым выглядзе. Ну й сьцяга было для ініцыятараў гэтых працэсаў неабходным “апошнім мазком” у карціне вяртаньня краіны ў блаславёнае савецкае ўчора. Галасаваньню папярэднічала шалёная кампанія падкантрольных уладу СМІ (улучна з адзіным існаваўшым тэлевізійным каналам, вяшчаньне якога ахоплівала ўсю Беларусь) супраць “Пагоні” і бела-чырвона-белага сьцяга (гаварылася, што яно — сьцяг калябарантаў і ворагаў краіны на той час!). Вялізны націск быў зроблены на факт выкарыстаньня гэтых сымбаляў часткай калябарантаў падчас другой сусьветнай вайны, але быў прыцягнуты і прыклад Літвы зь ейнай прэтэнзіяй на ўсю гістарычную спадчыну былога Вялікага Княства Літоўскага (цытата з Лукашэнкі: *“Бразаўскас* [тагачасны прэзыдэнт Літвы — **І.Л.**] *мне гаварыт: ты пачаму, Аляксандар Грыгор’евіч, мой герб узял? А я атвічаю: да ні брал я, ня нужан он мне!”* [17]), і расейскага трэнсу ў зьвязку зь іхнымі развагамі *“о чуждой этнической биоэнергетике, заложенной в “Погоне” и бело-красно-белом штандарте”* [18]. Аднак асноўная тэза, што ўбівалася ў галовы чытачоў і тэлегледачоў, была такая: цяжкая сучаснасьць сымбалізуецца знакамі незалежнай Беларусі ды “праклятых нацыяналістаў і дэмакратаў”, а лепшая будучыня (яна ж сьветлая мінуўшчына) — эмблемамі БССР; вяртаньне пад камуністычныя сымбалі ёсьць вяртаньнем у маладосьць для паджылых людзей ды вяртаньнем у юнацтва й дзяцінства для людзей сярэдняга веку. Хіба ж Вам ніколі не хацелася вярнуцца ў дзяцінства?!

І прыём спрацаваў! Грамадзтва Рэспублікі Беларусі ў траўні 1995 году раскалолася амаль роўна напалам. Вяртаньне да савецкай сымболікі падтрымалі 49,7% выбарцаў, унесеных у сьпіс для галасаваньня. 50,3% галасавалі супраць або ўвогуле ігнаравалі рэфэрэндум [19]. Прычым, як сьведчыць тагачасная прэса, частка з тых, хто дадатна адказаў на хітра сфармуляванае лукашэнкаўскімі юрыстамі пытаньне рэфэрэндуму (“Ці падтрымліваеце Вы ўвядзеньне новай

17 **Цыганкоў, Сяргей.** Жах, які ў красавіку 1995-га // **Свабода.** 28 красавіка 1995.

18 **Свабодны, Вячаслаў.** Пагоня і бела-чырвона-белы // **Свабода.** 1995. № 20.

19 **Навіна Ніва.** 10 траўня 2000.

20 **Наша Ніва.** 1995. № 6.

дзяржаўнай сымболікі?”), зусім ня мелі на ўвазе падтрымаць гербава-сьцягавую рэсаветызацыю. Вось што пісала ў газэту “Наша Ніва” пасьля галасаваньня ейная чытачка Л. Дамброўская:

“Дарагая, любімая газэта! На рэфэрэндуме я галасавала за новую дзяржаўную сымболіку — бела-чырвона-белы сьцяг і герб “Пагоня”. Раптам аказалася, што пад новым сьцягам мелі на ўвазе стары чырвона-зялёны… Для майго 37-гадовага жыцьця чырвона-зялёны — гэта й ёсьць стары сымбаль. Упэўненая, што для многіх, многіх людзей — таксама. Ці даўно мы абмяркоўвалі і прымалі сымболіку нашае зноў народжанае дзяржавы — гістарычныя сьцяг і герб? Хто ж вінаваты ў тым, што палітычная думка скача, як Пятрушка, і кланяецца то ў адзін, то ў другі бок, то адной, то другой публіцы? Думаю, што многімі людзьмі ўжо прынятае раней рашэньне пра новыя сымбалі новае дзяржавы не падлягала сумневу. Бо новыя дзяржаўныя сымбалі — гэта ня новыя гатункі кілбасы й гарэлкі, якіх можа быць некалькі на памяці аднаго пакаленьня” [20].

Аднак мэта ўладаў была дасягнутая. Прапанова Лукашэнкі знайшла падтрымку ў большасьці **ўдзельнікаў** рэфэрэндуму. Не зважаючы на нормы заканадаўства, якія абавязвалі вырашаць пытаньні падобнай значнасьці толькі большасьцю галасоў **усіх выбарцаў**, унесеных у электаральныя сьпісы, улада адразу заявіла аб сваёй перамозе. Яшчэ нават да фармальнага абвяшчэньня вынікаў рэфэрэндуму кіраўнік справаў Адміністрацыі Лукашэнкі, нядаўні першы сакратар райкаму КПБ Іван Ціцянкоў асабіста зьняў з галоўнага флагштоку краіны на даху прэзыдэнцкага палацу і публічна разьдзёр на кавалкі зьненавідны для іх сымбаль беларускае незалежнасьці — бела-чырвона-белае палотнішча Дзяржаўнага сьцягу. З гэтага сымбалічна дзікунскага акту й пачалася эпоха шызафрэнічнага існаваньня пакуль яшчэ незалежнай Рэспублікі Беларусі пад “новымі-старымі” дзяржаўнымі сымбалямі падсавецкае БССР.

Абсурднасьць сытуацыі яшчэ больш падкрэсьліў абвешчаны распараджэньнем кіраўніка прэзыдэнцкай Адміністрацыі праз 7 месяцаў пасьля зацьвярджэньня савецкае сымболікі ў якасьці дзяржаўнай “конкурс на найлепшы тлумачальны тэкст да

[21] **Распараджэнне Галавы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 41рп ад 21.12.1995 г. // Дзяржаўны архіў Дзяржаўнай геральдычнай службы Рэспублікі Беларусь.**

[22] **Ліст В. Л. Насевіча да намесніка старшыні Дзяржаўнай архіўнай службы Расіі В. М. Сапрыкава ад 17.08.1995 г. // Там самае.**

[23] **Заключныя лісты конкурса на лепшы эскіз герба і сцяга Рэспублікі Беларусь // Там самае.**

[24] **Распараджэнне Галавы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 41рп ад 1.08.2000 г. // Там самае.**

[25] **Там самае.**

[26] **Беларуская служба радыё “Свабода”, перадача ад 1.08.2000.**

Дзяржаўны архіў Дзяржаўнай геральдычнай службы Рэспублікі Беларусь.

Ліст В. Л. Насевіча да намесніка старшыні Дзяржаўнай архіўнай службы Расіі В. М. Сапрыкава ад 17.08.1995 г. // Там самае.

Заключныя лісты конкурса на лепшы эскіз герба і сцяга Рэспублікі Беларусь // Там самае.

Распараджэнне Галавы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 41рп ад 1.08.2000 г. // Там самае.

Беларуская служба радыё “Свабода”, перадача ад 1.08.2000.

геральдычнае службы Вячаслаў Насевіч, “звычайна інтэлігенцкага паходжання, з добрай сямейнай традыцыяй”. Пасля ўступлення ў пасаду [22], сталася справаю вельмі нялёгкаю, асабліва ўлічваючы інтэлектуальны патэнцыял прыхільнікаў аднаўленьня “сьветлага ўчора”. Красамоўны вынік конкурсу падвёў сябар ягонага журы, сумнавядомы ў Беларусі мовазнаўца-русіфікатар Аркадзь Жураўскі: Прадстаўленыя на конкурс матэрыялы ў цэлым пакідаюць сумнае ўражанне. Яны паказваюць, што ад удзелу ў конкурсе ўхіліліся вядучыя беларускія пісьменнікі, мастакі і публіцысты, і гэта не з’яўляецца выпадковым у сучасным палітыка-[23]. Заключныя лісты конкурса ўтрымоўваюць і іншыя цікавыя звесткі. Так, напрыклад, Дзяржаўная герба і Дзяржаўная сцяга Рэспублікі Беларусь, афіцыйнай форме выражаюць свае станоўчыя адносіны да цяперашняй сімволікі. Адпаведныя лісты ад [24] ўтрымоўваюць і вельмі цікавыя творы не адпавядаюць асноўнаму патрабаванню конкурса — даць найбольш поўнае раскрыццё сэнсу і значэння цяперашніх дзяржаўных сімвалаў у цэлым або іх паасобных элементаў… *Прадстаўленыя на конкурс празаічныя апісанні герба і флага* (sic! — **І. Л.**) *вельмі неаднолькавыя як па памеру, так і па зместу… Але ўсе гэтыя апісанні занадта кароткія, у сярэднім у большасці яны займаюць толькі адну старонку машынапіснага тэксту. Агульным недахопам іх з’яўляецца поўная адсутнасць гістарычных дадзеных”* [25].

Гучна распачатае “мерапрыемства” скончылася ціхім [26]. Беларускай службе радыё “Свабода” “перадаюць з Акадэміі — *1.000.000 минимальных заработных плат каждая”* [24], так і засталося незапатрабаваным абяцаньне Прэзыдэнтуры, што *“авторский текст победителя конкурса будет издан в виде красочной брошюры”* [25]. Беларуская інтэлектуальная эліта дэманстратыўна выказала сваё стаўленьне да палітыкі ажыўленьня зданяў нядаўняй мінуўшчыны.

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусі працягваецца паралельнае суіснаваньне дзьвюх сыстэмаў сымболікі, якія для дзьвюх асноўных групаў жыхароў гэтае краіны маюць вартасьць

дзяржаўных сымбаляў.
З аднаго боку, фактычна дзейнічаюць “Палажэньне аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусі” і “Палажэньне аб Дзяржаўным сьцягу Рэспублікі Беларусі”, зацьверджаныя ўказамі прэзыдэнта №№ 213 і 214 ад 7 чэрвеня 1995 г., якія зыходзяць зь дзяржаўнага статусу нэасавецкіх эмблемаў. На абароне гэтай сымболікі стаіць Дзяржаўная геральдычная служба, што знаходзіцца ў падпарадкаваньні Дзяржаўнага камітэту па архівах і справаводзтве Рэспублікі Беларусі. Сёньняшні ейны начальнік Сяргей Рассадзін дакладна ўяўляе, чые “геральдычныя густы” абслугоўвае ягоная ўстанова:
Мы маем поўную падтрымку кіраўніцтва і асабіста кіраўніка нашае дзяржавы, які праяўляе зацікаўленасьць у разьвіцьці сымболікі [26].
Сваё разуменьне гісторыі беларускай геральдыкі ды ейных пэрпэктываў галоўны Лукашэнкаў “геральдмайстар” Рассадзін (між іншым, гісторык паводле адукацыі) таксама выказаў вельмі недвухсэнсоўна, пішучы на тэму вайсковай геральдыкі:
Становление современной белорусской военной геральдики происходило и происходит прежде всего на базе достижений советской военной геральдики. Последняя складывалась в течение многих десятилетий и сформировалась в виде целостной, оригинальной системы…
В 1990-х годах ситуация в области военной геральдики резко изменилась. В частности, произошло массированное внедрение в нашу армейскую атрибутику тогдашних официальных символов Республики Беларусь — герба “Погоня” и бело-красно-белого флага, а также их производных. Проблема заключалась в том, что уже сама стилистика данных герба и флага была в корне отличной от применявшихся ранее, что в результате и привело к многочисленным издержкам…

Предпосылки для нормализации развития военной геральдики в Беларуси стали складываться после проведения всенародного референдума 1996 (sic! — **І. Л.**) *года, когда официальными символами нашего государства стали его ныне существующие герб и флаг…*
[К числу насущных задач] принадлежит, конечно, задача сохранения преемственности в развитии нашей военной геральдики. Ведь отказ от лучших достижений советской эпохи

27. Армия. 2000. № 1. С. 4—5.

в этой области, очевидно, неприемлем морально и, к тому же, невыгоден практически… Не стоит, тем более, менять на нечто новое и непривычное те атрибуты, которые в народном сознании прочно ассоциируются с героическим прошлым

[28] Гл. “Об общественных объединениях” Закона Республики Беларусь от 04.10.1994 № 3254-XII // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1994. № 29. Ст. 503.

[29] Гл. “Положение о порядке выдачи субъектам хозяйствования лицензий” Указа Президента Республики Беларусь от 16.08.1994 № 485 “О государственной монополии на производство и реализацию отдельных видов продукции” // Ведомости Президента и Кабинета Министров Республики Беларусь. 1994. № 11. Ст. 218.

[30] Загад Міністэрства культуры і друку СССР Рэспубліцы Беларусь ад 11.09.1991 № 331 // Свабода. 13 кастрычніка 1995.

Воружэнье общественных объединений” Закон должно Республики Беларусь от 04.10.1994 № 3254-XII // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1994. № 29. Ст. 503.

адбіліся сьветапоглядныя ўстаноўкі тае часткі насельніцтва Беларусі, чый сьцяг вісіць цяпер над

[29] Гл. “Положение о порядке выдачи субъектам хозяйствования лицензий” Указа Президента Республики Беларусь от 16.08.1994 № 485 “О государственной монополии на производство и реализацию отдельных видов продукции” // Ведомости Президента и Кабинета Министров Республики Беларусь. 1994. № 11. Ст. 218.

Гэта, напрыклад, будынак Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, ці ўстаноўленыя на ім сьцягі, ці выявы, ці

[30] Загад Міністэрства культуры і друку СССР Рэспубліцы Беларусь ад 11.09.1991 № 331 // Свабода. 13 кастрычніка 1995.

Беларусь 13 сакавіка 1996 г. // Звяночы архіў Дзяржаўнай геральдычнай службы

насьць выяваў гербу падлягае ліцэнзаваньню (за немалыя грошы) [29], вышэйзгаданымі “Палажэньнямі” устаноўлены нават сьпіс службовых асобаў, якія маюць права трымаць гэтую сымболіку ў сваіх працоўных кабінэтах. У выніку “нефармальным” чынам, гэта значыць не з прымусу і не пры выкананьні службовых абавязкаў, яна цяпер выкарыстоўваецца адно толькі падчас мерапрыемстваў, што ладзяцца вэтэранамі другой сусьветнай вайны ды камуністамі. Дзякуючы

[30] Загад Міністэрства культуры і друку СССР Рэспубліцы Беларусь ад 11.09.1991 № 331 // Свабода. 13 кастрычніка 1995.

гэтаму ладзіцца і шэнкаўскія “падпраўленыя копіі.

Зусім па-іншаму выглядае сучасны стан дасавецкай дзяржаўнай сымболікі Беларусі. Ужываючыся цалкам або ў выглядзе асобных элемэнтаў у эмблематыцы значнай часткі палітычных партыяў краіны (ад кансэрватараў зь Беларускага народнага фронту да сацыял-дэмакратаў) і самых розных грамадзкіх арганізацыяў (ад міжнароднага Згуртаваньня беларусаў сьвету “Бацькаўшчына” да рэгіянальнага “Цэнтру грамадзкіх ініцыятываў” з Маладэчна), аздабляючы шматтысячныя маніфэстацыі прыхільнікаў дэмакратычных рэформаў, зьяўляючыся ў выглядзе графіці на сьценах і мурох беларускіх гарадоў, гэтыя сымбалі сталіся сымбалямі яднаньня для ўсіх, незалежна ад этнічнае прыналежнасьці, хто жадае бачыць

Беларусь дэмакратычнаю, прававою, эканамічна моцнаю, урэшце — проста прыстойнаю эўрапейскаю дзяржаваю. У адказ на гэта Лукашэнкавы “ахоўнікі парадку” вядуць няспынную барацьбу з нацыянальнай сымболікай (іхныя спасылкі на дасюль дзейсны ў РБ Указ Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету БССР №990-Х ад 09.04.1981, якім уведзеная забарона на *“пользование флагами и вымпелами, не зарегистрированными в установленном порядке”*, ня маюць ніякага сэнсу хоць бы з прычыны “зарэгістраванасьці” бела-чырвона-белага сьцяга ў якасьці сьцяга БНФ), арыштоўваюць і зьбіваюць людзей, якія ёю карыстаюцца (зьвесткамі пра гэта напоўнены ўвесь беларускі незалежны друк за апошнія пяць гадоў), ці, напрыклад, забараняюць дзейнасьць выдавецтва “Хата” за тое, што ім *“выпушчана ў свет кніга “Пагоня” ў сэрцы тваім і маім”, зьмест якой супярэчыць вынікам рэферэндума па дзяржаўнай сімволіцы і такім чынам адмоўна ўплывае на паразуменне, еднасць і стабільнасць у грамадстве”* [30]. Аднак гэта толькі дадае ёй прывабнасьці ў вачах людзей, нават далёкіх ад беларускага нацыянальнага руху, але незадаволеных рэстаўрацыяй нэасавецкага ладу ў Беларусі.

Такім чынам, можна з упэўненасьцю сьцьвярджаць, што пытаньне аб дзяржаўнай сымболіцы ў Рэспубліцы Беларусі сёньня ёсьць вытворным ад праблемы выбару далейшых шляхоў палітычнага і грамадзкага разьвіцьця нашай краіны. Ад таго, наколькі хутка Беларусь эўрапейская здолее перамагчы Беларусь савецкую, залежыць і тэрмін, празь які адбудзецца аднаўленьне “Пагоні” і адпаведнага ёй сьцяга як афіцыйных сымбаляў незалежнай Беларускай дзяржавы.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**

[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (21) – 2002**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] [image] 2002
[image] [image] [image] [

невялікага польскага гораду, што сябе “паважае”. І Варшава, такім чынам, захавала за сабой статус *нармальнага* польскага гораду. З тае прычыны, што гэтага было як бы дастаткова, астатняя частка гораду забудоўвалася эклектычна, але эклектыка гэтая не пайшла на карысьць Варшаве, прынамсі, сучаснай Варшаве. Яе структурная пабудова функцыянальна стала нагадваць заштатны савецкі горад: гістарычны цэнтар, нібыта практычна некрануты (насамрэч — адноўлены); “старыя ўскраіны”, з разнароднай забудовай, зь меншай канцэнтрацыяй усялякіх забаўляльных устаноў, рэстарацыяў, кавярняў і турыстычных славутасьцяў; “новыя ўскраіны”, свайго роду субцэнтар, з гмахам (Палац культуры і навукі — PKiN — “восьмая высотка”, падораная Сталіным Варшаве — такая нелюбімая сучаснымі палякамі і — на зьдзіў — досыць упадабаная сучаснымі турыстамі за дзівосную панараму гораду), з сучаснымі гатэлямі і крамамі-гіпэрмаркетамі, з галоўным чыгуначным вакзалам (Warszawa Centralna); сапраўдныя ўскраіны, толькі шмат у чым савецкія, са шматпавярховікамі, часта аднааблічнымі; шчыльна прыслыя да гораду прадмесьці, з малапавярховай прыватнай забудовай і новымі гандлёвымі цэнтрамі ўздоўж найбуйнейшых аўтамагістраляў. Так уся “сталічнасьць”, разарваная паміж старым цэнтрам і новымі пампэзнымі будынкамі, сталася страчанай.
Менск таксама быў разбураны ў гады ВАВ, але ён *не* ўзнаўляўся, ён будаваўся наноў. Захаваўся толькі маленькі квартальчык, вельмі маленькі — але, што важна, гэта *ня* быў цэнтральны стары ўчастак, гэта — Траецкае *прадмесьце*. Так Менск страціў стары цэнтар гораду, і, відаць, таму сёньня ён арганічны. Арганічны — у адрозьненьне ад Варшавы, новы — у адрозьненьне ад Кіева. Новы Менск выйграў манумэнтальнасьцю — манумэнтальнасьцю па-савецку, з размахам — і прыгажосьцю, прыгажосьцю “па-новабеларуску”.

Ёсьць мноства складнікаў *прасторы* гораду. І адзін з найважнейшых — людзі як частка культурнага ляндшафту, калі, вядома, горад наагул фармуе такі. З Варшавай акурат у гэтых адносінах узьнікаюць праблемы: яна не адно цэлае, яна распадаецца. Стары цэнтар перасычаны турыстамі, супрацоўнікамі многіх разьмешчаных тут пасольстваў і

прадстаўніцтваў, тутэйшымі жыхарамі таксама — але яны абслугоўваюць турыстычную плынь. Новая эліта стала арганічнай часткай Варшавы новай (і акурат ёй, новай польскай несавецкай эліце не падабаецца PKiN, які нагадвае пра мінулае). Звычайныя гараджане засталіся паміж гэтымі двума полюсамі і на ўскраінах. І таму людзей *не відаць*. Каб знайсьці сапраўднага Чалавека Варшавы, трэба, напэўна, доўга жыць у гэтым горадзе.
Менск — парадны. І парадны для ўсіх адразу і практычна паўсюль у цэнтральнай частцы, дарэчы, даволі выцягнутай. І людзі адпавядаюць параднасьці гораду — адкрытыя, як шырокія праспэкты і плошчы Менску, прыязныя й даверлівыя. І нават “цяжкія” манумэнтальныя савецкія адміністрацыйныя будынкі плошчы Леніна, пераназванай усё-ткі ў плошчу Незалежнасьці, ня кідаюць ценю змрочнасьці на менчукоў, у іх заўсёды ёсьць нейкі вясёлы, задзірысты агеньчык, ён можа быць і зусім кволы, нават незразумела вясёлы, але ён ёсьць заўсёды — як і прывабныя маленькія сквэрыкі на кожным вольным месцы на вулках Менску.
Кіяўляне зусім іншыя. Яны менш адчуваюць Сталіцу; яны хутчэй адчуваюць Дом. Няхай яны нават і ня ведаюць свайго гораду, але яны адчуваюць усю спакойнасьць, памяркоўнасьць імклівага Кіева. Ён, нягледзячы ні на што, нехапатлівы. Таму што нават хуткасьць, мітусьня Кіева — хатняя, свойская, родная. Новая Ўкраіна, як вядома, першая вывучыла такія цудоўныя словы, як *самостійна, незалежна, рідна, вільна*. Дык вось, Кіеў зь сярэдзіны — гэта сталіца *Рідної України*. І кіяўляне — не сталічныя жыхары, яны проста гараджане.
Варта зірнуць на тое, як гарады сустракаюць вандроўнікаў. Кіеў — звычайным савецкім вакзалам*, нават не сталічным, звычайнай будоўляй вакол, адсутнасьцю тэлефонных аўтаматаў, “Макдональдзам” і станцыяй мэтро. Варшава — па-эўрапейску ўладкаваным падземным вакзалам (праўда, пабудаваным яшчэ за саветамі), які не замінае гарадзкому асяродзьдзю, — адным словам, як і мае быць у эўрапейскай краіне. Менскі вакзал ашаламляе: нечаканы ў маленькай краіне размах, эўрапейскі антураж, вялізныя залі, эўрапейская аддзелка, шмат шкла. А тут жа ж не чакаеш анічога эўрапейскага, асабліва калі прыяжджаеш з Масквы і не ўсьведамляеш сябе ў *іншай дзяржаве*. Праўда, карцінку вакзалу

псуюць чэргі ля абменных пунктаў дый тое, што палова электрычак адпраўляецца не з вакзалу, а з наступнай плятформы — п.п. “Інстытут Культуры”, якая зьдзіўляе сваёй правінцыйнасьцю, нечаканай у самым цэнтры сталічнага гораду. Проста Менск — *ня надта* эўрапейская сталіца.

Кіеў і Менск

Сутнасьць адрозьненьняў у гэтай пары наўпрост вынікае з задачаў, пастаўленых стваральнікамі абліччаў абодвух гарадоў: новы Менск — стары Кіеў. Менск стварае спэцыфічную, непаўторную атмасфэру, пры якой палітычныя хваляваньні, неадназначнасьць уладнай вэртыкалі адыходзяць на другі плян; узьнікае абсалютнае ўражаньне іх адсутнасьці — уражаньне, што людзі жывуць *асобна* ад палітычных калізіяў. Гэта, відаць, так і ёсьць: менчукі, людзі *прасторы*, жывуць у сваім квітнеючым горадзе, які харашэе, прыгажэе й адкрыты ўсім вятрам. Калі гэта толькі ўяўнае ўражаньне, то гэта пацьвярджае геніяльнасьць знаходкі таго архітэктара, таго PR-мэна і таго палітыка, што *стварылі* горад, які сыгналізуе пра гэта, г.зн. падманвае вандроўніка. Але Менск і менчукі кажуць, што гэта *праўда*.

А Кіеў *стары* таму, што ён захаваў свой уклад і свае традыцыі. Кіеў — правінцыйны. Але правінцыйны па-асабліваму. Манумэнтальныя ўрадавыя будынкі ў Кіеве не пануюць на плошчах (як у Менску), яны яўна прайграюць сваім архітэктурным рашэньнем старому Кіеву. Улады ж больш апякуюцца якраз старым Кіевам. Кіяўляне жывуць *іншым*. Кіеў выхаваў людзей *часу*. Афіцыйны Кіеў імкнецца стаць часткаю Вялікай Эўропы. І Кіеў стаў унутранай Правінцыяй, яшчэ ў большай ступені, чым, напрыклад, Пецярбург стаў акном Расеі ў Эўропу.

Варшава і Кракаў

Варшава па-свойму спакойная: няма затораў на вуліцах, незаўважная дзелавая актыўнасьць, няма буйных дзелавых цэнтраў і офісных будынкаў. І пры гэтым яна, несумненна, і дзелавая, і афіцыйная сталіца Польшчы. Таму тут чакаеш манумэнтальных урадавых будынкаў, якія, можа быць, не пануюць над прасторай (як у Менску), але напэўна займаюць больш важнае месца, чым у старым Кіеве. І *па-за* цэнтрам

зьяўляюцца сям-там непрыкметныя сьціплыя сядзібкі асобных міністэрстваў і ведамстваў — нечакана, убаку ад асноўных транспартных шляхоў. Варшава, як і Кіеў, — адлюстраваньне новай палітыкі дзяржавы. І, як на Ўкраіне, сталічнасьць тут набыла асаблівыя формы — ня надта гістарычныя, не зусім сучасныя, але дакладна не прасторавыя. У Варшаве няма значных музэяў; Варшаўскі ўнівэрсытэт “каціруецца” ў Эўропе значна горш за Ягелёнскі (што ў Кракаве). Але пры гэтым унівэрсытэт выглядае як прадстаўнічы “цэнтральны” будынак на фоне іншых адміністрацыйных збудаваньняў Варшавы. Прайграе ён толькі мясцовай штаб-кватэры NATO.
Кракаў жыве цэнтрам. І цэнтар нібыта цісьне на ўскраіны, не даючы ім далёка сысьці ад сябе ў пляне аблічча. Кракаў разьвіваецца не па-савецку *эвалюцыйна*. Яму ня трэба даводзіць, што ён частка Эўропы: Кракаў — эўрапейскі горад яшчэ зь Сярэднявечча. Кракаву ня трэба разьвівацца за мяжу гораду: няма ўжо Рэчы Паспалітай, для якой ён мог быць сталіцай. І горад засяродзіўся на самім сабе. Новыя будынкі тут не ўрываюцца ў старую забудову, хутчэй наадварот — старыя паўсюль залазяць у новыя раёны, робячы іх арганічным працягам старога Кракава (мімаволі ўзьнікае аналёгія з усюдыіснай навізной Менску). Кракаў адрозьніваецца ад любога старога гораду савецкай прасторы тым, што ў ім згладжваюцца адрозьненьні ў інфраструктуры паміж цэнтрам і ўскраінамі.
Выходзіць, кожны горад і кожная дзяржава па-свойму дэманструюць найлепшыя свае рысы — што і павінны паказваць сталіцы. Але акурат гэтых адрозьненьняў і шукае вандроўнік. Прыяжджаеш у горад і імкнешся знайсьці ягоную “разынку”, нешта такое, што нідзе больш ня ўбачыш, не адчуеш, не пачуеш. Таму так запамінаюцца адкрыты і парадны Менск, па-добраму правінцыйны Кіеў, сучасная, але празьмеру эклектычная Варшава, стары й прыцягальны ўсёй сваёй прасторай Кракаў.

[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Мікола Рабчук

Эмансыпацыя слова: “самвыдаў” супраць “дзяржвыдаву”

“Самвыдаў” — пераклад расейскага тэрміну *“самиздат”*, што ўвайшоў у большасьць моваў безь перакладу, таксама як *vodka*, *sputnik*, *gulag*, *intelligentsia*, *perestroika*. З этымалёгіі слова “самвыдаў” можна зрабіць выснову, што гэтым тэрмінам пазначаецца ўсякая друкаваная прадукцыя, выдадзеная самім аўтарам — ці то тэхнічна (набор, друк, капіяваньне), ці то фінансава (за свой кошт). Такая “этымалягічная” інтэрпрэтацыя, аднак, надта шырокая й недакладная. Насамрэч тэрмін “самвыдаў” узьнік у вельмі канкрэтным месцы й часе (Савецкі Саюз 1960-х гадоў) і ў яшчэ больш канкрэтным, вельмі спэцыфічным паняткавым кантэксьце савецкага “навамоўя”. Па сутнасьці, гэты тэрмін — своеасаблівая бінарная апазыцыя, іранічная рэпліка да агульнапрынятага ў СССР паняцьця “дзяржвыдаў”. Калі браць фармальна, “дзяржвыдаў” — гэта

МІКОЛА РАБЧУК (нар. 1953, Луцк) — культурны і палітычны аналітык, гісторык культуры, дасьледчык украінскага нацыяналізму. Ягоныя апошнія кнігі — “Від Малоросії до України: парадокси запізнілого націєтворення” (2000) і “Дилеми українського Фауста: громадянське суспільство і розбудова держави” (2000). Інтэлектуальны

толькі назоў дзяржаўнага выдавецтва, створанага ў 1919 у Маскве. У 1943 годзе яго перайменавалі ў “Дзяржлітвыдаў”, падобныя “дзяржвыдавы” паўсталі і ў іншых савецкіх рэспубліках. Толькі ў 1963—64 гадах яны пачалі ператварацца ў “Художественная литература” (у Маскве), “Дніпро” (у Кіеве), “Мастацкая літаратура” (у Менску) і да т. п. Факты гэтыя, перайменаваньні сталіся адной з шматлікіх прамаў аслабленьня савецкага “навамоўя”, спробаю частковага адыходу ад яе абсурднасьць.

Аднак усе выдавецтвы і надалей заставаліся дзяржаўнымі, бок партыйныя (розьніца між дзяржавай і партыяй у таталітарных дзяржавах, як мы ведаем, неістотная), прычым адзяржаўленьня ўсіх сфэраў жыцьця, распачаты бальшавікамі ў 1917 годзе, прывёў да поўнага зьнішчэньня грамадзянскай супольнасьці і, у прыватнасьці, такіх важных яе элемэнтаў, як незалежная прэса й кнігавыданьне. Тэрмін “самвыдаў”, такім чынам, стаў своеасаблівым адказам маладой грамадзянскай супольнасьці, яе першых парасткаў пасьлясталінскага часу на татальны кантроль дзяржавы (партыі) у сфэры друкаванага і ўсякага іншага публічнага слова. “Самвыдаў” быў спробаю зруйнаваць тую манаполію, і з гэтага пункту погляду сам тэрмін ёсьць нечым большым, чым задзірыстае перакрыўленьне навамоўнага “дзяржвыдаву”; па сутнасьці, гаворка ішла пра антытэзу ўсякаму таталітарнаму, падцэнзурнаму, непраўдзіваму, несвабоднаму дыскурсу, які ў самым шырокім значэньні сымбалізуе тэрмін “дзяржвыдаў”.

“Самвыдаў” можа быць вызначаны як сукупнасьць літаратурных, публіцыстычных дый іншых тэкстаў, што робяцца ды множацца саматужным спосабам, бяз санкцыяў уладаў, і распаўсюджваюцца насуперак афіцыйным забаронам і перасьледам. Умовы існаваньня самвыдаву — гэта, з аднаго боку, адсутнасьць надта жорсткіх рэпрэсій, характэрных для клясычнага таталітарызму, зь іншага — адсутнасьць сапраўднай свабоды слова, характэрнай для дэмакратычных грамадзтваў. Інакш кажучы, самвыдаў характэрны для аўтарытарных грамадзтваў рознай меры рэпрэсіўнасьці й рознай ступені адзяржаўленьня публічнага дыскурсу.

У СССР за Сталіным самвыдаў быў немагчымы, паколькі іншадумцаў зьнішчалі за самое толькі падазрэньне ў

ліў 1919 у Кіеўскае літвыдаўні. Яго існаваньня “The Nowhere Nation, або Ці маў Ўкраіна існаваньня?” “Новае поле Ільменьнік Рыцар сын Тарыса” былі надрукаваныя “Ў краю такім чудаў” “МАЯСНЕ”

іншадумстве. А за Гарбачовым самвыдаў стаў ужо непатрэбны, бо падчас перабудовы цэнзуру аслабілі, а затым і зусім скасавалі. Такім чынам, храналагічныя рамкі савецкага самвыдаву могуць быць акрэсьленыя 1960—80-мі гадамі — ад “позьняга” Хрушчова, умоўна кажучы, да “раньняга” Гарбачова. (За “раньнім” Хрушчовым самвыдаву не было, паколькі грамадзтва жыло яшчэ па інэрцыі, паралізаванае жахамі таталітарнага тэрору. Уласна кажучы, і за “позьнім” Хрушчовым самвыдаў быў пераважна літаратурны, а не палітычны — часткова дзеля згаданай інэрцыі страху, часткова дзеля намаганьняў тагачаснай інтэлігенцыі дзейнічаць у легальных рамках з шчырай вераю, што сыстэму можна палепшыць, адрадзіць “праўдзіва-ленінскі” сацыялізм зь “людзкім абліччам”. Па сутнасьці, палітычны самвыдаў пачынаецца толькі пасьля брэжнеўскага перавароту 1964 году й далейшага спыненьня хрушчоўскай “адлігі”.)
Другая ўмова існаваньня самвыдаву — наяўнасьць у грамадзтве адукаванай і адначасова больш-менш незалежнай інтэлігенцыі. Характэрныя рысы гэтай праслойкі — па-першае, ідэалягічная індактрынаванасьць, то бок схільнасьць прадукаваць і пашыраць пэўныя ідэі, ці, па-сучаснаму, інфармацыю (у тым ліку й непажаданую для кіраўнічага рэжыму); і, па-другое, своеасаблівая (хутчэй уяўная, чымся рэальная) “надклясавасьць”, інакш кажучы, схільнасьць адчуваць сябе прадстаўніком усіх клясаў і ўсёй нацыі наагул (уласна, сама канцэпцыя “нацыі” — ідэалягічная прыдумка інтэлігенцыі), што немінуча зрабіла інтэлігенцыю ў аўтарытарных дзяржавах Усходняй Эўропы паборнікам нацыянальнага й сацыяльнага вызваленьня.

Знамянальна, што зьяўленьне сьвецкай (а ня толькі царкоўнай, як дагэтуль) цэнзуры ў тых дзяржавах прыпадае на канец XVIII стагодзьдзя, г.зн. на пэрыяд паступовага выхаду інтэлігенцыі на гістарычную сцэну. Так, у Расейскай імпэрыі царскі ўказ 1783 году аб вольных друкарнях ня толькі дазваляў *“каждому по собственной воле заводить типографии”*, але і ўсталёўваў суворы папярэдні нагляд за іхнай прадукцыяй, даручаючы адпаведным цэнзурным органам не прапускаць *“ничего противного законам Божьим и гражданским или же к явным соблазнам клонящегося”* [1].

1 **Литературный энциклопедический словарь. М.: Советская энциклопедия, 1987. С. 491.**

Першымі самавыдавецкімі, ці, лепш сказаць, “протавыдавецкімі” творамі ўва Ўкраіне трэба лічыць, напэўна, гістарычныя нарысы, мэта якіх была выратаваць ад забыцця і ўвекавечыць для будучых пакаленняў гісторыю, культуру і побыт Украіны. Гэтыя нарысы, якія ў 1992 г. выйшлі ў Кіеве асобнай кнігай пад назвай “Старажытнасці Украіны”, былі напісаны ў 1846 г. Мікалаем Рыбінскім, які ў 1847 г. быў сасланы ў Аляксандраўскі ваенны форт за ўдзел у Кірыла-Мяфодзіеўскім таварыстве. Рыбінскі, як і іншыя члены таварыства, імкнуўся ўсімі сродкамі, у тым ліку і праз гістарычныя даследаванні, абудзіць у сваіх суайчыннікаў пачуццё нацыянальнай годнасці, прывіць павагу да роднай мовы, культуры і гісторыі. Ён лічыў, што ведаць гісторыю сваёй краіны — гэта не толькі абавязак, але і неабходная ўмова для таго, каб быць сапраўдным грамадзянінам. Менавіта таму ён так падрабязна апісваў побыт, звычаі, адзенне, ежу і нават забавы старажытных украінцаў, імкнучыся паказаць, што іх культура была самабытнай і каштоўнай.

Падрабязны пераказ мэты і зместу “Старажытнасцей Украіны” Рыбінскага можна знайсці ў кнізе Ігара Сліпушкі “Гісторык, паэт і рэвалюцыянер: Мікалай Рыбінскі”, выдадзенай у Кіеве ў 1992 г. Сам твор Рыбінскага, на жаль, не перавыдаваўся з 1918 г., і яго можна знайсці толькі ў старых выданнях. Аднак, нягледзячы на гэта, ён аказаў значны ўплыў на развіццё ўкраінскай гістарычнай думкі і літаратуры. Рыбінскі, як і іншыя члены Кірыла-Мяфодзіеўскага таварыства, верыў у ідэю славянскай узаемнасці, але пры гэтым падкрэсліваў самабытнасць украінскай культуры і яе адрозненне ад рускай. Гэта было важна ў эпоху, калі царскія ўлады імкнуліся ўсімі сродкамі русіфікаваць украінцаў, ператварыць іх у частку “адзінага рускага народа”.

Рыбінскі, як і іншыя члены таварыства, імкнуўся ўсімі сродкамі русіфікаваць украінцаў, ператварыць іх у частку “адзінага рускага народа”. Самы, напрыклад, Кірыла і Мяфодзій, Гогаль, Шаўчэнка, Кастамараў, Куліш, Пачатак і Канец Кірыла-Мяфодзіеўскага Таварыства, Кіеў, Навукова-дасследчая кафедра гісторыі Украіны, 1997. Кастамараў М. І. Кірыла-Мяфодзіеўскае таварыства. Кіеў:

Рэакцыя аўтарытарнай улады на паэтычны, ці, уласна, палітычны самвыдаў была вельмі жорсткая, але па-свойму заканамерная, — бо ў Шаўчэнкавых тэкстах і сапраўды імпліцытна месьціліся ўсе інкрымінаваныя яму злачынствы: *Шевченко… сочинял стихи, на малороссийском языке, самого возмутительного содержания. В них он то выражал плач о мнимом порабощении и бедствиях Украины, то возглашал о славе гетманского правления и прежней вольности казачества, то с невероятною дерзостью изливал клеветы и желчь на особ императорского дома… Сверх того, что все запрещенное увлекает молодость и людей с слабым характером, Шевченко приобрел между друзьями своими славу знаменитого малороссийского писателя, а потому стихи его вдвойне вредны и опасны… по возмутительному духу и дерзости, выходящей из всяких пределов, он должен быть признаваем одним из важных преступников* [5].

Нават пасьля высылкі Шаўчэнка хоць і ўнікае простых палітычных інвэктываў, усё ж не адмаўляецца ад далейшага распаўсюджваньня сваіх твораў праз самвыдаў, — пра што можна меркаваць, напрыклад, зь невялічкай палемікі-ліставаньня з Кулішом на пачатку 1858 году вакол толькі што напісаных “Нэафітаў”. Асьцярожны Куліш як умее адгаворвае апальнага паэта, які не пасьпеў яшчэ нават вярнуцца з высылкі (сам Куліш яшчэ заставаўся ў Ніжнім Ноўгарадзе), ад абнародаваньня такіх тэкстаў. “Твае “Нэафіты”, браце Тарасе, гожая штука, дый не для друку! — піша ён. — Ня варта напамінаць добраму сыну (г.зн. Аляксандру II) аб бацьку-нябожчыку (Мікалаю I, што памёр у 1855 годзе), чакаючы ад сына якога б ні было дабра. Ён жа ў нас цяпер першы чалавек: каб ня ён, дык і дыхнуць нам не далі б. А свабода прыгонных — то ж ягоная справа. Найбліжэйшыя цяпер да яго людзі духоўныя — мы, пісьменьнікі, а не пузатыя чыны. Ён любіць нас, ён дае нам веры, і вера ня зганьбіць яго. Таму ня толькі друкаваць гэтую рэч рана, дый дазволь мне, браце, не пасылаць і Шчэпкіну, бо ён зь ёю пачне ўсюды насіцца, і пойдзе чутка, што зусім ня трэба пускаць цябе ў сталіцу”.

“Які там табе нячысты казаў, — адказвае напаўжартаўліва, напаўраздражнёна Шаўчэнка, — што я падрыхтаваў сваіх “Нэафітаў” для друку? І згадкі, і думкі не было. Я паслаў іх табе толькі прачытаць, каб ты бачыў, што я тут ня склаўшы

рукі сяджу. І стары Шчэпкін не такі, каб ён там вазіўся ў Маскве зь імі як зь пісанай торбаю. І ты аддай чысьценька перапісаць іх і пашлі старому, бо ён ужо ведае, што “Нэафіты” ў тваіх руках” [6].

У выніку лібэральных рэформаў 1860-х гадоў і, у прыватнасьці, замены ў Маскве й Пецярбурзе так званай папярэдняй цэнзуры карнаю, самвыдаў у Расейскай імпэрыі прыходзіць у заняпад. Гэтаму спрыяла таксама пашырэньне сувязяў з замежжам і масавы завоз адтуль выданьняў, што не праходзілі праз цэнзуру. Побач зь Венай, Бэрлінам, Жэнэваю значнымі цэнтрамі ўкраінскага кнігавыданьня становяцца галіцкія гарады Каламыя й Львоў (на той час — тэрыторыя адносна лібэральнай Аўстра-Вугоршчыны). Самвыдаў у Расейскай імпэрыі, такім чынам, пасьпяхова маргіналізуецца, робячыся аб’ектам дзейнасьці пераважна радыкальных, экстрэмісцкіх палітычных групаў. Такі ж стан рэчаў захоўваецца і ў Савецкай імпэрыі ў яе першыя, адносна лібэральныя дзесяцігодзьдзі.

Першыя адважнікі

Замацаваньне сталінізму, як ужо казалася, рабіла немагчымым існаваньне ня тое што самвыдаву, але і якіх-кольвек драбнейшых формаў грамадзянскага непадпарадкаваньня. Адзіным істотным выняткам з гэтага правіла можна лічыць досыць вялікую сетку вырабу й распаўсюджваньня самвыдаву, створаную ў Заходняй Украіне Арганізацыяй украінскіх нацыяналістаў і падтрыманую цягам амаль цэлага паваеннага дзесяцігодзьдзя Ўкраінскай паўстанцкай арміяй. Трэба памятаць, аднак, што тая сетка не зьявілася (дый не магла зьявіцца) у рамках таталітарнай сыстэмы; яна дасталася сталінскаму рэжыму як своеасаблівая спадчына ад аўтарытарнай (але не таталітарнай!) Польшчы на акупаваных заходнеўкраінскіх землях. Па сутнасьці, гэта быў рух супраціву на акупаванай саветамі тэрыторыі, а не “дысыдэнцтва” ў межах СССР. Гэты рух мог сілкавацца нейкі час назапашанымі людзкімі, матэрыяльнымі й духоўнымі рэсурсамі, але без падтрымкі збоку ён быў асуджаны на бязьлітасны таталітарны тэрор.

Зразумела таксама, што пасьля частковага выкрыцьця сталінізму паралізаванае страхам грамадзтва патрабавала пэўнага часу для знаходжаньня ўласнага голасу й

фармуляваньня ўмоваў, якія б ішлі няхай не насуперак, але ўсё ж далі б больш, чым палавіністыя й непасьлядоўныя спробы афіцыйнай улады дэсталінізаваць краіну. На пачатку “адлігі” гэтыя спробы здаваліся досыць радыкальнымі, а грамадзянская супольнасьць была надта слабой і неструктураванай, каб намагацца хоць неяк радыкалізаваць “зьнізу” рэформы, распачатыя “зьверху”. Фактычна, інтэлігенцыя 50-х гадоў ставілася да Хрушчова прыблізна таксама, як П.Куліш — да Аляксандра II (“Ён жа ў нас цяпер першы чалавек; каб ня ён, дык і дыхнуць нам не далі б. А свабода прыгонных — то ж ягоная справа”. З часам тая вернападданьніцкая парадыгма адродзіцца што да Гарбачова і нават да Краўчука, з акцэнтам, праўда, на другой частцы Кулішавай формулы: “Найбліжэй цяпер да яго людзі духоўныя — мы, пісьменьнікі, а не пузатыя чыны. Ён любіць нас, ён дае нам веры, і вера ня зганьбіць яго”). Зразумела, што першымі самавыдавецкімі тэкстамі пасьлясталінскага часу сталі літаратурныя творы, якія прызначаліся пераважна для друку, але, між іншым, не прайшлі празь пільнае рэдактарскае (радзей — цэнзарскае) вока. Гэткага роду самвыдаў быў ці, прынамсі, выглядаў адносна бясьпечным, паколькі яго творцы заўжды маглі адбіцца тым, што не яны вінаватыя ва “ўцечцы інфармацыі” з рэдакцый і выдавецтваў, у якія падаваўся рукапіс, а распаўсюднікі такога самвыдаву заўжды маглі сьцьвярджаць, што маюць справу з цалкам “законапаслухмянымі” тэкстамі, пададзенымі ў афіцыйны друк. Гэтая традыцыя з часам пашырылася й на самавыдавецкую публіцыстыку, напісаную ў форме палемічных артыкулаў і адкрытых лістоў, што адсылаліся ня толькі ў рэдакцыі, але і ў розныя партыйныя й дзяржаўныя органы, да службовых асобаў і да т. п. Хаця ў большасьці выпадкаў галоўным адрасатам такіх пасланьняў было замежжа: творцы самвыдаву досыць хутка зразумелі, што ніякае пашырэньне машынапісных тэкстаў на цыгарэтнай паперы сярод аднадумцаў ня дасьць творам такога розгаласу, як перадача тых самых тэкстаў праз радыё з-за мяжы. Гэта яшчэ раней усьвядоміла савецкая палітычная паліцыя, якая галоўную сваю ўвагу засяродзіла на сувязях дысыдэнтаў з замежжам дый на самой інфармацыі, што трапляла туды — у найменш жаданы бок. Факт падачы самавыдавецкага твору ў афіцыйныя інстанцыі перастаў, такім чынам, быць “зьмякчальнай”

акалічнасьцю, але сам прыём усё ж выкарыстоўваўся й надалей — часткова па інэрцыі, часткова дзеля вонкавага, перадусім міжнароднага эфэкту.

Георгі Касьянаў у сваёй кнізе “Незгодні: українська інтеліґенція в русі опору 1960—80-х років” (Київ: Либідь, 1995) цалкам слушна сьцьвярджае, што “самвыдаў быў ня проста інтэлектуальным падмуркам супраціву, але і ці не найгалоўнейшай формаю ягонага існаваньня. Да ўзьнікненьня й разьвіцьця іншых праяваў духоўнага “андэрграўнду” (рок-музыка, поп-арт і інш.) ён быў адзінай, найбольш структураванай, формаю духоўнай апазыцыі”. Досыць умоўна разьвіцьцё ўкраінскага самвыдаву можна разьбіць на тры этапы: “Першы — літаратурны самвыдаў пачатку 1960-х гадоў, збольшага паэзіі, а таксама артыкулаў, якія тычыліся пытаньняў літаратуры. Другі этап — зьяўленьне палітычных артыкулаў, ананімнай публіцыстыкі (1963—65 гг.). І, нарэшце, трэці — другая палова 60-х гадоў, — гэта пэрыяд пашырэньня артыкулаў з аўтарскімі подпісамі, публіцыстыкі, а таксама дакумэнтаў, аўтары якіх не хавалі сваёй датычнасьці да іх” [7]. Г.Касьянаў досыць дакладна аналізуе асноўныя творы палітычнага самвыдаву 60-х гадоў, ад ананімнага памфлету “З нагоды працэсу над Пагружальскім” (1964) і “клясычнай” працы Івана Дзюбы “Інтэрнацыяналізм ці русіфікацыя?” (1965) да зьявленьня “ундэрнай” літаратуры пры канцы 60-х (“Бяльмо” М.Асадчага, “Гора ад розуму” В.Чарнавола, “Запаведнік імя Берыі” В.Мароза) дый, нарэшце, выхаду ў 1971 г. праваабарончага часопісу “Український вісник”. Галоўнай тэмаю ўсіх гэтых выданьняў, піша дасьледнік, было нацыянальнае пытаньне, якое “аналізавалася ў двух узаемазвязаных аспэктах: палітычным і, так бы мовіць, культурным, які ў канкрэтным гістарычным кантэксьце таксама меў палітычную афарбоўку” [8].

Большасьць твораў тагачаснага самвыдаву пісалася з марксісцкіх пазыцыяў — часткова таму, што гэта адпавядала сьвятаполяду аўтараў, часткова зь меркаваньняў бясьпекі (непрыхаваны антыкамунізм караўся сыстэмаю найбольш жорстка: дастаткова згадаць хаця б максымальны тэрмін зьняволеньня для Валянціна Мароза — “нэаданцавіста”, г.зн. пасьлядоўніка ідэоляга ўкраінскіх нацыяналістаў Данцова), а

7 Касьянов. Цыт. твор. С.88-89.

8 Тамсама. С.92.

9 Тамсама. С.90.

10 Тамсама. С.103.

11 Тамсама. С.193.

часткова таму, што такім быў тады “надзеяў далягляд” на Таварыства.

“Стан масавай сьвядомасьці інтэлігенцыі й масавай сьвядомасьці наагул вызначаў узровень крытыкі сыстэмы” [9]. Наступствам таго флірту (ці кампрамісу) з “сапраўдным”, “неперакручаным” марксізмам-ленінізмам была ўтрымленка Богдан Сосна, Change and National Consciousness in Twentieth-Century Ukraine. New York: St. Martin’s Press, 1985, P. 250–251, ленінізм ня меў якогасьці цэласнага погляду на нацыянальнае пытаньне, да Першай сусьветнай вайны тая праблематыка ў ленінізьме ўвогуле ігнаравалася, а з часам даволі цынічна падпарадкоўвалася практычным патрэбам “клясавай барацьбы”, то бок інтэрпрэтавалася на розныя лады, у залежнасьці ад кантэксту дый бягучых патрэбаў. Выходзіла, што на кожную цытату з “праўдзівага” Леніна можна было знайсьці цытату зь Леніна “перакручанага” (ці наадварот), і ўся дыскусія, такім чынам, лёгка зводзілася, па назіраньні Г.Касьянава, “да схаластыкі” [10]. Аддаючы належнае грамадзянскай мужнасьці дысыдэнтаў і высокім маральным крытэрам іхнай самавыдавецкай творчасьці, дасьледнік справядліва ўказвае й на ейную тэматычную дый інтэлектуальную абмежаванасьць, нястачу канструктыўных праграмаў, павярхоўнасьць аргумэнтацыі. Да ўсяго гэтага, давалася ў знакі “правінцыйнае становішча ўкраінскай культуры, якое праграмавала адпаведны ўзровень усьведамленьня інтэлігенцыяй сваіх задач, узровень інтэнсіўнасьці рэпрэсій супраць іншадумцаў, надзвычай неспрыяльныя ўмовы разьвіцьця руху супраціву, калі даводзілася ахвяраваць якасьцю інтэлектуальных экзэрсысаў на карысьць больш руціннай, будзённай “арганізацыйнай” працы” [11].

Таму ўкраінскі самвыдаў 60-х гадоў характарызуецца толькі як “падрыхтоўчы этап да фармаваньня палітычнай праграмы іншадумства, ці руху супраціву. Працэс фармаваньня гэтай праграмы быў перарваны арыштамі й судамі. У выніку, ён спыніўся ў фазе фармуляваньня дэструкцыйных пастулятаў і антытэз... Аднак для саміх шасьцідзясятнікаў гэта было неабыякім прагрэсам, ён сьведчыў пра пачатак фармаваньня палітычнай апазыцыі... Практычна ўсе палітычна актыўныя іншадумцы бралі ўдзел у напісаньні й распаўсюджваньні самавыдавецкіх твораў. Праз самвыдаў наладзілася сыстэма

[12] Тамсама. С. 95, 119.

[13] Krawchenko Bohdan Social Change and National Consciousness in Twentieth-Century Ukraine. New York: St. Martin’s Press, 1985, P. 250–251.

стала дзейных кантактаў між імі. Гэта была арганізацыйная база руху супраціву", своеасаблівая "партыя самвыдаву" [12]. Па падліках канадзкага дасьледніка Б.Краўчанкі, ува Ўкраіне ў 1960—72 гг. дзеяла блізу тысячы дысыдэнтаў [13]. Нават калі дапусьціць, што насамрэч іх было больш і што ў наступным, асабліва рэпрэсіўным дзесяцігодзьдзі ўсё-ткі зьявіліся новыя людзі, агульная колькасьць украінскіх дысыдэнтаў, якія мелі дачыненьне да палітычнага самвыдаву, наўрад ці перасягала паўтары—дзьве тысячы. Ведаючы спэцыфіку пашырэньня самвыдаву, можна лічыць, што вакол кожнага дысыдэнта было ад некалькіх да, максымум, дзесяці зь лішкам "спачувальнікаў". Усё гэта дае падставы зь вялікай упэўненасьцю сьцьвярджаць, што нават самыя папулярныя творы палітычнага самвыдаву даходзілі ня больш як да дзесяцёх, у найлепшым выпадку дзесяцёх зь лішкам тысяч чытачоў.

Г. Касьянаў, такім чынам, мае рацыю, калі сьцьвярджае, што "дысыдэнты супрацьстаялі сыстэме ўва ўмовах пераважна варожага стаўленьня да іх з боку большасьці" і што палітычны самвыдаў быў у пэўным сэнсе маргінальнай зьявай у СССР. Прычынаю таго была, з аднаго боку, досыць моцная камуністычная "контрапрапаганда", вынікі якой, уласна, не пераадоленыя й дасюль, а зь іншага боку — інэрцыя "генэтычнага" страху, народжаная сталінізмам і ўмела падтрыманая партыйна-кагэбісцкай машынай пасьлясталінскага часу.
Ува Ўкраіне на тыя дзьве прычыны накладалася яшчэ й трэцяя — перадузятае альбо нават адкрыта варожае стаўленьне расейскага дыямаратэйшчанага насельніцтва да ўсяго "сьвядома-ўкраінскага", а тым больш "нацыяналістычна"-дысыдэнцкага. (Выразнай мяжы між тымі дзьвюма зьявамі, прынамсі, не існавала: досыць часта яны атаясамліваліся ня толькі ў кадэбісцкіх рэзалюцыях, але і ў масавай сьвядомасьці.) Характэрным прыкладам такога масавага стаўленьня да дысыдэнтаў дый іхных тэкстаў будуць, зразумела, не стандартныя "лісты працоўных", напісаныя пад партыйную дыктоўку ў рамках чарговай кампаніі "ўсенароднага" асуджэньня тых ці іншых "адшчапенцаў", а адзінкавыя "прыватныя" водгукі, створаныя, як той казаў, ад сэрца і не

14 Касьянов. Цыт. твор. С.128.

15 Krawchenko. Ibid. P.251.

сапсаваныя парткамаўскім рэдагаваньнем. Г. Касьянаў прыводзіць бліскучы ўзор такога пасланьня — водгук аднаго ці некалькіх рабочых на пакаяннае выступленьне дысыдэнткі Зіновіі Франко па тэлевізіі: “Мы, працаўнікі фабрыкі “Сьветач”, ад дзяцінства ведаем, што ты за птушка, але ж твая гордасьць за дзеда свайго, падлюка, кроў бы цябе ясная заліла, курва ты. Табе савецкая ўлада дала ўсё і тваім дзецям, а ты, што граеш на руку імпэрыялістам, бачце, што яе схапіла на гарачым, раскаялася гадзюка...” [14].

Па даследаваньнях Б.Краўчанкі, з 1942 дысыдэнтаў, што дзеялі ўва Ўкраіне ў 1960—72 гг., 77,2% былі ўкраінцамі і толькі 0,5% — расейскамоўнымі (яшчэ 2,9% склалі яўрэі, а 19,4% — прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў, 1268 выявіць не ўдалося) [15]. Г.Касьянаў лічыць гэтыя дадзеныя цалкам заканамернымі: “Расейская інтэлігенцыя ўва Ўкраіне жыла й працавала ўва ўмовах адноснага ідэалягічнага камфорту і ў любым выпадку не ўціскалася па нацыянальных матывах, таму ёй не было асаблівай патрэбы разьвіваць нацыянальную культуру ў рамках сыстэмы” [16]. Да сказанага можна дадаць, што расейскамоўная меншасьць ува Ўкраіне была прывілеяваная ня толькі палітычна й культурна — як прадстаўнікі імпэрскай большасьці, але й сацыяльна — як гарадзкое насельніцтва, якое з пагардай ставілася да сельскіх, запрыгоненых калгасным ладам украінафонаў.

Тым часам самі гарады былі пераважнай, калі не выключнай, базаю дысыдэнцтва — як з-за высокай канцэнтрацыі тут інтэлігенцыі, так і з-за вышэйшай сацыяльнай мабільнасьці, а таксама свабоды гарадзкіх жыхароў у параўнаньні зь вясковымі, даведзенымі, па сутнасьці, да напаўрабскага стану. Паводле зьвестак Б.Краўчанкі, толькі 9% украінскіх дысыдэнтаў жылі ў сельскай мясцовасьці [17] — і гэта пры тым, што амаль дзьве траціны іх (59%) паходзілі зь сялян [18]. Як вынік, сацыяльная база ўкраінскага дысыдэнцтва, а таму й самвыдаву, была вельмі абмежаваная. Амаль усе дысыдэнты жылі або ў Галіччыне (34%), дзе гарадзкое асяродзьдзе было адносна мала русіфікаванае, або ў Кіеве (38%), дзе канцэнтрацыя інтэлігенцыі наагул была надзвычай высокаю праз сталічны статус. (Яшчэ 19% дысыдэнтаў прыпадала на Крым, дзе большасьць, відавочна, былі татары, а таксама на гарады зь мільённым насельніцтвам — Днепрапятроўск, Харкаў

16 Касьянаў Г. Цыт. твор. С.191.

17 Krawchenko B. Ibid. P.251.

18 Bilocerkowycz J. Soviet Ukrainian Dissent: A Study of Political Alienation. Boulder, Colorado, London, 1988. P.67.

19 Krawchenko B. Ibid. P.251.

дый Адэсу, дзе значную частку складалі, вядома, габрэі. На астатнія 17 абласьцей Украіны прыпадала 9% дысыдэнтаў і, мабыць, прыблізна столькі ж палітычнага самвыдаву) [19].
І ўсё-ткі, нягледзячы на ўсю сваю вонкавую грамадзкую маргінальнасьць, самвыдаў досыць моцна паўплываў на папулярную культуру ўсёй краіны — і ня толькі падчас перабудовы, калі самавыдавецкі бум 1987—90-х гадоў завяршыўся ўрэшце поўнай легалізацыяй і заканамерным зьнікненьнем самвыдаву. Па-першае, мусім памятаць, што і ў папярэднія гады некаторыя творы самвыдаву даходзілі да дзесяцёх зь лішкам тысячаў чытачоў, г.зн. мелі прыблізна тую самую аўдыторыю, што і большасьць сёньняшніх украінскіх выданьняў. Зрэшты, вузіня чытацкага кола кампэнсавалася тым, што бальшыня чытачоў самвыдаву былі прафэсіяналы, грамадзка актыўныя й палітычна/нацыянальна заангажаваныя. Па-другое, рэальная аўдыторыя самвыдаву была значна шырэйшай дзякуючы перадачам замежных радыёстанцыяў, якія слухала калі й ня большасьць, то, ува ўсякім разе, значная частка савецкіх інтэлігентаў. І хаця нават ува Ўкраіне інтэлігенцыя слухала ахвотней расейскія, чым украінскія радыёгаласы, інфармацыя пра значныя зьявы ўкраінскага самвыдаву да слухачоў трапляла — калі не з украінскіх, дык прынамсі з расейскіх крыніц.
І, па-трэцяе, акрамя палітычнага, існаваў надзвычай разнастайны літаратурны і ўсякі іншы самвыдаў, што, уласна, і меў самае непасрэднае дачыненьне да папулярнай культуры. Большая частка гэтага самвыдаву была расейскамоўнаю зь дзьвюх прычын.

Па-першае, таму што асяродкам пашырэньня самвыдаву былі, у асноўным, гарады, якія й дасюль пераважна расейскамоўныя. Украінскамоўная інтэлігенцыя ў большасьці гарадоў была досыць малалікая і адначасна больш радыкальная і палітызаваная — з-за свайго каляніяльнага, прыніжанага статусу. Фактычна ўжо сам выбар украінскай мовы ў расейскамоўным асяродзьдзі быў выклікам ня толькі самому асяродзьдзю, а й пэўнай дзяржаўнай палітыцы і таму небеспадстаўна трактаваўся як адна з праяваў “нацыяналізму” (што за савецкім часам было, па сутнасьці, напаўкрымінальным абвінавачаньнем). Зразумела, што такая сацыяльна

маргіналізаваная інтэлігенцыя калі ўжо й ангажавалася ў якуюсь самавыдавецкую дзейнасьць, то выключна ў палітычную. На штосьці іншае яна ня мела ані сілы (праз сваю малую колькасьць і маргіналізаванасьць), ані ахвоты (праз прыніжаны статус украінства агулам і, адпаведна, пераважную арыентацыю ўкраінскамоўнай інтэлігенцыі на палітычныя, нацыянальна-вызваленчыя прыярытэты).
А па-другое, пашырэньне расейскамоўнага самвыдаву было справаю значна больш бясьпечнаю — і тое ня толькі аб'ектыўна, з-за пэўнай дзяржаўнай палітыкі, але і суб'ектыўна, з-за асаблівай прадузятасьці, падазронасьці дый проста страху насельніцтва перад дэманізаваным "украінскім буржуазным нацыяналізмам", пад які лёгка можна было падвесьці ўсё ўкраінскае. Трэба памятаць таксама, што за расейскім самвыдавам стаяла значна мацнейшая расейская культура й значна лібэральнейшыя, то бок менш рэпрэсіўныя завядзёнкі, што панавалі ў Маскве й Ленінградзе, адкуль, уласна, і прыходзіла ўва Ўкраіну большасьць самавыдавецкіх матэрыялаў. (Знамянальны той факт, што расейскамоўная інтэлігенцыя ўва Ўкраіне, нягледзячы на сваю значную колькасную перавагу над інтэлігенцыяй украінскамоўнаю, па сутнасьці, так і не стварыла ўласнага самвыдаву.)

"Мастацтва дзеля мастацтва"
Улада ставілася да непалітычнага, пераважна расейскамоўнага самвыдаву збольшага талерантна. На тое было, відавочна, некалькі прычынаў. З аднаго боку, непалітычны самвыдаў не прызначаўся для экспарту за мяжу, а таму й не чапаў дзялянкі, якая ахоўвалася КГБ найбольш старанна і жорстка. А зь іншага боку, такі самвыдаў нэўтралізаваў ці, прынамсі, лякалізаваў энэргію патэнцыйна "бунтарскай" інтэлігенцыі ў сфэру несанкцыянаванай дзейнасьці, якая была ў цэлым бясьпечная (ува ўсякім разе, ня надта пагрозьлівая) для рэжыму. Займаючыся такім самвыдавам, інтэлігенцыя задавальняла да пэўнай меры духоўную патрэбу ў "недазволеных" тэкстах, у "забароненых" інтэлектуальных пладах, якія выглядалі з тае прычыны асабліва салодкімі, і адначасова заспакойвала свае сацыяльныя амбіцыі, дэманструючы (галоўным чынам сабе) пэўнае франдзёрства й "вальнадумства" да аўтарытарнай улады. У пэўным сэнсе тое была сублімацыя духоўных,

інтэлектуальных ды сацыяльных патрэбаў і адначасна скіраваньне тых патрэбаў у цалкам бясьпечнае — як для ўлады, так і для інтэлігенцыі — рэчышча.
Можна дапусьціць, што КГБ меў свае падставы не “зважаць” на пашырэньне непалітычнага самвыдаву. З аднаго боку — з прычыны яго сублімацыйных функцыяў; зь іншага — таму што толькі на такім, “бясьпечным”, самвыдаве тайная паліцыя мела магчымасьць адсочваць шляхі яе вырабу й распаўсюджваньня, выяўляць патэнцыйных актывістаў самавыдавецкага руху й вэрбаваць іх або накідаць іншага роду “апеку”, а таксама закідаць у самавыдавецкі абарот уласныя правакацыйныя тэксты (накшталт “Пратаколаў сіёнскіх мудрацоў” і да т. п.).
Пашырэньню непалітычнага самвыдаву ў 70-я гады спрыялі два фактары, якія можна ўмоўна акрэсьліць як “пазытыўны” і “нэгатыўны”. “Пазытыўным” фактарам трэба лічыць пашырэньне сацыяльнай і тэхнічнай базы самвыдаву, у выніку: (а) колькаснага павелічэньня гарадзкой інтэлігенцыі, якая, можна сказаць, і была галоўным распаўсюднікам несанкцыянаваных тэкстаў, і (б) зьяўленьня прамысловых кампутараў і ксэракапіявальных машын у дзяржаўных установах. Хаця ўся тая аргтэхніка жорстка кантралявалася ўладаю (ксэраксы ўсе былі пад наглядам “асобых аддзелаў”, г. зн. прадстаўніцтваў КГБ на прадпрыемствах і ўва ўстановах, і доступ да іх для большасьці супрацоўнікаў быў сувора забаронены), кампутарныя раздрукоўкі й ксэракопіі паступова пацясьнілі ў “непалітычнай” сфэры такія традыцыйныя формы пашырэньня самвыдаву, як фатакопіі й перадрукоўкі на цыгарэтнай паперы праз капірку (што давалі магчымасьць адной машыністцы за раз вырабляць 10—15 экзэмпляраў цяжкачытэльнага тэксту). Паколькі магчымасьці новай капіявальнай тэхнікі былі значна шырэйшыя, то і пакараньні за выраб на ёй палітычнага самвыдаву былі найбольш жорсткія. Апроч таго, закансьпіраваць дзяржаўны кампутар або ксэракс было практычна немагчыма — у адрозьненьне ад прыватнай друкарскай машынкі ці фоталябараторыі. Таму само зьяўленьне капіявальнай тэхнікі амаль не паўплывала на пашырэньне палітычнага самвыдаву. Затое непалітычны самвыдаў пражыў дзякуючы той тэхніцы сапраўдны росквіт. Асобы, што мелі доступ да ксэраксаў, капіявалі несанкцыянаваныя тэксты для сябе, для сяброў, для

супрацоўнікаў і нават для незнаёмых людзей — за адпаведную плату (грашыма, цукеркамі, паўлітрамі і да т. п.). Пакараньне за такую дзейнасьць было адносна мяккае: вымова, перавод на іншую пасаду, звальненьне з працы. Часам, праўда, “шылі” крымінальны артыкул — але для гэтага, як правіла, КГБ мусіў мець да “злаўмысьнікаў” яшчэ якіясьці, больш сур’ёзныя, прэтэнзіі.
“Нэгатыўны” фактар, што на свой лад паспрыяў пашырэньню непалітычнага самвыдаву, зьвязаны з далейшым крызысам афіцыйнай ідэалёгіі і, адпаведна, пошукам разумных альтэрнатываў або нават сурагатаў, якія кампэнсавалі б духоўную пустэчу ў атэістычным грамадзтве пасьля таго, як сьвецкая рэлігія — камунізм — аказалася мёртваю. Трэба мець на ўвазе таксама, што якраз у той час цалкам верагодны рух інтэлігенцыі ў несанкцыянаваную палітычную сфэру быў жорстка заблякаваны суворымі рэпрэсіўнымі акцыямі рэжыму супраць дысыдэнтаў. 28 чэрвеня 1971 году ЦК КПСС прыняў сакрэтную пастанову “Аб загадах па супрацьдзеяньні нелегальнаму распаўсюджваньню антысавецкіх ды іншых палітычна шкодных матэрыялаў”. Неўзабаве ЦК КПУ прыняў аналягічную пастанову, расставіўшы ў ёй, ясная рэч, антынацыяналістычныя акцэнты. Для эфэктыўнага правядзеньня карных акцыяў старшынём КГБ Украіны быў прызначаны заўзяты сталініст В.Федарчук. У пачатку 1972 году ў Кіеве, Львове дый іншых гарадох Украіны адбыліся масавыя арышты іншадумцаў. Амаль усе яны атрымалі надзвычай вялікія (па дзесяць і болей гадоў) тэрміны зьняволеньня й высылак. У тым самым годзе зьнялі занадта “лібэральнае” (з пункту гледжаньня рэжыму) кіраўніцтва КПУ. Шырокамаштабныя “чысткі” адбыліся ў партыі, у навуковых і навучальных установах, часопісах і выдавецтвах і г. д. У выніку ўсіх тых загадаў палітычны самвыдаў ува Ўкраіне практычна перастаў існаваць.

Аднак вызваленая хрушчоўскай “адлігаю” інтэлектуальная й духоўная энэргія грамадзтва ўжо не зьмяшчалася ў рамкі афіцыйнай ідэалёгіі й жорстка рэглямэнтаванай дзейнасьці. Каб нэўтралізаваць тую энэргію, рэжыму заставалася толькі зноў вярнуцца да тагачаснага тэрору сталінскага часу й да яшчэ большага ізаляцыянізму ў замежнай палітыцы. Першага ўлада

20 Касьянов. Цыт. твор. С.184.

не хацела, другога не магла. А таму ў 60—70-х гадах савецкая інтэлігенцыя “часткова выйшла з-пад татальнага кантролю й дыктату дзяржавы” [20]. Асьцерагаючыся непасрэднага (і дужа небясьпечнага) умяшаньня ў палітычную сфэру, гэтая інтэлігенцыя досыць энэргічна асвойвала ўсё іншыя дзялянкі інтэлектуальнага жыцьця, якія не вялі яе да простай канфрантацыі з уладаю.

Перадусім тое тычыцца такіх цалкам легальных сфэраў, як літаратура й філязофская клясыка (у тым ліку арыентальная), сучасная замежная літаратура, кіно, мастацтва, творы савецкіх (пераважна расейскіх) аўтараў, якім дазвалялася выходзіць за межы кананічнага сацрэалізму. Далей ішлі сфэры напаўлегальныя — дасавецкія, дасталінскія, а часам і дабрэжнеўскія выданьні дый іхныя “супрацьзаконныя” копіі (як, скажам, “Адзін дзень Івана Дзянісавіча”, “Майстар і Маргарыта” або “Цішыня й гром” Сіманенкі). Сюды ж далучаўся і досыць вялікі масіў філязофска-рэлігійных тэкстаў (“Цытадэль” Экзюпэры, творы Фларэнскага, Салаўёва ды іншых расейскіх філёзафаў пачатку стагодзьдзя, тэксты зь ёгі, тантрызму, дзэн-будызму, крышнаізму і інш.). Да напаўлегальнай належала й палітычна нэўтральная творчасьць дыяспарных аўтараў — ад Набокава да паэтаў нью-ёрскай групы, а таксама некаторых польскіх, чэскіх, славацкіх пісьменьнікаў, апублікаваных на радзіме ў часы “адлігаў”. Асаблівае месца ў напаўлегальнай сфэры займалі афіцыйныя публікацыі з паметаю “ДСК” (“Для службовага карыстаньня”) — размаітыя аналітычныя матэрыялы дасьледчых інстытутаў, засакрэчаная статыстыка, агляды й рэцэнзіі замежных навінак, што рыхтаваліся для спэцыялістаў акадэмічнымі інстытутамі літаратуры, кінамастацтва і інш., а таксама вайсковыя выданьні — ад спэцыяльных часопісаў да звычайных газэт вайсковых акругаў, якія можна было выпісаць і нельга было купіць у розьніцу. Самавыдавецкі статус усіх гэтых выданьняў вызначаўся, ясная рэч, ня іхным зьместам, а толькі несанкцыянаваным спосабам выкарыстаньня.

Далучэньні якіхсьці бязьвінных тэкстаў накшталт кнігі Дэйла Карнэгі “Як здабываць сяброў і ўплываць на людзей” да “дзяржаўнага самвыдаву”, то бок да “ДСК”, немажліва растлумачыць рацыянальным чынам, калі не ўлічыць агульнай дзяржаўнай параноі, характэрнай для савецкай улады, і

глыбокай падазронасьці да якіх-небудзь немарксісцкіх, “нематэрыялістычных” канцэпцыяў. У выпадку Карнэгі ўладу магло насьцярожыць у роўнай ступені і “абстрактна”-гуманістычнае вызначэньне чалавека як складанай істоты, як асобы (а ня гайкі й шруба), і, адначасова, тое, што ім (чалавекам) можна маніпуляваць з дапамогаю даволі простых псыхалягічных прыёмаў. Здаецца, з тых самых прычын пад грыф “для навуковых бібліятэк” трапіў і пераклад кніжкі амэрыканскага псыхоляга Эдварда дэ Бано пад характэрнай назваю “Нестандартнае мысьленьне”, а кнігі некаторых расейскіх аўтараў, што займаліся падобнай праблематыкаю (як Уладзімер Леві, напрыклад), лічыліся напаўапальнымі й таму былі асабліва папулярныя сярод лібэральнай інтэлігенцыі.
Ня выключана, што “апальнасьць” асобных тэкстаў спараджалася выключна “ведамаснай цэнзураю”, то бок пэўнымі карпарацыйнымі інтарэсамі навуковых дый іншых кланаў, што імітавалі ідэалягічную “пільнасьць” яшчэ з часоў барацьбы з генэтыкай і кібэрнэтыкай. Такім чынам, у самвыдаў траплялі нават перакладныя брашуры замежных аўтараў па пытаньнях здаровага харчаваньня (харчаваньне сырым, вэгетарыянства, лячэбнае галаданьне); у самвыдаве апыналіся й іншыя тэксты пра “нетрадыцыйныя” мэтады лекаваньня — ад урынатэрапіі, гамэапатыі, мануальнай тэрапіі, водных і дыхальных працэдураў да сапраўды фантастычных мэтадаў парапсыхалягічнага лекаваньня.
Ува ўсім гэтым, безумоўна, праглядала варожасьць матэрыялістычнай, праграмна атэістычнай дзяржавы да ўсялякай містыкі й мэтафізыкі, у выніку чаго ў самвыдаў выціскаліся ня толькі ўсе тэксты па парапсыхалёгіі, а й папулярныя аповеды пра ўсякія таямніцы прыроды (Атлянтыда, Шамбала, Бэрмудзкі трохкутнік), НЛА, дзівосныя прадказаньні будучыні (ад Настрадамуса да Вангі), падручнікі па ёзе, каратэ і да т.п.
Зь іншых прычынаў выціскалася ў самвыдаў літаратура па пытаньнях сэксу, культуры полавых зносінаў — ад папулярных брашур накшталт “Майстэрства быць удваіх” да клясычнай “Камасутры”. Тут ужо праяўлялася іншая непрыязнасьць — непрыязнасьць таталітарнай дзяржавы да сфэры прыватнага й непадкантрольнага (ці, прынамсі, недастаткова кантраляванага) жыцьця сваіх грамадзянаў. Зразумела, што

сэкс быў той дзялянкаю, што найменш паддавалася адзяржаўленьню, а таму ўлада, ня маючы магчымасьці тую дзялянку “закрыць”, проста замоўчвала яе (“у нас секса нет”). Адным з наступстваў такой палітыкі была досыць сур’ёзная неабазнанасьць звычайных грамадзянаў у пытаньнях полавых зносінаў; іншым, больш важным для нашай тэмы вынікам было функцыянаваньне вышэйзгаданай папулярнай літаратуры ў рэжыме маскульту, дзе яна праз забароненасьць выконвала неўласьцівую ёй ролю такога сабе “мяккага порна”.
(Між іншым зазначым, што “крутая парнуха” ў СССР мела даволі вузкае кола абарачэньня — пераважна ў крымінальным і калякрымінальным сьвеце, але пратачалася часам і ў салдацкае асяродзьдзе, дзе побыт шмат у чым збліжаўся зь лягерна-крымінальным. Грамадзянскай маргіналізацыі такога “самвыдаву” спрыяла ня толькі агульнае нэгатыўнае стаўленьне да яго з боку інтэлігенцыі, але і ўбогая тэхнічная база, якая не дазваляла выявіць усе, так бы мовіць, “магчымасьці жанру”, дый даволі жорсткія рэпрэсіі ўладаў да такой прадукцыі — хоць і не настолькі жорсткай, як да самвыдаву палітычнага).

Самвыдаў як зьява папулярнай культуры

Украінскі, г. зн. украінскамоўны, самвыдаў непалітычнага кірунку быў, як ужо адзначалася, колькасна дужа абмежаваны й зводзіўся, у асноўным, да мастацкай літаратуры. Найчасьцей гэта былі вершы, радзей — апавяданьні, яшчэ радзей — эсэ ці пераклады. (Поруч з асобнымі вершамі Т.С.Эліята й Эзры Паўнда ў Львове 70-х гадоў, напрыклад, распаўсюджваўся цэлы самавыдавецкі збор Сыльвіі Плат у перакладах А.Лышэгі й кніжка чэскага канцэптуаліста Ладзіслава Новака ў перакладзе аўтара гэтага нарысу і ў мастацкім афармленьні Ўладзімера Каўфмана. Можна згадаць таксама, што ў 1971 годзе Рыгор Чубай пераклаў для самавыдавецкага альманаху “Скрыня” невялічкую абсурдысцкую п’есу Тадэвуша Ружэвіча “Старая баба выжывае”. Характэрна, што прыблізна ў той самы час Уладзімер Дзіброва ў Кіеве пачаў перакладаць “не для друку” творы Бэкета й іншых заходніх абсурдыстаў). Агульнай асаблівасьцю ўсіх гэтых літаратурных тэкстаў, зь перакладамі ўключна, было тое, што яны сьвядома пісаліся не для афіцыйнай публікацыі, нягледзячы на сваю ўяўную

апалітычнасьць, былі апрыёрна непрымальныя для рэжыму з эстэтычных меркаваньняў (як “мадэрнісцкія”, “фармалістычныя”, “дэкадэнцкія” і да т.п.).
Адмежаваньне літаратурнага самвыдаву ад палітычнага як самастойнага й досыць яскравага кірунку адбылося ўва Ўкраіне ў другой палове 60-х гадоў часткова таму, што ўва ўмовах грамадзкага “пахаладаньня” шанцы на падцэнзурны друк рабіліся мінімальнымі нават для палітычна бязьвінных (але не безаблічных у мастацкім пляне) твораў; а часткова таму, што якраз у гэты час зьявілася другая хваля маладой інтэлігенцыі, якая, у адрозьненьне ад “шасьцідзясятнікаў”, не фліртавала з сацрэалізмам і, наагул, ніякім чынам у афіцыёзны “мэтад” ня ўпісвалася (В.Галабародзька, І.Калінец, В.Стус, М.Вараб’ёў, Р.Чубай, М.Сачанка, В.Кордун і інш.).
Калі да таго часу літаратурны самвыдаў складаўся пераважна з тэкстаў, што не прайшлі палітычнай цэнзуры або былі ёю істотна скалечаны (Л.Кастэнка, В.Сіманенка, М.Халодны), то са зьяўленьнем малодшых, эстэтычна патрабавальных паэтаў самавыдавецкая літаратура набывае самадастатковыя вартасьці й паступова выходзіць за межы чыста ўтылітарнага, прапагандысцка-асьветніцкага, выразна палітызаванага абарачэньня. Рэпрэсіі 70-х гадоў супраць палітычнага самвыдаву ў значнай ступені зачапілі самвыдаў літаратурны — і ня толькі таму, што абодва самвыдавы часта мелі тыя самыя крыніцы й каналы пашырэньня (досыць вузкае асяродзьдзе гарадзкой украінскамоўнай інтэлігенцыі), але й таму, што ў кампаніі паляваньня на “буржуазна-нацыяналістычных” вядзьмарак КГБ ахвотна пашыраў рэпрэсіі й на ўсякія іншыя непалітычныя формы грамадзкай актыўнасьці (уключна з рухамі гіпі, рокераў, бардаў, аматараў эзатэрычных рэлігіяў або ўсходніх адзінаборстваў). Аднак, у адрозьненьне ад палітычнага, літаратурны самвыдаў у 70-я гады ня быў зьнішчаны, наадварот — ён адкрыў, так бы мовіць, другое дыханьне, усклаўшы на сябе ў значнай ступені “нонканфармісцкія”, “дысыдэнцкія” ў адносінах да сыстэмы функцыі самвыдаву палітычнага й канчаткова зацьвердзіўся ў сваім праграмным “эстэтызьме”, арыентацыі на “чыстае мастацтва” (часьцей дэклярацыйнай, чымся рэальнай, у тых ды, зрэшты, якіх-небудзь іншых умовах).
Сталася тое перадусім таму, што рэпрэсіі супраць

літаратурнага самвыдаву ніколі ня былі такімі жорсткімі, як супраць самвыдаву палітычнага. Маладых “эстэтаў” выганялі з ВНУ, з працы (як было, прыкладам, з аўтарамі мастацкага альманаху “Скрыня” ў 1972—73 гг.), цягалі ў КГБ, арганізоўвалі “закрытыя” рэцэнзіі, дзе ананімныя “экспэрты” з навуковымі й пісьменьніцкімі званьнямі вышуквалі “прыхаваны антысавецкі зьмест” у фармалістычных экзэрсысах дамаслых мадэрністаў, пускаліся ў іншыя правакацыі, але ўсё ж да судовых перасьледаў і канцлягерных прысудаў, як правіла, не даходзіла. Нонканфармісцкая моладзь, якая мела дастаткова падстаў не прымаць убогага й надзвычай артадаксальнага на той час мастацкага афіцыёзу, магла адмежавацца ад яго й не станавіцца пры тым на шлях адкрытай палітычнай канфрантацыі з рэжымам, выбіраючы сабе аўтсайдэрскі статус дворнікаў, вартаўнікоў, качагараў, грузчыкаў і пераносячы літаратурна-мастацкае жыцьцё ў прыватныя памяшканьні й майстэрні.
Акурат у 70-я гады, нягледзячы на неспрыяльны палітычны клімат, зьявілася пакаленьне ўкраінскай інтэлігенцыі, якое мела, па-першае, у большай ступені гарадзкое (а не выключна сельскае, як дасюль) паходжаньне і, па-другое, значна лепшыя магчымасьці для асьветы — ня толькі праз тое, што жыло ў горадзе, але й праз агульны заняпад таталітарнага рэжыму ў пасьлясталінскія часы й далейшага больш шырокага пранікненьня ў СССР сучаснай культурнай інфармацыі. Літаратура, якая фармавалася ў кантэксьце Кафкі й Сэн-Жон Пэрса, Цэляна й Картасара, Борхеса й Эліята, Ванэгута й Фолкнэра (ня кажучы ўжо пра Антоныча й часткова рэабілітаваных аўтараў “расстралянага адраджэньня”), зразумела, не магла быць падобная на тую, што фармавалася (у найлепшым выпадку) у кантэксьце Шаўчэнкі, Малышкі дый некаторых не да канца забароненых расейскіх паэтаў “срэбранага веку”.

Менавіта ў 70-я поруч зь цікаваю, усё больш разнастайнаю паэзіяй ува Ўкраіне выяўляецца самавыдавецкая проза — апавяданьні й нават аповесьці Ю.Віньнічука, тэксты В.Яворскага, Б.Жолдака, У.Дзібровы, І.Клеха, В.Кашкі, К.Маскальца, Л.Падэрэвянскага — і аж да “армейскіх” апавяданьняў Ю. Андруховіча, напісаных у 1984—85 гг. і

[21] Драней У. Нядзеля гарбаты // Сучасніцы. 1993. №10.

перабудовы. Усе гэтыя тэксты пісаліся не для друку й пашыраліся ў машынапісах, а таксама, так бы мовіць, вусна — пераважна ў аўтарскім выкананьні. Багемныя вечары, на якіх чыталіся новыя вершы ці апавяданьні, адбываліся, як правіла, стыхійна, у досыць вузкім коле сяброў, хоць часам яны рыхтаваліся загадзя як мастацкія акцыі й уключалі ў сябе “падпольныя” выставы, выкананьне бардаўскіх песень і, звычайна, піцьцё віна або прынамсі гарбаты [21]. На такія акцыі часам прыходзіла шырокая публіка, уключна з стукачамі, якіх, вядома, стараліся ўнікаць, аднак залішняй кансьпірацыяй не злоўжывалі.

Багемныя асяродкі гэткага тыпу існавалі ў Львове, Кіеве, Луцку, Вужгарадзе, Тэрнопалі, Івана-Франкоўску й нават Бахмачы; кантакты між імі ўключалі ня толькі абмен лістамі, кніжкамі й рукапісамі, але й “гастрольныя” паездкі адзін да аднаго — з адпаведным застольлем і чытаньнем тэкстаў перад рознай публікай, якая зьбіралася з гэтай нагоды. Акурат на гэтым, гарадзкім узроўні ўсталёўваліся пэўныя кантакты між украінскімі й расейскімі нонканфармістамі, хоць і тут яны не былі шырокія з прычыны ўзаемнай (палітычнай і культурнай) перадузятасьці. Найчасьцей яны абмяжоўваліся сувязямі з габрэйскай інтэлігенцыяй, якая хоць і была пераважна расейскамоўнаю дый расейскакультурнаю, усё ж праяўляла сябе інтэлектуальна больш адкрытай і ўспрымальнай да праблем іншай (у дадзеным выпадку ўкраінскай) прыгнечанай меншасьці.

Не належачы да нелегальнай сфэры палітычна, а да сфэры легальнай — эстэтычна, украінскі літаратурны самвыдаў 70-х— пачатку 80-х гадоў знаходзіўся, так бы мовіць, у дваістай сытуацыі. У выпадку далейшага грамадзкага “пахаладаньня” ён цалкам мог апынуцца за мяжою закону й трапіць пад артыкулы крымінальнага кодэксу нароўні з самвыдавам палітычным. Адначасова, у выпадку “пацяпленьня” (хаця б да ўзроўню лібэральных Эстоніі ці Масквы, ня кажучы ўжо пра Польшчу або Вугоршчыну) ён у значнай ступені мог бы легалізавацца — што, уласна, і адбылося ў сярэдзіне 80-х гадоў з украінскай самавыдавецкай, прынцыпова не сацрэалістычнай паэзіяй, а ў другой палове 80-х — і з прозай.

Наагул, паколькі розьніца між напаўлегальнай і легальнай

літаратурай не была выразнай, стаўленьне ўлады да яе таксама не было дакладным і адназначным. Часта яно залежала ня толькі ад краіны ці рэгіёну, але й ад канкрэтных людзей, ад кароткачасовай каньюнктуры і, звычайна, ад кантэксту, у якім напаўлегальная літаратура пашыралася й публічна або прыватна камэнтавалася. У выключных выпадках можна было атрымаць крымінальны артыкул нават пры распаўсюджваньні цалкам легальных твораў (аж да працаў Леніна ўключна). Хоць часьцей улада абмяжоўвалася ў такіх выпадках шантажом ці вэрбоўкай пераляканых ахвяраў альбо выключэньнем іх з ВНУ, з працы дый іншымі дробнымі рэпрэсіямі.
Акурат у гэтай сфэры напаўлегальнага — афіцыйна не санкцыянаванага, але як быццам і не забароненага — функцыянавала большая частка савецкага самвыдаву, робячыся часткаю масавай культуры; і, наадварот, у гэтую сфэру выціскалася ці сьцякала ўся неафіцыйная, неафіцыёзная масавая культура, становячыся volens-nolens часткаю самвыдаву.
Не належачы ані да сфэры забароненай “палітыкі”, ані да сфэры санкцыянаванага афіцыёзу, непалітычны самвыдаў быў дастаткова прывабны і паважаны сярод рамантыкаў, нонканфармістаў, інтэлектуальных дысыдэнтаў, незадаволеных убогімі камуністычнымі догмамі; і адначасова ён быў дастаткова бясьпечны, каб выклікаць да сябе масавую цікавасьць. Вынікам такога сымбіёзу самвыдаву й маскульту ў сфэры напаўзабароненага было, з аднаго боку, абуджэньне масавага інтарэсу да тэкстаў, якія ў іншых абставінах ніколі б да сябе такой цікавасьці ня выклікалі (ад Скаварады да Лотмана й ад Тычыны да Галабародзькі), а зь іншага боку, вынікам было пранікненьне ў катэгорыю “сур’ёзнага” самвыдаву тэкстаў, якія ў іншых абставінах так бы й заставаліся (у найлепшым выпадку) на ўзроўні маскульту (ад “Сабору” й “Мяча Арэя” да “Ўкраіны нашай Савецкай” П. Шэлеста, раскрытыкаванай камуністычным афіцыёзам, і да ўсялякіх “сакрэтных дакладаў” пра іншаплянэтнікаў, шаптуноў, празарліўцаў і парапсыхолягаў, што зьявіліся быццам бы зь нетраў якіхсьці навукова-дасьледчых інстытутаў).

Непалітычны самвыдаў, такім чынам, быў свайго роду “шэрай зонаю”, дзе адбываўся пераход сур’ёзных (у тым ліку й

палітычных) тэкстаў у рэжым маскульту, а маскультаўскіх — у рэжым “сур’ёзнага” самвыдаву. Найпрасьцейшым прыкладам такой дыфузіі можна лічыць спалучэньне вульгарных анэкдотаў з рафінаванымі палітычнымі — і ня толькі ў вусным ужытку, але і ў самавыдавецкіх (машынапісных, магнітафонных) калекцыях. Або памятны ўплыў блатнога фальклёру на бардаўскую песьню й наадварот. (Зэкаўскія песьні прываблівалі інтэлігенцыю, хутчэй за ўсё, сваёю “апазыцыйнасьцю” да ўлады, квазі-“дысыдэнцтвам”, за якім бачылася пэўнае “вальнадумства”, “фронда” й ад якога адначасова ня “пахла” надта небясьпечнай “палітыкай”. Таксама й блатнякі шанавалі плякатна-лубянога Цоя ці Высоцкага зь гітараю, Ясеніна зь люлькаю — як “ізгояў” грамадзтва, “сваіх”, — хоць у рэальным жыцьці, як і ў рэальных зонах, інтэлігенты й блатнякі лічылі за лепшае ня мець нічога супольнага.)

Наступствам такой двухбаковай канвэртацыі “сур’ёзнага” самвыдаву й “нізкага” маскульту быў ня проста ўзаемаўплыў розных тэкстаў, але й, так бы мовіць, зьмяшэньне жанраў, іхная гібрыдызацыя, замена сутнасьці бачнасьцю — калі ў тэксьце бачылі больш (ці, прынамсі, “іншае”), чым было насамрэч. Фактычна маскульт сілкаваўся “іміджам” самвыдаву — выпадкова пачутым, пабачаным, пераказаным, прыдуманым. Мала хто чытаў “Архіпэляг ГУЛАГ” Салжаніцына або “Інтэрнацыяналізм ці русіфікацыя?” Дзюбы, аднак багата хто пра гэтыя тэксты штосьці чуў — калі не з “варожых” радыёхваляў, то, прынамсі, з афіцыйнай прапаганды і ўспрымаў гэтыя адгалоскі крамольных тэкстаў з прымхлівай сумесьсю захапленьня, інтарэсу, скепсысу, страху. Гэтыя “веды” былі вельмі фрагмэнтарныя, эклектычныя, прыблізныя й павярхоўныя — яшчэ больш павярхоўныя, чым характэрнае для ўсякай масавай культуры веданьне двух-трох радкоў з хрэстаматыйных тэкстаў Шаўчэнкі, Пушкіна, гімну СССР, гімну Ўкраіны, народнай песьні і да т. п. А між іншым, гэтыя веды, безумоўна, абуджалі цікавасьць да больш даступнага і больш бясьпечнага самвыдаву, робячы яго больш рэспэктабэльным, а ўласную далучанасьць да яго — больш гераічнаю, чым яна была на самай справе.

Акурат гэты сымбіёз самвыдаву й маскульту падрыхтаваў спрыяльную глебу для часопіснага й выдавецкага буму падчас гарбачоўскай галоснасьці, што надта хутка, аднак, перайшла ў

свабоду слова, пакончыўшы з самвыдавам, а разам з тым і з масавай цікавасьцю да “забароненых” твораў Дзюбы й Салжаніцына, якія так і засталіся непрачытанымі “ў народзе”. У новых умовах масавая культура адрэагавала на гэтыя дый іншыя тэксты так, як і мусіла адрэагаваць — нудою, абыякавасьцю й расчараваньнем. Калі ў 70-я ці ў 80-я гераіня “з народу” яшчэ магла сказаць свайму “бойфрэнду” штосьці накшталт: “Матцы прапанавалі Булгакава за 120 рэ. Ну дзе ж такія грошы?” (Яўгенія Кананенка, “Тры сусьветы”), то ў 90-я такая гераіня выкажацца, хутчэй за ўсё, перафразаю з Уладзімера Дзібровы: “І гэта яны забаранялі?!..”
Таталітарны рэжым, безумоўна, пераацэньваў сілу непадцэнзурнага слова й несанкцыянаванай грамадзянскай актыўнасьці, зьбліжаючыся, дарэчы, у гэтым з рамантычнымі поглядамі ці, уласна, ілюзіямі сваіх апанэнтаў. Сёньня той самы рэжым цудоўна (і нават больш чым цудоўна) выжывае ва ўмовах свабоды слова й дэмакратыі. Разам з тым, той жа рэжым, здаецца, фатальна недаацэньваў сілу масавай культуры, якая рабіла самвыдаў свайго часу чымсьці значна большым, чым ён быў на самай справе, выводзячы яго за вузкія рамкі палітызаваных, інтэлігенцкіх сэктаў, “бязьмежна далёкіх ад народу”. Сёньня з спазьненьнем найменш на трыццаць гадоў рэжым пачынае ўсьведамляць, што з усіх мастацтваў найважнейшым зьяўляецца не літаратура й нават не кіно, а тэлевізія — як галоўны прадуцэнт і носьбіт маскульту.
Пераклаў з украінскай мовы Павал Абрамовіч
паводле: Рябчук Микола. Дилеми українського Фауста: громадянське суспільство і “розбудова держави”. Київ: Критика, 2000.

[image]
[image]

№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 12-11-2002
[image]

З дыярыюшу вясковага настаўніка

Гэты чалавек працуе вясковым настаўнікам. Скончыў Інстытут замежных моваў і, як гэта часта бывае (асабліва што да гэтага інстытуту), выкладае ў школе беларускую мову і літаратуру. Не так даўно ён зноў паказваў мне свае дзённікавыя запісы. Я пераконваў яго надрукавацца ў “Нашай Ніве”. Пасля доўгіх угавораў ён нарэшце пагадзіўся падаць, на мой выбар, толькі адзін кавалак са сваіх запісаў, дый тое пры ўмове, што ягонае прозвішча не будзе названае.

12.12.97. З’явілася нечаканая нагода з’ездзіць на пару дзён у Менск. Спыніўся ў З. К. (Дагэтуль дзіўлюся на яго перакладчыцкі талент).

Зайшоў у “Кр.” да Вал. Ак. Убачыўшы мяне, той устаў, цёпла вітаўся, доўга паціскаў руку. У кабінеце больш нікога не было, адно што каля свайго прац. стала завіхаўся Л. Гал.

Прыйшоў Ул. Арл. Як заўсёды гжэчны. Павітаўся. Доўга размаўляў праз тэл. 236-61-42 (гэта — тэл. “Кр.”). Прыбег Ів. Сав. Выказваў думкі.

Колькі разоў заглядаў у каб. Ул. Няк., вітаўся. Усе чакалі Ал. Раз. Той прыйшоў з марозу, энергічна паціснуў руку (пэўне, з

холаду).
Потым паказваў часопіс, прапаноўваў напісаць у рубрыку “Калі б я быў прэзідэнтам”.

13.12.97. Ноччу прачнуўся. Доўга ляжаў, думаў: якая дзіўная прапанова! А што, калі на самай справе — у прэзідэнты? Во халера! Тады, відаць, усё ж такі прыйдзецца кінуць жонку.
Пад раніцу сасніў адну знакамітую фотамастачку. З чаго б гэта? Ніколі да гэтага не сніў, больш за тое, нават з ёю не знаёмы. Халера яго ведае, можа, з таго, што колькі дзён таму заходзіў да суседкі, якая доўга шукала і нарэшце купіла сваёй дачцэ-школьніцы “глёбус” (менавіта так яна вымаўляе гэтае слова).
З раніцы зайшоў у краму. З часу апошняй пабыўкі ў Менску з’явіўся новы гатунак каўбасы, нават два — “Новарасійская” і “Хабараўская”. Звар’яцелі: з якой далечыні ўжо возяць прадукты!
Па абедзе ездзіў у рэд. “Нар. Вол.”. Праходзіў паўз прэзідэнцкі палац. Здаецца, упершыню і па-сапраўднаму звярнуў на яго ўвагу.
Шкада, што заўтра з раніцы ад’язджаю ў вёску.

15.12.97. Жонка сустрэла неяк падазрона. Увесь дзень напальваў лазню. Увечары, ужо пасля ўсяго, жонка, перад тым як заснуць, неяк каротка ўсхліпнула дый сказала: “Ну, што ты ўжо зноў надумаў, валацуга?”.
Чытаў рознае. У І. Ст. прачытаў: “Я знаю, што многія з нас недаацэньваюць жанчын і нават кпяць з іх. Але гэта памылка, таварышы, сур’ёзная памылка”. Доўга не мог заснуць.
Зноў гартаў “Пытанні ленінізму”: “Спасылаюцца на парламенцкую гісторыю еўрапейскіх і амерыканскіх дзяржаваў, спасылаюцца на тое, што дзвюхпалатная сістэма ў гэтых краінах дала толькі мінусы…
Але гэта адбываецца таму, што… другая палата арганізуецца недэмакратычным шляхам, часам шляхам прызначэння яе чальцоў зверху”.
Гэтыя абедзве палаты трэба ўраўнаваць у правах — такая выснова ў І. Ст.

16.12.97. Пабег у школу даць пару ўрокаў. Сустрэў у калідоры Ів. Ів. (Дарэчы, неблагі хлопец.) Той сумна глянуў на мяне ўчарашнімі вачыма і кінуў: “Заходзь увечары”. Трохі выпілі. У ложку жонка скрозь сон нешта буркнула. Спаць не хацелася. Навобмацак узяў з паліцы кніжку. Запаліў лямпу. Аказалася — “Анталогія кінізму”. Дарэчы, купіў даўно, а яшчэ ніводнага разу не разгарнуў.
Асабліва ўразілі два месцы. Адно: “На пытанне, чаму людзі падаюць жабракам, а філосафам — не, ён (Дыяген) адказаў: “Таму, што кульгавымі і сляпымі яны стаць могуць, а філосафамі — ніколі”.
Дарэчы, у Менску звярнуў увагу на тое, што людзі даволі ахвотна падаюць жабракам.
І другое месца: “Тыраны ніколі не жывуць у бяспецы, нават тады, калі яны ператворацца ў бронзу ці жалеза. І ў такім выглядзе ім пагражае пагібель — быць рассечанымі на кавалкі ці пераплаўленымі”. І яшчэ: “На любоў і сяброўства ён (тыран) не можа разлічваць: дрэсіроўшчык драпежных ільвоў мае да сваіх выхаванцаў больш любові, чым прыдворныя і блізкія да тыранаў асобы”.
Даволі трапна. Цікава, калі гэта было напісана? Дваццаць пяць стагоддзяў таму! Халера! Гэта столькі часу ходзім па коле невуцтва і неадукаванасці.
Пагасіў лямпу. Трохі сціскала ў скронях.
Колькі прайшло часу — не ведаю. Раптам ўсяго мяне некуды кінула.
Спачатку ўправа. Потым яшчэ раз управа. Закруціла па нейкім коле. Бачу сябе ў вялікай белай палаце на трыбуне. Вакол людзі. Некаторыя трымаюць у руках шыльдачкі з назвамі раёнаў і аўтаномных абласцей. Па-за імі стаяць жабракі з працягнутымі рукамі. Я ў цэнтры. Сярод натоўпу жабракоў ходзіць з ліхтаром чалавек у хітоне і страшна голасна гукае: “Дзе чалавек? Шукаю чалавека! Шукаю чалавека!”
З’яўляюцца дрэсіроўшчыкі з ільвамі. Па-над людскім тлумам бліснуў і паволі згас профіль рымскага патрыцыя — вельмі падобны да Ал. Раз. Плавяцца кавалкі бронзы.
У гурме жабракоў і бамжоў бачу жонку, якая адной рукой абхапіла за шыю нашую карову, а другой нешта паказвае мне. На каровінай пысе раптам з’яўляюцца вусы, і карова пачынае рыкаць амаль што чалавечым голасам: “Адна частка

адзінаасобнікаў разбэсцілася, кінула калгасы і пайшла ў спекуляцыю”.
Зверху шугае полымя, і з клубоў агню імкліва пачынае апускацца металічная, як у цырку, клетка. Яна амаль цалкам накрывае натоўп.
Лямант, енкі, праклёны. Жонка некуды знікае. Наўздагон ёй — лёгкая іранічная ўсмешка маладой асобы. Згасае святло. Зусім цёмна. Расплюшчваю вочы.
У вушах усё яшчэ гучыць, звініць і рвецца вонкі голас: “Жуць го до срача… Забій го вечным пюрэм!”
Пільна ўглядаюся ў цемру. Нарэшце пераконваюся, што сапраўды прачнуўся.

17.12.97. Трэба ўсё ж такі напісаць ліст Ал. Раз.

Тэкст да друку падрыхтаваў
Алесь Анціпенка

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (21) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]

Чалавек – [image] 2002
аналізыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Марыя Роўда

“1896”

Бледнатварая й рудая — каму ты гэткая трэба? Толькі й застаецца табе цяпер, што сядзець у гэтым старым парку, які й ня парк ужо даўно, а спарахнелая батанічная шыза, якую маленькая пляменьніца твая называе балотам. Прыстойныя людзі ў гэты парк ні нагой: таямнічая старасьвеччына, крымінальныя падлеткі, памятнік забітай маньякам жанчыне. Сюды калі й ходзіць хто, дык гэта беспрытульныя закаханыя альбо мастакі й маргінальныя паэты. Адныя — каб самаахвярна суполіцца на схіле зарослага кустамі й дрэвамі стромкага берага, а другія — каб натхніцца маляўнічымі развалінамі. Дзіва, як гэтыя разваліны яшчэ тут захаваліся — у самым эпіцэнтры вірлівага ўскрайку гораду, у атачэньні навамодных шматпавярховікаў, розных па сваім выглядзе й напоўненасьці чалавекамі, але безаблічных і чужых. Хаця што я гэтак разышлася? Сама я тут таксама чужая, хаця й купляю адсырэлы хлеб у мясцовай краме, сьмятану ў пакетах, піва, масла, сыр і тлушч. Гэна нешматлікія адгалоскі нармалёвага жыцьця мікрараённых цывілізацыяў — цукерак я не спажываю, а

МАРЫЯ РОЎДА (нар. 1975) — пісьменьніца, перакладчыца, выкладчыца граматыкі ангельскае мовы ў Лінгвістычным унівэрсытэце. Рыхтуе кандыдацкую дысэртацыю на тэму дыстантных адносінаў і іхнае ролі ў разуменьні тэксту. Вытанчаныя апавяданьні Марыі Роўды друкаваліся пераважна ў газэце “Наша Ніва”. Пачынаючы ад першага аповеда

астатнія прадукты прызначаныя, здаецца, для турыстаў і альпіністаў. Тушонка, кансэрвы, згушчонка — амаль усе яны з даўніх часоў чорнага рынку ваенных часоў. Турыстаў і альпіністаў сярод мясцовых няма: я б іх адразу вылічыла. Так што прыцягнула да гэтай мясцовасьці вайна. І вылічваюць мяне — гэта я бачу.
Я бачу, як на мяне касавурацца жанкі, як пакрыўджана і агрэсіўна зыркаюць мужыкі. Ні з аднымі, ні з другімі кантакт не іду, таму першыя падазраюць мяне ў зносінах з апошнімі, а гэныя ня могуць уцяміць, прываблівае іхная гераічна-прапітая мужчынскасьць, ці тая самая "чужаніца", якая "жыве побач", той самай "ворагіні" Відаць, асоба мая старанна абгаворваецца ў хатах, таксама трымаюцца ад мяне далей. Да таго ж, я абрываю алычу й яшчэ нейкія дзівосныя, відаць, экспэрымэнтальныя фрукты-ягады, што растуць тут на кожным рагу ў парку. Я ня ведаю, што тут каму належыць і ці належыць увогуле. А паколькі галоўнага гаспадара, пана Любанскага, ужо даўно няма на сьвеце, я зь бессаромнай непасрэднасьцю пад'ядаю мясцовыя дзівосы.
На людзкі недавер я не крыўдую, бо (цешу сябе гуманістычным спадзевам) разумею. Жыве іх тут няшмат — усе яшчэ з даўніх часоў, і шмат у каго бабкі ды дзедкі, калі верыць часопісным артыкулам, рабілі ў пана. Некаторых людзей я пазнаю менавіта па фатаграфіях у часопісах. Нават па фатаграфіях іхных продкаў. Мне падабаецца гадаць, чыя гэна бабця працавала пакаёўкай у пані Любанскай, чый дзед басаногім падшыванцам насіў цыдулкі на ўскраек парку, дзе яго чакаў самавіты вершнік з уладнай паставай і сумнымі вачыма. Я мяркую і, магчыма, нават правільна вызначаю. Але нішто ўжо ў гэтых занядбаных людзях не нагадвае пра старыя чароўныя часы. І нездарма, відаць, ацывілізаваныя насельнікі мікрараёнаў клічуць мясцовых абарыгенамі.

Абарыгены ж таксама бачаць сябе ў марах ацывілізаванымі й справядліва лічаць, што маюць поўнае права скарыстаць з дасягненьняў прагрэсу. Таму амаль усе яны будуюцца ў былым чыстым полі. На гэтым полі я калісьці шасьціклясьніцай палола буракі ў школе на практыцы, і настаўніца-наглядчыца сказала, што раблю я як для сябе. Тады я яшчэ ня ведала, як можна інакш, а таму стараннасьцю й сумленнасьцю сваёй, відаць,

"Выраў гэта зь мяне" (1993),
якая прыцягнула да сябе ўвагу
крытыкаў і інтэлектуальнага чытача.
Апошні твор
М. Рудзянёнка
"ARCHE",
"Адкуль ідуць перагалы?"
(№1 1998)

узгадавала сабе нечуваную ўдачу. Цяпер на гэтым полі будуецца дом, дзе, верагодна, на тых самых градах паўстане мая трохпакаёвая кватэра.
Любы абарыген, калі б нехта палічыў неабходным запытаць яго, сказаў бы, што ўважае за шчасьце зьехаць з гэтых развалінаў XIX стагодзьдзя й перасяліцца ў сучасны дом. Што ім з таго, што гэтыя гістарычныя будынкі могуць зьнесьці, каб добраўпарадкаваць парк, адчыніць у панскай сядзібе рэстарацыю, насыпаць дарожак, каб ужо ацывілізаваныя абарыгены маглі горда прагуляцца з вазком па прыбраным парку, а ўвечары зайсьціся зь сябрамі, як нармальныя пацаны, у бар. Што ім з таго, што нейкіх там рамантыкаў з добраўпарадкаваных мікрараёнаў ахапіла туга праз тое, што згубіць стары парк сваё “мона но аварэ”, і ня будзе дзе тым рамантыкам ствараць свае праўдзівыя мастацкія шэдэўры й ачароўваць даверлівых блізарукіх жанчын.
Я разумею. І рамантыкаў, і абарыгенаў. Але мне шкада. Нават ня столькі парку, колькі аднаго цаглянага трохпавярховага будынку — вінакурні, пабудаванай у 1896 годзе. Якраз тады, калі закрычала ўпершыню маленькае блакітнавокае стварэньне, на якое ўжо невядома як — з радасьцю ці журбою — глядзела далёкая Ганна Грышкевіч. Якраз у той год нарадзілася мая прабабка, каб пражыць 86 гадоў, перажыць сьмерць шасьцярых з сваіх семярых дзяцей і некалькі разоў памяняць імя: Марыя, Марыля, Маруся, Марыя Іванаўна Хіхіч. За рознымі панамі, войскамі й эміграцыямі. Для розных вуснаў, зубоў, языкоў, вушэй і вачэй. Каб паняньчыць мяне й перадаць мне сваё імя. Разам зь лепшай доляй. І цяпер я, бледнатварая й рудая, жыву гэтай лепшай долю і мяняю імя ў залежнасьці ад краіны сьвету й працадаўцы: Маша, Марыя, Маруся, Мэры, Маня, Марыя Іванаўна Хіхіч. Сама сабе пані, ваярка й, казаў бы той Саша Сакалоў, “унутраная эмігрантка”.
Вось таму я й жыву цяпер у гэтым цагляным трохпавярховіку, равесьніку Львоўскага опэрнага тэатру. Жыву, таму што спадзяюся, што калі я буду жыць у ім, то зь ім нічога ня здарыцца. Не зьнясуць, не закінуць, не падпаляць. Жыву ягоным жыцьцём, каб быць анёлам-ахоўнікам, каб выратаваць — яго, а таксама сваю лепшую долю. Вядома, чалавек разумны, той самы гома сапіенс, сказаў бы, што, каб выратаваць будынак, трэба хадзіць па інстанцыях, пісаць дасьледчыя й

публіцыстычныя артыкулы, зьбіраць подпісы й ладзіць пікеты. Але вядома, што жанчыны эвалюцыянавалі інакш і таму ратуюць усё ў гэтым жыцьці любоўю й каханьнем, асабліва калі на людзкі цьвярозы розум спадзявацца не выпадае. Каханьне — гэта, выходзіць, крайняя мера. А мая прысутнасьць тут, на трэцім паверсе вінакурні, — гэта яшчэ й крайняя мера крайняй меры. Карацей, не зусім падзеленага каханьня.
І ўбілася я сюды, у гэты прасьмердлы часам пакойчык з зашмальцаванымі блакітнымі шпалерамі, сталом з парэзанай цыраткай і кампутарам на ім, з чатырма зэдлікамі й правіслым ложкам, адно каб ня быць западозранай у схільнасьці да ўмоўнасьцяў і разьмеранага мікрараённага побыту. У якасьці альтэрнатываў выступалі яшчэ закінутая воданапорная вежа ў вёсцы цераз дарогу й унівэрмаг “Беларусь”. У вежы мелася высокае акно й заржавелыя жалезныя дзьверы, і яна выдатна пасавала для жытла адзінокай маладой жанчыны з творчымі памкненьнямі й даўгой касой. А ва ўнівэрмагу “Беларусь” можна было б аб’яўляць гасьцям па громкай сувязі, што на другім паверсе яны знойдуць утульны бар, а таксама вазіць каву ў ложак на эскалятары. Але ні там, ні тут нічога ня выйшла. У вежы не знайшлося пэўных гаспадароў, а ўнівермаг маё гуманістычнае “сапіенс” палічыла за лепшае пакінуць людзям. Такім чынам, чысьціня, сапраўднасьць, жыцьцяздольнасьць, экспэрымэнтальная сэлекцыйнасьць творчага зерня ўва мне занесьлі мяне на гістарычныя плянтацыі менскай Лошыцы. І цяпер кожную ноч я ратуюся ад страху й адзіноты гукам вадаспаду забруджанай вады, якая па старой генэтычнай памяці (бо цяпер гэта можа быць названа вадой зь вялікай нацяжкай) перацякае праз шлюз. Нараніцу, паточаная, бы шашалем, сьлязьмі, страхам і бяссоньніцай, я, удзячная Богу за некалькі гадзінаў сну й жывому-здароваму абуджэньню, стаю ля акна, аглядаю вершаліны дрэваў, правяраю зоркасьць вока на паўразбуранай альтанцы, карчме й сядзібе, п’ю каву й назіраю, як нейкі мясцовы энтузіяст зь целам спэцназаўца ў адстаўцы спускаецца па лесьвіцы з моста ў ваду, плёскаецца ў ёй і нават не пакрываецца аніякім чырвоным сыпам. (Я падазраю, што тут не ва ўсіх ёсьць водаправод.)

Затое ля сядзібы яшчэ колькі месяцаў таму ляжаў у зямлі скарб

нейкага маладога й раньняга стагодзьдзя й апаленае палена, якое спарахнела ў пыл, як толькі яго дасталі — праводзілі цеплатрасу. (Яшчэ адно ўскоснае ўказаньне на рэстарацыю: для абарыгенаў ня сталі б гэтак старацца.) Падчас гэных гістарычна-будаўнічых раскопак мы яшчэ былі разам. Разам пераскоквалі цераз траншэі, уцякалі з эцюднікамі па сьнежных гурбах ад спушчаных сабак, разам наткнуліся на партызанаў, якія вялі немца на допыт. Тады тут здымалі кіно, а мы ранымрана, звыклымі для паклоньнікаў парку сьцежкамі, нечакана для сябе выпаўзьлі проста насустрач гэным узброеным людзям. І паколькі парк быў заўсёды казкай, легендай, зачараванай краінай каханьня — настолькі нерэальна сапраўднага, што дыхала даўніной, — я ані не зьдзівілася, калі пабачыла там партызанаў. Затое зьдзівілася, калі 8 траўня ў рамантычным парку XVI стагодзьдзя забэмкаў аркестар і каля нашай любімай лаўкі мы напароліся на шнуры, кабэлі, прамовы, сівых бабулек з мэдалямі, якія сядзелі на прынесеных для іх крэслах, хіталі галовамі, хапаліся за сэрца й зьяжджалі са сьвята на “хуткай дапамозе”. І гэна быў дзень разьвітаньня зь мінулым — і для іх, і для нас. Цяжкі й упарты дзень, які настойліва цягнуў да сябе, прэч ад нас, прэч ад мяне нашую закаханую рэчаіснасьць, нашую існасьць, наш давер.

Гэным днём мы яшчэ здолелі застацца разам, паверыць у натуральнасьць, нязмушанасьць нашага суіснаваньня. Але потым нагнала ветрам іншыя дні, і яны нізкімі абыякавымі хмарамі зьнесьлі цябе ў неакрэсьленым кірунку. І хаця я заўжды магла б адшукаць цябе ў гэтым горадзе, нават высачыць цябе, я ўсё роўна не змагла б цябе знайсьці. Бо ты зьнік у нетрах невядомай мне неагучанай крыўды, злоснага сумненьня, падазрэньня ў тым, чаго не было. І паколькі я ня ведала, што нас разлучыла, я вырашыла шукаць адказу ў снох. Я рана клалася спаць і позна ўставала. Я глядзела свае сны гэтак, як людзі глядзяць на дошку на лекцыях геніяльнага прафэсара, каб пабачыць тое, чаго няма ў падручніку, але што трапна й яскрава раскрые таямніцу мудрагелістай навукі. Спачатку некалькі тыдняў мне сьнілася, што ты крочыш побач са мной. Але я бачыла толькі твае чаравікі — нічога болей. Нарэшце, пасьля адной выпадковай сустрэчы ў кіно на “Небе над Бэрлінам” і рытуальнага замірэньня ў кавярні мне прысьніўся твой твар. Ты глядзеў на мяне й маўчаў. Але ты не

кахаў мяне. Ты чакаў. Ты чакаў майго разуменьня, маёй здагадкі. Але я не здагадвалася, ніяк не здагадвалася, чаго ты хочаш, хаця й спадзявалася, што змагу зразумець цябе, калі ты сам паспрабуеш мне растлумачыць. Пасьля гэтага ты прыходзіў да мяне кожную ноч, але ўсё роўна моўчкі. Затое ты быў побач, і калі мне хацелася пабачыць цябе пасярод якога-небудзь сну, я аглядалася й бачыла цябе. І ты кахаў мяне. Тады ты мяне кахаў. І яшчэ ў двух снох. У тым, дзе мы сядзелі ў Лошыцы на лаўцы, ты трымаў маю руку на сваім сэрцы й гладзіў мяне далоняй па твары. І ўсьміхаўся. І гэна было больш, чым каханьне — гэна былі мы. Нарэшце разам, нарэшце бяз страху, нарэшце самі сабой. І ў апошнім сьне, дзе ты зноў прамаўчаў. Дзе гаварыла толькі мая прабабка Марыля й апавядала мне мой лёс. Але я ня чула словаў, а толькі бачыла вобразы, зь якіх запомніла сьвятло й адчуваньне шчасьця. І калі лёс скончыўся, мы пайшлі з табой, узяўшыся за рукі: ты моўчкі, а я з усьмешкай суцяшэньня й каровай на вяроўцы за сьпінай.
А калі сны пра цябе перасталі мне даваццa, калі я перагаварыла праз тэлефон з усёй тваёй раднёю, бо цябе ніколі не было дома, калі паглядзела ў кіно шэсьць фільмаў і не сустрэла цябе, я зразумела, што з гэтага моманту пайшоў чысты аркуш часу й жыцьця. Прабел, пустыя мілімэтры ў тэксьце нашага лёсу. Мілімэтры бясконцыя й няўмольныя, бо яны не хацелі запаўняцца. І я пачала шукаць адказу ў мінулым. У тваіх даўніх словах, паводзінах, марах. Я зграбла ў кучу ўсё тое, што здавалася мне трызьненьнем, калі мы былі разам: што я прапаную табе ўмоўнасьці, што я нічога не напісала, што нейкая там Надзя табе раднейшая за мяне і што жыцьцё пакажа. Вось гэна было адкрыцьцё! І я пачала перапісваць гэную лухту нанава, каб выправіць свой чысты й сьветлы гештальт, несправядліва заплямлены ў тваёй сьвядомасьці.
Я зьняла жытло ў трохпавярховым доме з выкладзеным цэглай надпісам “1896” пад дахам. Сярод сабак, катоў, абарыгенаў, легендаў і аварыйных станаў. Я пісала дзёрзка й шчыра — гэтак, як для сябе, ведаючы загадзя, што праз колькі гадоў гэтага ня буду разумець нават я сама. Я хацела выдрапаць Надзіны вочы, выкруціць ёй, як ляльцы, рукі й ногі, павыдзіраць валасы — абавязкова з валасянымі цыбулінамі, навесьці на яе псоту, сурочыць на тры пакаленьні наперад. Але я, маладушнае, супярэчлівае стварэньне, прабачыла ёй і

пакарала тым, што кінула пра яе думаць. Пабачым, што ёй зараз пакажа жыццё!
А пакуль што жыццё паказвала мне. Дый як магло быць інакш, калі адзіным прымальным доказам каханьня, прымальным для цябе, мог быць, як на мой розум, толькі экстрэмізм. А як яшчэ назваць тую справу, калі я мусіла ўсе свае абстрактныя погляды й перакананьні, прыдбаныя ў гадзіны чытаньняў і разважаньняў, у гады вандровак па палітычна-карэктных краінах, пусьціць ва ўжытак? Выцягнуць іх тутака, у роднай краіне Беларусі, проста пасярод Лошыцы — ня тое што ў супрацьлеглым баку ад істэблішмэнту, а ўвогуле па-за рамкамі яго. Прымусіць іх рэалізоўвацца, працаваць, рабіцца ўмоўнымі рэфлексамі — гэтак, каб нават старыя сябры паверылі ў трываласьць маіх рэакцыяў, а ты не сумняваўся ў маіх незвычайнасьці й ня-ўмоўнасьці. Перабольшыць іх настолькі, каб яны зрабіліся знакам, безумоўным для барацьбітоў з умоўнасьцямі. Жыць творчасьцю, але абавязкова ў экстрэмальных умовах, сярод няшчасных і зьнядоленых. Кахаць, але прынцыпова заставацца адной, каб ня быць падобнай да ўсіх астатніх і не паразытаваць на мужыку. Зарабляць высокаінтэлектуальнай працай — пляваць, што жабрацкія грошы. Змагацца за вагу ў грамадзтве, але не прадавацца намэнклатуршчыкам і ня мець справы з кар'ерыстамі. Езьдзіць на ровары й кожны дзень рызыкаваць гэным сваім творчым, сумленным, высокаінтэлектуальным жыццём, бо кіроўцы гатовыя забіць цябе. Дзіва што: яны з апошняй моцы выцінаюцца, каб "адпавядаць", трацяць інтэлектуальныя й фізычныя сілы, здароўе, грошы на няхай зьнешнія, але атрыбуты прыстойнага жыцьця. А тутака нейкая дзеўка ўпарта торкаецца пад колы на сваім ровары. Ня можаш зайсьці замуж за мужыка з машынай — сядзі ў хаце альбо езьдзі на аўтобусе № 3, а не гайсай на прадукце вытворчасьці Менскага матацыклетнага й вэласыпэднага заводу, няхай і з поўным наборам катафотаў! Знайшлася экалягіня, фэміністка — дарма, што вас за алтар не пускаюць! Так, я — за экалёгію, я — за экалёгію, я — за экалёгію! Гэта праўда, і гэта ня самы дрэнны вобраз мяне. Не хапала яшчэ, каб яны здагадаліся, што я не змагла зайсьці замуж ня тое што за мужыка з машынай, а нават за небагатага мастака, і што ў першую чаргу я ўсё ж — за каханьне.

Каханьне заўжды здавалася мне неабвержнай ісьцінай, падмуркам, сутнасьцю чалавечага існаваньня. Каханьне было мэтай і сродкам жыцьця, галоўнай *безумоўнасьцю* сьвету. І ўсё ў маім жыцьці было падпарадкавана пошуку, чаканьню, прадчуваньню сапраўднага каханьня. Сумненьня быць не магло. Рана ці позна сутнасьць павінна была атрымаць сваю вонкавую праяву. І каб сустрэць гэта рана ці позна ў поўнай зброі, трэба было ўпарадкаваць сваё жыцьцё так, каб ніякія *ўмоўнасьці* не маглі зрабіцца перашкодай майму каханьню. Ніякія грошы, ніякія квадратныя мэтры, ніякія хваробы, ніякая саманерэалізаванасьць, ніякія праблемы ў адносінах, нават сьмерць. Менавіта таму ў далёкія 16 гадоў я вырашыла атрымаць прыбытковую адукацыю, займець уласную жыльлёвую плошчу, рэгулярна займацца фізкультурай, рэалізоўваць таленты, вывучыць псыхалёгію й жыць доўга. На гэты момант асабліва злабадзённым быў выбар прафэсіі, і, паступіўшы ў адну вельмі гуманітарную ўстанову без іспытаў, я ўсё ж абрала больш прагматычную спэцыяльнасьць, каб вандраваць па сьвеце й, галоўнае, мець выбар у каханьні. Дакладней, мець магчымасьць паміж карысьцю й каханьнем абраць апошняе. За час вучобы я сапсавала сабе здароўе так, што яго прыйшлося потым адбудоўваць рэгулярнай фізкультурай і рацыянальным харчаваньнем. Я хаатычна рэалізоўвала свае таленты, так што час ад часу мусіла пытацца ў сябе, ці не загубіла я іх. За наступныя пасьля 16 дзесяць гадоў я гэтак ублыталася ў адносіны зь людзьмі, што мусіла вучыць псыхалёгію, а таксама ўсе ажыцьцяўляльныя й неажыцьцяўляльныя мэтады псыхатэрапіі. Я ледзь не памерла ад страшэннага расчараваньня ў патэнцыйных аб'ектах каханьня, якія — дзякаваць павевам псыхалягічнага пазытывізму, а таксама міралюбнасьці характару — удалося прабачыць і палюбіць. І самае галоўнае: я ўсё ж атрымала прыбытковую адукацыю, зь якой проста не захацела скарыстаць. Мая адукацыя была вельмі гуманістычнай, альтруістычнай і няўхільна цягнула мяне ў бездань навукі й дабрачыннасьці — у кар'еру выкладчыка. Але адукацыя ўсё ж давала мне магчымасьць вандраваць і рабіць *выбар на карысьць каханьня*.

Каб аб'яднаць усе мэты ў адну, я, павандраваўшы па сьвеце,

павыкладаўшы ва ўнівэрсытэце й паўдзельнічаўшы ў напісаньні падручніка, вырашыла кінуць гэтыя дзіцячыя гульні й зарабіць вялікія грошы. Заробкі гэныя даваліся лёгка, працадаўцы-гаспадары проста прасіліся ў падручнік па культуралягічных асаблівасьцях сялянскай клясы братняга нямецкага народу, кармілі добра й нават вадзілі ў тэатар. Жыцьцё на экалягічна чыстай нямецкай прыродзе, праца крамніцы ў летняй будцы-кавярні пад адкрытым небам, прыклад самастойных дагледжаных немак, нямецкая філязофія й літаратура, чытаныя ў адсутнасьць наведнікаў, прывялі мяне да высновы, што ўсё складзецца як і заплянавана. І калі я, дагледжаная й самастойная, вярнулася на патрыманым аўтамабілі на радзіму Беларусю, ушчамілася ў ЖБК, зрабіла неабходныя ўнёскі й пачала сабе вольна-прывольна займацца навукай, у паветры, як ужо можна было здагадацца, запахла каханьнем. Канечне ж, небагатым мастаком. Разумным, таленавітым, шчодрым і сьмелым да дабрыні. Знаўцам гісторыі, літаратуры й мастацтва. Чалавечным і страсным. Чалавекам якраз для мяне. …Аднойчы зімовым вечарам, калі Гільдэнстэрн і Разэнкранц ужо памерлі, а Арланда яшчэ не пасьпела прычараваць гледачоў празрыстасьцю сваёй скуры, я зайшла ў тралейбус і мне падалося, што нехта паклікаў мяне. Я павярнулася на голас, не заўважыла нікога знаёмага, але раптам убачыла *Яго*. “ЁН!”. “ЁН!”. “ЁН!” — запульсавала ў галаве чырвоная лямпачка з надпісам “Архетып каханага”, а па-простаму кажучы, “Казачны прынц.” Я падышла й удавана спакойна спынілася побач, а потым пачала цішком паглядаць на ягонае адлюстраваньне ў акне. Гэтак, як і ён на маё. І больш за ўсё мне тады хацелася, каб мы ехалі разам усё жыцьцё, каб засталіся побач навекі, каб маглі папросту называць адно аднаго па імені й сьмяяцца з адно толькі нам зразумелых рэчаў. А потым мы выйшлі з тралейбуса праз розныя дзьверы, але на адным прыпынку й абое пакіравалі ў адзін бок. На дварэ быў сьнег, сьлізка, і на сьцежцы не было як разьмінуцца, а крочылі мы амаль аднолькава хутка. Тады ён, зайшоўшы крыху наперад, сказаў, што нам не застаецца нічога іншага, акрамя як пазнаёміцца й ісьці разам. Мы пазнаёміліся, і высьветлілася, што мы абое любім адну й тую самую музыку, тыя самыя кнігі, едзем з аднаго й таго самага кінапаказу й, да ўсяго, жывём цераз дарогу. Вядома, гэтак быць не магло, але гэта адбылося.

Бо гэтак мусіла быць. Натуральна, здаецца, зусім натуральна з пункту гледжаньня жыцьця, калі глядзець на яго зьверху, што два чалавекі, якія гэтак пасуюць адзін да аднаго, павінны сустрэцца й быць разам. Натуральна, але сапраўдны цуд. І цяпер я разумею, што гэна й было цудам. Да таго ж, аднойчы я ўзгадала, што ўжо даўно ведаю яго.
Неяк на Новы год, калі мне было пяць ці шэсьць гадоў, мае бацькі й сястра глядзелі “Блакітны агеньчык”, а я, стомленая, але задаволеная здаровай камплектнасьцю свайго жыцьця, залезла ў сэкцыю. Ляжала сабе ў адчыненай нішы з падушкамі, слухала музыку й раптам адчула нейкую незвычайную тугу. Як быццам мне не хапала некага, як быццам быў яшчэ нехта іншы, хто мог бы быць побач са мной, але каго побач не было. І тады мне прымроіўся твар. Твар чарнявага хлопчыка зь зялёнымі вачыма. Хлопчыка, які чакаў і якому на гэны момант было гэтак жа невытлумачальна сумна, як і мне. І калі ты паказаў мне свае дзіцячыя фатаздымкі, я пазнала таго хлопчыка — пазнала гэны выраз твару й гэны душэўны стан — і ўспомніла Новы год амаль дваццацігадовай даўніны. І яшчэ высьветліла, што мы з табой недзе з год хадзілі ў адзін дзіцячы садок, хаця й у розныя групы, бо ты старэйшы за мяне.

А цяпер паміж мною й табою — наждак чорнага неба бяз зораў. Нямы, асіплы ад болю няспраўджанага каханьня Лошыцкі парк. Я сяджу ля стала, гляджу паверх манітора ў пустую цемру за акном, слухаю гуд кампутара, насьцярожанае пагойдваньне дрэваў і думаю, ці магла я што ўратаваць, ці магу я табе што растлумачыць? Дый што тлумачыць? Кожны чалавек чуе толькі тое, што хоча пачуць. І нават мой пісьменьніцкі дар не дапамог мне давесьці табе, што я кахаю цябе аднаго й толькі таму хачу быць з табой разам. Што я ня кваплюся ні на твае таленты, ні на твой час, які ты павінен прысьвячаць мастацтву, ні на тваю свабоду. І хіба ёсьць нейкая іншая свабода, акрамя ўнутранай? І хіба ёсьць свабода, большая за рабленьне дабра, якое адзінае не абцяжарвае душы? І хіба можа нейкі чалавек у цябе гэта адняць? Але, відаць, не насьпеў яшчэ для цябе час пачуць і зразумець мяне. Паверыць мне, паверыць сабе, даверыцца жыцьцю. Таму я сяджу-вычвараюся ў гэтай смуроднай вінакурні, якую скаланае ад мацюкоў маіх суседзяў, а ты недзе ўпарта даводзіш сабе, што толькі безь мяне, толькі ў вясёлай

кампаніі “сабе падобных” вольных мастакоў ты можаш ствараць мастацтва.
Толькі гэта няпраўда. Пазаўчора я бачыла цябе з адной, да цябе зусім не падобнай. Бачыла, як вы прыдзяўбліся да майго дому, стаялі з эцюднікамі ў мяне пад вокнамі, бралі паўлітровымі слоікамі ваду з ракі, разводзілі фарбы, малявалі пэйзаж насупраць — мае ўлюбёныя дрэвы й нашую альтанку. Бачыла, *што* яна крэмзала — нават здалёку было відаць, што яна імітатарка й пасрэднасьць. А ўжо калі б давялося пісаць ейны партрэт, то рабіць гэта трэба было б толькі ў якім-небудзь авангардным стылі, каб неяк замаскаваць ейную “неўміручую прыгажосьць” і надаць ёй хаця б крыху характару. Скажу табе шчыра: не найлепшы выбар, асабліва пасьля мяне. Я, можа, і не прыгажуня з вокладкі, але мой твар нельга забыць. Я прыроджаная муза, натхняльніца, зь мяне энэргія сьвішча. А яна што? Раструшчаная алыча, падгнілая на жнівеньскім сонцы. Уяўляю, як зь цябе ўсе сьмяюцца. Толькі што ўжо казаць — што зроблена, тое зроблена. Хаця… Ты іншы. Таленавіты. Я ж бачыла, *што* ты маляваў: ня бераг насупраць, а дзяўчынку Насьцю зь вінакурні. Насьці — гады чатыры. Яна стаяла ўбаку й цікавала, як вы малюеце, — ня ведала, што й ты ўпаляваў яе. Заціснула паміж ног ляльку, так што гэная задрала ёй сьпераду спаднічку. Адной рукой абцягвала цяльняшку, а другой паднесла да рота пасмачку цёмных вільготных валасоў да плячэй. А ты гэтак ласкава пасьміхаўся, гледзячы на яе. Я ўжо нават ня ведала, да каго цябе раўнаваць: да гэнай бясталентнай памаўзы ці да дзяўчынкі Насьці. Слухай, ну няўжо гэтая ніякая крэмзала й ёсьць гэная самая “родная” Надзя? І як мне цяпер разумець мужчын?
Разумей не разумей, а жыць будзеш, у любым выпадку, з самой сабой. У сваім унутраным сьвеце. І менавіта з гэтага сьвету будзеш узірацца ў жыцьцё. І нават калі прымеш сьветапогляд каханага мужчыны, ня будзеш праз гэта шчасьлівая, бо заставацца будзеш толькі сабой. І калі будзеш імкнуцца “адпавядаць” ці “не адпавядаць” — толькі зламаеш сваю асобу. І твой мужчына кіне цябе. Таму што нават “ніякая крэмзала” Надзя — цяплейшая за ягоны адбітак у люстэрку, і ў гэтым сэнсе яна яму цяпер сапраўды раднейшая за мяне. І вось гэта была мая асноўная памылка, праз гэта я сяджу адна. А па вялікім рахунку, што страшнага ў адзіноце? Адна ты ці зь

некім, ты ўспрымаеш сьвет толькі празь сябе.
А што датычыцца памылкі… Ён плявузгаў, што я кахала зашмат. А што было рабіць? Я ж шукала. Дый ён мне сустрэўся позна — колькі мне ўжо было гадоў! А я таропкая: я халерык, я баялася не пражыць свайго жыцьця. А ён тыповы флегматык. Ужо ж ён не сьпяшаўся на сустрэчу са мной, а вінаватая выйшла, канечне, я. І да таго ж, чаму ён лічыць, што лепш за мяне ведае, кахала я некага ці не? Няхай ён думае разам са сваёй Надзяй, што ў мяне няма гонару, але кахала я *насамрэч* толькі яго. І тым каштоўнейшае мне было гэтае каханьне, таму што я ведала ўжо, што каханьнем ня ёсьць. Хаця… Усё гэта было шчырым. Шчырым захапленьнем людзьмі й жыцьцём. Гэта было любоўю, а не каханьнем, прагай жыцьця і (што маніць) пошукам “муза”. А мне варта было проста любіць гэных людзей, а не прыдумляць, не драматызаваць жыцьця й не лямантаваць потым, што я расчаравалася ў мужчынах. Бо ў выніку ў вачах людзей я прыдбала сабе драматычны жыцьцёвы досьвед, і мужчына, якога я сапраўды пакахала, кінуў мне мой жыцьцёвы досьвед у твар. (Нельга так з жыцьцёвым досьведам — гэта парада абодвум зацікаўленым бакам.) Да таго ж, калі чалавек кажа, напрыклад, што ён любіць сьвітанак і захад сонца, зіму й восень, дождж і сьнег надвячоркам, ніхто ня будзе падазраваць гэтага чалавека ў разбэшчанасьці й няшчырасьці, скажам, да зімы, якая надыходзіць пасьля восені. Калі ж вядзецца пра людзей, то выходзіць, гэта брудная справа — любіць іх? Але кожны чалавек — гэта зьява. Нават “ніякая Надзя”. І калі чалавек па маладосьці называе любоў каханьнем, хіба можна пароць яму гэтым вочы? Асабліва калі ўсё гэтак добра склалася: духоўнае паразуменьне, гарачае каханьне, “прыбытковая” адукацыя, жыльлёвая плошча… Але гэта жанчыны не раўнуюць мужчын да мінулага, бо яны, вядома, прыгажэйшыя, разумнейшыя, душэўнейшыя і гатуюць лепш за папярэдніц. А вось мужчыны… Яны раўнуюць да кожнага слупа, нават калі гэта слуп, які ты не змагла абмінуць, катаючыся на лыжах, калі табе было пяць гадоў. Добра. Няхай. Але я, прынамсі, не хацела за гэны слуп замуж?! І як яшчэ я магу растлумачыць сябе й сваё жыцьцё? Што яшчэ я магу распавесьці, каб ты мяне зразумеў? Што яшчэ я магу сказаць, акрамя таго, што…

…Была шостая гадзіна раніцы. Мы сабралі па вёсцы кароў і пагналі на пашу. На выгане, каля сажалкі, я прысела на кукішкі і ўбачыла ў траве роснае павуціньне. У кроплях расы раздрабілася на фарбы прахалоднае ранішняе сонца… Усё. Гэта ўсё, што я магу растлумачыць табе пра сваё жыццё. Мне было тады дзевяць гадоў, і гэнае роснае павуціньне сталася для мяне тым, чым ёсьць маё да цябе каханьне.

Але якраз гэта я ўжо не магу сказаць табе. Таму, што я нават ня ведаю, дзе ты атабарыўся, хаця й падазраю з кім. Таму, што я не наважваюся падысьці да цябе, калі ты малюеш у парку разам з крэмзалай-Надзяй. Таму, што я баюся быць адрынутай і абсьмяянай. Таму, што я кахаю цябе, як гэта ні дзіўна, цяпер ужо непадзеленым каханьнем. Але чаму? Чаму людзі, гэтак блізкія адзін адному, як мы былі блізкія з табой, павінны разыходзіцца празь нейкія абстрактныя рэчы, кшталту “ўмоўнасьцяў-няўмоўнасьцяў”? Так, менавіта абстрактныя, няпэўныя рэчы. Канечне, у тваёй Надзі можа быць вельмі фотагенічны твар, і яна маладзейшая за мяне, і праз колькі гадоў яна атрымае ў Акадэміі мастацтваў дыплём і зробіцца дыплямаванай мастачкай. Але ведаеш што? Я думаю, што ты ўсё ж такі кахаеш мяне. І што якраз гэтае пакутлівае, нерэалізаванае каханьне гоніць цябе ў парк і прымушае пісаць дзяўчынку Насьцю. І менавіта праз гэтае, балючае гэткім жа самым, як і мне, болем каханьне твае вочы скуголяць рыкам галоднага апантанага ваўка, калі ты прыходзіш сюды адзін і ўзіраешся ў дом з надпісам “1896” — з таго месца, дзе мы заўжды малявалі разам. Але ж ты… Ты ж ня ведаеш, што я тут жыву!!!

Як жа я не здагадалася адразу? Калі ўжо я была гэткай няправільнай жанчынай, што надумалася забясьпечыць сабе матэрыяльны бок жыцьця, пабудаваць кватэру, а потым учапіцца ў цябе “па разьліку”, не растлумачыўшы табе, што гэтым разьлікам было стварыць атол каханьня, на якім не замінала б дыхаць, нягледзячы на праклятае жыцьцё зь ягонымі аб’ектыўнымі заканамернасьцямі, то цяпер я павінна памяняць ролі. Паколькі ты — сапраўдны мужчына, а я — сапраўдная жанчына і паміж намі — сапраўднае каханьне, я вельмі правільна зрабіла, што “зьняволілася ў вежы”. Цяпер я мушу даць табе знак, каб ты мог мужна мяне заваяваць. І для гэтага я напісала на шторах у сваім пакоі пасланьне для цябе. Якраз

гэтае: “Была шостая гадзіна раніцы. Мы сабралі па вёсцы кароў і пагналі на пашу. На выгане, каля сажалкі, я прысела на кукішкі й убачыла ў траве роснае павуціньне. У кроплях расы раздрабілася на фарбы прахалоднае ранішняе сонца”. Гэта й быў мой знак табе, каб ты мог пабачыць, што я чакаю цябе, што я кахаю цябе, што я пазбавілася ад ўмоўнасьцяў тым, што перапаўзла сюды. І… што я таленавіцейшая за тваю Надзю. Але чамусьці ён не пабачыў майго пасланьня — ні калі падыходзіў пад вокны вінакурні, каб паназіраць за дзецьмі ці намаляваць паліто, што сушылася на другім паверсе ў адчыненым акне, ні калі стаяў на месцы нашых спатканьняў на супрацьлеглым беразе. Дый я не магла больш штодзень сядзець пры завешаных шторах, бо ў мяне й без таго было змрочна на душы. Праўда, каб выратаваць сваю псыхіку й каб у яго было больш шанцаў заўважыць мой знак, я вырашыла часьцей гуляць удзень. Блукала па парку, карміла апалымі яблыкамі коней, гладзіла дрэвы, пад якімі мы некалі мілаваліся, чытала на лаўцы каля сядзібы.

Аднойчы, калі я гэтак гуляла, пачаўся моцны лівень, а я была далёка ад дому й ня ведала, куды бегчы, каб укрыцца. Я прытулілася да вялікага дрэва ды ўспомніла, што неяк летам вось так жа пачаўся дождж і мы схаваліся пад дрэвам, але разам з намі туды набілася процьма камароў. І тады ты сказаў: “Цяпер я ведаю, што такое рай па-беларуску: Ён, Яна, Лошыцкі парк, лівень і поўна камар’я”. І паколькі цяпер мне не было з кім абдымацца, а Лошыцкі парк больш ня быў раем, бо не было ні Яго, ні камар’я, мне зрабілася гэтак горка й крыўдна, што я вырашыла: лепш намокнуць. Няхай сабе нават захварэць і памерці, таму што як, як, як мне цяпер жыць безь яго? І я паплялася сабе па сьцежцы дахаты разам з правадыром-дажджом.

Калі я наблізілася да панскай сядзібы, то заўважыла, што з тэрасы нейкая жанчына ў белай сукенцы маша мне рукою й запрашае зайсьці. Я падумала, што гэта нейкая рэстаўратарка ўгледзела мяне й выскачыла ў адной сукенцы, каб уратаваць ад ліўня. Мне не хацелася тады ні з кім размаўляць, але калі яна ўжо гэтак расьпяражывалася за мяне, што не пабаялася прамокнуць, я вырашыла завітаць да яе. Жанчына яшчэ крыху пастаяла на тэрасе, але ўжо проста глядзела ўверх на хмары. (Ну й рамантычная асоба: гэткай непагадзі не баіцца.) Потым,

відаць, упэўнілася, што я кірую да яе й зьнікла з вачэй. Я абышла сядзібу, падышла да ганку й убачыла на лаўцы маладога чалавека ў шэрай куртцы й завялікіх акулярах, які сузіраў халодныя памыі дажджу й гладзіў мокрага чорнага сабаку. Я адразу падумала, што гэта й ёсьць лошыцкі маньяк, бо ў ягоным твары было нешта не ад гэтага сьвету, нешта нэкрафілічнае. Тут маньяк заўважыў мяне, усьміхнуўся й неспадзеўкі па-беларуску прапанаваў перасядзець дождж разам зь ім: “Заходзьце, спадарычна. Перачакаем разам. Вы ж, відаць, ніколі не былі тут усярэдзіне”. Я крыху пакрыўдзілася на “відаць, ніколі” (усё ім відаць — празарліўцы вялікія), але паднялася на ганак, бо хай ён і маньяк, але беларус. Да таго ж, я разьлічвала, што ў сядзібе мяне чакае салідарная жанчына ў белым. Малады чалавек яшчэ нахабней усьміхнуўся (у чалавека гора, а ён сьмяецца) і назваўся незразумелым імем Габрусь.

— Псэўданім?
Малады чалавек засьмяяўся (прыстойнасьці — ня самы моцны ягоны бок) і сказаў:
— У пэўнай ступені, так.
— А чым вы займаецеся?
— Я гісторык.
— Энцыкляпэдыст?
— Ха-ха. Безумоўна.
(І ён туды ж.)
— Водзіце экскурсіі па сядзібе?
— Не. Звычайна не, але для вас магу правесьці.
— А гэта можна?
— Так, я сябрую з рэстаўратарамі.
Я змрочна:
— Мастакамі, вядома ж.
— А што, вы ня любіце мастакоў?
— Чаму ж? Зусім наадварот.
— Ды вы ня бойцеся, яны цяпер працуюць унізе. Я правяду вас па першым паверсе. На другі нельга: можа абваліцца.
— Які вы клапатлівы.
— Ага. Галянтны.
— Мне пашчасьціла.
— Хадзем.
Мы ўвайшлі з Габрусём у сядзібу, і ён распавёў мне пра печы,

пра паркет, пра стагодзьдзі й прыбудовы, паказаў знакаміты камін і карціны рэстаўратараў.
— А вось тут тэраса.
— А мне адна жанчына адсюль рукой памахала — запрашала схавацца ад дажджу. Такая ў белым.
— Хто тут сёньня ў белым? Здаецца, я ня бачыў.
— Можа, вы яе ня ведаеце. Вы б у яе адразу закахаліся. Вельмі рамантычная асоба.
— Чаму?
— Стаяла пад дажджом у адной сукенцы — даўгой, як даўней насілі, глядзела ў неба.
— Хутчэй вар'ятка, чым рамантычная.
— Чаму гэта?
— Восень жа. У белай даўгой сукенцы, на дажджы.
— А я б хацела зь ёй пазнаёміцца. Даведаецеся, хто гэта, перадавайце прывітаньне.
— Абавязкова. А вось я ведаеце з кім хацеў бы пазнаёміцца?
— З кім?
— З тым чалавекам, што жыве ў вінакурні.
— Там многа хто жыве.
— Не, на трэцім паверсе, дзе надпіс.
— Які надпіс?
— Ну… "Была шостая гадзіна раніцы"… Пра кароў, пра павуціньне й усё такое.
— А нашто?
— А па-вашаму, гэта цалкам натуральна, што сярод абарыгенаў зьяўляецца гэткі надпіс?
— Чаму б не?
— У гэтага чалавека вельмі тонкая душа. Альбо негранёны прыродны талент, альбо… Альбо падсяліўся нехта. Які-небудзь бедны мастак.
— А калі мастачка?
— Тады яшчэ лепш.
— Чаму?
— Я б узяў яе за жонку.
— А калі яна замужам?
— Я б змагаўся.
— А калі яна кахае свайго мужа?
— Быў бы хросным бацькам іхным дзецям.
— А калі гэна ўсё ж мужчына?

— Запрасіў бы яго на піва. Ці напрасіўся б да яго на госьці, бо мне надта карціць паглядзець, што там усярэдзіне.
— А калі гэта я?
— Вы?
— А чаму б не?
— А вы што, так хочаце за мяне замуж?
— Ну, дзякуй. Я там проста жыву. Так што з вас піва.
— Хм. Добра. Толькі свой ровар пайду вазьму.
Так у маім жыцьці зьявіўся Габрусь. Габрусь займаўся гістарычнымі дасьледаваньнямі, пісаў артыкулы, складаў нейкія дапаможнікі й проста любіў парк. Габрусь мог адказаць на любое гістарычнае пытаньне, расказаць, чаму заняпалі індзейцы й у што верылі шумеры. Габрусь вадзіў мяне ў кіно, катаўся разам са мной на ровары, даваў чытаць кнігі й уставіў мне новы замок у дзьверы, каб я больш не баялася абарыгенаў. У душы ў мяне пасьвятлела, да мяне вярнуліся мае сябры й умільна паглядалі на нас з Габрусём, бо відавочна спадзяваліся, што жыцьцё маё нарэшце “наладзіцца”. Я пазнаёмілася зь дзяўчынкай Насьцяй, і тая пачала заходзіць да мяне, каб паслухаць якую казку й выцыганіць цукерку, якімі мяне шчодра частаваў Габрусь. Яшчэ ён насіў мяне на руках па схіле ля карчмы, дзе раней былі прыступкі, чытаў мне вершы, запрашаў у вандроўкі, знаёміў з сваімі сябрамі й, здаецца… Здаецца, ён мяне кахаў.

І хоць-калі я нават пачала задумвацца пра тое, што ў нас з Габрусём і праўда ўсё ідзе вельмі гладка і што ён зьбіраўся ажаніцца з гэнай “беднай мастачкай”, якая хавалася за шторамі на трэцім паверсе, а там жыву я, і Габрусь мне ўсё больш і больш падабаецца… А можа, мне варта было б наблізіць яго да сябе, забыцца на свае перажываньні, паспрабаваць адчуць каханьне наноў, толькі зь іншым чалавекам? Дазволіць ягонай пяшчоце праліцца ў мяне. Аддаць сваю. У нас магло б атрымацца. Усе людзі ўсё роўна зьвяры, таму ці не адная трасца, які з табой мужчына? А тут яшчэ й добрае сяброўства… Я магла б сябе ўгаварыць, пераканаць, што мне няма патрэбы ў табе, што не цябе адзінага я кахаю, бо вось жа й ты, відаць, змог, здужаў-такі (а казаў: “манагамны”) аб’езьдзіць Надзю. (Дарма яна торкаецца па парку. Два разы яе бачыла безь цябе. Дарма. Не хачу я зь ёй дыхаць адным паветрам. Нядобры яна

сабе выбрала лёс.) Усё! Вырашана! Габрусь дык Габрусь! Ён таксама чалавек і тым больш мужчына. Мабыць, гэта нават будзе цікава. Век жыві — век вучыся. Можна й пакаштаваць. Жанчына ніколі не застаецца адна! Кожны наступны мужчына пасуе ёй больш, чым папярэдні! Толькі вось каханьне...
Дый Габрусь, які цяпер ужо меў дазвол затрымлівацца запозна, у нейкі момант падхопліваўся й некуды ўцякаў. І заўжды ў бок Серабранкі — ускокваў на ровар і ляцеў у цікаўную цемру парку. Нават начных абарыгенаў не баяўся — вось які харобры. Па ўсім відаць: горкая мая доля — быць мне з Габрусём, калі ён ужо гэткі станоўчы, мужны, дабрадзейны й шляхетны. Ня хоча чалавек карыстацца маім разгубленым станам, складанасьцю маёй жыцьцёвай сытуацыі. Але чаму ён зьяжджае гэтак позна? Ды ўсё ў бок парку… Ноччу напрасткі ў Серабранку… А што калі ён усё ж?.. Мне ж адразу на тое выдала… Лошыцкі маньяк!!! Так. Такім ён і павінен быць: зьнешне прыстойны, добры, аматар старасьвеччыны й рамантычных разгубленых жанчын. Вось чаго ён да мяне прыбіўся: адчуў, што зь мяне ён зможа па-асабліваму назьдзекваццa — як-небудзь па-гістарычнаму. Што за сьвет! Што за жыцьцё! Ні табе каханьня адданага, ні шчырага сяброўства! Адныя дыплямаваныя мастачкі й гістарычныя маньякі! Што ж мне цяпер рабіць? Страшна мне зрабілася не на жарт. Канечне, Габрусь ня мог ведаць, што менавіта сёньня ўночы я здагадалася пра тое, што ён маньяк. І калі б хацеў, ён бы ўжо даўно ўчыніў сваю подлую расправу, бо нават новы замок у дзьверы мне ўстаўляў ён. Абароны перад Габрусём у мяне не было. Ні цяпер, ні раней. Чаго ж ён чакае? Можа, шкадуе? Ці й праўда праняло і ён закахаўся? І я да яго ўважліва стаўлюся, шаную, ягоныя артыкулы чытаю. Падумаць толькі: гісторык-маньяк! Але чаму? Можа, яшчэ ня позна нешта выправіць? Пагутарыць па душах, пераканаць, падлячыць. Страшна вось што: ён маньяк, а ўсё паказвае на тое, што ён мужчына, які мне пасуе. Вось у чым праблема: мне пасуе гісторык-маньяк. І я чыста ягоны тыпаж: бледнатварая й рудая. Рудая з золатам, але гэта цяпер нічога не мяняе, проста я па старой звычцы спрабую намякнуць табе, што ўяўляю сабой выверaны й ухвалены мастацтвам вобраз. Значыць, што мы маем: бледнатварая й рудая (з золатам) жанчына сядзіць у засцаным шматлікімі пакаленьнямі катоў і абарыгенаў будынку, трасецца ад страху, бо колькі дзён таму

вырашыла ўзяць сабе за абраньніка забойцу-псыхапата, зь якім яе зьвязваюць далікатныя адносіны, і горш за ўсё тое, што гэтая жанчына — я. І ўсё тое, што адбываецца, выходзіць — мой выбар. І гэты выбар ніяк не ўплывае на таго, дзеля каго ён быў зроблены, а толькі шкодзіць мне. Так, шкодзіць, бо вось жа й Габрусь — маньяк, і я сама ў гэтым дурным, навязаным мне змаганьні з умоўнасьцямі зрабілася адно іхнай закладніцай. І няўжо гэтая жанчына — я? Гэта ня я, але я ўсё гэта дзеля яго... а ён жа вось…

А што ён? Можа, яму цяпер іншае трэба. Ягоная душа, можа, пляваць хацела на ўмоўнасьці-няўмоўнасьці й проста прагне новага досьведу, а язык ня змог як сьлед растлумачыць. Можа, яму зараз трэба пажыць нейкім іншым жыцьцём, прайсьці пэўны этап. Пазаймацца творчасьцю, пасябраваць зь іншымі людзьмі, палюбіцца зь іншымі жанчынамі, нават займець дзіця. Абрасьці дзецьмі. Выгадаваць іх. Альбо кінуць. Зрабіць свой выбар і сутыкнуцца зь ягонымі наступствамі. Атрымаць жыцьцёвую ўзнагароду альбо цяжкую расплату. Зразумець альбо не зразумець. Быць разумным альбо дурным. Захварэць на брыдкую хваробу. Вылечыцца. Альбо памерці. Весьці аскетычны лад жыцьця. Баляваць. Сьпіцца. Дасягнуць прасьвятленьня. Пайсьці ў манастыр. Падацца ў пажарнікі. Разысьціся са мной назаўжды альбо вярнуцца. Не, не вярнуцца — вяртаюцца назад. Проста прыйсьці. Проста прыйсьці нейкім новым днём. Сустрэцца на новай жыцьцёвай пераправе альбо на сталым адрэзку спакойнага спраўджанага быцьця. Быць. Быць. Са мной ці безь мяне, але самому. Самім сабой. Бяз страху. Са сваім рашэньнем. І з маім каханьнем, якое я не магу вытравіць зь сябе. А што каханьне? Кахай не кахай, ня трапіш у рай. Перад Богам мы ўсе паўстанем паасобку. Дык што я мучаюся? Мне б цяпер думаць, што я асабіста скажу Богу й ці ёсьць я сабой, сваёй душой. Але калі ўсё гэта — мае рашэньні, дык можа, гэта сапраўды я?

Наступным днём у пакоі пахла ня мною. Ня мёдам ад майго цела й нават не мачой з пляцоўкі, як звычайна, а цёплай крывёю. Крывёю, не сапсаванай яшчэ тытунём і алькаголем. Крывёю не салёнай. Крывёю маладой, салодкай. Дзявочай крывёю. Я не магла зразумець, адкуль ідзе гэты пах. Ён ня быў непрыемны — ён быў чужы й празь яго чамусьці рабілася сумна. А яшчэ — шкада некага. Некага бязьвіннага, маладога,

некага, хто пры іншых абставінах мог бы зрабіцца табе найлепшым сябрам, а замест таго затапіў твой пакой сваёй крывёю. І можа, дзеля гэтай дзеўкі ты выварочвала б у транспарце ўсе кішэні, каб знайсьці квіток, бо тая спадзяецца на цябе, таму што едзе зайцам, а зайшла кантралёрыха. І ты дапаможаш ёй, а потым пазнаеш, узгадаеш, дзе й з кім яе бачыла, і праз гэтую сытуацыю, праз гэты момант узрушэньня, калі трэба дапамагчы маладзенькай хітрай дурніцы, ты будзеш адчуваць салідарнасьць, шкадаваньне й ніякай нянавісьці. Але цяпер яна нахабненька едзе зайцам па тваім жыцьці, борзьдзенькай вершніцай на тваім мужчыну, і ўсё, чаго ты хочаш, — гэта забіць яе. Для цябе больш няма асобных дзяўчат: для цябе ўсе яны — яна адна, суперніца. І калі ты выходзіш з вагона мэтро й гатовая ўчапіцца ў валасы зграбнай дзяўчыне, якая стаіць сьпінай да цябе ля супрацьлеглай платформы, ты разумееш, што гэта — мяжа і што далей цябе выратуе ад забойства толькі Бог. І тады ты молішся, каб Бог пазбавіў цябе ад гэтага жудаснага жаданьня, ад нянавісьці, ад рэўнасьці, і на сьветлае сьвята Раства цябе адпускае. Адпускае канчаткова, вызвольна, лёгка. Дзяўчаты гораду Менску ўратаваныя, ты прыгадваеш, што ведаеш сваю суперніцу ў твар, і ўсё, што ты потым кажаш пра яе, — гэта ня злосьць, а самаіронія. Ты выратоўваешся, бо можаш жартаваць. Ты робішся ўсё больш прыгожая і вясёлая. Цяпер ты — прывабная, годная жанчына, ты зноў любіш сябе й людзей, і людзі любяць цябе. І няхай некаторыя з гэтых людзей — гістарычныя маньякі, але тваё жыцьцё зьмянілася да лепшага. Ты перажыла цэлую восень і зіму безь яго, вось ужо ідзе другі вясновы месяц, і ўсё ня так дрэнна, а нават шчасьліва. Да таго ж, сёньня сьвеціць сонца, цёпла й прыемна-пуста. Недзе адсыпаецца пасьля сваіх цёмных справаў Габрусь, прыглядаецца да інтэнсіўнасьці сьвятла твой каханы, ты падыходзіш да новага й вельмі важнага рашэньня — карацей, жыцьцё ўяўляе сабой заканамерную, непазьбежную гармонію. Толькі вось гэты пах — цёплы, салодкі пах чужой дзявочай крыві.

Раптам мне хочацца кіслага альбо салёнага — каб прагнаць гэты салодкі крывавы пах з роту. Дзіва што: трэба ж было ўчора навыдумляць гэтулькі жарсьцяў — таму й здаецца цяпер. Я іду ў мясцовую краму й купляю піва. Піва стаяла ў цяньку — яно

прахалоднае, цёмнае, як і рака насупраць вінакурні. Я радуюся, што змагу пачаставаць ім Габруся. Я спытаю яго наўпрост, ці маньяк ён і як нам быць далей. Альбо нешта адно... Не. Нешта адно будзе гучаць куртата — трэба ўжо высьвятляць усё адразу. Тым больш, невядома, што ў Габруся наўме й што яго напужае мацней. Можа, ён закаханы ў галоўнага рэстаўратара альбо ў абарыгена зь целам спэцназаўца ў адстаўцы, а тут я са сваім золатам і шостай гадзінай раніцы. А шторы трэба зьняць: калі ён мяне дагэтуль не знайшоў, то ён ужо, відаць, і ня прыйдзе. І ўвогуле, можа, мне лепей зьеха…

Гэты пах быў для мяне як аплявуха — ніколі мне не давалі поўху, але я адкінула галаву ўбок і назад гэтаксама, як гэта робяць ў кіно. А потым мяне разьвярнула й страсянула, як быццам мяне аблілі кіпенем. Мазгі мне засьціла нянавісьцю адразу. Надзя, відавочна, заходзіла да мяне, не засьпела ў хаце й скіравала ўжо была ў парк. Але разьвярнула яе гэтак жа, як і мяне, калі я тарганулася, бо адчула гэты салодкі крывавы пах нястрыманага, карысьлівага цела й няўдалай парфумы. Хаця я думаю, што страсянула мяне нават не праз пах, а праз тое, што прыхаваныя хвалі рэўнасьці ў нас пазналі адна адну хутчэй за нас саміх. Размова, праўда, пачалася яшчэ прыстойна. Надзя спыталася, ці не Марыяй мяне клічуць, а потым паведаміла, што яна Зьмітрова дзяўчына. Гэта мяне чамусьці разьвесяліла, магчыма таму, што я ўжо даўно ня чула ягонага імя. Наступная ж фраза, якая магла мяне павесяліць хутчэй, чым папярэдняя, прывяла мяне ў стан ледзянога, злоснага шаленства. Пасьля таго, што *мне* прыйшлося перапакутаваць, яна прасіла мяне...

— Аддайце мне яго! Адступіцеся!

Вось тут да мяне дайшоў сэнс папярэдняе фразы. (Зьмітрова дзяўчына — яна! Скажы яшчэ — самога цара Саламона! Каб і хацела адступіцца, не адступлюся цяпер!) І я, склаўшы рукі на грудзёх, скорчыла зьдзекліва ўважлівую, але гордую міну (спадзяюся, усё ж ня змучаную й не няшчасную).

— Аддайце! Вы ж сабе лёгка знойдзеце іншага! Вы ж сапраўдная, а я больш не магу! Не магу фарбаваць валасы, рабіць завіўку, падрабляць выраз твару, як у Моны Лізы. Я ўсё роўна ня буду вамі. А вам жа нічога ня трэба выдумляць — проста быць сабой, і мужчыны вас будуць кахаць. А я не магу. Я ледзь утрымліваю яго каля сябе. Я яму надакучыла. Я мяняюся, але ўсё роўна не пасьпяваю. Нашу чорнае, прыходжу ў парк, а

вы ўжо ў шэрым. Нашу шэрае, а вы ўжо ў чырвоным. Я ня ўмею быць такой, як вы. Ну адступіцеся! Зрабіце так, каб ён на вас забыўся, каб у яго зьнікла ўсялякая надзея. Можа, тады ён прытуліцца да мяне душой. Ён жа ганарлівы. Ён ня будзе за вас змагацца. Ён і цяпер моўчкі трымаецца на адлегласьці, хаця сэрца ягонае з вамі — пячэцца, сквырчыць пырскамі на вашым агні. І целам ён не са мной. Ён не трапляе ў мае рухі. Не знаходзіць маіх грудзей. Ён з вамі. Раз за разам ён гэта робіць з вамі, а не са мной. Астудзіце яго. Пакрыўдзіце яго. Зрабіце ягонаму гонару так балюча, каб ён ужо ніколі не захацеў да вас! Вы ж халодная! Злая! Ну дык будзьце сабой! Вы ж не разумееце яго! А я разумею! Я адна вартая ягонага каханьня!
— Ну няхай ён вас і кахае! Што вы тут перада мной прамовы робіце! Начыталіся кніг! Што ні слова, то нейкі пазычаны патас. Вы што, па-людзку гаварыць ня ўмееце? Вам жа можна дыягназ ставіць. Вы што, думаеце, тое, як і што чалавек кажа, не ўплывае на ягонае жыцьцё? Ды калі вы й далей будзеце думаць і размаўляць гэткім чынам, усё скончыцца клінікай. Ды вас і сурочваць ня трэба… Самі сябе й сурочылі.
— Вось! Вось дзе яно! Вядзьмарка паганая! Сядзіш сабе тут, на людзей псоту наводзіш! Нікога табе не шкада, акрамя самой сябе!
— Ой, ды не сквярыцеся вы. Наўкола людзей поўна. Ня можаце са сваім мужыком паладзіць — няма чаго да мяне лезьці. “Грудзей ён маіх не знаходзіць!” Відаць, доўга шукаць трэба.
— На сябе паглядзі, грымзала! Ссохлая ваўчыха пасьля зімоўкі!
— Затое не аброслая кумпякамі, як ты.
— Дзе ж ты іх бачыла, карова здыхлявая?
— На гэнай тупой шчаціністай сьвінаматцы, што тут рохкае перада мной. І яшчэ з конскім хвастом. На галаве.
Тут мы добра паплявaліся, выдралі адна ў адной колькі рудых валасінаў (з той толькі розьніцай, што адныя — натуральныя, а другія — пафарбаваныя) — ня ведаю, праўда, ці з валасянымі цыбулінамі, — папярэдзілі адна адну, што “век табе шчасьця ня бачыць, асабліва зь ім,” узаемна пажадалі ўжо ўсялякіх дробных непрыемнасьцяў і годна разышліся. Шкада, мала пабіліся, мала пагаварылі. Толькі што перад дзецьмі няёмка — куды ўжо там болей. Яны мяне цяпер жахліва баяцца: вядзьмарка, ваўчыха пасьля зімоўкі (ссохлая!) ды яшчэ здыхлявая карова. Нават для дзіцячага розуму гэтага занадта,

хаця цалкам рэалістычна. Таму дзеці ад мяне зноў аддаліліся, і, калі я выходжу на двор, яны, бедныя, галёкаюць і ня ведаюць, куды ўцякаць і дзе хавацца. Тая ж Насьця да мяне тыдзень не прыходзіла, а ейная ўлюбёная рудавалосая лялька ўвесь час валялася мокрая й брудная на ганку, і з кудзерамі ейнымі граўся вёрткі знуджаны кот.

Пазьнікалі ўсе, нават Габрусь, — але я вырашыла, што ня здамся й што ніякая Надзя ў сваім айчынным ружовым трыкатажы з зацяжкамі не сапсуе мне майго шчасьлівага жыцьця. А яна нічога — толькі што пакамечыла сябе падробкамі й сваёй маладой, ня вельмі здаровай злосьцю. Зьнешне бесхарактарны псэўдарамантычны вобраз, але гэткія насамрэч бываюць вельмі прагматычныя. Усё жыцьцё палююць, пралічваюць і цудоўна адчуваюць каньюнктуру. Вучобу, працу, дзейнасьць, інтарэсы выбіраюць такія, каб лягчэй было знайсьці мужа. Таўкуцца там, дзе болей мужчын. Вынюхваюць, вышукваюць, выбіраюць найбольш пэрспэктыўных альбо ўжо самарэалізаваных. Ніколі не бяруць тых, каго яшчэ трэба выхоўваць, а выдзіраюць гатовенькіх, выгадаваных іншымі жанчынамі, няхай сабе маткамі, сяброўкамі ці жонкамі. Потым — грошы, паказуха, тусоўка, уплыў, уцехі. Альбо: грошы, сям'я, дом, крэпасьць, паказуха. Дзеці — альбо выпадковасьць, альбо сьцяг, альбо сродак. Мужчына ж калі не спраўляецца, то можна й замяніць. Сказаць "я адна вартая ягонага каханьня" заўсёды знойдзецца каму. Увогуле, словы "каханьне", "душа", "узаемаразуменьне", "павага" такія дзеўкі часта любяць казаць, толькі чакаюць усяго гэтага ад іншых: другога кірунку вэктар іхнай духоўнай дзейнасьці папросту ня мае. Па жыцьці яны ідуць як гібрыд танка й сучкі ў пэрыяд цечкі. Такія — выдатная пара для мужчыны пыхлівага, для мужчыны ганарлівага, для мужчыны, які ня будзе лётаць за нейкай там занадта сабе на ўме. Але вось што цябе адрозьнівае ад Надзінага тыпажу, дык гэта тое, што ты мужчына з гонарам, да таго ж разумны й папраўдзе таленавіты. Ты ня зможаш не заўважаць ейнай каньюнктурнасьці й пустаты занадта доўга. І калі добра паразважаць, то ты зусім ня ейны тыпаж, а яна сама ну ніяк ня ўпісваецца ў прастору вакол цябе. І няхай мой твар — гэта камэдыя лірычных станаў, але ўсё ж я прыгажэйшая за яе й пасую табе больш. Табе, канечне, самому вырашаць, але факты — рэч упартая. І гэта ўсе кажуць.

А да мяне нечакана заявілася незнаёмая абарыгенка й сказала: “Тут вас усе вядзьмаркай клічуць. Пагаворваюць, вы псоту наводзіць умееце. А то, можа, і прываражыць?” Я дагэтуль ня ўпэўненая, гаварыла яна сур’ёзна, намякала, што ёй патрэбная мая дапамога, прапаноўвала сваю ці сьмяялася зь людзкіх забабонаў. Яна ўвогуле была нейкая незвычайная: усяго гадоў на сем старэйшая за мяне, але нейкая архаічная. Прычоска ў яе была высокая, арыстакратычная — такую насілі шляхцянкі гадоў сто таму. Сукенка на ёй была таксама нейкая антыкварная, але чыстая, белая, багатая. Праўда, мне падалося, што падол ейнай даўгой сукенкі набрыняў халоднай цяжкой вадой. Здаецца, я нават пачула, як кропля вады бэмкнула аб падлогу. І тады жанчына ўздыхнула й вымавіла: “Вы яшчэ можаце спадзявацца, а мне ўжо запозна. Усё яшчэ можа зьмяніцца, пакуль вы па гэты бок. А ў мяне ўжо спадзеў слабы, хутчэй, нават ніякі. Маю справу можа вырашыць толькі Бог”.
— Вы зь некім рассталіся?
— Рассталася, ды яшчэ па сваёй волі. Мне б неяк перачакаць, ператрываць, перапакутаваць, *перажыць*. А я ня здолела… Змучылася я надта. Я замуж у дзевятнаццаць гадоў зайшла — за добрага, за багатага. Думала, буду цяпер шчасьлівай, зажыву поўным, радасным жыцьцём. Радасьці былі, і муж у мяне быў вельмі спагадлівы — ня надта каб і крыўдзіў, але не змагла я сабе выгадаваць шчасьця. Самотна мне было, нікому я не была патрэбная — усё адна сядзела. А муж мой, як утрапёны, справамі займаўся: гойсаў па горадзе, па ўсіх турках і барках, грошы зарабляў, за ідэі змагаўся. Хаця й я часу не марнавала: пра гаспадарку дбала, потым бедным, абяздоленым дапамагаць пачала, дом састарэлых утрымлівала. Я любіла людзей — не за ўзнагароду, шчыра ім сэрца сваё аддавала. А вось пад сэрцам у мяне жыцьцё гэтак і не забілася. Можа, таму нішто майго мужа ў хаце й не трымала. Я сябе страшна вінаваціла, але рук не апускала й змагалася за гэтае дзіця, як магла: зёлкамі лячылася, да дактароў езьдзіла, да бабак хадзіла. Толькі не захацеў мне Бог дзіцяці даць. Я як у сон правалілася — адно добрымі справамі ратавалася; але потым праз новае каханьне аджыла. Думаю, сядзеў ува мне недзе глыбока гэты спадзеў — нарадзіць дзіця, хоць бы і не ад свайго мужа. Але каханьне — гэта ня жарт, і ніякі разьлік у ім ужо потым ролі ня грае:

закахаешся й будзеш на гэтым агні гарэць. А тут муж і пачуцьцё абавязку. Праўду кажуць: “Нельга слугаваць двум панам”. Вось я й зламалася: не магла болей маніць, здраджваць аднаму й другому, мучыцца, чакаць і спадзявацца невядома на што. І цяжка мне было, горка, што не магу я іншаму чалавеку жыцьцё даць, што гэткая я нягодная. Думала: “Нашто ж я ў гэты сьвет прыйшла, калі не магу сваё жыцьцё далей перадаць?” Але ж на нешта мяне Бог стварыў… І ў чым была мая віна? Гэна не віна мая была, а бяда. Не змагла я, не хапіла ў мяне моцы прыняць Госпада волю. Думала, сама здолею ўсё адным махам вырашыць, усё скончыць, забіць сваю жахлівую бяду. А мне б варта было перажыць, мне б варта было паверыць, што ня нам вызначаць, каму й калі ў гэты сьвет прыходзіць і калі сыходзіць зь яго…
Жанчына змоўкла, утаропілася пакутніцкім поглядам у акно, і ад сукенкі ейнай ізноў павеяла цяжкім вільготным холадам.
Я здрыганулася й счакала крыху, бо ня ведала, як далей працягнуць гутарку: распытваць пра падрабязнасьці мне падалося нетактоўным, а пра бязьдзетнасьць ейную гаварыць было ніякавата. Празь нейкі момант я насьмелілася скіраваць гутарку на каханьне, бо палічыла тады гэтую тэму самай нэўтральнай і бясьпечнай:
— Я вас вельмі добра разумею. У мяне гэткае самае пытаньне: кахаць аднаго чалавека й спадзявацца невядома на што альбо выбраць іншага, даступнага і жыць потым правільным упарадкаваным жыцьцём.
Жанчына хітанула галавой, як быццам у знак згоды, але працягвала ўзірацца — ці то ўдалячынь, ці то ўсярэдзіну сябе:
— Трэба слухаць сябе. Сваё сэрца й сваё сумленьне.
Я ўзрадавалася, таму што, хаця жанчына й адказвала адстаронена, як быццам аднекуль здалёк, парада была даволі неканкрэтная й нязмрочная:
— Я гэтаксама думаю. Мне здаецца, што самую глыбіню свайго сумленьня падмануць немагчыма. Тваё сумленьне заўжды з табой, нават калі ты тлуміш галаву сабе й людзям.
Госьця нарэшце зірнула на мяне, усьміхнулася ўсьмешкай жанчыны са стогадовым досьведам і заўважыла:
— І яшчэ трэба зразумець сваё сапраўднае жаданьне й добра падумаць, у чым насамрэч яно палягае. Бо мары могуць збыцца, і добра, калі гэта сапраўды будзе тое, чаго ты хацела.

Тут я занэрвавалася, бо пераключылася на сябе й успомніла, што хачу быць са Зьмітром:
— Але як жа я магу гэта ведаць? Як мне зрабіць правільны выбар, які будзе потым апраўданы жыццём?
Абарыгенка пасур'ёзьнела, нават паружавела, і з імпэтам прамовіла:
— Магчымасьць выбару дае нам Бог і кіруе нас, калі мы прыслухоўваемся да яго. Але вырашаем мы самі. Учынак альбо ягоная адсутнасьць — гэта ўсё рашэньні. Трэба думаць і вырашаць у згодзе з Богам і сваім сумленьнем. А ўжо воля Бога на тое, каб дазволіць нашаму рашэньню адбыцца альбо спыніць яго. Узнагародзіць альбо пакараць.
— Можа, мне тады ня варта й рыпацца? Хаця… Усё роўна ж прыйдзецца нешта думаць, неяк жыць. Я адчуваю, што, пакуль я ня вызначуся, мяне будуць перасьледаваць адныя й тыя ж беды.
— Неабходнасьць выбару ўсё роўна кладзецца на нас. Тое, які выбар мы робім, таксама важна: выбар паміж любоўю й пыхай, паміж дабром і злом.
— Але ж ня я адна раблю выбар. Астатнія — таксама, і магчыма, супрацьлеглы.
— Спадзявайцеся. Спадзявайцеся на Бога й на добры сыход. Бог вызначае нашыя шляхі — мы вырашаем, як па іх ісьці.
— О-ох. Цікава, ці ёсьць Богу справа да ўсіх гэтых жаночых-мужчынскіх жарсьцяў? І ці маюць яны ўвогуле дачыненьне да нашага жыцьця? Жанчына, канечне, жыве мужчынам і потым дзецьмі (тут госьця мая схіліла галаву набок і так горка паглядзела мне ў вочы, што я ад ейнага позірку ажно прыкусіла кончык языка), але я вось нядаўна ўявіла сабе, што будзе мне гадоў семдзесят, стану я перад люстэркам і скажу: "Ну вось і прайшло тваё жыцьцё, а ці спраўдзілася яно?" — і ўбачу перад сабою толькі твары гэных недатумкаў, якіх я мела гонар "кахаць". І што, гэта сэнс жыцьця? Магу сабе ўявіць, як ужо Бог ад нашых глупстваў стаміўся. Мы заўжды нешта просім у яго, і хочам усё адразу, а самі баімся сябе, баімся Боскага ў сабе, сваіх самых сьветлых і прыгожых здольнасьцяў — любіць і рабіць дабро.
— І мы не заўжды ведаем, што ёсьць дабром. Так?
— Але як жа нам тады вырашаць?! Што дабро, а што зло, я магу ведаць альбо абстрактна, альбо па мінулым досьведзе, але

ж як жыцьцё павернецца, я не магу прадбачыць. Як жа мне правільна выбраць?
— Я не магу вырашаць за вас альбо прадказваць ваш лёс. Але я думаю, вам трэба пакласьціся на Бога й прыслухацца да сябе.
— Прыслухацца да сябе… Я й не разьбяруся, дзе ўва мне гаворыць маё “я”, а дзе — нешта іншае. Тут, хутчэй, трэба настолькі ад сябе дыстанцыявацца, каб зразумець, хто ты, што ты й куды табе ісьці.
— Магчыма, табе ня будзе іншага шляху, акрамя як пратаптаць сваю асобную сьцежку.
— О-ой, не пужайце мяне, і так цяжка. Хаця… Хай сабе й сваю, але ж чаму я не магу быць разам з мужчынам, якога кахаю? Няўжо ж мая сьцежка павінна абавязкова быць самотнай?
— А вы яе гэтак бачыце?
— Нічога я ня бачу — я проста хачу жыць зь ім у любові й згодзе. І ў творчасьці. І як я магу бачыць тое, чаго, відавочна, няма?
— А вы паспрабуйце. Адна справа захацець, а іншая — убачыць і зрабіць неабходныя захады. А там хто ведае: я ж вам казала — пакуль жывём, мы можам спадзявацца.
— Колькі я ўжо спадзяюся! Столькі ўсяго зрабіла, гэтак зьмянілася… да лепшага, знак падала! А дзе ён? Чаму ён не прыходзіць?
— Нельга быць гэткім капрызным дзіцем. У вас ужо дастаткова розуму й досьведу, каб адказаць на свае пытаньні й уладкаваць жыцьцё. Нельга ўсе рашэньні на Бога й выпадак сьпіхваць. Трэба ўзяць на сябе адказнасьць за свой лёс, а ня енчыць і жаліцца ўсяму сьвету, што прынц ніяк ня хоча прыйсьці й заваяваць.
— Ага. Толькі гэтак любоўныя справы й робяцца: сядзіш, марыш, на пяльцах вышываеш, а тут праходзіць міма прынц, прычым ня твой, і па нейкай памылцы альбо непаразуменьні цябе выбірае. І самае дзіўнае, што ў вас выдатна ўсё выходзіць — хоць заўтра пад вянец. А паспрабуеш таргануцца й цяўкнуць, што шчырага, узаемнага каханьня з тваім *абраньнікам* хочаш, — адразу ўсё адбярэцца й будзеш адна ў вінакурні век дажываць.
— Век дажываць. Калі б вы толькі ведалі, якое гэта шчасьце — *дажыць* свой век! Гэта заўжды шанец дачакацца цуду!
— Цуду. У мяне ўсё жыцьцё — цуды. Ведаеце, я думаю, што

калі мой лёс ніколі не падводзіў мяне і вырашаў мае справы самым цудоўным чынам, то, можа, і цяпер мне варта аддацца зьбегу абставінаў? Забыць Зьмітра, калі ўжо мы рассталіся, застацца з Габрусём — можа, гэта й ёсьць жыцьцёвая мудрасьць?
— І вы здолееце з гэтым жыць?
— Гэтак шмат хто жыве.
— Але ж яны не шчасьлівыя.
— А я шчасьлівая?! Ну хаця… Не бяз гэтага. Я сапраўды шчасьлівая — мне няшчаснай быць проста невыносна, агідна.
— Вось бачыце, вы любіце шчасьце, і шчасьце любіць вас. Але самае галоўнае — гэта тое, што вы любіце жыцьцё. Паспрабуйце палюбіць свайго мужчыну гэтак жа, як вы любіце жыцьцё. Паспрабуйце ўбачыць свайго мужчыну, а не свае чаканьні да яго, і палюбіце ягонае жыцьцё й яго ў гэтым жыцьці. Менавіта палюбіце, таму што каханьне — рэч далёка небескарысьлівая.
— Я б і радая, толькі адкуль мне цяпер ведаць, хто мой мужчына? Зьмітра ж ад мяне як адрэзала.
— Мне чамусьці здаецца, што ваш мужчына — у вашых снох. А наконт адрэзала… Гэта быў падарунак лёсу: інакш і быць не магло, калі вы прагнулі чыстага шчырага каханьня — толькі вольнай душою можна па-сапраўднаму палюбіць і пакахаць. Іншая справа, што, каб шчыра кахаць, людзям неабавязкова быць паасобку…

Тут раптам забрахаў унізе сабака, і госьця мая страпянулася й пачала разьвітвацца: “Загаварыла я вас. Пайду ўжо. Вунь і сабака мой безь мяне засумаваў. І вы не бядуйце аб сваім каханым: нельга куды-кольвек прыйсьці, не прайшоўшы шляху”. І я гэтак задумалася над ейнымі словамі, што ажно не заўважыла, што незвычайная незнаёмка сышла. А калі я ачомалася й кінулася да акна, то ўбачыла далёка справа толькі мокрага чорнага сабаку — я й ня чула, што ішоў гэткі моцны дождж.
Надышоў вечар, аблашчаны сьвежым пахам ракі й маладой лістоты. Я не магла больш заставацца ў хаце й асэнсоўваць нядаўні візыт і свае пэрспэктывы седзячы. Да таго ж я падумала, што нядрэнна было б знайсьці гэную дзіўную абарыгенку (хаця б па сабаку, калі сама яна будзе ў хаце) і

спытаць ейнае імя. Таму я выйшла на двор, пакружыла вакол вінакурні, торкнулася ў краму, але нікога не сустрэла. І раптам я вельмі выразна адчула, што ня маю тут нікога, ніводнай роднаснай душы, што абарыгенаў люблю толькі як вобразы й пэрсанажы, а не як канкрэтных жывых людзей, і што я тут гэткая ж чужая, як і ў якім-небудзь іншым месцы. Я ўзгадала, што першапачаткова хацела ўсяліцца сюды нават не для таго, каб гэткім вычварным чынам прывабіць Зьмітра, а каб выратаваць будынак. Замест гэтага я толькі напоўніла яго яшчэ адной чалавечай гісторыяй і дагэтуль не даведалася, які лёс прыгатаваны вінакурні з надпісам “1896”. Цалкам магчыма, што людзей будуць хутка адсяляць, бо хадзілі ўжо чуткі, што неўзабаве здаюцца новыя дамы. Значыць, выкінуць і мяне, бо я не змагу нічога запярэчыць, ня здолею памітынгаваць нават дзеля забавы, бо ўжо ня веру ў выніковасьць мітынгаў. Тым больш што жыць тут сапраўды вельмі некамфортна, хаця я й перабыла ў вінакурні самыя няўтульныя поры году. Адна надзея, што Габрусь, гісторыкі й рэстаўратары не аддадуць будынку на разбурэньне. Праўда, усе яны дасьведчана кажуць пра вялікія грошы, пэўны тэрмін эксплюатацыі, а самі проста ня маюць паміж сабой ніякай еднасьці й ня хочуць насамрэч зьвязвацца зь нейкімі невыгоднымі справамі. Яны гэтак слаба падобныя да мужных змагароў — у большасьці сваёй яны затурканыя бытам, разгубленыя, хоць і ганарлівыя мужчыны. А Габрусь яшчэ й маньяк. І ўсё скончыцца тым, што я паплачу-паплачу па вінакурні (калі мой сябар Габрусь дасьць мне дажыць да гэтага дня), а потым пераеду ў новую кватэру на былым полі, завяду сабе стомленага побытам мужчыну й буду мудра пасьмейвацца з закаханых ідэалістычных дурніц.
Гэтак я думала па дарозе ў парк, самотная, злая, прагорклая ад расчараваньня жанчына, як раптам убачыла на дрэве за мостам аблічча сьвятога. Спачатку я вырашыла, што мне здаецца і гэта маё сумленьне папярэджвае мяне, што нельга дрэнна казаць пра людзей, а тым больш мужчынаў. Але калі я зірнула на дрэва зноў і зноў, то ўпэўнілася, што аблічча ўсё яшчэ там, і вельмі выразнае. Сьвяты з барадой, даўгімі расхрыстанымі валасамі й буйным носам мудраца глядзеў на мяне разумнымі ўважлівымі вачыма. І ў той жа час ён глядзеў і ўправа, і ўлева, і ўверх, і ўніз, і ў вечнасьць, і ў сябе. Ён думаў, ён ведаў і, як быццам, хацеў нешта сказаць, а можа, проста быў. І ўжо аднаго

гэтага было дастаткова, каб адчуць, ухапіць нейкую думку, ідэю і адразу яе забыць, але супакоіцца й паверыць. Я як быццам убачыла, зразумела сябе, свой шлях, сваё каханьне й сваю любоў, сваё змаганьне й свой спакой. Я ўбачыла прасьветлены позірк Зьмітра, ягонае прабачэньне й прыняцьце, твары ягоных дзяцей з маёй усьмешкай, пачула сьмех нашых бацькоў і ўздых маёй прабабулі. Я адчула смак сьлёз у горле маёй нядаўняй госьці й пагладзіла зморшчыны ад п'янага роздуму на лобе спэцназаўца ў адстаўцы. І я кінулася да дрэва, каб яшчэ пагутарыць, запытацца, але зблізу аблічча было ўсяго толькі тоўстым сукам. Тады я датыкнулася пальцамі да сьветлых дарожак дрэва й намацала цёплы старэчы твар, і, калі я адбегла назад, сьвяты ўсё гэтак жа глядзеў на мяне, на раку, на вінакурню, на сядзібу й у неба.

І я зразумела, што гэта разьвітаньне: Лошыца прыняла мяне, адкрыла мне свае таямніцы й гэтым адпускала мяне. І парк, і сядзіба, і вінакурня застануцца й будуць жыць сваім жыцьцём, хаця непазьбежна зьменяцца. Гэтак і я мушу ўвайсьці ў жыцьцё й пакінуць мінулае за сьпінай, каб яно магло з чалавечай драмы зрабіцца жыцьцёвым знакам. Я павінна пакінуць тую Лошыцу, якую любіла, бо яна ўвасабляла для мяне каханьне да Зьмітра, і прыняць Лошыцу зь ейным асобным адмысловым лёсам. І Зьмітра таксама я павінна ўбачыць не як увасабленьне сваёй мары, а як асобнага чалавека, які можа мяняцца й выбіраць новыя кірункі для свайго ўнутранага й вонкавага жыцьця. Я не павінна чакаць ад яго "ідэальнасьці" й падпарадкаванасьці маім уяўленьням — я павінна радавацца яму, факту ягонага існаваньня. І калі я хачу кахаць Зьмітра, то мне нішто не замінае: глупства — патрабаваць гарантыяў узаемнасьці. Хаця я, здаецца, і не прасіла ніколі гарантыяў — я проста хацела быць разам. Тут я ўзгадала скандал з Надзяй, і да мяне дайшло, што нам нішто не перашкаджае быць разам, што паміж намі, па вялікім рахунку, не стаяць трэція асобы альбо абставіны, што мы ня разам толькі з-за ўласных страхаў, пыхі й крыўдаў. Дык значыць, цяпер, калі гэтыя заганныя пачуцьці вытраўленыя хаця б з майго сэрца, бо пра цябе я нічога ня ведаю, акрамя таго, што ты горды й пакутуеш на адлегласьці, мы можам аб'яднацца й быць разам? Гэта ж цалкам магчыма, бо мы нават не пасварыліся, не разышліся душою, не забылі адно аднаго, а проста аддаліліся целам у

часе, каб перш-наперш знайсьці сябе. А знайшлі… Я знайшла Габруся, абарыгенку ў белай сукенцы, дзяўчынку Насьцю, аблічча сьвятога, творчасьць і ўнутраны спакой. А яшчэ я нарэшце знайшла сваё сапраўднае каханьне — цябе ў тваім жыцьці, без маіх страхаў і сумненьня…
Пакуль я рабіла для сябе гэтыя высновы, парк раптоўна пачаў губляць колер. Ён рабіўся шэрым — недзе сьвятлейшым, а недзе цямнейшым, і толькі валасы мае гарэлі ля твару рудым агнём. Яны былі лішнімі — яны вярталі мяне ў мінулае, дзе я кахала цябе інтуіцыйна, сьлепа, навобмацак, але дзе ты любіў дакранацца да маіх валасоў. А цяпер я кахаю цябе сьвядома, кахаю менавіта цябе, але з аднолькавай верагоднасьцю я магу альбо ўбачыць цябе заўтра, альбо ня ўбачыць цябе ніколі. Таму я больш не хацела сваіх валасоў. Я не хацела цягаць тваё каханьне за сьпінай — я прагнула сустрэцца тварам да твару, зірнуць табе ў вочы чыстым радасным позіркам чалавека свабоднага ад крыўды й чаканьняў. Я так больш не магла: мне не патрэбны быў гэты руды адчай, які я сама раней пялегавала й любіла. І таму, калі я сшарэлым прыцемкам прыйшла дахаты, я запляла валасы ў касу, пазычыла ў суседзяў вялікія бабуліны нажніцы для стрыжэньня авечак (сама я мела толькі манікюрныя), стала перад люстэркам і адрэзала прэч свой тугі, непадатлівы руды адчай.

Праўда, адчай не адпусьціў мяне адразу, а прымусіў напасьледак зрабіць адзін ірацыянальны ўчынак. Я так расхвалявалася, калі ўбачыла свае кароткія абскубаныя валасы, што ўнутрана залямантавала, бо мусіла пайсьці дзеля Зьмітра на гэткую дзікунскую, нечалавечую ахвяру. І мне захацелася кінуць сваю касу яму ў твар, каб ён нарэшце зразумеў, як я пакутавала, як несправядліва ён са мной абышоўся. І яшчэ я хацела, каб ён ведаў, што я не намерваюся пакутаваць надалей і не зьбіраюся ні з кім ваяваць, а буду проста жыць. І калі ён гэткі сьляпы й не заўважае вытанчаных сьціплых знакаў, кшталту “шостай гадзіны раніцы”, то я пашлю яму такі знак, што ён пашкадуе.
Цяпер можна дзівіцца, што, вырашыўшы мірыцца, я шпурнула яму чорную значку. Але наступнай раніцай я выправілася на пошту, скруціла касу й паслала яе Зьмітру дахаты. Я разумела, што адрэзаная каса наўрад ці прывядзе да цябе каханага

чалавека — хутчэй, наадварот, выкліча жах ці гідлівасьць альбо, яшчэ горай, сьмех тваёй немудрагелістай суперніцы, але я проста ня здолела даць сабе рады. Хай глядзіць, хай узгадае, хай нават спужаецца, а сяброўка ягоная хай вішчыць у прыпадку рэўнасьці й злосьці. І няхай каса мая паляціць у сьмярдзючы бак для сьмецьця, я хаця б упэўнюся тады, што ён мяне не кахае, і здолею перамагчы ў сабе жаданьне быць разам. Я магла б зрабіць прасьцей: напісаць ліст, паштоўку, патэлефанаваць, але мне здавалася, што Зьміцер будзе пачувацца як загнаны зьвер, на якога палююць і якому не даюць шанцу самастойна распараджацца сваім жыцьцём. Я адчувала, што ён сам павінен зрабіць першы крок да замірэньня, і спадзявалася, верагодна, гэткім чынам нагадаць пра сябе, прымусіць думаць. І яшчэ я хацела, каб ён даткнуўся да мяне, хаця б на адлегласьці, пагладзіў мае валасы, няхай і не ляжаць яны ўжо на маёй сьпіне. Цікава, няўжо я зьбіралася адчуць фантомныя болі?

А ў Зьмітра ажно забалеў жывот, калі ён убачыў гэную скручаную, як зьмяюка, касу. “Дадумацца да такога! Ды зь якой мэтай? Што мне цяпер з гэтай касой рабіць? Павесіцца на ёй, ці што?” Халодная, нежывая, рудая, яна смаліла яму рукі, і ён, запіхнуўшы касу ў эцюднік, пакіраваў у Лошыцу. Па-першае, гэткую незразумелую рэч нельга было трымаць у хаце, а па-другое, яму трэба было ўсё як сьлед абдумаць, далей ад мітусьні й людзей.

…Марыя разышлася зь ім неяк па-дурному, абразьліва, нагаварыўшы няведама чаго пра чалавечыя адносіны, творчасьць, самарэалізацыю, умоўнасьці, багацьце, беднасьць. Вось што мучыла яго. Яна ўсё скандаліла й скандаліла, прычым сама з сабой, а ён ніяк ня мог даўмецца, чаго яна ад яго хоча. Ніводнае зь ейных словаў, рашэньняў ня мела дачыненьня да ягонага непасрэднага жыцьця, да рэальнага стану рэчаў. Да таго ж, незразумела было, якая роля ва ўсіх ейных рашэньнях адводзіцца яму. У яго яна нічога па-сур’ёзнаму не пыталася — толькі пераконвала яго чамусьці, што ён ёй здраджвае, што ён, відаць, ня шчыра яе кахае й спадзяецца знайсьці сабе іншую, маладзейшую дзяўчыну. Яна нават дастала нейкі падрабязны нямецкі гараскоп на мінулы год, дзе было дэталёва расьпісана, як ён перакінецца да іншай і будзе выпрабоўваць каханьне сваёй партнэркі, але потым упэўніцца ў сталасьці ейных

пачуцьцяў і выбера яе. Калі Марыя з шалёнымі вачыма й выразам абражанага гонару на твары цытавала яму гэны гараскоп, Зьміцер вельмі моцна засумняваўся ў тым, што ў яе ўсё добра з галавой, і падумаў, ці не пашукаць яму, сапраўды, іншай — хай прасьцейшай, але не настолькі разумнай вяшчухі, каб ажно зашкальвала.

Потым ён стаміўся трываць ейныя прыпадкі, справакаваныя тым, што ён ходзіць маляваць ня зь ёю, а зь сябрамі-мастакамі, а пасьля п'е зь імі ў парку піва й, можа, калі гарэлку. Для Марыі гэта чамусьці сталася галоўным доказам таго, што яму на яе пляваць, і яна пусьціла ў ход цяжкую артылерыю абвінавачаньняў у тым, што ён убогі п'яніца. Гэта ўжо было занадта, тым больш што яна, відавочна, не ўсьведамляла, што кажа не пра яго, а пра нягеглы плод свайго ўяўленьня. Да таго ж, неабгрунтаванае абвінавачаньне ў п'янстве гэткае ж прыкрае для мужчыны, як і празываньне шлюхай — для жанчыны. Таму ён пачаў азлоблена маўчаць — яна гістэрыла, а потым неяк сумелася й… некуды зьнікла. Праўда, ненадоўга. Ён нават не пасьпеў як сьлед засумаваць па ёй, а яна ўжо з позіркам адданай сучкі кінулася яму пад ногі ў кіно. Зьміцер тады ўзрадаваўся, таму што мірыцца неяк трэба было, а тут выпадак зладзіў гэткую добрую магчымасьць, якая не закранала нічыйго гонару. Але ў кавярні Марыя зноў гаварыла ў асноўным пра сябе, ні пра што ў яго не цікавілася. Ён бачыў, што яна хоча пагаварыць пра *ix*, але загадзя баіцца, што ён ня пойдзе на размову. Вось гэтая ейная нявера ў тое, што ён здатны на разумныя ўчынкі, на добрыя чалавечыя адносіны, узлавала яго больш за ўсё. І таму, калі Марыя зьнікла ў невядомым кірунку — зноў жа не празь яго, не праз сварку, а праз ідыёцкі страх перад жыцьцём, праблемамі, людзьмі, Зьміцер уздыхнуў з палёгкай. Нарэшце ён быў вольны — і для мастацтва, і для асабістага жыцьця.

<Асноўны тэкТады ж вельмі дарэчы яму падвярнулася пад руку Надзя. Яна, сапраўды, была маладзейшая за Марыю й ня мела ейнага жыцьцёвага досьведу, якім тая адначасова й ганарылася і які сама сабе не магла прабачыць. Надзя была ўладкаванай па жыцьці дзяўчынкай, мела спадкаемную кватэру недалёка ад цэнтру, багатага бацьку, вясёлы, нахабны нораў і добрыя жыцьцёвыя пэрспэктывы. Ёй ня трэба было ні за што змагацца, яна ня мусіла думаць, як зарабіць на кавалак хлеба,

фарбы, вандроўкі. У ейным веку дзяўчаты нават пра замужжа згадваюць са сьмехам і шчанячай радасьцю, таму што гэта — наперадзе, блізка й будзе вельмі ўдалым. Асабліва для яе, для Надзі, таму што любы будзе рады й ім ня будзе пра што клапаціцца. Праўда, Зьмітру потым падалося, што Надзя й сама была радая любому. І, нягледзячы на тое, што яна старанна строіла Зьмітру вочкі, старанна спакушала яго, хаця яны ўжо даволі доўга былі разам, і шчодра дазволіла пажыць у сваёй кватэры, Зьміцер усё больш упэўніваўся, што Надзі было ўсё роўна, хто мог апынуцца на ягоным месцы — “абы моцна ня піў і не сьмярдзеў”.

Спакваля Зьміцер адыграўся на Надзі за непаразуменьні з Марыяй і пачаў заўважаць, што Марыі яму не хапае. Марыя ж не заўжды была гэткай ідыёткай, як у апошнія месяцы іхнага сяброўства. Дагэтуль ім было вельмі добра, і яны змаглі супольна прайсьці ў каханьні й жыцьці праз, здавалася, непераадольныя выпрабаваньні. І ў першую чаргу — увесь гэны даўгі шлях адно да аднаго, да іхнага знаёмства. Дзіва, як яны знайшлі адно аднаго й што гэтак доўга шукалі, бо, хаця яны вельмі розныя па тэмпэрамэнце й па характары, яны якраз тыя супрацьлегласьці, якія прыцягваюцца й утвараюць адно цэлае. У гэтым Зьміцер не сумняваўся, нават калі яны канчаткова разышліся. Ён адчуваў Марыю, ейны душэўны стан і настрой на адлегласьці і быў упэўнены: тое самае робіцца з Марыяй. Ён мог меркаваць, што дзеецца ў ейным жыцьці й што яна перажывае. Аднойчы ён ішоў з кухні й нечакана жахнуў кулаком па дзьвярах лазьнічкі. Ён адчуваў: Марыя ў гэты момант знайшла сабе некага іншага — можа, сябра, а можа, новае каханьне. Пасьля гэтага ў яго ўжо зусім не заладзілася з Надзяй, але ён ня мог вырашыць, што яму цяпер рабіць. Ён вёў той лад жыцьця, якога гэтак унікаў, быўшы з Марыяй. Але цяпер атрымалася значна горай: ён быў зь нялюбай жанчынай і яму ўжо даўно надакучыла разгаманьваць зь ёю пра мастацтва й любіцца “ў адплату” невядома каму.
А цяпер вось яшчэ гэтая каса. Навошта было адразаць валасы? Ходзіць недзе, бунтуе мужыкоў якой-небудзь тыфознай стрыжкай. Ніколі ёй гэтага не прабачу! Так і ўяўляю, як яна стаіць дзе-небудзь на галерэі каля прыбіральняў у Доме афіцэраў, паліць і хіліць абскубаную галоўку да задымленага

плечыка. “Млее” ад балбатні якога-небудзь джазанутага псэўдаінтэлектуала зь нью-ёрскай бародкай, а сама паціху глядзіцца ў люстэрка ўнізе — ці прыгожа яна выглядае. Косіць пад маладую. Сама ж прыпадабняецца да Надзі й усёй гэтай падлеткавай зграі. Зусім затлуміла сабе галаву. Сто працэнтаў, што й паліць пачала. Дадумалася! Касу даслала! Магла б адну якую пасмачку пакласьці, калі ўжо была на тое нейкая рамантычная патрэба. Добра яшчэ, што ня ўсю галаву па пошце атрымаў. Што яна за жанчына? І ці жывая яна там? Вунь жа каса якая халодная, а раней — рукой возьмешся, а яна ажно гарачая каля шыі. Марыя, Марыя, якая ж ты свалата. А ты, дурань бесхарактарны, яе кахаеш…

Гэтак стаяў і разважаў Зьміцер каля ракі, на супрацьлеглым ад вінакурні беразе. У вінакурні на трэцім паверсе балявалі: сьмяяліся, сьпявалі, крычалі, але мацюкоў чуваць не было. Добра ж некаторым жывецца — сядзяць сабе ў раі, забаўляюцца, песьні сьпяваюць, а ў цябе ў эцюдніку рудая каса, і невядома, што зь ёй цяпер рабіць. Зьміцер адкрыў эцюднік, выцягнуў касу, пагладзіў, акуратна скруціў, прыцэліўся й шпульгануў у раку. Рудая зьмяюка праплыла крыху па паверхні, пакуль не намокла й не патанула.

А на супрацьлеглым беразе зьявілася аднекуль дамачка ў белым — таўклася зазыўна каля вады й тарэшчылася на Зьмітра. Памылкі быць не магло: незнаёмка глядзела менавіта на яго, пасьміхалася прыязна і ўсім сваім выглядам запрашала да сябе. Цётка была яўна мясцовая, бо занадта дзіўная, але нічога непрыемнага ён у ёй не знайшоў і падумаў, што калі яна сама гэтак напрошваецца, то чаму б і не. У рэшце рэшт, яму трэба было забыцца, разьвеяцца, да таго ж, такой зьдзічэлай жанчыны, як абарыгенка ў белым, у яго яшчэ не было. Ад Надзі ён усё роўна сыдзе, Марыя як у ваду канула, а гэтая тут — жывая, прыгожая, ладная. Хай мне будзе горай — пайду. Цікава проста, што за яна. У белай даўгой сукенцы. Відаць, на сьвята на трэці паверх прыйшла. А можа, гэта яна сама ў тым пакоі з надпісам на шторах жыве. З такой і ня грэх, бо надта душэўна напісала. Ня хоку, вядома, але нельга чакаць зашмат ад абарыгенкі.

А я ўсё ж вырашыла пераяжджаць. Дом мой якраз здалі, і, хаця кватэра была яшчэ не ўпарадкаваная, жыць там можна было, асабліва пасьля Лошыцы. Вядома, мне было шкада пакідаць

вінакурню, раку, мост, альтанку й парк, але я паміралa ад самоты й бязглуздасьці свайго асабістага жыцьця. Я хацела на новае месца, каб усё забыць і пачаць спачатку. Мяне гнала прага пераменаў, бо я больш ня ў стане была слухаць свой унутраны голас і жыць безь Зьмітра там, дзе ўсё было прасякнута каханьнем да яго й дзе дрэвы яшчэ маглі засьведчыць, што ён таксама мяне кахаў. Праўда, Зьміцер патрабаваў ад мяне нейкай паказной, кідкай інакшасьці, але я й так інакшая, як і кожны чалавек. Да таго ж, я не магу быць інакшай больш, чым я ўжо ёсьць, і, думаю, я не павінна перарабляць пад сваю інакшасьць грамадзтва, бо гэтак я яе проста згублю. І як можна было прылічыць мяне да ўмоўнасьцяў? — Я ж чалавек! Я чалавек! Я звычайны чалавек, і тым больш жанчына. Я й так шмат зрабіла, каб годна справіцца са сваёй сытуацыяй: навуку рухала, напісала пра горад, у якім ня здолела прарасьці каранямі, знайшла новых сяброў… Дарэчы, высьветлілася, што Габрусь зусім не маньяк — проста ён любіць гуляць у прэфэранс. Гэта тое, што дае яму адчуваньне стабільнасьці жыцьця, асабліва цяпер, калі ён разышоўся са сваёй жонкай. І паколькі ўдзень усе занятыя, гуляе ён з прыяцелямі позна ўвечары й па начах, таму й мусіў езьдзіць на ровары праз начны парк, бо хацеў і са мной пабыць, і пагуляць у карты. А яшчэ Габрусь патлумачыў, што не прыяжджаў столькі часу, бо прачытаў у “Спадчыне” новы матэрыял пра Лошыцу, і яму карцела сёе-тое пашукаць у архівах. Асабліва спадзяваўся ён знайсьці што-небудзь пра пані Любанскую, дачку маршалка мазырскай шляхты, якая зайшла за мясцовага пана ў дзевятнаццаць гадоў, была надта прыгожая й, па чутках, круціла раманы з самымі выбітнымі мужчынамі свайго часу, але была вельмі спагадлівая, дапамагала бедным, утрымлівала дом састарэлых — толькі вось дзяцей ня мела й утапілася на свой дзень народзінаў. Выцягнуў яе ейны сабака. А пан змарнеў і некуды зьехаў. Цяпер пані завецца Белай Дамай, зьяўляецца час ад часу ў белай сукенцы ў парку й дапамагае закаханым і бязьдзетным жанчынам.

Як я гэта пачула, дык ажно скаланулася ад холаду, і мне падалося, што забрахаў сабака й кропля вады бэмкнула аб падлогу. Перад вечарынай я зноў паспрабавала знайсьці госьцю ў белай сукенцы, але нідзе не сустрэла яе, а суседзі й Насьця яе ня ведалі. Таму я запрасіла толькі старых сяброў, Габруся й

нагатавала есьці. Госьці прынесьлі віно й шакаляд, а адна даўняя мая прыяцелька падарыла мне “Чупа-Чупс”. Гэтак мы сядзелі, гутарылі, жартавалі й сьмяяліся. І я бачыла, што сябры радуюцца за мяне, таму што я нарэшце раблю, як людзі. І яшчэ яны падмігвалі мне, пераглядаліся міжсобку і ўсё намякалі, што за Габрусём я не прападу. А мне было ніякавата. Надышоў жа мой апошні вечар у Лошыцы, дзе я была гэткай няшчаснай і гэткай шчасьлівай. Апошні вечар, за каторым ужо не павінна было быць цябе, пасьля якога ты мяне ўжо больш ніколі ня знойдзеш. Апошні вечар, які пяройдзе ў ноч. Дзе я больш не змагу супраціўляцца абставінам і абяру Габруся. І Габрусь выведзе мяне ў тое жыцьцё, дзе я ўжо больш ня буду згадваць цябе.

І калі я сядзела з гэткімі маркотнымі думкамі пасярод агульнай весялосьці, я адчула, што нехта пагладзіў мяне па шыі, і затым па сьпіне ў мяне як быццам праліўся ручаёк ледзяной вады — якраз там, дзе раней была каса. А праз колькі часу дзьверы самі адчыніліся, і я, здаецца, пачула шоргат набрынялай вадой даўгой сукенкі. Але ўвайшоў ты, спыніўся на парозе, агледзеў гасьцей і зьдзівіўся, быццам не знайшоў некага, каго напэўна чакаў убачыць. А потым заўважыў мяне. Я схапілася за горла ад хваляваньня, але ўсё роўна заплакала, а ты падышоў да мяне, апусьціў вочы, узяў мяне за руку й прыклаў яе да свайго сэрца…

А Габруся мы бачылі амаль праз год у кіно разам з Надзяй. Казалі, што ён носіць яе на руках, чытае ёй вершы, катаецца зь ёй на ровары. Ён нават прывёў Надзю на хрэсьбіны нашага сына Андрэя, дзе сам, канечне ж, быў хросным. Андрэй нарадзіўся падобным да бацькі, але з маёй усьмешкай і меншым за звычайных дзяцей, бо крыху раней за тэрмін. А ўсё праз тое, што, калі мы клалі кафлю на бальконе на нашым першым паверсе, да нас падбег сабака — чорны, мокры, быццам толькі што з вады. А стаяла ж гарачыня — ліпень! Я гэтак спужалася, што хлопец, відаць, вырашыў лезьці з сваёй нэўрастэнічнай маці на волю. І пакуль мы чакалі таксоўку на лаўцы каля пад’езду, сабака ляжаў каля маіх ног — шчасьлівая, супакоеная псіна. За гэныя некалькі хвілінаў сабака абсох і цела ягонае перастала дрыжэць.

Пасьля раддому мы каталі Андрэя ў парку, таму ён хутка падрос, падужэў і дагнаў сваіх равесьнікаў. Абарыгены мяне

цяпер вельмі паважаюць, тым больш што пасьля родаў я пакруглела й стала называцца “маладзіцай”. Калі мы са Зьмітром і Андрэем гуляем у парку, абарыгены кланяюцца нам, усьміхаюцца й кажуць: “Здрастуйця”. Самі ж яны таксама пакрысе перасяляюцца ў новыя шматпавярховікі, робяцца вельмі сур’ёзнымі, важнымі й замаўляюць у Зьмітра праўдзівыя мастацкія шэдэўры. А я…

А я вось цяпер хоць-калі думаю: “Нашто я тады, на сваю галаву, палола гэныя буракі?”

Лістапад 2001 г. — красавік 2002 г.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 12-11-2002

Сяргей Балахонаў

Ізноў пра кляты постмадэрнізм

Хорхе баяўся другой кнігі Арыстотэля з-за таго, што яна, імаверна, навучала ператвараць кожную праўду, каб не рабіцца рабамі сваіх перакананьняў. Мусіць, абавязкам кожнага, хто любіць людзей, — навучаць сьмяяцца з праўды, *навучаць абсьмейваць саму праўду*, бо адзіная цьвёрдая праўда — што трэба вызваліцца ад нездаровай жарсьці да праўды…
Умбэрта Эка. “Імя ружы”
Чытаць далей ня мела сэнсу. Ён спрабаваў прасачыць ланцужок словаў, наперад, радок за радком, намагаючыся адначасова ўцяміць, ухапіць, зразумець, прыдумаць (?) хаця б які сэнс…
Ігар Бабкоў. “Адам Клакоцкі і ягоныя цені”

Чамусьці менавіта ў Горадні апошнім часам нараджаецца шмат тэкстаў, зь якімі хочацца спрачацца і спрачацца. І я тут маю на ўвазе ня столькі непараўнальнага (і ў гэткай самай ступені непапраўнага) Алеся Чобата, колькі Данілу Жукоўскага, які на

бачынах “ARCHE” ды “Нашае Нівы” марыць пра *лепшую беларускую літаратуру*, што зацікавіла б паспольства. Мара сьветлая і пахвальная, як грамата выдатніка. Аднак сп. Жукоўскі яўна перабірае зь меркай крытыцызму, папросту плюючы наўкола: і ў калодзеж, і ў столю, і ў люстэрка. У артыкуле “Пасткі на хайвэі постмадэрнізму” (ARCHE-Скарына. 2001, №4(18)) сп. Жукоўскі ганіць на чым сьвет сучасную беларускую літаратуру за постмадэрновасьць маладых і традыцыйнасьць старых. Постмадэрнізму дастаецца на абаранкі безь ліманадкі больш за ўсё, бо гэты напрамак настолькі антыпатычны аўтару, што ён без ваганьняў залучае яго ў двукосьсі й паблажліва называе “*ўвесь гэты “постмадэрнізм”*. Цытую: “*Лозунгі постмадэрнізму лёгка знаходзілі дарогу да сэрцаў, спавітыя прывабным вэлюмам “заходняе штучкі”. Першая спакуса “постмадэрнізму” — ісці лёгкім шляхам. Навошта вырашаць праблему сталення нацыі сучаснымі сродкамі і катэгорыямі? Можна ўзняць “сучасную” тэму (прыкладам, гомасексуалізм).[…]; “Постмадэрнізм” — маскіровачная сетка… Местачковасці ён стварае філасофскі базіс, маразму дапамагае выглядаць творчым пошукам, непавагу да чытача выстаўляе клопатам пра ягонае культурнае развіццё*”. Што, апрача адмаўленьня, хацеў выказаць гэтым сп. Жукоўскі? Гэта пустата. Цягам усяго тэксту не названы ніводзін аўтар, ніводзін твор, што стаўся аб’ектам такой зьніштажальнай крытыкі. Вось і стаецца не зусім зразумела, ці былі ў Данілы Жукоўскага падставы сыкаць на беларускі постмадэрнізм, ці ўсё гэта *un pensier del suo capo*. Патрэбная канкрэтыка. Можна пагадзіцца, што для кагосьці постмадэрнізм сапраўды маскіровачная сетка. Няма роду без выроду. Але ж гэта наўрад ці будзе зьявішчам усеагульнага характару. Магчыма, хтосьці голасна сьпяшаецца абвесьціць сябе постмадэрністам. Аднак мала проста назвацца постмадэрністам, трэба ім быць.

Сапраўды постмадэрнісцкія творы, безумоўна, у Беларусі ёсьць. Для іх аўтараў постмадэрнізм зусім не маскіровачная сетка, а сапраўды *апошняя тэрыторыя*, паводле трапнага выслоўя ўкраінскага пісьменьніка Юр’я Андруховіча. Паміж беларускіх мадэрністаў паўстаюць (у альфабэтным парадку): Валянцін Акудовіч з сваімі пэсымістычнымі літаратурна-філязофскімі эсэ

кшталту “Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека”; Ігар Бабкоў з кангеніяльнымі прадмовамі да нумароў часопісу “Фрагмэнты” (найперш 1996—1997 гг.), з інтэлектуальным раманам-сном “Адам Клакоцкі і ягоныя цені”; Валер Булгакаў з зайдросным комплексам размаітых тэкстаў (цыкл вершаў “Сумесна. Суцэльна. Супольна”, эсэ “Слоўнік паняцьцяў”, аповесьць “Правільны выбар”, дасьледзіны “Мой Багушэвіч: дыялектыка клясычнага тэксту”, “Геній Лукашэнкі” ды інш.); Міхась Баярын найперш са зборнікам *антыкоідных* вершаў “Шалёны вертаградар”, куды ўвайшла адметна вартая ўвагі паэма “Лісты да беларускага сябра”; Андрэй Дынько з поўным алюзіяў на *дзесьці чытанае* “Аповедам №3” і дэканструкцыйнымі прагледзінамі беларускай савецкай літаратурнай спадчыны “Заўвагі пра самаатаесамленьне і раздвоенасьць”; Віктар Жыбуль з вытанчана сэнсацыйнымі паліндромнымі тэкстамі; Юрась Пацюпа з настальгіяй па XVIII ст. у *відчайдушно іскрометних* “Юрлівых санэтах”; Прафэсар Каркаран (*раптам быў і раптам зьнік*, не раскрыўшы чытачам свайго *incognito*) зь містэрыямі-забаўлянкамі “Кіно і немцы” ды “Нецьвярозы настрой”; Андрэй Хадановіч, які кожным сваім вершам ці артыкулам сьведчыць пра жыцьцё беларускае літаратуры (нагадаю хоць бы “З чаго пачынаецца Жодзіна?”, “Песню белорусских партизан”, “Калыханку для маладога літаратара”); Ян Какупала зь неадназначнымі містыфікацыямі ў “Сазе пра Кліменкаў” і “Сазе пра “Пагоню”. Гэты пералік далёка ня поўны. Названыя імёны прыведзены тут, як той казаў, наўскідак, безь вялікіх прыпамінаў. Гэтыя творы — тое, што ўрэзалася ў памяць. У “Пастках на хайвэі постмадэрнізму” ніхто зь іх ані паўсловам ня ўзгадваецца.

Затое ёсьць наруглівыя намінкі на іншых аўтараў, якія да постмадэрнізму маюць хоць і блізкае, але ўсё ж апасродкаванае дачыненьне. Імёнаў зноў жа няма. Размова ідзе пра *“бізнэсмэна-літаратара”* і пра *“дужа рэвалюцыйнага шмат у якіх пытаньнях паэта”*, якія нібыта зьдзекуюцца ў сваіх *“творах малога жанру, але вялікіх амбіцыяў”* з сучасьнікаў і калегаў па пяры. Гаворыцца пра *“барда-журналіста”*, які нібыта ня мае здольнасьцяў *“пераканаць нас”*, што сапраўды ён там і там шэдэўраў не пабачыў. З чаго такая безыменнасьць-безназоўнасьць? Павесіць на фанэрчыне фатаграфію апанэнта і пуляць у яе з рагаткі вельмі проста. А вось выказваць свае

заўвагі проста ў твар свайму апанэнту, аказваецца, цяжка. Далей сп. Жукоўскі разважае аб прыстойнасьці. Але ж ці можа тут быць пра гэта гаворка? Ці прыстойна казаць, што паколькі А і В сядзелі на трубе, то С і D з суседняга даху, як і ўся дахоўка, — лухта, ня вартая чытацкае ўвагі? Такое называецца зьмешваньнем паняткаў.

Крытыкуючы постмадэрнізм, сп. Жукоўскі не называе ніводнага імені. Калі ж ён узяўся пахваліць канкрэтнага постмадэрніста А.Хадановіча (гл. артыкул "Чырвоныя з зялёным і чырвоныя з белым" у ARCHE-Скарына, №6(20) за 2001 г.) за "*падкрэслена інтэлектуальную паэзію*", то ніводным слоўцам не абмовіўся, што гэтым разам таксама маем справу зь беларускім постмадэрнізмам. Вось жа й можна прыраўноўваць случчакоў-БНРаўцаў зь "Нічыіх" А. Федарэнкі да *карнавальных калябарантаў* зь "Сьмерці лютніста" С. Балахонава, абсалютна не папярэджваючы чытача пра тое, што творы гэтыя адносяцца да прынцыпова розных традыцыяў.
Пасьля ўсяго з экстравагантнасьцю БТРа ў інтэр'еры Пулаўскага палацу цьвердзіць: "*Трэба перастаць хавацца за постмадэрнізм і звярнуцца да вырашэння даўно наспелых праблем. Неабходна пагадзіцца з тым, што на highway постмадэрнізму нельга трапіць, абмінуўшы тракт Багушэвіча. Не трэба нічога адрынаць*". Гуляеце на публіку, спадару Жукоўскі. Ці ж будзе сапраўдны постмадэрнізм адрынаць таго ж самага Багушэвіча, абмінаць "*кепскабудзе*"ўскі багушэвіцкі тракт? Адказ на гэтае пытаньне вядомы: спадчына клясыка не застанецца па-за постмадэрнісцкім кантэкстам, залучаючыся ў віртуальную рэчаіснасьць спавязаных міжсобку мінуўшчыны, цяпершчыны й будучыні. Спрэчка, вядома, тут магчымая. Але ж ня варта забывацца, што акурат Ф. Багушэвічу прысьвечана памянёнае вышэй постмадэрнісцкае дасьледаваньне В. Булгакава. А ў нашым любым Гомелі людцы добрыя, дзеткі Зямлі-маткі маёй нават рок-кампазыцыю на адзін зь вершаў Францішка Багушэвіча напісалі! Натуральна, нікому не забаронена раздражняцца на амаль дадаісцкі "Тазік беларускі", але прычым тут постмадэрнізм? А такая акалічнасьць, што тыя альбо іншыя творы нельга адшукаць у Горадні (ды хоць бы дзе!), — не апраўданьне і не выбачэньне. У сп. Жукоўскага часам "пры чытаньні ці слуханьні чарговага опусу зьяўляецца

адчуваньне, што зь цябе зьдзекуюцца, робяць зь цябе дурня”. Што ж, і ў 1894 годзе шаноўны Шымон Рэўка з-пад Барысава наракаў на “якогась пана Марцінкевіча” і ягоныя “ксёнжкі”, каторыя “як бы сьмеючыся з нашага брата пісаны”. Вось жа й выходзіць: “Ня дай сабе засохнуць! Пачуйся Багушэвічам!”
Як на мой розум, галоўныя праблемы беларускага постмадэрнізму зьвязаныя не з “пагоняю за модай” ці “пошукам лёгкіх дарог”. Як матка Аляксандра Македонскага ў старасьвецкай “Александрыі”, беларускі постмадэрнізм ніяк ня можа разрадзіцца буйным творам. У нас на сёньня няма ніводнага постмадэрнісцкага раману (“Адам Клакоцкі і ягоныя цені” І. Бабкова хоць і ўсьцешны, але малапаказальны вынятак). Да таго ж, амаль усе беларускія постмадэрнісцкія творы разьлічаны на абазнанага чытача: нашы літаратары не займаюцца прыемным фліртам з масавым чытачом, як, прыкладам, У. Эка ці В. Пялевін. Што праўда, некаторыя схільныя бачыць элемэнты постмадэрнізму ўжо ў творах У. Караткевіча, перш за ўсё ў рамане “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”. Аднак гэта належным чынам не даказана. (Вось, дарэчы, яшчэ адна праблема беларускага постмадэрнізму — нявысьветленасьць каранёў ва ўласна беларускай літаратуры.)
Акрамя нястачы раманаў, адчуваецца востры недахват перакладных постмадэрнісцкіх твораў (за выняткам “Шэршняў” П. Гандке ў пераклумачэньні Яўгена Бяласіна, Дж. Фаўлза ў перакладзе В. Судлянковай, “Парфумы” П. Зюскінда ў бліскучым перакладзе В. Сёмухі ды яшчэ вельмі кароткага сьпісу). Да гэтага часу ў беларускую не перакладзены ніводзін раман Умбэрта Эка, хаця ад першага італьянскага выданьня “Імя ружы” прамінула ўжо 20 гадоў. Ці мо будзем чакаць, як беларускага перакладу Джойсавага “Ўлісу” (няпоўнага, між іншым)?
Яшчэ сп. Жукоўскі ўпэўнены, што *“нашы экстрэмісты (sic!) перакананыя ў немагчымасьці ўласнае перамогі”*, і нават акрэсьлівае “гэтую хваробу” як Сындром Непераможнага Ворага (СНВ). Ня знаю, якім бокам гэта датычыць беларускага постмадэрнізму. Хто такія экстрэмісты? І хто — вораг? Ці сп. Жукоўскі пад ворагам разумее ўсё таго ж Аляксандра Лукашэнку? Аднак і такое тлумачэньне ягоных словаў не праясьняе сытуацыі. Можа быць, вы ведаеце, што *перамога* бывае рознаю. Прыпусьцім, што мелася на ўвазе заваёва

“экстрэмістамі” гербавых скрынак з адсоткамі лукашэнкаўскага рэйтынгу. Дык, мабыць, шаноўны аўтар, відочна ўратаваны ад СНВ, прапануе небаракам канкрэтны ход, як тае перамогі дасягнуць?
Вы будзеце сьмяяцца, але *народ — хворы* (прынамсі, ладная яго частка). Хворы, як, прыкладам, немцы за часамі Гітлера. Таму яна — гэтая частка — не ўспрымае аніякай праўды, акрамя жаданай. І яе дае Лукашэнка. Наша праўда ня горшая, а папросту незапатрабаваная. Адсюль — заданьне, пакліканьне ствараць глебу для таго, каб людзі сталі атаясамліваць свае жаданьні з нашай праўдай.
Неабходнасьць публічнай дыскусіі “на вачах досыць шырокай зацікаўленай аўдыторыі” не падлягае ніякаму сумневу. У дыскусіі варта ўступаць ды распальваць іх самому. Чым больш будзе палемік унутры нацыянальнае беларускае грамады, тым болей шанцаў, што яны здабудуць водгук і ў крэольскай грамадзе. На парадку дня — патрэба заваёвы тэлебачаньня. Хто герой?

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-11-2002**
[image]